Установа адукацыі
“МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ХАРЧАВАННЯ”

І. А. Пушкін

# ГІСТАРЫЧНАЯ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ГОРАДА МАГІЛЁВА

**Курс лекцый
для студэнтаў усіх спецыяльнасцей
дзённай і завочнай формы навучання**

Магілёў 2006

УДК 947.64-25
ББК 63. 3
П 91

Абмеркавана і рэкамендавана да друку на пасяджэнні кафедры гуманітарных дысцыплін. Пратакол № 6 ад 09.02.2006 г.
Навукова-метадычным саветам УА МДУХ. Пратакол № 5 ад 15.03.2006 г.

Складальнік
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных
дысцыплін УА МДУХ
І. А. Пушкін

Навуковыя рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных
гістарычных дысцыплін УА "МДУ імя А.Куляшова"
А. Р. Агееў
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных
дысцыплін УА МДУХ
А. П. Косцераў

**Пушкін, І. А.**
П 91 **Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва** : Курс лекцый. – Магілёў: УА МДУХ, 2006. – 150 с.

У кнізе ўтрымліваюцца звесткі аб асноўных, найбольш важных падзеях, з'явах, датах, імёнах, заканамернасцях з гісторыі і культуры горада Магілёва. Асвятляецца дзейнасць найбольш выдатных асоб, якія звязаны з гісторыяй і культурай горада. Прадстаўлены асноўныя помнікі гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры горада Магілёва. Выданне будзе цікавым для выкладчыкаў, настаўнікаў, студэнтаў і навучэнцаў школ.

**УДК 947.64-25**
**ББК 63. 3**

© УА "Магілеўскі дзяржаўны
універсітэт харчавання", 2006

# Змест


Уводзіны ........................................................................................ 4

Лекцыя 1. Узнікненне Магілёва і паходжанне назвы горада .................. 5

Лекцыя 2. Эканамічнае, грамадска-палітычнае і рэлігійнае жыццё Магілёва ў сярэдневеччы ........................................................ 15

Лекцыя 3. Развіццё архітэктуры і мастацтва ў Магілёве. Быт жыхароў горада ў 15-18 стст. ............................................................. 33

Лекцыя 4. Гісторыя і традыцыі харчавання ........................................... 52

Лекцыя 5. Магілёў у віхуры ваенных падзей .......................................... 62

Лекцыя 6. Магілёў у складзе Расійскай імперыі ..................................... 73

Лекцыя 7. Магілёў у час першай сусветнай вайны і рэвалюцый ........... 94

Лекцыя 8. Магілёў у 1920 – 1930-я гады ................................................ 104

Лекцыя 9. Падзеі вайны 1941 – 1945 гг. і Магілёў. Абарона, акупацыя і вызваленне горада ........................................................................ 122

Лекцыя 10. Магілёў на рубяжы тысячагоддзяў ....................................... 129

Літаратура ........................................................................................... 145

# Уводзіны

Беларускае Падняпроўе самы цікавы рэгіён Усходняй Еўропы. Невыпадкова менавіта тут былі выяўлены самыя старажытныя ў Беларусі стаянкі першабытных людзей. На працягу стагоддзяў Магілёўшчына і горад Магілёў знаходзіліся на месцы сутыкнення чалавечых інтарэсаў і канфліктаў: рэлігійных, міждзяржаўных, нацыянальных. Але магілёўцы імкнуліся пакінуць пасля сябе дабро, веліч, высокародныя ўчынкі, прыгажосць, памкненні, увасобленыя ў помніках матэрыяльнай і духоўнай культуры. Магілёў зведаў багацце і веліч, войны і разбурэнні, уздым і заняпад. Нягледзячы ні на што, захаваў у гістарычнай і культурнай спадчыне магілёўцаў своеасаблівасць і адметнасць, якія вартыя памяці і ўшанавання.

Як адзначае пісьменнік Кастусь Тарасаў: “Любоў да Радзімы мае перадумовай веданне мінулага свайго народа – яго перамог і паражэнняў, здабыткаў і страт, яго герояў, мысліцяляў, вялікіх майстроў, помнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры... Менавіта любоўю да Радзімы дыктуецца жаданне прасякаць загадкі даўніны, даведацца пра тое, што было, але чаго ўжо няма, ці што засталося малапрыкметнымі слядамі ў скупых словах летапісаў і нешматлікіх дакументах...”[1]. Гэтай высокароднай мэты найлепей дасягнуць пранікнуўшыся мінуўшчынай роднага краю – горада Магілёва, яго гістарычнай і культурнай спадчынай.

Любыя веды аб мінулым Магілёва набліжаюць яго да нас, узбагачаюць нашыя пачуцці, запаўняюць навакольную прастору і папярэдні нам час мноствам падзей і асоб. Гісторыя і культурныя здабыткі Магілёва дазваляюць убачыць у далёкай даўніне тое, што было для яе будучыняй, прынамсі гэта і дазваляе вучыцца ў яе. Выказваючы свой гонар за мінулае, мы спадзяемся, што наступныя пакаленні будуць ганарыцца днём сёняшнім, учынкамі і справамі людзей пачатка 21 стагоддзя.

Таму вывучэнне курса ‘Гістарычная і культурная спадчына Магілёва” будзе садзейнічаць: станаўленню і развіццю адукаванай, творчай, нацыянальна-свядомай і сацыяльна-актыўнай асобы; выхаванню пачуцця гонару за свой край, патрыятызму. У выніку, у свядомасці замацуюцца веды аб асноўных, найбольш важных падзеях, з’явах, датах, імёнах, заканамернасцях з гісторыі і культуры горада Магілёва; адбудзецца знаёмства з дзейнасцю выдатных асоб, якія звязаны з гісторыяй і культурай горада.

За апошнія некалькі год з’явілася даволі шмат кніг і публікацый па гісторыі і культуры Магілёва, у напісанні каторых браў удзел і аўтар курса лекцый. Праводзяцца міжнародныя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя Магілёву. Гэтыя выданні пашыраюць і паглыбляюць веды зацікавіўшыхся спадчынай Магілёва. Апошняе і з’яўляецца адной з мэтаў курса лекцый. Аўтар адабраў з вялікай колькасці падзей і асобаў, на яго думку, найбольш цікавыя, якія можна выкарыстаць сучаснікамі ў сваёй практычнай дзейнасці. Напрыклад, спадчына Магілёва і магілёўцаў знойдзе сваё адлюстраванне ў турызме, рэкламе, стварэнні архітэктурных і геаграфічна-ландшафтных асяродкаў, у назвах крам, кавярняў, рэстаранаў, тавараў, блюд і г.д.

На старонках курса лекцый няма спасылак на выкарыстаныя крыніцы і даследаванні (агульны спіс размешчаны напрыканцы), аднак абавязак аўтара засведчыць, што ён карыстаўся шматлікімі даследаваннямі – як даўняй пары, так і сучаснымі, за што выказвае падзяку: Агееву А.Р., Барысенка М.С., Бяспанскаму С.І., Капыціну В.Ф., Клімуць Ж.Я., Косцераву А.П., Марзалюку І.А., Сідарэнка Б.І., Філіповічу І.І., Шымукенусу М.У., Яцкевічу З.Л. і інш.

[1] Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. – Мінск: Полымя, 1990. – С.5.

## Лекцыя 1. Узнікненне Магілёва і паходжанне назвы горада

1. Месцараспалажэнне Магілёва.
2. Археалагічныя помнікі, першыя паселішчы і ўзнікненне Магілёва.
3. Легенды і навуковыя меркаванні аб паходжанні назвы горада Магілёва.
4. Помнікі Магілёўскага летапісання - Магілёўская хроніка і яе аўтары.

Магілёў мае славутую і велічную гісторыю. Неабходна ведаць, што яго будынкі прыводзілі ў захапленне падарожнікаў. Тавары, выраблeныя працалюбівымі, руплівымі, таленавітымі рукамі магілёўскіх майстроў, знаходзілі попыт на рынках Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Голас магілёўскіх купцоў можна было пачуць у Расіі і Украіне, у Польшчы і Чэхіі, на нямецкіх землях. Магілёўскія юнакі імкнуліся да асветы, здабывалі адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах. Нашы продкі будавалі, стваралі мастацкія шэдэўры, увасобленыя ў камяні, метале, жывапісе. Яны пісалі вершы, выдавалі кнігі, стваралі гісторыю Магілёва, дбайна заносячы важнейшыя падзеі гарадскога жыцця ў магілёўскія хронікі. Яны былі людзьмі. Яны прыходзілі ў гэты свет і ператваралі яго ў адпаведнасці са сваімі патрабаваннямі, кахалі, нараджалі, умелі любіць і ненавідзець, стваральна працаваць і ваяваць.

Вылучаюцца некалькі этапаў у тысячагадовай гісторыі Магілёва: старажытны перыяд – з'яўленне чалавека, першыя стаянкі і паселішчы на тэрыторыі сучаснага горада; росквіт Магілёва - горад у складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, Рэчы Паспалітай; Магілёў губернскі – у складзе Расійскай імперыі; савецкі перыяд – адміністрацыйны цэнтр БССР і Магілёў - прамысловы і культурны цэнтр незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Самыя старажытныя паселішчы людзей на тэрыторыі сучаснага Магілёва адносяцца да перыяду 10 - 8 тыс. да н.э. Тэрыторыя горада была заселена чалавекам у эпоху ранняга жалезнага веку. Ад гэтага часу вядомы два помнікі культуры: Пелагееўскае гарадзішча ("Змяеўка") і паселішча на гары "Магіла". Наступны этап у асваенні тэрыторыі гістарычнага цэнтра звязаны з славянскай каланізацыяй. Як цэнтр княскай адміністрацыі Магілёў вядомы, згодна асобных археалагічных знаходак, з часоў князя Усяслава Ізяслававіча (1002-1003 гг.), гарадскі комплекс Магілёва сфарміраваўся ў 16 стагоддзі.

Тым не менш варта распачынаць Магілёўскую гісторыю з старажытных часоў, бо без аналізу папярэдадніх падзей не магчыма зразумець узнікнення горада Магілёва як буйнага рамесна-гандлёвага цэнтра. Важную ролю адыгрываў геаграфічны фактар.

### 1. Месцараспалажэнне Магілёва

Калі б на Беларусі не было рэк, дык чалавек ніколі б не з'явіўся на абшарах нашай Бацькаўшчыны. Са старажытных часоў засяленне тэрыторый адбывалася ўздоўж рэк. Месца, дзе ўзнік наш родны Магілёў, было вельмі спрыяльнае для жыцця чалавека. Не толькі таму, што тутака перакрыжоўваліся гандлёвыя і іншыя шляхі. Над шырокім і шматводным Дняпром узвышаліся халмы, узгоркі, было вельмі зручна для жыцця.

Рака Дняпро – адна з самых буйнейшых у Еўропе, яе агульная даўжыня каля 2201 кіламетра. Гэта быў галоўны гандлёвы шлях «з вараг у грэкі». На мапах і ў даведніках пазначана: «Магілёў – рачны порт на Дняпры», яшчэ ў па-за мінулым годзе гэта выглядала смешна, а сёлета па рацэ курсіраваў прагулачны карабель – з'явілася магчымасць у магілёўскіх немаўлятак адчуць дрыжэнне палубы і пачуць сябе капітанам. Абмялеў Дняпро ў раёне горада. А, здаецца, зусім нядаўна, у 50-60-я гады 20 ст., Магілёў быў сапраўдным портам, рачны транспарт па рацэ падымаўся вышэй па цячэнню да г.Оршы. Яшчэ да вайны, у раёне сённяшняга пляжа была сапраўдная прыстань.

Гораду не хапае вады. Абмялелі рэкі і з-за глабальных экалагічных праблем, і з-за прамысловага росту Магілёва, адпаведнага павелічэння колькасці насельніцтва.

Рака Дубравенка сёння нагадвае ручаёк. Яе агульная даўжыня каля 18 км, пачынаецца ад в. Сафіеўка Пашкаўскага сельсавета. 22 працэнты ракі знаходзіцца ў лесе, мае два прытокі: Струшню і Прыснянку. Нічым не нагадвае паўнаводную раку. Калісьці, будучы акадэмік і даследчык Арктыкі Ота Шмідт у шасцігадовым узросце пераплыў Дубравенку і гэта была незвычайная з'ява, аб ёй напісана было ў адзінай газеце «Могилевские губернские ведомости». У 1930-я гады вялікія лодкі з рыбаю падымаліся ўверх па цячэнню Дубравенкі да прыстані, якая была ў раёне сённяшняга Мінскага рынку. Паціху знікаюць дробныя рачулкі і ручайкі на тэрыторыі горада, знікае і чалавечая памяць аб іх.

Яшчэ пасля  вайны гарадскі пляж быў там, дзе ў р. Дняпро ўпадапа рэчка Дзебра, там быў натуральны пясчаны пляж. Гэта ў раёне сённяшняга Падніколля. Дзебра – правы прыток Дняпра, даўжынёю крыху болей 3 км, цячэ ўздоўж вуліцы Катоўскага. У раёне Магілёўскага аўтавакзала яе замуравалі ў трубы, раку напаткаў лёс Нямігі ў Мінску, Няглінкі ў Маскве. Праязджаючы па мосце ад плошчы імя Леніна ў бок Юбілейнага, мы бачым тэрасы – сведчанні былой магутнасці ракі. У 17 стагоддзі, калі да Магілёва падыйшло войска пад камандаваннем Радзівіла, была праблема, як фарсіраваць Дзебру. Напярэдадні Паўночнай вайны магілёўцы ўбівалі палі (сваі) у дно ракі Дзебра, каб вораг не меў магчамасці перавозіць па ёй войска.

Падобна да Дзебры і рака Струшня, правы прыток Дубравенкі даўжынёю менш 3 км. Цяпер падобна на ручаёк і толькі назва вуліцы каля Быхаўскага рынку, магчыма, хутка будзе нагадваць пра існаванне ракі, якая ў мінулым мела назву Уструшня.

З правага боку ў Дубравенку, у раёне Пячэрскага лесапарку, упадае ручэй (рака) Прыснянка даўжынёю каля 3,5 км. Вельмі маляўнічы.

Завяршаючы размову пра рэкі, трэба ўзгадаць раку Качарага, якая цякла паралельна Дняпру яшчэ ў пачатку XX ст. і ўпадала ў Святое возера. Толькі канавы ў раёне Абісініі нагадваюць нам аб ёй.

Улюбёнымі месцамі адпачынку гараджан з'яўляюцца берагі двух магілёўскіх азёр. Пячэрскае возера было штучна ўтворана на р. Дубравенка. Займае плошчу 10 га, найвялікшая даўжыня 1,6 км, шырыня 170 м, глыбіня 4,5 м. Шмат паданняў аб знікшай пад вадою царкве звязана з назваю Святога возера ў Магілёве. Але хутчэй за ўсё яго так назвалі з-за выключных якасцей вады.

Сапраўды, Святое возера – самае чыстае вадасховішча на тэрыторыі Магілёва. У савецкі час, калі змагаліся з рэлігіяй, яго сталі называць Грабянёўскім. Яно займае плошчу 28 га, даўжынёю 820 м, шырынею 490 м, глыбіня 12 м. Калісьці, яшчэ ў СССР, у водах возера праводзілася Усесаюзнае спаборніцтва па падводнаму арыентаванню. А сёння – гэта не толькі цудоўны пляж, але і месца правядзення народнага свята «Купалле».

Вабяць магілёўцаў і шматлікія кар'еры, якія запоўнены вадою і ўтварыліся ў выніку прамысловай здабычы пяску.

Напрыканцы, карціць сказаць, некалькі слоў пра крыніцы. Найбольш вядомыя дзве. Магілёўская крыніца ў Любужскім лесе – радовішча мінеральных вод па левым беразе Дняпра і помнік прыроды – Палыкавіцкая мінеральная крыніца. Яна была ўпершыню навукова даследавана ў 1802 г. акадэмікам В.М.Севергіным. Па паданнях кожную 8-ю, 9-ю і 10-ю пятніцу пасля праваслаўнай Пасхі вада крыніцы лічыцца святой (гаючай). Кожны дзень магілёўцы ідуць да крыніцы, да вады. Бо без яе, як у той песні: «... і ні туды, і ні сюды».

Геаграфічныя ўмовы і абумовілі з'яўленне стаянак і паселішчаў старажытных людзей на тэрыторыі сучаснага горада.

## 2. Археалагічныя помнікі, першыя паселішчы і ўзнікненне Магілёва

Упершыню чалавек з'явіўся на тэрыторыі сучаснага Магілёва ў познім палеаліце, больш за 10 тысяч гадоў назад, і ў раннім мезаліце (10–8-е тысячагоддзі да н.э.), пра што гавораць прылады працы і зброя, якія выяўлены на стаянках Хвойна і Магілёўская. У той час пасля раставання апошняга ледніковага покрыва ў гарах Скандынавіі і наступлення значнага пацяплення з паўднёвых раёнаў на поўнач для асваення новых тэрыторый па далінах рэк пачалі прасоўвацца паляўнічыя. Яны былі носьбітамі грэнскай культуры, характэрная асаблівасць якой – наяўнасць асіметрычных наканечнікаў стрэл так званага «грэнскага тыпу».

Помнікам ранняга этапу грэнскай культуры (10–12 тысяч гадоў назад) з'яўляецца стаянка Хвойна, якая размешчана на левым беразе Дняпра, за 3,5 км на ўсход ад Магілёва, вышэй вусця р. Хвоенка. Стаянку выявіў у 1975 г. і абследаваў у 1985-89 гг. на плошчы 500 м$^2$ В.Ф.Капыцін. Тут быў старажытны лагер паляўнічых, паўночная частка якога знішчана кар'ерам. Культурны пласт прадстаўлены гарызонтам цёмна-бурага пяску з попельнымі дамешкамі. На глыбіні 0,9–1,06 м выяўлены рэшткі расшчэпленага і апрацаванага крэменю, перакрытыя дзюннымі пясчанымі адкладамі, а таксама пласціны і адшчэпы для вырабу прылад працы, нуклеусы, скрабкі, разцы, праколкі. Магчыма, паселішча было размешчана тут у перыяд фарміравання глебавага покрыва, які працягваўся 200–300 гадоў і скончыўся ў сярэдзіне 9-га тысячагоддзя да н.э.

Стаянка Магілёўская эпохі ранняга мезаліту (10–8-е тысячагоддзі да н.э.) знаходзіцца на ўсходняй ускраіне горада, за 0,5 км на поўнач ад чыгуначнага маста цераз Дняпро. Выявіў у 1897 г. славуты магілёвец Е.Р.Раманаў, абследаваў у 1925 г. і 1927 г. К.М.Палікарповіч. У 1985 - 86 гг., у сувязі з узнікненнем небяспекі знішчэння помніка кар'ерам, экспедыцыя Магілёўскага педінстытута на

чале з В.Ф.Капыцiным правяла тут раскопкі. На стаянцы прасочаны культурны пласт магутнасцю 0,3–0,6 м, абследавана 180 $м^2$ плошчы. Сярод знаходак наканечнікі стрэл грэнскага тыпу, вастрыі, нажы, канцавыя скрабкі, бакавыя разцы, пласціны, нуклеусы.

У эпоху мезаліту змяніліся прыродныя ўмовы, сфарміраваліся сучасныя кліматычныя зоны і ландшафт. Ішоў пошук новых спосабаў дабывання ежы, вырабу прылад працы і палявання.

У неаліце (канец 5 – пачатак 4-га тысячагоддзя да н.э.) сталі больш дасканалымі прыёмы апрацоўкі каменю – пілаванне, шліфоўка, свідраванне. Для неаліту характэрна вынаходства глінянага посуду. Яго з'яўленне дало магчымасць гатаваць, захоўваць і назапашваць ежу. Увесь комплекс неалітычных помнікаў, што вылучаны на тэрыторыі Магілёва і ў наваколлях, адносіцца да верхнедняпроўскай культуры, археалагічнай культуры неалітычных плямён, якія ў 4–3-м тысячагоддзях да н.э. насялялі тэрыторыю паўднёва–усходняй Беларусі ў басейне Дняпра на паўночны ўсход ад вусцяў Бярэзіны і Іпуці. Верхнедняпроўцы займаліся пераважна паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам. Плямёны сяліліся ўздоўж карэнных берагоў рэк і азёр у наземных жытлах з агнішчамі ў сярэдзіне, выраблялі крамянёвыя прылады працы і зброю, скрабкі, скоблі, нажы, сякеры, ромбападобныя наканечнікі стрэл. Кераміка – вастрадонныя гаршкі, аздобленыя грабеньчатымі адбіткамі, ямкавымі, лапчастымі і накольчатымі ўзорамі.

Бронзавы век на тэрыторыі Магілёўшчыны пачаўся ў 2-м тысячагоддзі да н.э. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі абумовіла панаванне там амаль на працягу ўсей эпохі каменных прылад працы, пры апрацоўцы якіх выкарыстоўвалася свідраванне, пілаванне. Да таго часу адносяцца знаходкі на тэрыторыі горада каменных баявых сякер, дасканала адшліфаваных, з адтулінай для драўлянага дзяржання.

Адзін з помнікаў сярэднедняпроўскай культуры ў наваколлях Магілёва – грунтавы могільнік, які выявіў на ўсходняй ускраіне в. Вейна ў 1930 г. В.Р.Тарасенка. Пахаванні – трупапалажэнне на глыбіні 2,5 м. Каля аднаго знойдзена каменная свідраваная сякера, побач з другім – канцавы скрабок з рэтушаванымі краямі.

У канцы 8 – пачатку 7 стагоддзя да н.э. на тэрыторыі Магілёўшчыны пачаўся жалезны век. Жалеза дабывалі з бурых жалезнякоў (балотных, лугавых, азёрных) сырадутным спосабам у печах - домніцах. Вытворчасць прылад працы з жалеза значна павялічвала прадукцыйнасць земляробства, удасканальваліся дрэваапрацоўка, будаўнічая справа, выраб зброі. У раннім жалезным веку на мысах высокіх і стромкіх берагоў рэк з'явіліся ўмацаваныя паселішчы – гарадзішчы.

Гарадзішчы ранняга жалезнага веку вядомы ў наваколлях Магілёва – за 1 км ад в. Палыкавічы, за 1 км ад в. Буйнічы, а таксама на тэрыторыі горада (Пелагееўскае гарадзішча ва ўрочышчы Змяёўка на правым беразе р. Дубровенка на праспекце Міру). Яны ўтвораны насельніцтвам мілаградскай культуры (7–3 ст. да н.э., назва ад гарадзішча каля в. Мілаград Рэчыцкага р-на Гомельскай вобласці), для якой уласціва кераміка з яйцападобным тулавам, з прамым

адагнутым вонкі венчыкам або паўсферычныя пасудзіны без акрэсленага венчыка, упрыгожаныя ямкавымі або пазногцевымі ўцісканнямі на венчыку ці шыйцы, радзей у верхняй частцы тулава. Асноўнымі занятками насельніцтва былі земляробства і жывёлагадоўля, дапаможнымі – паляўніцтва і рыбалоўства. Тып жылля пераважна паўзямлянкі, пазней – наземныя або злёгку заглыбленыя ў зямлю жытлы, прамавугольныя ў плане, слупавой канструкцыі. Пахавальныя абрады – трупапалажэнне на курганных і трупаспаленне на бескурганных могільніках. Пры абследаванні Пелагееўскага гарадзішча выяўлены рэшткі жытла слупавой канструкцыі, два бронзавыя бранзалеты з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам, якія адносяцца да часоў мілаградскай культуры. Адносна этнічнай прыналежнасці мілаградскіх плямён існуе думка, што яны былі неўрамі. Пра іх пісаў Герадот, а краіну іх называў Неўрыдай.

Паводле Баркулабаўскага летапісу і сведчанняў Е.Р.Раманава, на месцы сучаснага парку імя Горкага існавала гарадзішча «Магіла», якое было парушана пры будаўніцтве замка ў 1526 г. Тут у агаленнях берагавога абрыву р. Дубравенка Е.Р.Раманаў выявіў фрагменты штрыхаванай керамікі з дамешкамі тоўчанага кварцу ў цесце, падобныя на знойдзеныя на Пелагееўскім гарадзішчы. Побач з гарадзішчам «Магіла» знаходзілася селішча 5–7 ст. Археалагіны матэрыял 10-12 стагоддзяў на гэтым месцы знойдзены І.Іоне, І.А.Марзалюком. Знаходкі апошняга і дазваляюць павялічыць век існавання Магілёва на 200 годоў.

У раннім жалезным веку побач з гарадзішчамі існавалі селішчы – неўмацаваныя пасяленні. Адно з іх размешчана на ўзгорках першай надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра, на ўсходняй ускраіне горада, плошчай 60 х 210 м.

У 2-й палавіне 1-га тысячагоддзя н.э. ў Верхнім Падняпроўі пачалося рассяленне славян, фарміраваліся саюзы плямён. Магілёўскае Падняпроўе было межавой зонай, дзе па-суседску жылі крывічы (паўночныя раёны), дрыгавічы (правабярэжжа Дняпра) і радзімічы (Пасожжа).

Мяжа паміж крывічамі і дрыгавічамі (паводле В.В.Сядова) праходзіла прыкладна па лініі Заслаўе–Барысаў–Шклоў і апускалася па Дняпры да Рагачова. Найбольш старажытныя помнікі крывічоў – падоўжаныя курганы, якія адначасова былі калектыўнымі магільнымі скляпамі. У 10 ст. ў крывічоў пашыраны пахавальны абрад трупапалажэння ў курганах паўсферычнай формы. Асновы курганоў звычайна абкружаны невялікімі канавамі, у якіх гарэлі пахавальныя агні.

У наваколлі Магілёва вядомы курганныя могільнікі крывічоў 11 ст. каля вёсак Княжыцы і Ямніца. Паводле звестак Е.Р.Раманава, вялікі курганны могільнік крывічоў да 1880-х гадоў захоўваўся паміж Дняпром і Дубравенкай і быў знішчаны ў час работ па нівеліраванні гарадскіх валоў. Там знойдзены шкляныя пазалочаныя пацеркі 11 ст. Наогул пры правядзенні археалагічных даследаванняў на тэрыторыі горада і наваколля знойдзены рэчы крывічоў і радзімічаў.

Адносна ўзнікнення назвы Магілёва і даты яго заснавання існуе некалькі процілеглых версій. Паводле адной з іх, Магілёўскі замак быў пабудаваны пры ўпадзенні Дубровенкі ў Дняпро. Час яго заснавання адносіцца да 1267 г. У польскай хроніцы Магілёў значыцца пад 1320 г.

Па другой версіі, у «Хронiцы беларускага горада Магілёва» паведамляецца, што ўпершыню замак у Магілёве быў пабудаваны рускім князем Львом Данілавічам у 1267 г. Іншыя даследчыкі лічаць, што замак у Магілёве мог быць пабудаваны ўнукам Льва Данілавіча – Львом Юр'евічам каля 1319 г , бо ёсць звесткі, што ен у той час ваяваў з літоўцамі ў наваколлі Магілёва.

Наступная версія тлумачыць, што «...годам яго заснавання прынята лічыць паведамленне летапісца Сурты аб закладцы Магілёўскага замка ў 1267 г. Ён быў пабудаваны пры ўпадзенні Дубравенкі ў Дняпро, дзе ў той час існаваў рыбацкі пасёлак».

Яшчэ адна версія грунтуецца на тым, што першае ўпамінанне аб Магілёве ёсць у хроніцы Трубніцкага. Паводле падання каля 1267г. быў закладзены Магілёўскі замак. Прыблізна гэту дату заснавання замка – «за некалькі соцень гадоў перад 1526 г.» – адзначае хроніка Т.Р.Сурты і Ю.Трубніцкага. Паколькі маюцца сведчанні пра «будаўніцтва ў 1267 г. Магілёўскага замка, ёсць усе падставы лічыць, што Магілёў як пасяленне існаваў раней гэтай даты».

Нягледзячы на вядомыя адрозненні і супярэчнасці, усе версіі адносяць узнікненне горада да 1267 г., таму не здзіўляе прыняцце гэтай даты за канчатковую, з якой звязваліся ўсе святы і юбілеі. Яна трывала ўвайшла ў даведачную, навуковую і навукова-папулярную літаратуру. Спробы некаторых даследчыкаў звярнуць увагу на малую верагоднасць даных, што мелі дачыненне да 1267 г., на жаль, не атрымалі далейшага развіцця ў савецкі час і першыя гады існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь. І толькі ў апошнія 2-3 гады пераважная колькасць мясцовых навукоўцаў і краязнаўцаў канчаткова засведчыла, што дата 1267 год з'явілася ў 19 стагоддзі і ніякімі ранейшымі пісьмовымі крыніцамі не пацверджана. Археалагічныя даследаванні пераканаўча адносяць час узнікнення Магілёва ў 11 стагоддзе. Таму найбольш дасведчаныя навукоўцы гавораць аб тысячагадовай гісторыі Магілёва.

## 3. Легенды і навуковыя меркаванні аб паходжанні назвы горада Магілёва

Цікавыя звесткі і гіпотызы аб паходжанні назвы горада Магілёва. Іх можна падзяліць на: рамантычныя паданні, фантастычныя і навукова абгрунтаваныя.

Паводле падання, у дрымучым лесе, што рос раней на месцы сучаснага горада, жыў асілак Машэка. Багаты князь адабраў у яго каханую дзяўчыну, і Машэка пакляўся ўсе жыццё помсціць багацеям. Ен нападаў на купцоў і паноў, якія праязджалі праз лес ці плылі па Дняпры, і забіваў іх. Так з'явілася шмат магіл, ад якіх і пайшла назва Магілёў. Згодна іншай версіі падання, пад час сваёй дзейнасці Машэка сустрэў былую каханую, якая быццам бы ўзрадавалася сустрэчы, а потым забіла Машэку калі ён спаў. Яго пахавалі на высокай гары над Дняпром, а месца пахавання назвалі "Магіла Льва", бо быў асілак "магучы як леў". Гэта паданне ляжыць у аснове паэмы Янкі Купалы «Магіла Льва» і п'есы В.Вольскага «Машэка», многіх іншых твораў беларускага мастацтва.

Цікавую інфармацыю дае «Баркулабаўская хроніка», якая складзена прыкладна на мяжы 16–17 ст. З летапіснага дакумента вынікае, што мясцовасць, дзе размешчаны Магілёў, яшчэ да заснавання горада называлася Магілай «Лет(а)

1526 болший замок зароблен и принято много горы Могилы, на которой теперя замок Могилев стоит, по горце Могиле назван Могилев». І калі да падання можна адносіцца з пэўным недаверам (якое аднак прываблівае сваёй рамантычнай прыгажосцю кахання і чалавецкасцю), то паведамленне летапісу трэба ўважліва аналізаваць.

Слова «магіла» ў дыялектах усходніх славян – пагорак, асобная гара, насып, курган. Такія ці блізкія да іх значэнні захаваліся ў гаворках і ў наш час, а таксама ў іншых славянскіх мовах. Так, у балгарскай мове слова «магіла» значыць узгорак, курган, а ўтвораны ад яго прыметнік «магілесть» – «гарысты».

Відаць, назва Магілы, якая папярэднічала геаграфічнаму найменню Магілёў, адлюстравала гэтыя значэнні. Больш таго, другое найменне ўзнікла ад першага і мела амаль аднолькавы з ім першапачатковы сэнс. Рабіць такі вывад дазваляюць наступныя меркаванні, выказанныя даследчыкам А.Рогалевым.

Магілёў размешчаны на першай і другой надпоймавых тэрасах Дняпра. Дзве глыбокія рачныя даліны накшталт ірвоў падзяляюць горад на часткі. Выразна вылучаецца старая частка Магілёва, якая размешчана на стромкім правым беразе Дняпра і на рацэ Дубравенка, што ўпадае ў Дняпро ў межах горада. З боку больш нізкага задняпроўя гэтая частка здаецца высокай гарой над ракой.

Агульны малюнак Магілёўскага ландшафту даказвае, што самая старажытная назва ў наваколлях горада – Магілы – спрадвеку азначала рэальныя ўзгоркі і берагавыя ўзвышшы, а не рукатворныя курганы і іншыя пахавальныя насыпы. Толькі чаму назва горада замацавалася ў форме Магілёў, а не Магілы?

Справа ў тым, што найменне Магілы вызначала пэўную колькасць узвышшаў, пагоркаў, што ўяўлялі сабой адзіную і найбольш выразную асаблівасць мясцовасці. А геаграфічная назва Магілёў мела дачыненне ўжо не да ўзгоркавага ўрочышча, а да паселішча. Таму змянілася і форма выражэння адпаведнага значэння. Слова «Магілёў» у адрозненне ад папярэдняга наймення Магілы стаіць у адзіночным ліку і з'яўляецца не назоўнікам, а старажытнарускім прыметнікам са значэннем «узгоркавы». На гэту важную акалічнасць раней мала звярталі ўвагу даследчыкі.

Большасць з іх настойвала на паходжанні назвы Магілёў ад уласнага імя ці прозвішча тыпу Магіла. Выказвалася думка, што назва горада ўтварылася ад прозвішча ці мянушкі кіеўскага князя Льва Данілавіча Могія, што азначае «магутны, моцны». Магілёў пры такім тлумачэнні «той горад, што належыць Могію». У сапраўднасці месту належалі ўмацаваны замак і паселішча вакол яго. Але паселішча, перш чым завалодаў ім князь Могій, ужо існавала пад назвамі Магілы, Магілёў. Дарэчы, суфікс -еў (-оў), з дапамогай якога ўтварылася назва, меў значэнне не толькі прыналежнасці, але і адноснае. Такі суфікс ёсць у складзе іншых старажытных найменняў па Дняпры – Рагачоў, Лоеў, Шклоў – і ніводнае з іх не тлумачыцца паходжаннем ад уласнага імя, мянушкі ці прозвішча.

Прозвішчы тыпу Магіла зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах 17 ст. Назва ж Магілёў упершыню ўпамінаецца ў 14 ст. Моўныя формы, якія адпавядаюць прозвішчам у сучасным разуменні гэтага слова, з'яўляюцца ў 15 ст. Такім чынам, найменне Магілёў не магло ўтварыцца ад падобнага прозвішча, якое пачало ўжывацца пасля з'яўлення геаграфічнай назвы. Дапусцім, што назва горада магла

ўтварыцца ад мянушкі Магіла, якая, верагодна, ужывалася яшчэ ў старажытнарускі перыяд (13–14 стст. ) Але ў той час назвы гарадоў ад мянушак не ўзнікалі. Яны маглі ўтварацца на аснове асобных імёнаў князёў – Уладзімір-на-Клязьме, Яраслаўль, Барысаў, Браслаў, Заслаўе (Ізяслаўль) і іншым. З гэтага пункту гледжання назва Магілёў узнікла хутчэй за ўсё не ад імя, мянушкі ці прозвішча чалавека, а ад папярэдняга наймення Магілы, якое ў сваю чаргу ўзыходзіла да агульнага слова «магіла» ў значэнні «гара», «узвышша».

Геаграфічныя назвы Магіла, Магільна, Магільніца, Магільцы і іншыя вядомы ў Польшчы, Балгарыі, Югаславіі. На Беларусі самай старажытнай з'яўляецца назва Магільна, якая ўпершыню ўпамінаецца ў 1235 г. на тэрыторыі сучаснай Міншчыны (вёска Магільна Уздзенскага раёна). На Украіне існуюць райцэнтры Магілёў-Падольскі ў Вінніцкай і Магілёў у Днепрапятроўскай абласцях. У Сенненскім і Шумілінскім раёнах Віцебскай вобласці ёсць вёскі пад назвай Магілёўка. Магілёўка – гэта «паселішча», што знаходзіцца побач з магілай-гарой. На думку А.Рогалева, назва вёскі Магілёўшчына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці сведчыць аб размяшчэнні пагоркаў-магіл не толькі ў вёсцы, але і ў бліжэйшых наваколлях; назва ж населенага пункта Магілёўцы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці гаворыць пра абагульненае абазначэнне жыхароў – Магілёўцы. Магілёўцамі называлі тых, хто жыў у «магілістай», узгорыстай мясцовасці.

Такім чынам, найбольш вядома легенда аб назве нашага горада, звязаная з месцам пахавання, забітага здрадзіўшай яму дзяўчынай, разбойніка Машэкі. Неабходна засвоіць навуковае тлумачэнне. У старабеларускай і украінскай моўнай традыцыі слова "магіла" мела адрозны ад сённяшняга сэнс. Пад "магілай" звычайна разумелася любое ўзвышанае месца (гара). Слова "магіла" ужывалася у сярэднявеччы і як імя асабістае. Даследчыкамі прынята лічыць наяўнасць суфікса "-еў" у назве горада як паходжанне назвы "Магілёў" ад асабістага імя Магіла.

Гісторыя Магілёвае знайшла сваё адлюстраванне ў шматлікіх пісьмовых крыніцах. Таму неабходна пазнаёміцца з помнікамі магілёўскага летапісання, ў якіх адлюстравана грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё магілёўцаў, а таксама падзеі з гісторыі ВКЛ, РП, Расіі: Баркулабаўскім летапісам, хронікай Магілёва Т. Сурты і Трубніцкіх, хронікай Быхаўца, "Запіскамі ігумена Арэста", хронікай Спаскага манастыра.

## 4. Помнікі Магілёўскага летапісання - Магілёўская хроніка і яе аўтары.

Магілёўская хроніка – помнік гарадскога летапісання 17–19 стст., апошні беларускі летапісны звод. Складзена ў Магілёве Т.Р.Суртам (у 1693 г. зрабіў першы запіс, які дапаўняў да 1701 г., змяшчае звесткі з 1526–1701 гг.) і Юрыем Трубніцкім (звесткі за 1701–46 гг.), прадоўжана сынам апошняга Аляксандрам і ўнукам Міхаілам (да 1856 г.). На думку Магілёўскага краязнаўца І.І.Філіповіча, апрача названых складальнікаў хронікі да яе напісання мелі дачыненне таксама невядомы аўтар (запісы з 1793 г. да 1812 г.) і апошні ўладальнік рукапісу Іван Міхайлавіч Трубніцкі, які зрабіў адзіны запіс за 1864 г. На гэтым тэкст хронікі заканчваецца.

Напачатку, хутчэй за ўсё, хроніка пісалася па-беларуску, пасля кімсьці з Трубніцкіх была перапісана ўжо па-польску. Самы стары з захаваўшыхся варыянтаў хронікі напісаны па-польску, запісы за 1841–56 г. па-руску. Найбольшую навуковую і гістарычна-літаратурную каштоўнасць мае частка, якую склалі першыя два храністы (звесткі за 1526–1746 гг.). Яна зберaглася ў рукапісу і датавана 1747 г. (лісты запісаў за 1705 г. і 1710–44 гг. згублены).

Крыніцамі паслужылі летапісныя запісы і ўспаміны сучаснікаў, матэрыялы Магілёўскага архіва, хронікі А.Гваньіні і М.Стрыйкоўскага, асабістыя назіранні аўтараў і інш. У хроніцы адлюстравана сацыяльна-палітычнае, гаспадарча-эканамічнае і культурнае жыццё Магілёва эпохі позняга феадалізму. Змяшчае цікавы матэрыял па гісторыі Беларусі, Украіны, Польшчы, Расіі 17–18стст. Запісы аб падзеях перыяду Паўночнай вайны 1700–21 гг. паказваюць цяжкае становішча горада і яго жыхароў ва ўмовах іншаземных інтэрвенцый, у першую чаргу з боку Маскоўскай, а пазней расійскай дзяржавы. Створаны каларытныя вобразы Пятра I, Карла XII, Меншыкава, Мазепы, беларускага шляхціца Сініцкага і інш. Многія старонкі хронікі напоўнены глыбокім сацыяльным Іпадтэкстам, прасякнуты нянавісцю да феадалаў і гарадской буржуазіі, спачуваннем простаму чалавеку. Аўтары, у значнай ступені паланізаваныя беларускія мяшчане, не страцілі сувязі з народнымі традыцыямі і абапіраліся на беларускую культурную спадчыну. У хроніцы змешчаны таксама шэраг літаратурных твораў 1-й палавіны 18 ст. (алегарычная сатыра «Карнавал іншаземны ў Польшчы» і інш.). Паводле жанравай формы Магілёўская хроніка – летапіс, які месцамі пераходзіць у дзённік горада. Складаецца з кароткіх пагадовых запісаў і разгорнутых апавяданняў пра значныя гістарычныя падзеі і асобныя моманты з жыцця герояў. Магілёўская хроніка – каштоўны збор арыгінальных, нярэдка унікальных звестак па гісторыі беларускіх зямель, крыніца пазнання жыцця беларускага горада эпохі барока. Як літаратурны помнік хроніка з’яўляецца гістарычнай аповесцю дакументальна-мемуарнага характару, вылучаецца жывасцю і дэталёвасцю апавядання, рэдкай для летапісаў набліжанасцю аўтараў да аб’екта напісання. Часткова публікавалася ў 19 ст. у перакладзе на рускую мову (у 1887 г. была выдадзена ў Маскве ва універсітэцкай друкарні пад назвай «Хроніка беларускага горада Магілёва» М.Гартынскім). Перакладчыкам яе быў кіраўнік канцылярыі Магілёўскага губернатара стацкі саветнік Мікалай Рыгоравіч Гартынскі. Гэты пераклад апублікаваны таксама ў «Чытаннях у імператарскім таварыстве гісторыі і старажытнасцей расійскіх» (на рускай мове, кн 3. М. , 1887). Частка хронікі (да 1746) змешчана ў Поўным зборы рускіх летапісаў (т. 35, 1980). Магілёўская хроніка зберагаецца ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М.Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу (Расія).

Характэрная асаблівасць запісаў Магілёўскіх храністаў – несупадзенне часу падзей з часам унясення запісаў пра іх. Так, напрыклад, Сурта расказвае аб вялікім пажары ў 1664 г. у Магілёве, які пачаўся ад «камяніцы Васілеўскіх», а далей у дужках даецца дапаўненне, што ў 1740 г. камяніца была разабрана на пабудову Кармеліцкага касцёла. Такая прыпіска магла быць зроблена толькі Ю.Трубніцкім пры перапісцы рукапісу Сурты пасля 1740 г. Пад 1707 г. летапісец

паведаміў пра лёс братоў Сініцкіх, іх здраду ў час Паўночнай вайны і высылку ў Сібір, дзе адзін памёр, а другі звар'яцеў і быў вернуты назад толькі ў 1721 г.

Хоць Сурта пачаў свае апісанне з падзей далёкіх, ён скарыстаў, відаць, і больш раннія польскія хронікі, аднак па запісах можна зрабіць вывад, што яны рабіліся з уласных назіранняў недзе з канца 1670 г.

З агульнай колькасці запісаў, якія ўнёс у хроніку Сурта, 46% адносіцца непасрэдна да Магілёўскіх падзей, а ў Ю.Трубніцкага Магілёўскі матэрыял склаў 80%. Гэта абумоўлена іх грамадскім і службовым становішчам. Сурта – купецкі стараста, таму крыніца большасці яго запісаў – пераважна расказы старых людзей, уласныя назіранні, розныя хронікі і ў меншай ступені дакументальныя запісы. Ю.Трубніцкі – кіраўнік магістрацкай канцылярыі, праз яго рукі праходзіла ўсе гарадское справаводства, да таго ж перыяд, які ахоплівае сваім расказам летапісец, быў значна багацейшым на падзеі як у жыцці горада, так і дзяржавы.

Запісы А.Трубніцкага вызначаюцца вялікімі перапынкамі паміж падзеямі, пра якія расказвае храніст. Час апісанняў – 24 апошнія гады ўваходжання Магілёва ў Рэч Паспалітую і першыя 16 гадоў у складзе Расійскай дзяржавы. У іх адлюстраваны найбольш значныя падзеі дзяржаўнага значэння (смерць цароў, каралёў, каранаванне новых), некаторыя гарадскія падзеі (пажары, незвычайныя прыродныя з'явы, царкоўнае жыццё).

Апавяданне М.Трубніцкага пачынаецца з кароткага апісання пачатку ваенных дзеянняў 1812 г. (уступленне французаў у Вільню) і заканчваецца паражэннем Напалеона пад Лейпцыгам. Запісана гэта з вядомых яму афіцыйных крыніц. Падзеі акупацыі Магілёва храніст, якога на той час там не было, апісвае пазней і, відаць, са слоў іншых. З 1830 г. да 1841 г. ніякіх запісаў няма. З 1841 г. да сярэдзіны 1856 г. асноўны змест запісаў – кароткія штогадовыя звесткі пра характар пораў года, час іх наступлення і ўплыў на ўраджай, на цэны, паведамленні пра пажары, рамонт царкоўных пабудоў, пра знаходжанне ў горадзе і праезд праз яго асоб імператарскага дома. Коратка згадваецца паўстанне 1830 г. Дастаткова падрабязна расказвае храніст пра эпідэміі халеры ў 1831, 1847, 1848, 1853 гг. , іх вынікі і сродкі лячэння.

Апошні і адзіны запіс у хроніцы Івана Трубніцкага ад 1864 г. расказвае пра праліўны дождж з громам і маланкай, які быў у Магілёве вечарам аднаго дня.

М.Гартынскі ў зробленым ім перакладзе хронікі г.Магілёва апусціў да 46% запісаў, якія не мелі дачынення да Магілёўскіх падзей. Разам з тым ён зрабіў запісы аб падзеях у жыцці горада з іншых крыніц, што не мелі непасрэднага дачынення да хронікі. М.Гартынскі прыпісаў аўтарства хронікі А.Трубніцкаму, «зрабіўшы яго рэгентам магістрата», і яго сыну Міхаілу. Як высветлілася, з арыгінала рукапісу ў 1822 г. была зроблена першая копія, а ў 1876 г. з яе, палічыўшы за арыгінал, – другая, якая некалькі разоў перапісвалася. Верагодна, для перакладу. Пры гэтых перапісках і былі ўнесены тыя недакладнасці і памылкі, што потым перайшлі і ў пераклад Гартынскага. Сам перакладчык хутчэй за ўсё не бачыў сапраўднага рукапісу хронікі, а пра яе аўтараў ведаў па чутках. Арыгінал хронікі да паступлення ў Санкт-Пецярбургскую публічную бібліятэку ў 1872 г. доўгі час зберагаўся ў сям'і Трубніцкіх і лічыўся згубленым.

У 1930-я гады ў Магілёўскім дзяржаўным гістарычным музеі зберагаўся экзэмпляр рукапіснай хронікі Трубніцкага у рускай транскрыпцыі. Гэта быў аб’ёмны сшытак у сінім пераплёце з белай глянцавай паперай, запісы ў якім зроблены старанным каліграфічным почыркам. Змест яго адпавядаў друкарскаму выданню хронікі. Праўда, ніякіх планаў, малюнкаў і дадаткаў ці даравальных надпісаў у ім не было. Час і абставіны паступлення гэтага экзэмпляра ў Магілёўскі музей невядомы. Магчыма, калі ў 1919 г. адбывалася нацыяналізацыя ўсіх буйных бібліятэк горада і камплектацыя на іх аснове фондаў гарадской бібліятэкі і бібліятэкі музея, у апошнюю, верагодна, трапіла і рукапісная копія хронікі. На жаль, у 1941 г. разам з іншымі музейнымі экспанатамі згаданы вышэй экзэмпляр хронікі загінуў. У пасляваенныя гады краязнавец І.Філіповіч адшукаў арыгінал хронікі ў бібліятэцы Ленінграда, перапісаў яго і ўвёў у навуковы ўжытак.

Шмат звестак па гісторыі і культуры горада Магілёва ўтрымліваецца і ў іншых летапісах і хроніках.

## Лекцыя 2. Эканамічнае, грамадска-палітычнае і рэлігійнае жыццё Магілёва ў сярэдневеччы

1. Рост горада ў сярэдневеччы. Структура горада, яго выгляд.
2. Развіццё рамяства, унутранага і знешняга гандлю.
3. Магілёў часоў Магдэбургскага права.
4. Рэлігійнае жыццё. Межканфесійныя адносіны.

### 1. Рост горада ў сярэдневеччы. Структура горада, яго выгляд

На думку некаторых даследчыкаў у 12–14 ст. Магілёў уваходзіў у склад Віцебскага княства, з 14 ст. – Вялікага княства Літоўскага. Паводле звестак, якія адносяцца да 1320 г., Магілёвам і воласцю, гэта значыць сёламі, што ўваходзілі ў склад велікакняжацкіх уладанняў – старостваў, кіравалі службовыя асобы – старосты. Пасля заключэння ў 1385 г. Крэўскай уніі, саюза Вялінага княства Літоўскага і Польшчы, замацаванага ў 1386 г. жаніцьбай вялікага князя Ягайлы з польскай каралевай Ядвігай і каранацыяй яго пад імем Уладзіслава II, Магілёў трапіў пад уладу караля і з’яўляўся яго ўласнасцю. У якасці шлюбнага падарунку з канца 14 ст. належыў каралеве Ядвізе і названы быў у той час «местам», што значыцца горадам.

У пачатку 1440-х гадоў Магілёў узгадваецца ў ліку гарадоў, якімі валодаў вялікі князь Свідрыгайла, у 1455 г. – у сувязі з вайной князя Свідрыгайлы супраць караля і пабудовай у горадзе ў 1477 г. царквы. У 1503 г., падчас шлюбавання, Магілёў быў падараваны ў пажыццёвае валоданне жонцы караля і вялікага князя Аляксандра Казіміравіча Алёне Іванаўне, у 1514 г. разам з замкам і воласцю перададзены ва ўтрыманне пану Юрыю Зяновічу, а потым стаў цэнтрам эканоміі.

З 16 ст. пачынаецца новы якасны этап у развіцці горада. Магілёў развіваецца з нечуваным да гэтага часу дынамізмам і на пачатку 17 ст. становіцца адным з буйнейшых гарадскіх цэнтраў Вялікага княства Літоўскага. Гэты быў перыяд найвялікшага росквіту Магілёўскага гарадского жыцця, якое заклала

падмурак гарадской культуры на Беларусі. Завяршыўся ён гвалтоўным знішчэннем горада рускімі войскамі пад час Паўночнай вайны.

Рост гарадскіх пасадаў абумоўліваў стварэнне ўмацаванняў вакол іх. У першай палове 17 ст. былі скончаны работы па будаўніцтву развітай абарончай сістэмы ўмацаванняў з трох паясоў ліній абароны, праіснаваўшых да пач. 19 ст. Першая лінія – замак, другая – Кругавы (або Бліжні) вал, трэцяя – Палявы (Дальні, Кругавы) вал. У горад магчыма было трапіць праз брамы. Найбольш вядомая і аздобленая – Каралеўская (знаходзілася перад сёняшнім абласным драмтэатрам).

Першую лінію складаў замак – меўшы працягласць умацаванняў 288 сажняў (613 метраў). Другая лінія ўмацаванняў – Кругавы (або Бліжні) вал, працягласцю 680 сажняў (1449 метраў), ахоплівала Стары горад і мела чатыры брамы. Трэцяя лінія абароны – Палявы (Дальні, Кругавы) вал у розны час меў розныя памеры і колькасць брам. У канцы 17 ст. ужо мелася 13 брам Палявога вала.

У адрозненне ад двух папярэдніх паясоў трэці не з’яўляўся замкнёным ланцугом, а перарываўся ярамі і рэкамі. Ён пачынаўся ад яра Дзебры, перасякаў Дубравенку, яе прыток Струшню і падыходзіў да Дняпра.

У 1526 г. Баркулабаўскі летапіс і Магілёўская хроніка паведамлялі, што ў Магілёве пачалося будаўніцтва замка. Хутчэй за ўсё “новага замка”. Месцам для замка была выбрана зручная ў тактычных адносінах пляцоўка, якая знаходзілася пры зліцці Дубравенкі з Дняпром, з высокімі і стромкімі схіламі, плошчай больш за 1 га, сваім заходнім схілам узвышалася на 20 м над далінай Дубравенкі, паўднёвым – на 25 м над Дняпром. З усходняга боку пляцоўку абкружаў стромкі і высокі да 14 м схіл. З поўначы праходзіў абарончы роў. Абавязкі па ўзвядзенні замкавых умацаванняў выконвалі гараджане і жыхары воласці.

У 16 ст. адбыліся змены ў сацыяльным статусе Магілёва – горад быў вылучаны са складу воласці і ў 1577 г. атрымаў магдэбургскае права. Горада-будаўнічым адлюстраваннем гэтага працэсу стала інтэнсіўнае асваенне прылеглых да замка тэрыторый, узнікненне новых пасадаў, колькасны і якасны рост гарадской забудовы. Так, ужо ў 1604 г. тэрыторыя Магілёва складалася з 15 соцен. У межах Старога горада (Нагорскі пасад) знаходзіліся Астрогская і Нагорская сотні. За імі ва ўсходнім накірунку размяшчалася Ледзькаўская сотня. На правабярэжжы Дняпра (Пакроўскі пасад) – Курдзенееўская, Перахрысценская, Слабодская, Грыўлянская, Выганская і Бярозаўская. За Дубравенкай (Задубровенскі пасад) – Папінская, Трысненская, Каскоўская, Дабраслаўская. За Дняпром (Задняпроўскі пасад) – Траецкая і Лупалаўская сотні.

Археалагічныя раскопкі З.Яцкевіча, І.Марзалюка сведчаць аб інтэнсіўнасці засялення гарадскіх тэрыторый у гэты час. Найбольшай магутнасцю вызначаецца культурны слой 17 ст. Звяртае на сябе ўвагу вялікая насычанасць слоя знаходкамі, асабліва кафляй, скуранымі, металічнымі і шклянымі вырабамі. Гэта акалічнасць тлумачыцца высокай шчыльнасцю забудовы, канцэнтрацыяй на пасадзе будынкаў заможных гараджанаў – купецтва і цэхавай верхавіны.

У другой палове 16-17 стст. інтэнсіўна раслі і засяляліся іншыя тэрыторыі. Гэта тычыцца і Шклоўскага пасада, які сфармаваўся ў паўночна-ўсходнім

накірунку ад Нагорскага і з'яўляўся складовай часткай Новага горада. На яго тэрыторыі знаходзіўся працяг Нагорскай і Ледзькаўскай сотні, межы пасада даходзілі да Палявога вала (на левабярэжжы Дубравенкі, паміж сучаснымі вуліцамі Лазарэнкі і Яцына), вуліц Вялікай і Малой Грамадзянскай, Камсамольскай, Лепяшынскага, яра Дзебры і Машакоўскай гары.

Вельмі інтэнсіўна ў 16-17 стст. ішло развіццё Пакроўскага пасада. У 17 ст. ён ахапіў тэрыторыю паміж правабярэжжам Дняпра і Дзебрай у межах сучасных вуліц Вялікай і Малой Грамадзянскай, Т.Сурты, Ламаносава, частцы Падгорнай, санітарную і зялёную зону гарводаканала.

Віленскі пасад прымыкаў з паўночна-заходняга боку да Шклоўскага пасада. Найбольш раннія знаходкі, знойдзеныя тут, датуюцца 17 ст.

Задубровенскі пасад ахопліваў тэрыторыю правабярэжжа Дубравенкі ад яе вусця да Горнага завулка. Найбольш раннія матэрыялы адносяцца да другой паловы 16 ст.

Задняпроўскі пасад быў адным з буйнейшых у горадзе. Ён складаўся з двух вялікіх сотняў – Траецкай і Лупалаўскай. Ён пачаў засяляцца з 15 ст. Пасад слаба даследаваны. Большая частка тэрыторыі на сённяшні дзень знішчана будаўнічымі кар'ерамі 1970-х– 80-х гадоў.

Пісьмовыя крыніцы і матэрыялы археалагічных даследаванняў, на думку І.Марзалюка, дазваляюць з упэўненасцю казаць, што ў канцы 16 - пачатку 17 стст. горад дасягнуў межаў, акрэсленых трэцяй лініяй умацаванняў. Гістарычныя планы Магілёва сведчаць, што ён не выйшаў за гэтыя межы да канца 18 ст. Яго плошча ў гэты перыяд складала каля 58 га.

У якасці прыкладу варта пазнаёміцца з гісторыяй садова-паркавага мастацтва і пабудовы мастоў у Магілёве.

Першыя ўспаміны пра магілёўскія паркі і скверы адносяцца да 17 стагоддзя. Доўгі час гарады мелі чыста абарончую функцыю. Жытло гараджан абносілася абарончымі збудаваннямі. Гарады былі вельмі кампактнымі, мелі вузкія вуліцы і завулкі, вузкія і высокія дамы месцічаў. Месца для дрэў не хапала. І толькі са значным ростам насельніцтва гарадоў, іх багацця з'яўляюцца ў межах гарадской забудовы скверы і паркі.

Даволі вялікія сады і паркі былі ў 18 стагоддзі: пры кармеліцкім кляштары, каля палаца каталіцкага арцыбіскупа С.Богуша-Сестранцэвіча (палац захаваўся, вул. Ленінская, дом 25); на тэрыторыі Спаскага манастыра побач з палацам, які быў пабудаваны па замове праваслаўнага архіепіскапа Св.Георгія Каніскага (палац захаваўся, вул.Ленінская, 11 «а»). Апошні быў пасаджаны дзякуючы намаганням пераемніка Г.Каніскага архіепіскапа Афанасія. Яшчэ адзін сквер-парк існаваў у 18 - пачатку 19 стст. у курданёры (замкнёным двары) езуіцкага кляштара (не захаваўся).

У 1820 - 21 гг. паміж галоўным корпусам старога беларуска-магілёўскага шпіталя і р.Дубравенка была створана вялікая садова-паркавая кампазіцыя. Рэшткі яе і сёння можна пабачыць у выглядзе алей з векавымі дрэвамі і некаторымі іншымі элементамі паркавай архітэктуры ў раёне Пячэрска. У сярэдзіне 19 ст. невялікія паркавыя ансамблі, пераважна з газонаў і клумб, былі

ўтвораны пры гарадской бальніцы (захавалася), пры новым вайсковым шпіталі, што знаходзіўся за Быхаўскай заставай (вул. Чалюскінцаў).

Магілёўскія дакументы сведчаць, што ў другой палове 19 ст. у горадзе каля 100 дзесяцін зямлі былі засаджаны садовымі дрэвамі, плады якіх вывозіліся на продаж у Маскву, Смаленск, Віцебск, Пскоў і інш. гарады, у тым ліку і абрыкосы, якія вырошчваліся ў нашым родным Магілёве.

У пачатку 20 ст. у Магілёве існавала некалькі садаводстваў Бабкова, Біндзера і Аконскага, а таксама Сад-Трэк, Дзіцячы сад (абодва ў раёне аўтавакзала), Мікалаеўскі, гарадскі (на вале), Мураўёўскі (за тэатрам) і Беклемішаўскі (былая Губернатарская, цяпер плошча Савецкая). Таму невыпадкова адбылося правядзенне менавіта ў Магілёве першай выстаўкі садаводства ўвосень 1903 г.

Амаль усе гістарычнае ядро горада ўпрыгожвалі своеасаблівыя зяленыя аазісы. Сцежка, што спускалася ад дома губернатара па тэрасах да Дняпра, і сам бераг ракі былі абсаджаны акацыямі. У садзе Магілёўскага генерал-губернатара Дамбавецкага (сад высаджаны ў 1872 г. ) летам 1884 г. быў зроблены фантан, які з’яўляўся састаўной часткай Дняпроўскага водаправода. У цэнтры Беклемішаўскага саду знаходзіўся сонечны гадзіннік. Дрэвы на вуліцах горада добра даглядаліся.

За горадам былі сядзібна-паркавыя комплексы. Адным з сапраўдных шэдэўраў садова-паркавага мастацтва канца 18 – пачатку 19 ст. можна лічыць ансамбль сядзібы «Піпенберг» на ўскраіне Магілёва каля Буйнічаў. Ён мае вельмі цікавую гісторыю. Напрыканцы 18 ст. у Магілёў прыбыў другі Магілёўскі намеснік, расійскі сенатар Петр Багданавіч Пасек. Тады і пачалі будаваць сабор Святога Іосіфа, што быў закладзены імператрыцай Кацярынай II і аўстрыйскім імператарам Іосіфам II з нагоды іх сустрэчы. Кацярына II выбрала праект, які прапанаваў архітэктар і мастак Мікалай Львоў. Дарэчы, ен пакінуў нам шэраг цікавых акварэлей з выявамі Магілёва канца 18 ст. Падрадчыкам пабудовы сабора і загараднай рэзідэнцыі Пятра Багданавіча быў Чыр’еў. Зразумела, што храм будаваўся за дзяржаўны кошт. З той жа цэглы і за тыя ж грошы пад наглядам Пасека пабудавалася сядзіба «Піпенберг». Ансамбль размяшчаўся на дзвюх берагавых тэрасах, на ніжняй быў створаны прамавугольны штучны вадаём, на верхняй стаяў палац у стылі класіцызму з элементамі несапраўднай готыкі. На думку даследчыка З.Яцкевіча былі тут, відаць, і прыгожыя лартэры, і цудоўныя баскеты з натуральных і штучных пасадак, творы архітэктуры малых формаў (скульптуры, альтанкі і інш.). Рэшткі раслін захаваліся і цяпер, але вельмі здзічэлі. На верхняй тэрасе, напрыклад, вакол рэшткаў падмурка палаца раслі ружы.

Стваральнікі гэтага цудоўнага сядзібнага комплексу невядомы. Але, калі ўлічыць працу ў Магілёве выдатнага архітэктара, аднаго з заснавальнікаў пейзажнага стылю ў расійскім садова-паркавым мастацтве М.А.Львова, які быў знаёмы з Пасекам, па меркаваннях З.Яцкевіча аўтарства помніка належыць М.Львову. Мікалай Аляксандравіч распрацоўваў і ансамбль Саборнай плошчы, дзе насупраць храма Святога Іосіфа знаходзілася брама, за якой пачынаўся раўчук у бок р.Дубровенка. Надзвычай творча ў пачатку 19 ст. да развіцця цудоўнага горадабудаўнічага комплексу паставіўся таленавіты дойлід Стасаў. Паводле яго

прапановы раўчук быў засыпаны і абкладзены дзёрнам, пасаджаны кусты і дрэвы, пракладзены сцежкі, а таксама зроблены вадасцёкі ў выглядзе труб, якія ішлі пад зямлёй. Садова-паркавы ансамбль – адзін з прыгажэйшых горадабудаўнічых помнікаў – стаў цудоўным месцам адпачынку магілёўцаў.

Лёс і час не былі літасцівы да гэтага твора. У 19 ст. у «Піпенбургу» размясціўся жаночы пансіён, які ў 1865 г. быў ператвораны ў Марыінскую дзявочую гімназію. Пасля пабудовы ў 1875 г. жаночай гімназіі на Дняпроўскім праспекце (вул Першамайская) «Піпенберг» апусцеў і хутка прыйшоў у заняпад. Да нашых дзён дайшлі толькі рэшткі помніка (падмуркі, сажалка, парк).

У 19 ст. у Магілёве былі зруйнаваны рэшткі абарончых збудаванняў. Валы былі зрыты, рвы засыпаны, а на іх месцы ўтварыліся скверы і паркі, вядомыя да сёння. Так, менавіта тады на месцы замка з’явіўся парк Дамбавецкага (рэшткі якога - сёння парк імя М.Горкага, а варта назваць - Замкавы сквер), крыху раней на месцы бліжняга вала - так званы Мураўёўскі сквер (Тэатральны, сёння амаль знішчаны ў выніку рэстаўрацыі тэатра), на месцы дальняга вала быў створаны рынак - Шклоўскі базар, а сёння гэта Камсамольскі сквер каля кінатэатра «Радзіма».

Да 1917 года былі вядомы рэшткі Беклемішаўскага скверу (на Губернатарскай, цяпер Савецкай плошчы), за горадам сядзібна-паркавыя комплексы: каля вёскі Сараканайск (выяўлены З.Яцкевічам, цяпер рыса горада); каля Буйніч сапраўдны шэдэўр садова-паркавага мастацтва - ансамбль сядзібы «Піпенберг» (не захаваўся). Карыстаўся вялікай любоўю, як цудоўнае месца для адпачынку, сквер на Саборнай плошчы - насупраць Іосіфаўскага сабора (цяпер фантан насупраць гасцініцы “Дняпро”); любіў пабавіцца з магілёўскімі дзеткамі царэвіч св.Аляксей у гарадскім садзе, вядомым пад назвай «на валу».

Шмат чаго змянілася ў Магілёве, як кажуць «старажылы не пазнаюць горад». З’явіліся новыя паркі і скверы. Сквер на плошчы імя Леніна нагадвае нам пра няспраўдзіўшыеся надзеі магілёўцаў жыць у сталіцы БССР (сквер утвараўся перад势 плануемым Домам ураду). Сумнаваты сквер па праспекту Міру невыпадкова, бо да 1960-х гадоў былі тутака Саборныя могілкі. Дарэчы сквер па вул. Мянжынскага таксама ўтварыўся на месцы абарончых збудаванняў за р.Дубравенкай. Амаль не ведаюць магілёўцы, што сквер ля гастранома па п-ту Міру насупраць гасцініцы «Магілёў» мае назву «Дружбы народаў» альбо параднёных гарадоў, сквер ля «Прыёрбанка» названы ў гонар горада-пабраціма Вілербана. Недзе ў хмызняку на Падніколлі ўсё яшчэ валяецца пліта з надпісам, што тутака парк у гонар 40-годдзя ўтварэння БССР. Толькі падчас Купалля крыху ажывае гарадскі парк імя 60-годдзя Кастрычніка (раён Святога возера). Здаецца, зусім мала ўвагі надаецца ўладамі месцам адпачынку гараджан. Пячэрскі лесапарк і Любуж - вось дзе яшчэ можна знайсці месца для душы, адпачыць ад гарадскога тлуму, паслухаць птушак, дакрануцца да волатаў-дубоў, знайсці пралеску...

Былая Афіцэрская вуліца - цяпер Міронава. Здаецца, зусім нядаўна, у 1970-я гады, алея герояў была не на Савецкай плошчы, а тутака, ля сквера ў гонар Перамогі (40 год Перамогі ў вайне 1941-45 гг.). Сёння гэты сквер - улюбёнае месца гараджан (якіх не вабяць агароды) - па нядзелях улетку іграе аркестр,

гарадскі цэнтр культуры ладзіць забаўляльную праграму, людзі таньчаць, дзеці... А галоўнае, усіх вабяць магілёўскія фантаны!

Няхай ніколі не паўтарыцца ў нашым горадзе выпадак з 1930-х гадоў, калі былі выраблены стогадовыя ліпы, таму што яны закрывалі прамысловы выгляд горада.

Магілёўскія масты. Перавоз на Дняпры існаваў з таго часу, калі быў пабудаваны замак. Дакументальна вядома аб існаванні перавозу ў 16 ст., ён належаў Спасаўскаму манастыру. Згодна з граматай караля Жыгімонта, якая датуецца 13 чэрвеня 1588 г., магілёўцам дазвалялася пабудаваць мост праз Днепр, які злучыў бы горад з Траецкім пасадам ці Лупалавым. Да пабудовы маста жыхарам горада дазвалялася мець перавоз без збору перавознай платы, асобны ад царкоўнага.

Масты былі і каля некаторых Магілёўскіх брам. Мескай (Горнай) у замку, Каралеўскай і Ветранай у Старым горадзе. Звычайна прыбрамныя масты рабіліся наступным чынам. У роў перад валам, які быў запоўнены вадой, убіваліся альховыя ці дубовыя палі. Наверсе апошніх мацаваліся бэлькі, што стваралі канструкцыйную аснову насцілу. Насціл рабілі з дошак ці тонкіх бярвён. Бліжэйшая да брамы частка моста была пад’ёмнай, што давала магчымасць адсякаць ворага, а таксама зачыняць нанач ці ў небяспечныя часы горад альбо замак. Ветраная брама з мостам знаходзілася ў раёне сучаснага прыпынку «Вуліца Болдзіна». Згодна інфармацыі З.Яцкевіча, напачатку 1980-х гадоў, калі вяліся рамонтныя работы, тут быў выкапаны катлаван і мясцовы краязнавец і журналіст Мікалай Ножнікаў бачыў, як экскаватарам выбіраліся дубовыя палі, якія добра захаваліся. Тады, магчыма, і скончылася гісторыя Ветранага моста, а таксама культурнага слоя, што захоўваў рэшткі жыцця і дзейнасці нашых продкаў. Магістрацкія кнігі сведчаць таксама, што для рамонту моста каля Быхаўскай брамы ў 1699 г. (раён вуліц Мянжынскага і Чэлюскінцаў) на гарадскім рынку набываліся брусы, бярвёны, цвікі латныя.

У час войнаў у Магілёве рабіліся пераважна наплаўныя масты. Шэраг такіх мастоў былі пабудаваны ў Паўночную вайну 1700–21 гг. расійскімі і шведскімі воінамі з прымусовым удзелам магілёўцаў. 21.6.1706 г., калі Пётр І разам з войскам пакінуў Магілёў, масты былі распушчаны для праезду байдакоў і плытоў. Паводле летапісаў, у сакавіку 1708 г. расійскія воіны пачалі будаваць 2 масты на байдаках. Адзін з іх быў насупраць вусця ракі Дзебры. Для гэтага моста выкарысталі драўляны вал (сцяну) і вежу, што былі пабудаваны для ўмацавання Пакроўскага пасада ўздоўж Дзебры ў 1704 г. пад кіраўніцтвам архітэктара, палкоўніка Федаровіча.

Другі мост пабудавалі побач з Бернардзінскім касцёлам (каля сучаснага маста). У сувязі з вялікай вадой, што заліла Пакроўскі пасад, быў зроблены памост па высокіх месцах. І працягваўся гэты памост аж да самога пекла - так зваўся вядомы на школішчы кабак (раён вул. Грамадзянскай).

Вясною акрамя 2 папярэдніх мастоў для пераходу маскоўскіх войскаў за кошт жыхароў горада пабудаваны трэці – у Палыкавічах.

У пачатку ліпеня 1708 г. ў Магілёў увайшоў авангард шведскіх войскаў. Маскоўскія салдаты пассякалі байдакі, на якіх мацаваліся насцілы, і масты

распусцілі. Шведы мусілі будаваць новыя, але дрэва, відаць, было бракаванае. Тады яны па-варварску разбурылі Буйніцкі манастыр і разабралі драўляныя пабудовы разам з царквой Успення. Тут адбыўся цікавы выпадак. Шведскі кароль Карл XII, аглядаючы войскі і фарпосты. паспрабаваў уз’ехаць на толькі што пабудаваны мост, але конь не пайшоў, нягледзячы на ўсе намаганні тытулаванай асобы.

Кароль здзівіўся і пачаў пільна ўглядацца ў збудаванне, а потым раптам загадаў паравярнуць дзве дошкі з насцілу. Калі гэта было зроблена, усе ўбачылі абразы Спаса ды Божай Маці. Карл XII загадаў замест гэтых дошак пакласці новыя і толькі пасля гэтага конь пайшоў па мосце. Вось так, нават жывёла не ступіла на святы лік.

Шведскі кароль досыць жорстка абышоўся з вінаватымі: павесілі двух чыноўнікаў. Абразы (іконы) па загаду караля аднеслі на месца, дзе раней быў манастыр.

На малюнку І.Пешкі, які датуецца мяжой 18–19 ст., адлюстраваны адзін з гарадскіх мастоў. Ён праходзіў у раёне царквы Святога Мікалая. Некаторыя старажылы Магілёва памятаюць той ці іншы мост у дадзеным месцы і адзначаюць, што ён быў не толькі пешаходны, але па ім можна было ездзіць на конях.

19 стагоддзе - перыяд інтэнсіўнага будаўніцтва мастоў не толькі праз Днепр, але і праз невялікія рэчкі, што цякуць у Магілёве. Згодна дадзеных гісторыка З.Яцкевіча, у Мінскім архіве захоўваецца перапіска за 1825 год паміж губернскім архітэктарам Стрэхавым і магілёўскім губернатарам Максімавым аб пабудове маста праз р. Струшню. Адбылося гэта будаўніцтва ў перыяд з 30 красавіка па 9 верасня 1826 г. У 1835 г. быў пабудаваны мост цераз Дубравенку, у 1860 г. паводле праекта Мікалая Ястрэбскага і пад яго ўласным кіраўніцтвам – цераз Дняпро. Эпагеем будаўніцтва мастоў і шляхоў было жыццё і дзейнасць у Магілёве Мікалая Ястрэбскага. Ён быў прызначаны начальнікам аддзялення XI акругі (Магілёўскай) шляхоў зносін 17 студзеня 1848 г.

У 1860 г. замест паромнай пераправы ён узвёў мост-прыгажун, які адпавядаў сусветным стандартам таго часу. Даўжыня яго была за 190 метраў, ён меў восем пралётаў. Апоры і быкі былі зроблены на драўляных палях, пралёты пакрыты аркамі шматкутняй сістэмы.

Менавіта гэты мост адлюстраваны на малюнку Напалеона Орды, зробленым у 1877 г. а таксама на фотаздымку-паштоўцы 1896 г.

Вялікі ўдзел у будаўніцтве мастоў прыняў першы гарадскі галава Рыгор Гартынскі. Пры ім узвялі мост на дарозе насупраць каталіцкіх могілак. Верагодна, гэта быў мост цераз роў перад Палявым ці Дольным валамі ў раёне былой Віленскай брамы (сучасны раён вул Лазарэнкі, 29). Другі мост быў пабудаваны цераз Дзебру (спуск ад 1-й гарадской бальніцы), трэці – на р. Дубравенка насупраць пешаходнай лесвіцы, якая ішла, відаць, ад былой Дубровенскай брамы. Сёння цудам захаваўся Брамны завулак, што вёў ад лесвіцы да моста цераз Дубравенку. Цяпер там невялікі масток, які вядзе да Быхаўскага рынку. Чацвёрты мост пабудавалі на р.Струшні. Магчыма, ён знаходзіўся ў вусці гэтай невялікай рачулкі, на месцы сучаснага аўтамабільнага маста.

Напярэдадні адкрыцця ў 1902 г. чыгункі ў Магілёве, быў узведзены яшчэ адзін мост цераз Дубравенку. Ён знаходзіўся ў раёне Карабанаўскіх могілак за сучасным чыгуначным насыпам, што зроблены пасля апошняй вайны. Як сведчыць дарэвалюцыйны здымак, ён быў металічны, мацаваўся на 2 мураваных з цэглы слупах - апорах авальнай формы і земляным насыпе каля рэчкі. Пасля пабудовы пасля вайны новага, да сёняшніх дзён ад старога захаваліся апоры, вядомыя ў горадзе пад назвай "быкі", на іх перыядычна трэніруюцца магілёўскія альпіністы.

Першы металічны мост цераз Дняпро быў узведзены ў 1936 г. Гэта быў чыгуначны мост на шляху Магілёў–Крычаў. У 1956 г. на месцы ўзарванага ў 1944г. маста Ястрэбскага пабудавалі жалезабетонны. У 1967 г. быў зроблены мост цераз Дняпро (у раёне праспекта Шмідта), у 1997 годзе мост імя М.Ф.Каралёва, які злучыў мікраараён Юбілейны з Задняпроўем у раёне вуліцы Фаціна.

**2. Развіццё рамяства, унутранага і знешняга гандлю**

У першай чвэрці 16 ст пачаўся хуткі эканамічны і тэрытарыяльны рост Магілёва, павялічылася колькасць яго насельніцтва, якое папаўнялася галоўным чынам з ліку «прихожих людей селян» і выхадцаў з Крычава, Мсціслава, Смаленска і іншых месцаў.

13(23).12.1595 г. Магілёў быў заняты атрадам казакаў на чале з С.Налівайкам і ўтрымліваўся ім 2 тыдні. Супраць Налівайкі выступіла 18-тысячнае войска пад камандаваннем рэчыцкага старасты М.Буйвіда. У бітве на Буйніцкім полі пад Магілёвам двухтысячнае войска казакоў мужна змагалася, але вымушана было адступіць. У час адступлення казакі спалілі большую частку горада, у тым ліку праваслаўныя цэрквы, разгрямілі і разрабавалі ў Магілёве дамы месцічаў і крамы багатых купцоў.

Да канца 16 ст. у выніку далейшага развіцця рамеснай вытворчасці і гандлю Магілёў стаў адным з буйнейшых гарадоў у Вялікім княстве Літоўскім. У 1577 г. у горадзе было 1261 домоў, каля 6,5 тысяч жыхароў, у 1604 г. – 2211 дамоў, 15 тысяч жыхароў, у 1661 г. – 2940 дамоў.

У 2-й палавіне 16 ст. рамеснікі горада мелі каля 40 розных спецыяльнасцей: кавалі, гарбары, ювеліры, слесары, шубнікі, мяснікі, фарбавальшчыкі, саладоўнікі, піввары, пушкары і іншыя. У 1577 г. у Магілёве 157 крам, у пачатку 17 ст. – каля 400. З канца 16 ст. большасць рамеснікаў аб'ядноўвалася ў рамесныя цэхі, якіх у Магілёве спачатку было 12, у 1604 г. – 18. Цэхі вялі барацьбу супраць рамеснікаў, што не ўваходзілі ў гэтыя арганізацыі.

Назіраўся значны рост колькасці рамеснікаў з ліку збеглых прыгонных. Колькасць рамеснікаў таксама папаўнялася за кошт прыгонных, што перасялялі ў горад феадалы. Павелічэнне рамеснага насельніцтва і ўмяшанне феадалаў у гарадское жыццё стварала канкурэнцыю і іншыя цяжкасці ў развіцці рамёстваў, абумовіла стварэнне карпарацыйных арганізацый, якія забяспечвалі манаполію вытворчасці і продаж рамесных вырабаў на гарадскім рынку. Першыя рамесныя карпарацыі (першапачаткова называліся старостамі, брацтвамі, пазней цэхамі) вядомы ў Магілёве з 2-й палавіны 16 ст. У 1577 г. на гарадской радзе былі зацверджаны статуты цэхаў кушняроў, калачнікаў, хлебнікаў, у 1579 г. – краўцоў,

у 1580 г. – цесляроў, у 1583 г. – маслабойнікаў, у 1588 г. – саладоўнікаў, мяснікоў, шаўцоў, кавалёў і іншых. Магчыма, рамесныя арганізацыі існавалі і раней. У канцы 16 – пачатку 17 стст. у Магілёве значна павялічылася колькасць рамёстваў (з сярэдзіны 17 ст. было больш за 80 розных спецыяльнасцей). Сярод пералічаных раней – слесары, шабельнікі, кажамякі, сядзельнікі, рымары, саф'яннікі, пекары, піражнікі, шапачнікі, фарбавальшчыкі, муляры, пушкары, медавары, піўвары, шапавалы, бондары, сітнікі, варсавальшчыкі, калеснікі, чахольшчыкі. У гарбарнай і кушнерскай вытворчасці існавала больш за 10 спецыяльнасцей. Вырабы Магілёўскіх саф'яннікаў, гарбароў, кушняроў-футравікоў (юфта, саф'ян, замша, футра, вырабы з футры) карысталіся вялікім попытам на заходнееўрапейскім рынку.

Унутраную арганізацыю рамесных цэхаў вызначалі статуты, якія рэгламентавалі аб'ём вытворчасці, якасць прадукцыі, парадак набыцця сыравіны і продажу вырабаў, правілы прыёму, абучэння вучняў, найму чаляднікаў, умовы іх пераходу ў майстры. Саслоўную згуртаванасць актыўна фарміраваў сход усіх членаў цэха. Статут Магілёўскага цэха купцоў называў галоўнымі 4 схода (2 студзеня, 1 красавіка, 1 ліпеня, 1 кастрычніка кожнага года).

Развіцце рамёстваў садзейнічае актыўнаму гандлю. На гарадскім рынку размяшчаліся гандлёвыя рады: шавецкі, жалезны, рыбны, мясны, палатняны, саляны, пякарскі, ганчарны, кавальскі, а таксама купецкі дом, «важніца» (вагавая), карчма, складскія памяшканні. Гандлем пераважна займаліся купцы (26–30% гарадскога насельніцтва). У 1636 г. купецкія вярхі стварылі купецкае брацтва, з дапамогай якога хацелі дасягнуць пануючага становішча на гарадскім рынку. У першай палавіне 17 ст. Магілёўскія купцы падтрымлівалі гандлёвыя сувязі больш як з 60 гарадамі: Віцебскам, Мінскам, Полацкам, Оршай, Мсціславам, Гроднам, Брэстам, Слуцкам, Барысавам, Крычавам, Гомелем, Бабруйскам, Заслаўем, Слонімам і іншымі. Асабліва ажыўлены гандаль вёўся з найбліжэйшымі (у радыусе 10 міль) гарадамі, дзе Магілёўскія купцы былі вызвалены ад уплаты пошлін.

Своеасаблівай формай сацыяльна-эканамічнага і рэлігійна-палітычнага руху былі праваслаўныя брацтвы, куды ўваходзілі пераважна рамеснікі, гандляры, а таксама духавенства і шляхта. Брацтва кушняроў Магілёва, створанае ў 1589 г., было адным з першых на Беларусі. Вядомы брацтвы пры цэрквах Святога Спаса (1597), Ушэсця (1602), Прэабражэнскай (1605), Богаяўленскай (1633), Крыжаўздвіжанскай (1634). Статут брацтваў прадугледжваў збор унёскаў, сумеснае святкаванне, адпраўленне набажэнстваў 4 разы на тыдзень, раздачу міласціны, аказанне дапамогі збяднелым «братчыкам», стварэнне школ. У Магілёве першая брацкая школа ўзнікла ў 1590–92 гг. У ёй навучаліся дзеці членаў Магілёўскага брацтва, а таксама сіроты. Вывучаліся царкоўнаславянская, «руская» (беларуская), польская, грэчаская і лацінская мовы, арыфметыка і іншыя прадметы. Выкладчыкамі былі адукаваныя для таго часу людзі - Цімафей Грыбач, Павел Канстанцін, Апанас Стралецкі, Фёдар Тарасевіч і іншыя.

У 1633 г. гараджане дабіліся каралеўскай прывілеі на пабудову школы пры Богаяўленскім кляштары. Школа таксама займалася вялікай выдавецкай дзейнасцю і ў 1757 г. была пераўтворана ў духоўную семінарыю.

Пасля апусташальнай вайны 1654-1667 гг. ажыўленню гаспадарчага жыцця садзейнічаў гандаль з рускімі гарадамі і Левабярэжнай Украінай. Кушняры і футроўшчыкі працавалі пераважна на сыравіне, якую прывозілі з рускіх гарадоў. Рускі ўрад даваў магчымасць магілёўскім купцам свабодна гандляваць у Смаленску, Маскве і іншых гарадах. Разам з рускімі купцамі яны ездзілі на далёкія кірмашы, у 1672 г. ўдзельнічалі ў Макар’еўскім кірмашы (сяло Макар’ева на р. Волга). З-за адсутнасці ва ўсходняй частцы Беларусі фальварачна-панскай сістэмы з яе развітой формай сяляне маглі больш свабодна распараджацца прадуктамі сельскагаспадарчай працы, пашыраць абмен паміж горадам і вёскай, стымуляваць развіццё вытворчых сіл. Да канца 17 ст. Магілёў стаў буйным горадам Беларусі з насельніцтвам 15 тысяч чалавек, 3 тысячамі дамоў.

У пачатку 18 ст. эканамічныя ўмовы Магілёва значна пагоршыліся. Паўночная вайна 1700–21 гг. прынесла яму цяжкія разбурэнні.

Пасля вайны гараджане, каб мець грошы для ўплаты падаткаў і аднаўлення гаспадаркі, здавалі зямельныя ўчасткі ў арэнду феадалам. У 1765 г. феадалы арандавалі ў Магілёве 240 зямельных участкаў. З-за цяжкіх павіннасцей і падаткаў, салдацкіх экзекуцый і рэквізіцый мяшчане пераходзілі з-пад улады магістрата ў падпарадкаванне свецкіх і духоўных феадалаў. У выніку магістрат губляў шмат падаткаплацельшчыкаў, слабела гарадская абшчына і гарадское самакіраванне. Тым не менш горад паступова аднаўляўся, пашыралася рамесная вытворчасць. У 1717 г. тут былі 844 дамы, у 1746 г. – 1119, у 1765 г. – 1879 дамоў, 832 рамеснікі. Цэхі ў той час ужо не маглі справіцца з няцэхавымі рамеснікамі, колькасць якіх увесь час павялічвалася. Да 1770-х гадоў колькасць цэхаў скарацілася да 9. У 18 ст. для прамысловасці Магілёва характэрна пранікненне ў дробнатаварную вытворчасць гандлёвага капіталу, звязанага з пашырэннем ролі скупшчыка, што паступова выцесніў дробнага таваравытворца з рынку збыту і пераўтварыў яго ў наёмнага рабочага. Гэты працэс суправаджаўся ўзмацненнем дыферэнцыяцыі сярод рамеснікаў і вылучэннем з іх асяроддзя параўнаўча невялікай групы заможных майстроў, якія для пашырэння сваёй вытворчасці наймалі рабочую сілу.

Эканамічнаму росту Магілёва спрыялі яго сувязі з рынкам. Побач з захаваннем традыцыйных знешнегандлёвых сувязей Магілёва, якія склаліся ў 16–17 ст., у структуры і накірунках знешняга гандлю ў 18 ст. адбыліся змены. Развіцце рускай прамысловасці, палітыка меркантылізму Пятра І, выхад Расіі да Балтыйскага мора рэзка знізілі неабходнасць пасрэдніцтва Магілёўскіх купцоў паміж заходнеўкраінскімі і расійскім рынкамі. У 18 ст. гандаль Магілёва з Масквой і Смаленскам крыху аслабеў, але ажыўлена вёўся з гарадамі Левабярэжнай Украіны (Нежынам, Кіевам, Ромнамі), адкуль Магілёўскія купцы прывозілі тытунь, турэцкія дываны, маскоўскае сукно, палатно і іншыя рэчы. Сярод польскіх гарадоў галоўнымі гандлёвымі партнёрамі Магілёва ў 18 ст. былі Гданьск і Вроцлаў, якія знаходзіліся пад уладай Прусіі. Развіваліся сувязі з Рыгай, Дынабургам, Круляўцом і іншымі прыбалтыйскімі гарадамі. Іншаземны гандаль Магілёва сканцэнтраваўся ў руках багатых купцоў, быў больш арганізаваны ў параўнанні з папярэднім перыядам. Гандлёвыя аперацыі вяліся пераважна на дагаворных умовах, па заключаных раней кантрактах.

## 3. Магілёў часоў Магдэбургскага права

Чацвер. 18 гадзіна. Гук звону на Магілёўскай ратушы. Бачна, як праз гандлёвую плошчу да ратушы спяшаюцца члены гарадскога магістрата. Апошнія ідуць спешным крокам, амаль бягучы. Усе пасадавыя асобы, нягледзячы на званне, за спазненне ці, ратуй Божа, за адсутнасць павінны былі плаціць вялікі штраф.

20 лютага 1561 г. Магілеву, паводле ўстаўнай граматы караля Польшчы і Вялікага князя літоўскага Сігізмунда II Аўгуста, было дадзена права на абмежаванае самакіраванне – войтаўства, згодна з якім гараджане вызваляліся ад нясення аднолькавых з сялянамі воласці павіннасцей, але заставаліся залежнымі ад замкавай адміністрацыі. Неаднаразова гараджане звярталіся да вялікага князя са скаргамі на старост і іншых службовых асоб і з просьбамі аб дазволе гораду неабмежаванага самакіравання. 28.01.1577 г. кароль Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў Стэфан Баторый выдаў Магілеву прывілей на Магдэбургскае права. Магілёў атрымаў герб і дазвол на пабудову ратушы.

Быў створаны выбарчы орган самакіравання – магістрат (рада), які ведаў адміністрацыйнымі, гаспадарчымі, фінансавымі, паліцэйскімі і судовымі справамі горада, быў распарадчым, выканаўчым і судовым органам. Магістрату падпарадкоўваліся ўсе жыхары горада, за выключэннем тых, хто жыў у юрыдыках (адміністрацыйна адасобленыя часткі горада, што былі пад уладай феадала, царквы або манастыра і на якія не пашыралася адміністрацыйная ўлада магістрата). Першапачаткова Магілёўскім магістратам кіравалі прызначаныя вялікім князем з мясцовых магнатаў войт і 2 выбарныя гараджаніна-бурмістры. З ліку гараджан выбіраліся 2 радцы (дарадчыкі) і 4 лаўнікі (прысяжныя засядацелі). Магістрат складаўся з рады, што ажыццяўляла функцыі гарадской улады і суда па маёмасных і грамадзянскіх справах, займалася зборам падаткаў, кантралявала гандаль, дзейнасць рамесных цэхаў, і лавы, якая была судовым органам па крымінальных справах. Да 1654 г. пасада Магілёўскага войта была пажыццёвай. Ён атрымліваў 1/3 гарадскіх даходаў ад штрафаў, у гарадскіх уладаннях яму адводзіліся вызваленыя ад падаткаў 2 валокі (каля 43 га) зямлі, дом, сядзібны ўчастак з агародам, сенакос. Да 1636 г. Магілёўскі магістрат выбіраўся на 2 гады. Выбары праходзілі на агульным сходзе гараджан, дзе адначасова выбіраліся два поўныя склады рады, кожны з якіх пасля прынясення прысягі войту кіраваў горадам на працягу года.

Перадача паўнамоцтваў аднаго складу рады іншаму адбывалася ва ўрачыстых абставінах на агульным сходзе ўсіх членаў магістрата. Службовыя асобы, што здавалі паўнамоцтвы, рабілі справаздачу аб фінансавай дзейнасці. Рада, якая прымала справы, называлася «рочнай». Для вырашэння найбольш важных пытанняў «рочная» і старая рады аб'ядноўваліся. Члены былога складу магістрата прыцягваліся да выканання абавязкаў службовых асоб «рочнай» рады, што адсутнічалі. У магістрат, як правіла, выбіраліся найбольш уплывовыя гараджане (прадстаўнікі гарадскога купецтва, цэхмістры, заможныя майстры). Некаторыя з іх займалі гэтыя пасады на працягу некалькіх гадоў. Замацаванне вышэйшых пасад за вузкім колам асоб прыводзіла да злоўжыванняў з боку вярхоў магістрата. У 1580 г. пры магістраце быў створаны кантрольна-дарадчы орган з 12

«паспалітых», якія выбіраліся з ліку гараджан ратушнай юрысдыкцыі і сачылі за правільнасцю выкарыстання бюджэту горада.

У 1588 г. пад уплывам гарадской абшчыны паўнамоцтвы «паспалітых» былі пашыраны, яны атрымалі права дарадчага голасу на выбарах службовых асоб абодвух складаў магістрата, на іх ускладаліся абавязкі «справовать и заведовать» усімі гарадскімі даходамі, весці строгі ўлік фінансавых спраў у сваіх спецыяльных ведамасцях і інш. Былі ўведзены пасады 4 «шафаров» (скарбнікаў) - 2 ад рады і 2 ад «паспалітых». Без удзелу апошніх магістрат не меў права прымаць рашэнні па фінансавых пытаннях. У 1589 г. гараджане дабіліся права выбіраць лентвойта (намеснік войта, спачатку прызначаўся войтам і ў яго адсутнасць меў законную ўладу ў горадзе) і заключылі пагадненне аб адмове войта ад свайго суда (у якасці кампенсацыі магістрат абавязаўся пажыццёва выплачваць яму 130 коп літоўскіх грошай, за войтам захавалася права адмены рашэння магістрацкага суда, а каб змяніць рашэнне войта, можна было апеляваць толькі да вярхоўнай улады).

Унутрыпалітычнае жыццё Магілёва ў канцы 16 – 1-й пал. 17 ст. напоўнена вострай барацьбой гараджан супраць магістрату, уладаў. За што горад праславіўся як “краіна бунтаў”. Увайшлі ў гісторыю Беларусі гарадскія паўстанні ў Магілёве ў 1606–10, 1636, 1638 гг.

У 2-й палавіне 17–18 стст. адбыліся змены ў структуры гарадской рады, выбарчай сістэме і ў прынцыпах кіравання горадам. Войт, як і ўся рада, выбіраўся штогод з ліку службовых асоб, што ўваходзілі ў склад пяці змен магістрата (бурмістраў, радцаў і лаўнікаў). Пасада лентвойта была ліквідавана. Палавіна членаў магістрата ў абавязковым парадку павінна была быць каталіцкага веравызнання. У гарадскім самакіраванні павялічылася роля сесіі «радных і посполітых». Сесія была распарадчым органам і займалася пытаннямі гаспадарчага, фінансавага і грамадска-палітычнага жыцця горада, прымала рашэнні, выкананне якіх было абавязкам дзеючага («рочнага») магістрата.

З 18 жніўня 1636 года выбары рады (магістрата) праходзілі 20 снежня кожнага года. За тры дні, 17-га, магістрат шырока абвяшчаў гараджан спецыяльнай пастановай (універсалам) аб выбарах. На наступны дзень у ратушы збіраліся мяшчане і выбіралі па 12 лепшых «мужей» ад купцоў і цэхавых рамеснікаў. 20 снежня ўсе абраныя «мужы» з’яўляліся на сесію магістрата, дзе выбіраліся 12 «паспалітых» (па 6 ад купцоў і рамеснікаў). 12 паспалітых разам са старою радай выбіралі новую раду, якая будзе кіраваць горадам. На сесіі магістрата выбіраліся адразу 5 змен «паспалітых» і 5 змен рады. Кожная змена паспалітых і рады кіравала горадам на працягу года, перадаючы у яго канцы свае паўнамоцтвы наступнай. Кожная рада прыносіла прысягу.

Перадача ўлады праходзіла ва ўрачыстых абставінах і ў прысутнасці усіх змен магістрата. Стары склад рады рабіў фінансавую справаздачу за год, перадаваў справы, ключы ад касы магістрата, пячатку новаму складу рады. Гэты дзень з’яўляўся святочным днём для жыхароў горада. Як бачна, выбары праводзіліся раз у 5 гадоў, але склад магістрата мяняўся штогод.

Гарадская рада кіравала горадам. На пасяджэннях рады разглядаліся пытанні і выносіліся пастановы аб парадку падаткаабкладання насельніцтва і грашовых збораў, аб перадачы ў арэнду гарадскіх уладанняў. Рабіліся запісы ў

актавую кнігу аб продажы, завяшчаннях, зацвярджаліся цэхмістры, цэхавыя пастановы, гандлёвыя і крэдытныя ўгоды. На чарговыя (кожны чацвер штотыднёва а 18 гадзіне) і пазачарговыя пасяджэнні павінны былі з'яўляцца ўсе члены новай і старой рады, паспалітыя, сотнікі, калі-нікалі дзесятнікі, а таксама ўсе пасадавыя асобы, якія загадзя апавяшчаліся праз слугу «мескага».

12 паспалітых выбіраліся на агульным сходае мяшчан і сачылі, каб не было злоўжыванняў з боку пасадавых асоб. Яны кантралявалі правільнае выкарыстоўванне гарадскіх сродкаў, выбіралі раду, клапаціліся аб росце дабрабыту горада. Без іх згоды магістрат не мог прыняць ніводнага рашэння ці пастановы. Рада (магістрат) перыядычна рабіла справаздачу перад імі за расход гарадскіх сродкаў.

Шафары (ці казначэі) выбіраліся па 2 ад рады і паспалітых. Яны выдаткоўвалі гарадскія сродкі толькі па распараджэннях рады і паспалітых. У канцы года яны рабілі фінансавую справаздачу.

Сотнікі выбіраліся гарадской абшчынай і былі замацаваны за вызначанай часткай горада, дзе мелі пэўныя паўнамоцтвы. На пасяджэннях рады разам з дзесятнікамі выступалі супраць злоўжыванняў, парушэнняў радай устаноўленага парадку. Выказвалі думкі гараджан аб падатках, прызначэнні пасадавых асоб. У сувязі з тым, што яны выступалі ад імя гарадской абшчыны, да іх уважліва прыслухоўваліся.

На штотыднёвых пасяджэннях мелі права прысутнічаць цэхмістры (кіраўнікі рамесных цэхаў), якія прымалі ўдзел у абмяркаванні розных пытанняў. Без іх не маглі выносіць пастановы па грашовых зборах.

Палітычнае жыццё Магілёва 18 ст. таксама запоўнена барацьбой гараджан супраць падатковага і павіннаснага ўціску, беззаконняў і самавольстваў магістрата пры размеркаванні і зборы падаткаў, злоўжыванняў уладаў. У 1742 г. і 1744 г. гараджане Магілёва не заплацілі належнай сумы грашовага збору, адмовіліся яго ўносіць, а таксама падпарадкоўвацца гарадской радзе. Магістрат прыняў жорсткія меры ў адносінах да найбольш актыўных арганізатараў супраціўлення. Многія рамеснікі былі прыцягнуты да суда, а шэсць чалавек зняволены ў турму.

Згодна Магдэбургскага права гораду надаваўся герб - своеасаблівая візітная картка. Гербы канчаткова сфарміраваліся і атрымалі шырокае распаўсюджванне ў феадальную эпоху. Менавіта ў той час яны набылі строга акрэсленую форму і функцыю. Перайшоўшы праз стагоддзі і эпохі, яны не згубілі свайго значэння і зараз.

Герб з'яўляецца сімвалам незалежнасці і падкрэслівае супольнасць людзей, якія карыстаюцца ім. Людзі ўвесь час знаходзяцца ў пэўных узаемаадносінах паміж сабой і з дзяржавай, вярхоўнай уладаю. У сярэднявечча найбольш поўна адлюстроўваў комплекс правоў і абавязкаў гараджан у адносінах да вярхоўнай улады прывілей на магдэбургскае права. З атрыманнем гэтага прывілею ў горадзе ствараліся органы самакіравання – магістраты, што выклікала неабходнасць надання ім атрыбутаў, якія б засведчылі іх юрыдычную і заканадаўчую дзеяздольнасць. Такімі атрыбутамі і былі герб і гарадская пячатка, якія даваліся гораду разам з прывілеем на магдэбургскае права.

Па далёка няпоўных дадзеных больш як 60 гарадоў і мястэчкаў Беларусі мелі магдэбургскія гербы. На іх адлюстроўваліся як свецкія, так і рэлігійныя сюжэты. Большасць гарадскіх гербаў Беларусі мела элементы свецкага зместу, у тым ліку на іх былі ўзоры тагачаснага беларускага абарончага дойлідства. Як, напрыклад, на магілёўскіх гербах.

У 1577 г. Магілёў атрымаў свой першы герб: вежа сярэбраная (белая), на блакітным полі, упрыгожаным раслінным арнаментам. У 1661 годзе горад атрымаў новы герб. Згодна з прывілеем, які, між іншым, ураўнаваў у правах наш горад са сталічным горадам Вільняй. На гэтым гербе – у блакітным полі тры срэбныя гарадскія вежы, у адчыненай сярэдняй браме – рыцар з узнятым мячом, а над ім герб – «Пагоня», які з'яўляўся і з'яўляецца гістарычным гербам для ўсёй Беларусі. З 2005 года гэты герб зацверджаны ў якасці афіцыйнага герба горада Магілёва.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння ўсходнебеларускіх земляў да Расійскай імперыі Магілёў у 1781 годзе атрымаў новы герб. Але ў дакументах тых часоў пазначана, што гораду дадзены «Стары герб» – узброены коннік у чырвоным полі. Калі ў гербе горада, атрыманым у 1661 г. выява «Пагоні» была толькі адным з элементаў, дык у той час яна стала дамінуючай. Герб уяўляў сабою тарчу (шчыт), у верхняй палове якога была палова расійскага герба – двухгаловы арол з каронаю, а ў ніжняй на чырвоным полі – белы вершнік з узнятым мячом у руцэ. У 19 стагоддзі існаваў герб Магілёўскай губерні «Три могилы с тремя выросшими на них золотыми колосьями». Цяпер на базе герба губерніі створаны і зацверджаны афіцыйны герб Магілёўскай вобласці (дададзена выява абразу Маці Божай Бялыніцкай).

Гербы Магілёва з'яўляюцца помнікамі мінуўшчыны і адлюстроўваюць цікавыя старонкі гісторыі горада.

## 4. Рэлігійнае жыццё. Межканфесійныя адносіны

Да 80-х гадоў 16 ст. насельніцтва Магілёва было спрэч праваслаўным. У апошняй чвэрці гэтага стагоддзя з'яўляюцца мяшчане рыма-каталіцкага веравызнання. З 16 ст. у горадзе ўзнікае і яўрэйская абшчына. Нягледзячы на пэўныя супярэчнасці ў Магілёве не было буйных міжканфесійных канфліктаў.

1596 год адзначыўся заключэннем у Брэсце царкоўнай уніі. Была аб'яднана праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай з каталіцкай. Не ўсе грамадзяне з ахвотай выканалі пастановы Брэсцкага царкоўнага сабору. Праваслаўным, у першую чаргу гараджанам, вельмі не падабалася, што ў каталіцкай царкве духоўная (царкоўная) улада вышэй за свецкую. Праваслаўныя братчыкі прызвычаіліся, у пэўнай меры, нават дыктаваць сваю волю святарам, успрымаючы царкоўную маёмасць як сваю і заключаючы дамовы з святарамі. Такое было немагчымым ва ўмовах падпарадкавання каталіцкім біскупам. Гэта прыводзіла к шматлікім канфліктам паміж праваслаўнымі гараджанамі і святарамі, якія прынялі уніяцтва. З аднаго боку было жаданне захаваць тое, што было, з другога прымус.

У знак пратэсту супраць гвалтоўнага насаджэння уніяцтва жыхары Магілёва ў 1599 г. не пусцілі ў горад архіепіскапа Г.Загорскага, які прыняў унію. Такім жа чынам у кастрычніку 1618 г., пагражаючы зброяй, яны абышліся з архіепіскапам

І.Кунцэвічам, які хацеў падпарадкаваць праваслаўныя цэрквы уніі. Кунцэвіч накіраваўся ў Варшаву, паведаміў каралю пра выступленне магілёўцаў супраць уніі і дабіўся каралеўскага універсала, паводле якога 20 удзельнікаў выступлення (Ісаеў, Шульха, Пуцята, Шэўнік і іншыя) былі прыгавораны да пакарання смерцю, а на жыхароў горада накладзены штраф.

Падтрымку праваслаўным брацтвам у канфесійнай барацьбе, пашырэнні асветы і друкарства аказваў вядомы царкоўны і культурны дзеяч Рэчы Паспалітай мітрапаліт кіеўскі і галіцкі Пётр Магіла – заснавальнік Мсціслаўска-Аршанска-Магілёўскай праваслаўнай епархіі з цэнтрам у Магілёве і непасрэдны кіраўнік яе брацтваў і манастыроў.

Тым не менш праваслаўныя цэрквы перадаваліся уніятам. У 1692 г. кароль Рэчы Паспалітай выказаў пажаданне, каб магілёўцы добраахвотна сталі уніятамі, а калі яны гэтага не зробяць самі, то будуць у уніі паняволі. Правячыя колы Рэчы Паспалітай узмацнілі барацьбу супраць праваслаўных брацтваў. Сеймавай пастановай 1676 г. усе праваслаўныя брацтвы пазбавіліся права прамога падпарадкавання канстанцінопальскаму патрыярху і сталі залежнымі ад мясцовых епіскапаў, якія прызначаліся з ліку уніятаў. Міжканфесійныя праблемы актыўна скарыстоўвала ў сваіх палітычных мэтах Расія.

Шмат добрага і дрэннага можна пачуць аб каталіках, аб дзейнасці на Беларусі і Магілёўшчыне каталіцкіх манашаскіх ордэнах. Не робячы дэтальнага аналізу, варта сказаць наступнае: не было б на нашых землях каталікоў – не было б у нас тэатру, батлейкі, оперы, балета і г.д. Каб падмацаваць гэтую думку, у якасці прыкладу, варта прыпыніцца і асвятліць асобныя старонкі дзейнасці каталіцкага ордэну езуітаў.

Да апошняга часу існавала і яшчэ існуе думка, што прадстаўнікі Таварыства Ісуса (езуіты) з’яўляліся ледзь не катамі беларускага народа, быццам бы садзейнічалі акаталічванню і апалячванню, не зважаючы на тое, што калі чалавек сам не захоча – яго ніхто не прымусіць. І толькі некаторыя беларускія даследчыкі станоўча ацэньваюць дзейнасць Таварыства на нашых землях.

За год да адкрыцця Амерыкі (калі кіравацца маштабамі сусветнай гісторыі) і праз год пасля нараджэння Францыска Скарыны (калі карыстацца храналагічнымі меркамі гісторыі нацыянальнай) з’явіўся на свет той чалавек, які заснаваў Таварыства Ісуса – інакш ордэн езуітаў. Менавіта 1491 год лічыцца найбольш верагодным пачаткам жыцця Іньіго Лёпэса де Ляёлі, больш вядомага пазней пад імем магістра Ігнацыя, альбо Ігнацыя Лайолы.

Нарадзіўся Ігнацый Лайола ў іспанскай шляхетнай сям’і, быў апошнім сынам у бацькоў. З 16 год служыў пры каралеўскім двары. Падчас хваробы ад цяжкага ранення, прачытаўшы багата духоўнай літаратуры, ён вырашыў ахвяраваць сябе Божай Маці і, выздаравіўшы, накіраваўся ў падарожжа ў Ерусалім. Вярнуўшыся, вучыцца ва ўніверсітэтах Барселоны, Саламанкі, Парыжа. Падчас вучобы, гуртуючы вакол сябе студэнтаў і каталіцкую моладзь, ён навучаў бліжніх праўдам веры, рыхтуючы іх душы да жыцця вечнага, згодна з распрацаванымі ім “Духоўнымі практыкаваннямі”, пазней пакладзеннымі ў аснову жыцця манахаў ордэна езуітаў. За сваю дзейнасць сярод моладзі неаднаразова атрымліваў папярэджванні ад інквізіцыі і нават аднойчы быў

пасаджаны ў турму. Толькі ў апошні год навучання Ігнацыя ў Парыжы “Духоўныя практыкаванні” былі зацверджаны галоўным інквізітарам Парыжа.

27 верасня 1540 года папа Павел III асобнай булай зацвердзіў каталіцкі ордэн – Таварыства Ісуса, вядомы пад назвай езуіцкі ордэн. Асноўнымі задачамі таварыства лічыліся: захаванне і абарона веры; змаганне супраць пратэстантаў шляхам пісьмовай палемікі, тэалагічных дыспутаў (езуіты ніводнага разу не пацярпелі паражэння ў такіх дыспутах); найважнейшым было выхаванне і адукацыя моладзі. Была створана выдатная сістэма адукацыі на ўніверсітэцкіх прынцыпах. Асновай былі калегіумы (навучальныя ўстановы). Першы калегіум Таварыства быў заснаваны ў Рыме (1551 год). Для большай уплывовасці на грамадства, з мэтай выхавання яго, езуіты звярталі вялікую ўвагу менавіта на адукацыю і выхаванне сваіх членаў. Не так лёгка было стаць членам Таварыства. Той хто збіраўся гэта зрабіць - адмаўляўся ад сваёй маёмасці, даваў тры звычайныя абяцанні і пачынаўся шлях адукацыі, які працягваўся амаль 15 год, вытрымаўшыя давалі апошняе абяцанне – безумоўнага падпарадкавання папежу. У 1570 годзе езуіты распачалі сваю дзейнасць у Вялікім княстве Літоўскім. На сучаснай тэрыторыі Беларусі яны з’явіліся ў 1573 г. у Воршы. У 1579 г. быў адчынены калегіум у Полацку, затым яны ўзніклі ў Брэсце, Бабруйску, Віцебску, Гародне, Драгічыне, Магілёве, Менску, Мерачы, Наваградку, Слуцку, Пінску, Нясвіжы, усяго ў XVII ст. было 22 калегіумы. Дзякуючы Таварыству ў 1578 годзе ў Вільне з’явіўся першы ўніверсітэт на Беларусі – Віленская езуіцкая акадэмія.

У 1812 годзе Полацкі езуіцкі калегіум быў пераўтвораны ў акадэмію. Яна атрымала правы універсітэта, ёй падпарадкоўваліся 13 езуіцкіх вучылішчаў у Полацку, Санкт-Пецярбургу, Віцебску, Воршы, Магілёве, Мсціслаўлю, Чачэрску, Клімавічах, Рызе, Астрахані, Адэсе, Саратаве, Раманаве (Валынь). Полацкая акадэмія праіснавала да 1820 года.

У акадэміях мог вучыцца любы здольны, нягледзячы на веравызнанне і маёмасны стан. Акрамя выдатных ведаў там выхоўвалі патрыётаў.

Езуіты падрыхтавалі шэраг вядомых навукоўцаў: Казіміра Лышчынскага (1634-1689) – грамадскага дзеяча і педагога, Марціна Почобута (1728-1810 ) – астранома, Францішка Нарвойта (1742-1819) – матэматыка, Альберта Каяловіча (1609-1677) – гісторыка, Мацэя Казіміра Сарбеўскага (1595-1640) – філосафа і інш. Віленскую акадэмію закончыў Магілёўскі арцыбіскуп (19 ст.) Ігнацы Галавінскі. Значны след у развіцці беларускага кнігадрукавання пакінуў бакалаўр філасофіі і вольных мастацтваў, магістр тых жа навук, здабытых у Віленскай езуіцкай акадэміі праваслаўны Максім Вашчанка – выдавец кніг з Магілёва, заснавальнік Магілёўскай школы кніжнай гравюры. У 1814 г. Полацкую акадэмію закончыў будучы Магілёўскі біскуп А.Фіялкоўскі.

У 1840 г. праваслаўным епіскапам Мінскім і Бабруйскім стаў Антоні (Зубко) – выхаванец езуіцкай акадэміі, вядомы тым, што ў 1827г. адкрыў семінарыю ў Жыровічах.

Закончыў Віленскую акадэмію пакутнік, член Таварыства Ісуса Святы Андрэй Баболя (16.05.1591-1657). Св. А.Баболя праславіўся сваёй ахвярнай прапаведніцкай дзейнасцю ў Бабруйску і Пінску.

Езуіты засноўвалі свае рэзідэнцыі па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Было створана на Беларусі 5 рэзідэнцый: у Бабруйску, Магілёве, Мсціслаўле, Слоніме, Юровічах. Больш дробнай адзінкай былі місіі, іх было каля 75. Напрыклад: у Лазовічах Клімавіцкага павету, Расна Чавускага павету, Чачэрску, Хольчы і г. д.

Прадстаўнікі Таварыства з’явіліся ў Магілёве толькі ў 1678 годзе. Адбылося гэта дзякуючы намаганням магілёўскага плябана Зеляновіча, справу якога працягнуў ксёндз Ян Ждановіч – пробашч магілёўскі. Яны былі фундатарамі магілёўскіх езуітаў. У хуткім часе езуіты набылі зямлю ў старым горадзе, заснавалі тут адну з пяці рэзыдэнцый. Тэрыторыя ў Магілёве, якая належала езуітам, размяшчалася адразу за каралеўскай брамай, па правым баку галоўнай вуліцы горада – Шклоўскай (цяпер месца паміж будынкам абласнога цэнтра культуры і домам №6 па вул. Першамайскай). Спачатку быў пабудаваны драўляны касцёл (існаваў у 1697 г.), у ім былі рэшты Св. Язафата Кунцэвіча. Побач будаваўся мураваны кляштар. Каля 1686 г. быў закладзены мураваны двухпавярховы будынак калегіума. Будаўніцтва было закончана ў 1699 г. У той жа год езуіты пачалі будаваць мураваны касцёл у гонар Св. Ксаверыя, які быў скончаны ў 1723 г. і асвечаны праз 2 гады. Гэта быў прыгожы і велічны будынак, багата аздоблены. Ён з’яўляўся сапраўдным упрыгожваннем Магілёва. На адной з трох’ярусных вежаў быў усталяваны гадзіннік.

У калегіуме ў розныя гады колькасць вучняў была неаднолькавая: 1798 г. – 154 чал., у 1817 г. – 176. Бацькі з ахвотай аддавалі сваіх дзетак вучыцца езуітам, як католікі так і праваслаўныя. Бо ў іх навучальнай установе давалі вельмі грунтоўныя і разнастайныя веды. У Магілёўскім калегіуме выкладалася філасофія, лацінская, грэчаская мовы, матэматыка, геаметрыя, астраномія, архітэктура, музыка і іншыя прадметы, існаваў пры калегіуме тэатр, вялікая і разнастайная бібліятэка. Навучэнцы павінны былі ведаць мовы, творы старажытнарымскіх аўтараў, умець складаць вершы, прамовы, спяваць у хоры, іграць на музычным інструменце.

У 1698 г. у Магілёве быў зафіксаваны паказ міракляў, або дыялогаў. Гэтую падзею можна лічыць пачаткам сапраўднага тэатральнага жыцця ў нашым горадзе. Найбольш актыўна езуіцкі школьны тэатр дзейнічаў у першай палове XVIII ст. У той час нават распаўсюджваліся праграмы школьнай сцэны. Сярод пастановак пераважалі панегірыкі, якія праслаўлялі прадстаўнікоў старадаўніх родаў ды іхнія гербы. Напрыклад, у 1722 г. выконваліся “Ганаровыя сармацкія знакі і дзедавы сякеры Асалінскіх”, у 1726 г. “Ключ ведаў, далучаны да ключа прадзедаўскага герба Міхайлоўскіх”, у 1732 г. пастаноўка “Укаранаванае жыццё мудрасці”. Пры калегіуме існаваў цудоўны хор і музычная бурса (аркестар).

Наогул, езуіты былі аднымі з заснавальнікаў беларускай оперы і балета, яны дапамагалі насельніцтву не толькі казаннямі, але і медыцынскай дапамогай. Каля калегіумаў будаваліся аптэкі і шпіталі. Большасць навучальных устаноў Таварыства Ісуса не мела абмежаванняў па канфесійнаму прынцыпу, туды мелі доступ і праваслаўныя. Значную ролю ў тым, што бацькі дасылалі сваіх дзетак вучыцца ў школы езуітаў адыгрывала тое, што там вучылі бясплатна. Мовай навучання пераважна была беларуская, польская стала ў канцы 18 ст. Паводле доктара гістарычных навук Л.Лыча: “… езуіты пайшлі на ўвядзенне ў Полацкім

калегіуме беларускай мовы ў якасці навучальнай дысцыпліны…”. Езуіты клапаціліся каб іх выхаванцы былі фізічна моцныя, для чаго шмат часу адводзілася плаванню, верхавой яздзе, фехтаванню, іх добра і смачна кармілі, абучалі спевам і танцам, іграць на музычных інструментах.

Дарэчы, паводле дадзеных на 1776 г. у дыяцэзіі Магілёўскай налічвалася 146 рыма-каталіцкіх парафій і толькі ў 60 з іх працавалі свецкія ксяндзы, астатнія абслугоўвалі манахі розных рэгулаў.

Варта адзначыць цікавы факт з гісторыі жыцця магілёўскіх езуітаў. 22 траўня 1780 г. а сёмай гадзіне раніцы касцёл Св. Ксаверыя наведаў аўстрыйскі імператар Іосіф ІІ і доўга маліўся, стоячы на каленях. Ён прыбыў у Магілёў інкогніта, пад імем графа Фолькэнштайна для сустрэчы з расійскай імператрыцай Кацярынай ІІ.

У выніку можна адзначыць пладатворную дзейнасць Таварыства Ісуса на абшарах Магілёўшчыны і Беларусі ў 1682-1820 гг.

У 19 ст. магілёўскія езуіты падзялілі лёс сваіх братоў па ордэну: на пачатку папа Клімёнт XIV забараніў яго, але ў 1814 г. правы ордэна былі ўзноўлены папам Піем VII. Расійскі цар Аляксандр І выдаў загад аб выдаленні езуітаў з Расіі ў 1820г. На той час у Магілёве дзейнічала 12 езуітаў. Адной з прычынаў выдалення прадстаўнікоў Таварыства было і тое, што іх выхаванцы актыўна ўдзельнічалі ў нацыянальна-вызваленчым руху польскага і беларускага народаў, змагаліся супраць Расіі на баку Напалеона.

Кляштарныя будынкі забралі пад штаб 1-й расійскай арміі, а касцёл пад вайсковую царкву. Тут у 1826 г. дапытвалі дзекабрыстаў. Касцёльныя званы і вежавы гадзіннік былі перададзены Магілёўскаму брацкаму праваслаўнаму манастыру.

Пасля пераводу 1-й арміі, вайсковай царкве далі назву Васкрасенская, якая дзейнічала да 1929 года і была гвалтоўна зачынена па распараджэнню камуністычнай улады.

У будынку кляштара да рэвалюцыі размяшчаліся розныя ўстановы: вайсковы шпіталь, гасцініца, крамы Шыка і г.д. У міжваенны час тут знаходзіліся кравецкія майстэрні. Пасля вайны 1941-1945 гг. касцёл езуітаў (царква) быў знішчаны, кляштар занялі пад абутковую фабрыку. Пры пабудове дома №8 па вул. Першамайскай архітэктурны комплекс магілёўскай рэзідэнцыі езуітаў быў зруйнаваны.

Напрыканцы хочацца прывесці словы Л.Лыча: “… гэтыя ж самыя езуіты, якіх мы прывыклі падаваць на старонках літаратуры толькі цёмнымі фарбамі, адразу ж пасля прыбыцця на Беларусь пастараліся дасканала вывучыць мову яе насельніцтва, і пачалі карыстацца ёю ў храмах у час казанняў…”.

Акрамя гэтага езуіты, паводле таго ж даследчыка, адважыліся на тое, супраць чаго так упарцілася праваслаўная царква на Беларусі, прыступілі да перакладу і выдання на беларускую мову свяшчэнных кніг і рэлігійнай літаратуры. Ватыкан даў згоду на пераклад катэхізіса Канізія, кнігі П.Скаргі аб грэцкай схізме, пяці кароткіх трактатаў Генадзя Сколяра аб памылках грэкаў, жыція праваслаўных святых. Гэта было ў той час, калі ў Маскоўскай Русі прызнаваліся за ерытычныя спробы першадрукароў Ф.Скарыны, а пазней І.Фёдарава на ўнясенні ўсяго толькі элементаў мясцовых моў у свяшчэнныя кнігі з мэтай іх лепшага разумення.

Працягвае дзейнічаць Таварыства Ісуса і сёння. Іх бліжэйшыя цэнтры да абшараў Беларусі ў Варшаве (Польшча) і Вільні (Летува), некалькі іх прадстаўнікоў вядуць дзейнасць на Беларусі.

Такім чынам, на працягу 16 – 18 стст. у Магілёве пражывала каля 10-17 тыс. чалавек. Горад быў буйным гандлёвым і рамесным цэнтрам. У канцы 16 – пач. 17стст. налічвалася рамеснікаў больш за 80 розных спецыяльнасцей, каля 400 крам. Большасць рамеснікаў аб´ядноўвалася ў цэхі, а купцы ў гільдыі. Магілёўскія купцы падтрымлівалі сувязь больш чым з 60 гарадамі розных краін.

У 16 ст. адбыліся змены ў сацыяльным статусе Магілёва – горад быў вылучаны са складу воласці і 28 студзеня 1577 г. атрымаў Магдэбургскае права. Назіраецца інтэнсіўнае асваенне прылеглых да замка тэрыторый, узнікненне новых пасадаў, колькасны і якасны рост гарадской забудовы.

## Лекцыя 3. Развіццё архітэктуры і мастацтва ў Магілёве. Быт жыхароў горада ў 15-18 стст

1. Архітэктурная спадчына. Магілёўская школа дойлідства.
2. Магілёўская школа іканапісу.
3. Магілёўская школа гравюры.
4. Заняткі, жытло і адзенне магілёўцаў.
5. Жыццёвыя звычаі гараджан.
6. Святкаванні ў Магілёве.

Неабходна засвоіць, што ў 16-18 стст. Магілёў з´яўляўся адным з буйнейшых цэнтраў мастацкай культуры не толькі Беларусі, але і ўсяго Вялікага княства Літоўскага. У выніку плённай працы таленавітых магілёўскіх майстроў у гэты перыяд склаліся: Магілёўская школа дойлідства, Магілёўская школа іканапісу, Магілёўская школа кніжнай гравюры. Сталі добра вядомы такія паняцці як: Магілёўская разьба, кафля, шкло, кераміка і г.д.

### 1. Архітэктурная спадчына. Магілёўская школа дойлідства

Архітэктура гарадоў фіксуе і ва ўласцівых ёй матэрыяльных формах і мастацкіх вобразах адлюстроўвае асаблівасці гістарычнага шляху, непаўторнае багацце культуры народа, нясе выключную інфармацыю аб яго мінулым і сучасным. Пачынаючы з 17 г. у мастацтве, а таксама ў планіроўцы і забудове Магілёва, адзначаецца развіццё тэндэнцый горадабудаўнічай культуры Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Гэта - ужыванне прынцыпаў рэгулярнай планіроўкі, станаўленне ў архітэктуры стыля барока, уплыў заходнееўрапейскага мастацтва. З 19 стагоддзя, калі Магілёў знаходзіўся ў складзе Расійскай імперыі, адчуваецца ўплыў рускага класіцызму і ранняй эклектыкі.

Сярод верхнепрыдняпроўскіх гарадоў Магілёў з’яўляўся характэрным узорам горадабудаўнічага мастацтва. Аднак архітэктурныя збудаванні з уласцівымі толькі ім рысамі, творы мясцовых гравёраў па медзі, мастакоў іканапісу і разьбы па дрэве сведчылі аб фарміраванні ў Магілёве высокаразвітай

мастацкай культуры са своеасаблівымі мясцовымі традыцыямі, прыёмамі і формамі.

Асноўнай дамінантай горада, яго сімвалам была ратуша. Закладзеная ў 1679 годзе (мураваная, драўляная вядома яшчэ з 1578 г.), будавалася майстрамі Ігнатам і Феськай. Яна знаходзілася на галоўнай плошчы («на валу») па суседству з гандлёвымі радамі і домам губернатара. Пабудаваная ў высокай правабярэжнай частцы Магілёва, ратуша добра была бачна з ракі і іншых падыходаў да горада, узначальвала архітэктурны анасамбль і сілуэт забудовы горада, складалася з асноўнага двухпавярховага мураванага корпуса і вежы (пабудавана ў 1692 - 1698гг.). У архітэктуры ратушы бачны багаты будаўнічы вопыт беларускага народа. У ёй адлюстравалася імкненне да простых і выразных формаў, якія былі тыповымі для лепшых помнікаў дойлідства Беларусі. Гэты цудоўны помнік архітэктуры ацалеў і не быў разбураны падчас вайны 1941 - 45 гг., але па-варварску, без прычыны, быў узарваны ноччу 1957 г.

Упрыгожвалі горад і помнікі культавага дойлідства. У горадзе Магілёве да 1917 года знаходзіліся 73 культавыя будынкі. З іх 29 праваслаўных цэркваў: 12 прыхадскіх, 5 зімовых (цёплых), 7 дамавых, 5 – на могілках; 4 рыма–каталіцкія касцёлы: прыхадскіх – 3, капліц – 1; 2 лютэранскія кірхі: 1 прыхадская, на могілках – 1; 38 сінагог (па іншых звестках да 50). Параўнайце з днём сённяшнім: 8 праваслаўных цэркваў (з іх 5 існавалі да 1917 года), 1 грэка–каталіцкая царква, 1 рыма–каталіцкі касцёл і 1 капліца (існавалі да 1917 г.), некалькі малітоўных дамоў пратэстантаў. Шэраг культавых будынкаў, якія захаваліся да сённяшніх дзён, выкарыстоўваюцца не па прызначэнню. Іншыя свядома знішчаны - каб нічога не нагадвала нам пра мінулае. Так, былі цалкам разбураны праваслаўныя цэрквы на могілках: Успенскіх (у раёне п-та Чалюскінцаў), Вазнясенскіх (п-т Міру), Брацкіх (р-н Карабанаўкі), Машэкаўскіх (р-н Юбілейны), Лупалаўскіх (скрыжаванне вуліцы Гагарына і бульвара Няскораных). Толькі сквер на скрыжаванні завулка Мігая (былы Лютэранскі) і вуліцы Ленінскай (Вялікая Садовая) нагадвае нам аб месцазнаходжанні Лютэранскай кірхі, гісторыя якой звязана з прыездам у Магілёў у 1780 годзе Кацярыны II. Імператрыца ахвяравала 500 рублёў на яе пабудову, а свяцiцель Георгій Каніскі, тагачасны епіскап Магілёўскі, на пабудову аддаў рэшткі драўлянай царквы, якую змянілі на мураваную. Не захавалася і кірха на лютэранскіх могілках (р-н вуліц Вавілава і Бурдэнкі).

Праваслаўныя храмы Магілёва былі вельмі разнастайнымі па сваёй архітэктуры, але найбольш вылучаліся цэрквы, якія належалі Магілёўскай школе дойлідства.

Магілёўская школа дойлідства сфарміравалася ў 17–18 стст. у грамадзянскім і культавым мураваным дойлідстве. Яна спалучала мясцовыя архітэктурна–будаўнічыя традыцыі і элементы стыля барокка. Найбольш значныя пабудовы: ратуша, Успенская, Пакроўская, Петрапаўлаўская, Богаяўленская, Спаская і іншыя цэрквы. Да сёняшніх дзён захаваўся толькі адзін узор Магілёўскай школы дойлідства – Мікалаеўская царква (1669–1772 гг.).

У старым горадзе ўздоўж цэнтральнай Шклоўскай вуліцы (цяпер Першамайская), на ўчастку, у 1619 г. падараваным Янам Агінскім, пачалося будаўніцтва Брацкага Богаяўленскага кляштара. Пры Богаяўленскім

праваслаўным брацтве існавала школа. У ёй вучыўся ўраджэнец Магілёва Фама Іяўлевіч, які напісаў першую паэму, прысвечаную гораду. Паэма ў 1625 г. пабачыла свет у Кракаве ў друкарні Ф.Цэзарыя. Пры брацтве была друкарня, у якой друкаваў кнігі славуты Спірыдон Собаль. Упрыгожаннем кляштара была Богаяўленская царква (знішчана ў 50–я гады 20 ст., цяпер на яе месцы жылы дом і музычная школа ў раёне Савецкай плошчы). Будаўніцтва храма пачалося ў 1633 г. і было завершана ў 1636 г. Выконвалася Варлаамам Паўлоўскім і Арсеніем Азаровічам з іншымі майстрамі. Інтэр'ер быў багата размаляваны, меў пазалочаны разьбяны іканастас, абразы пэндзля Афанасія Пігарэвіча ў сярэбраных абкладах (1755 г.), выкананых магілёўскім чаканшчыкам Пятром Сліжыкам. У 1657 г. побач з саборам пабудавалі чатырох'ярусную вежу–званіцу, на якой у 1686 годзе ўсталявалі на версе гадзіннік, зроблены манахам Макарыем. Побач са званіцай пазней пабудавалі мураваную цёплую царкву Іаана Багаслова. Яна была разбурана адначасова з Богаяўленскай царквой. Іх лёс такі ж, як і Васкрасенскай царквы (езуіцкага касцёла), знішчанай разам з мураванай цёплай царквой побач.

Чэх Бернард Таннэр (1678 г.) занатаваў: «Ён (Магілёў) складаецца з дамоў, упрыгожаных чымсьці накшталт карцін, дзіўных і вытанчаных». Таннэр, хутчэй за ўсё, пішучы такое аб горадзе, меў на ўвазе ўпрыгожванне фасадаў ляпнінай, а магчыма і жывапісам. Такі прыём сёння можна пабачыць на Магілёўскай Мікалаеўскай царкве 17 ст., з яе выразным рэльефам дэкарацыі фасада, карані якой, паводле даследчыка В.Чантурыя, цягнуцца яшчэ ад драўлянага дойлідства. Пры пабудове Мікалаеўскай царквы, закладзенай брацтвам у 1669 г. каля Дняпра, прыёмы, выкарыстаныя пры будаўніцтве Богаяўленскага сабору, атрымалі далейшае развіццё і дасканаласць, а архітэктурны абрыс храма набыў большую самастойнасць і выразнае аблічча. Галоўны фасад адрозніваецца ад астатніх яруснай пабудовай і дэкарацыяй, вылучаецца сваёй святочнасцю. Гэты прыём быў уласцівы архітэктуры барочных касцёлаў, як і дзве вежы на фасадзе з элементамі ордэрнай сістэмы. Храм з'яўляецца прыкладам спалучэння праваслаўных – візантыйскіх традыцый з еўрапейскімі, выдатным помнікам Магілёўскай школы дойлідства.

У стылі Магілёўскай школы дойлідства была пабудавана і Пакроўская царква. Знаходзілася па вуліцы Пакроўскай (забудова не захавалася). Цяпер на яе месцы расце хмызняк, гэта недалёка ад вул. Грамадзянскай (былой Вялікай Мяшчанскай) на тэрыторыі «Гарводаканала».

Славутасцю Магілёва з'яўлялася Спаская царква. Напачатку вядома драўляная (з 1478 г.). Яна (належыўшы ўніятам) адзіная дзейнічала ў 1619 – 1632гг., калі ў Магілёве былі зачынены ўсе праваслаўныя цэрквы. Мураваная была закладзена ў 1740 годзе, у 1748 г. пабудаваная частка была знішчана пажарам, у 1756 – 1762 гг. было закончана будаўніцтва ў комплексе з кляштарам віленскім архітэктарам І.Глаўбіцам. Па архітэктуры яе адносяць да стылю віленскага ці позняга беларускага барока. Інтэр'ер быў багата аздоблены творамі мясцовых выбітных майстроў: А.Пігарэвіча і П.Сліжыка. Побач знаходзілася цёплая «зімовая» царква. Шмат намаганняў для іх будаўніцтва прыклаў Св.Георгі Каніскі – архіепіскап Магілёўскі. Пасля смерці цела святцеля захоўвалася ў храме. У бязлітасныя для рэлігіі 1930–я гады яго выкінулі з храма. У 1950–я гады

знішчылі Спаскую царкву і на яе месцы пабудавалі адміністратыўны будынак Будтрэста №12.

Найбольш раннім са значных помнікаў культавай архітэктуры класіцызму ў Магілёве з'яўлялася Іосіфская царква. Пабудавана па праекту архітэктара М.Львова ў 1788–1798 гг. Была закладзена па загаду Кацярыны ІІ у гонар яе сустрэчы з аўстрыйскім імператарам Іосіфам. У 1802 г. загадам Сінода Царква была перайменавана ў Сабор. У супрацьлегласць строгай вонкавай архітэктуры інтэр'ер сабора быў насычаны ляпнінай і жывапісам: іанічныя калоны, нішы са статуямі і скульптурнымі медальёнамі, графічныя кампазіцыі, выкананыя на медных дошках рускім мастаком В.Баравікоўскім – у 1797 г. У інтэр'еры быў выкарыстаны штучны паліраваны мармур: светла-жоўты для сцен, зялёны для калон. Суквецце колераў рабіла ўнутраную прастору жывапіснай і святочнай. Сабор Св.Іосіфа набыў вядомасць як адзін з лепшых узораў класіцызму 18 ст., але ён быў зачынены ў 30–я гады 20 ст. У ім месціўся музей гісторыі і атэізму, потым прыйшоў час праекту пераносу сталіцы з Мінска ў Магілёў. Рабілася перапланіроўка горада, у будучай сталіцы не было месца культавым пабудовам. Таму ў 1938 годзе сабор знішчылі, на яго месцы цяпер гасцініца «Дняпро». Ад сабornай плошчы засталася арка, якая таксама змяніла сваё першапачатковае прызначэнне.

Захаваліся да нашых дзён яшчэ некалькі цэркваў. Але толькі Трохсвяціцельская выкарыстоўваецца па свайму прызначэнню. Пабудаваная на пачатку ХХ стагоддзя, зачынялася двойчы. Першы раз у 1930-я, другі раз у 1960-я гады. Доўгі час у ёй быў клуб завода «Строммашына» са славутай дыскатэкай «Рэзананс». Вернутая вернікам у канцы 1980–х гадоў, набыла першапачатковы выгляд. У ёй знаходзяцца: цудоўны помнік мастацкага ліцця – абклад абраза Св. Мікалая, каштоўная дэкаратыўная плітка на падлозе ў будынку царквы, некалькі выдатных беларускіх абразоў, у тым ліку цудатворны абраз Маці Божай Магілёва–Братскай.

Ацалела Канстанцінаўская царква, якая знаходзіцца па вул. Дарвіна (былая Машэкаўка), цяпер там размешчана абласная дзіцячая станцыя тэхнікаў.

З сямі дамавых цэркваў захаваліся толькі дзве. Аляксандра–Неўская размяшчалася ў будынку дзяржаўнай мужчынскай гімназіі, пабудаваным у 1789 г. як народнае вучылішча, з 1809 г. гімназія па вул. Вялікай Садовай (цяпер Ленінская, стары будынак СШ №3, у аварыйным стане). Ражство-Багародзіцкая была пабудавана разам з будынкам жаночага епархіяльнага вучылішча ў 1889–1892 гг. (архітэктары П.Камбураў і М.Макараў). Царква размяшчалася ў цэнтры будынка вучылішча на восі галоўнага ўвахода. Цяпер гэта будынак гуманітарнага ліцэя пры Магілёўскім дзяржаўным універсітэце па вул. Вароўскага (былая Быхаўская), а ў памяшканні царквы – актавая зала ліцэя. Знішчана Прэабражэнская дамавая царква, якая дзейнічала пры Магілёўскай семінарыі (пабудавана ў канцы 18 – пачатку 19 стст.). Знаходзілася ў двары дома па вул. Болдзіна (раней Семінарскі завулак). Няма Срэценскай пры мужчынскім епархіяльным вучылішчы па п–це Чалюскінцаў (былая Быхаўская вуліца). Цяпер вайсковая частка. Разбурана разам з гарадской турмой Мікалаеўская па вул. Вакзальнай (цяпер Першамайская, побач з тэатрам лялек). Нічога не нагадвае пра

Аляксандра–Неўскую дамавую царкву богаўгодных устаноў, Мікалаеўскую – дзіцячага прытулка па вул. Малай Садовай (цяпер вул. Піянерская).

Першыя каталіцкія касцёлы былі заснаваны ў Магілёве ў пачатку 17 ст. па прывілею караля Сігізмунда III. З 4 рыма–каталіцкіх культавых пабудоў не захаваўся толькі касцёл Св. Антонія. Ён знаходзіўся на беразе Дняпра ў раёне гарводаканала. Мураваны касцёл Св. Антонія пабудаваны быў у 1720 годзе, раней у Пакроўскім прадмесці пры Алейнай браме з 1687 г. існаваў драўляны (заснаваны фундацыяй рэчыцкага лоўчага Фёдара Ржавускага). Пры касцёле ў 18–19 стст. дзейнічаў кляштар бернардзінаў. Пасля вядомага паўстання 1863 г., кляштар скасаваны (у 1864 г), шмат маёмасці рыма–каталікоў канфіскавана, у прыватнасці касцёл і палац архіепіскапа Богуш–Сестранцэвіча.

Найбольш вядомы ў Магілёве касцёл Св. Станіслава, пабудаваны ў стылі барока. У 17 ст. на тэрыторыі Шклоўскага прадмесця, праз роў ад Каралеўскай брамы (цяпер на месцы брамы плошча перад Абласным драматычным тэатрам) быў пабудаваны спачатку драўляны, а пазней мураваны касцёл Успення Маці Божай (будаўніцтва пачалося недзе ў 1738 – 1740 гг., закончана ў 1752 г.). Пры касцёле існаваў кляштар кармелітаў. Касцёл у 1780 г. наведала Кацярына II, ёй так упадабаўся касцёл і арган у ім, што яна загадала кармелітаў выселіць і зрабіць касцёл кафедральным. З 1782 года касцёл стаў звацца Станіславаўскім. У 1783 г. была ўтворана Магілёўская архікатэдра, якой падначальваліся ўсе касцёлы на тэрыторыі Расіі ад Магілёва да абсягаў Далёкага Ўсходу. У 1788 г. (па іншых звестках у 1782 г.) быў рэканструяваны галоўны фасад. Да яго ў цэнтры прыбудавалі 4–калонны іанічны порцік. З 1860 года лічыўся парафіяльным і меў назву Успенскі. Касцёл вядомы размалёўкамі 18 ст. Захавалася фрэска 1765 – 1767 гг. з панарамай Магілёва ад ракі Дубравенкі, вядомая ў мастацтвазнаўчым свеце пад назвай «Уручэнне граматы кармелітам каралём Сігізмундам». У савецкі час у памяшканнях касцёла месціўся дзяржаўны архіў. Гэта выратавала пабудову, але не дапамагло аргану. Дырэктар архіва за непатрэбнасцю загадаў разламаць унікальны музычны інструмент і спаліў яго. Сёння касцёл вернуты рыма–каталікам. Адрэстаўраваны і з’яўляецца сапраўднай аздобаю і візітоўкай Магілёва.

Захавалася і дзейнічае рыма–каталіцкая капліца на Польскіх (каталіцкіх) могілках (вул. Лазарэнкі). На могілках доўгі час, калі ў Магілёве былі зачынены касцёлы, на рэлігійныя святы збіраліся вернікі–католікі. Пасля пачатку перабудовы ім вярнулі капліцу. Адрэстаўраваная рукамі вернікаў, яна пэўны час выконвала ролю касцёла. Цяпер кожны год на свята Св. Антонія (апекуна г.Магілёва) да яе ладзіцца ўрачыстая працэсія ад касцёла Св. Станіслава.

Менш пашанцавала касцёлу Св. Казіміра, ці Фарнаму, як яго часцей называюць. Пабудаваны недзе на самым пачатку 17 стагоддзя, ён быў перабудаваны ў 19 ст. У стылі класіцызму (1810 г.). Зачынены ў 20–я гады 20 ст., паціху разбураўся. У тым, што засталося сёння, месціцца гаспадарчае памяшканне ўпраўлення сувязі (у двары крамы саюздруку «Свет сёння»).

У савецкай гістарыяграфіі панавала памылковая думка, што большасць культавых пабудоў Магілёва разбурана ў гады вайны 1941–1945 гг. Гэта не так. Пашкоджаны? Так. Але знішчаны яны ў 50–60 гады 20 ст. Пры ўмовах існавання

прыходаў іх было магчыма аднавіць, але ўлады змагаліся з «рэлігійным дурманам» – не дазвалялі рэгістраваць прыходы, праследаваліся актывісты, вялася моцная антырэлігійная прапаганда. Храмы без вернікаў паціху разбураліся, а праз колькі год дзяржава засведчыла немагчымасць і немэтазгоднасць іх рэстаўрацыі і адбудовы. Не пашкадавалі нават унікальныя помнікі Магілёўскай школы дойлідства. Гэтакі лёс напаткаў праваслаўную Васкрасенскую царкву па Дняпроўскім праспекце (цяпер Першамайская). Але гэтая пабудова стала царквой толькі пасля 1833 года. Будавалася яна побач з Каралеўскай брамай як частка езуіцкага кляштара з калегіюмам. Доўгі час упрыгожваў горад мураваны касцёл Св. Ксаверыя і двухпавярховы корпус (1725 г.) езуіцкага калегіюма. У сярэдзіне 19 ст. касцёл быў пераабсталяваны пад праваслаўную царкву. Знішчаны ў 1960-я гады. Сёння на месцы касцёла–царквы пустая пляцоўка паміж музеем этнаграфіі і былым домам палітасветы. На рэштах калегіюма ў 1980-я гады быў пабудаваны музей дзекабрыстаў (цяпер этнаграфіі, філіял Абласнога краязнаўчага музея).

Напрыканцы 19 стагоддзя з 38 яўрэйскіх сінагог і малітоўных дамоў 25 належалі міснагімам і 13 – хаседзімам (прадстаўнікам дзвюх іўдзейскіх рэлігійных сект). Гісторыя яўрэйскай абшчыны ў Магілёве пачынаецца з канца 16 – пачатку 17 стст. Аднак яшчэ ў 1522 г. магілёўскія корчмы, васкабойня і вагавы збор былі перададзены ў арэнду Міхелю Езафовічу. Па першаму Усерасійскаму перапісу 1897 г. у горадзе з 43119 жыхароў яўрэяў было 21 453 чалавек (49,75%), у 1909 годзе з 53518 магілёўцаў – яўрэяў было 27474 (51,3%). Займаліся яўрэі гандлем і прамысловасцю, стваралі хеўры (саюзы), кожная з іх мела сваю сінагогу. У 1911 г. найстарэйшая мураваная сінагога налічвала 180 год. Першая хасідская малельня была пабудавана ў 1803 годзе на ўспамін аб вызваленні «бацькі» беларускіх хасідаў (хаседзімаў) Залмана Шнэерсона са зняволення, але яна згарэла ў 1846 г., і на яе месцы пазней пабудавалі так званую «Любавіцкую малельню».

З агульнай колькасці сінагог нам найбольш вядомы чатыры. Па–першае, сінагога Цукермана, былы палац магілёўскага рыма–каталіцкага архіепіскапа С.Богуш–Сестранцэвіча (18 ст.). Сёння ў будынку месціцца спартыўная школа. Па–другое, купецкая сінагога па Паштоваму (цяпер К.Лібкнехта) завулку, д. №4. Пабудавана ў 1909 годзе, цяпер зала бокса. Па–трэцяе, халодная сінагога па вул. Вялікай Мяшчанскай, раней Школішча (цяпер вул. Грамадзянская). Сёння засталіся рэшткі – гаспадарчае памяшканне каля гарводаканала. І апошняя, мураваная сінагога, вядомая па шматлікіх фотаздымках, па вул. Віленскай (цяпер Лазарэнкі) адразу за мастом праз раку Дубравенка. Была значна пашкоджана 10 красавіка 1942 г. у выніку паводкі ад моцнага скіду вады. Пасля дыверсіі падпольшчыкаў, вышэй па цячэнню р. Дубравенка каля чыгуначнага моста, у выніку выбуху ўтварыўся штучны запор вады, якая вясною змыла перашкоду і хваляй вышынёй да 8 метраў рушыла ў бок Быхаўскага рынка і р. Дняпро. Пасля вайны на рэштках сінагогі быў пабудаваны дом культуры.

Знішчэнне культавых пабудоў пачыналася з гвалтоўнай ліквідацыі абшчын і канфіскацыі будынкаў. Найбольш актыўна гэта праца праводзілася камуністычнымі ўладамі ў 1920–30-я гады.

Вяртаючыся да тэмы разбурэння Магілёва ў 1941–1945 гг., асабліва падчас абароны і вызвалення горада, трэба дадаць наступны факт. Сведкі тых падзеяў сцвярджалі, што ўноч на 28 мая 1943 года савецкая авіяцыя жорстка бамбіла цэнтральную частку горада. Мэтаю было знішчыць як мага больш жаўнераў гітлераўскай дывізіі, што знаходзілася на адпачынку ў Магілёве. Разам з гітлераўцамі знішчаліся і гарадскія забудовы, у тым ліку і культавыя будынкі. Званіцы і купалы ў цэнтры горада былі арыенцірамі для бомбакідання. Такім чынам былі пашкоджаны амаль усе праваслаўныя храмы, частка якіх у 1941–1944гг. з дазволу акупацыйных уладаў дзейнічала (перад вайной у Магілёве ўлады закрылі ўсе без выключэння цэрквы, касцёлы, сінагогі, афіцыйна ліквідавалі рэлігійныя абшчыны). Пашкоджана была прыгажосць горада! Канчаткова рэшткі помнікаў культавай архітэктуры былі зруйнаваны ў 1950–я гады.

У канцы 18 і першай палове 19 стст. сфарміравалася архітэктурнае аблічча старога Магілёва, якое прасочваецца і сёння, нягледзячы на страты і разбурэнні. У гэты час на Гандлёвай (цяпер Савецкая) плошчы быў створаны архітэктурны ансамбль, які складаўся з дамоў: губернатара, віцэ–губернатара і 2 саветнікаў, будынкаў губернскага ўпраўлення, ніжняга суда, урачэбнай управы і архіва. На Шклоўскай (пазней Дняпроўскі праспект, цяпер Першамайская) вуліцы створаны ансамбль Саборнай плошчы – цяпер сквер перад дзелавым цэнтрам (былая гасцініца «Дняпро»). Ад забудовы Саборнай плошчы засталася толькі арка (у гонар Кацярыны ІІ), якая ў 1930–я гады выкарыстоўвалася як брама – уваход у цырк, а пасля апошняй вайны перарobленая ў арку з памятнымі дошкамі ў гонар вайсковых часцей, што вызвалялі горад ад гітлераўскіх захопнікаў.

У 19 ст. большая частка дамоў месцічаў уяўляла сабой двух–трохпавярховыя мураваныя будынкі. Рэшткі гарадской жылой забудовы захаваліся па вул. Вялікай Садовай (цяпер Ленінская), Пажарнай (цяпер К.Лібкнехта), Дняпроўскім праспекце (цяпер Першамайская). Няшмат з іх засталося. З агульнай масы вылучаюцца два: былы палац каталіцкага архіепіскапа С.Богуш–Сестранцэвіча і Архіерэйскі палац, вядомы ў горадзе пад назвай палац Г.Каніскага (помнікі жылой архітэктуры 18 ст.). Пра першы размова ішла раней, таму варта крыху распавесці пра Архірэйскі палац.

У 1755 г. праваслаўным епіскапам Магілёўскім быў прызначаны Георгі Каніскі. У лістах да сваіх знаёмых і розных высакапастаўленных асоб ён яскрава апісаў “скудость” магілёўскага архірэйскага дома. З лістоў Г.Каніскага вынікае, што на той час асобнага дома для архірэя і неабходных для яго патрэб і службаў у Магілёўскай катэдры не было.

Пасля далучэння Магілёва да Расіі, імператрыца Кацярына ІІ напісала у калегію эканоміі (своеасаблівы правобраз сучаснага міністэрства): “выдать из экономической суммы на строение в Могилеве каменного архиерейского дома 10 тыс. руб.”, што сведчыць аб пабудове палаца не за сродкі царквы, а за агульнадзяржаўны кошт.

Аналіз прыведзеных звестак схіляе мяне і некаторых іншых даследчыкаў да высновы, што час пабудовы дома для пражывання магілёўскіх архірэяў можна вызначыць толькі прыблізна. Так, калі ўлічыць энергію, з якой Каніскі ажыццяўляў адбудову Магілёўскай катэдры, а таксама даволі цяжкае

матэрыяльнае становішча да 1774 г., то на думку мастацтвазнаўцы Н.Пятровіч, можна сцвярджаць, што будаўніцтва каменнага двухпавярховага палаца для архірэяў пачалося не раней 1770 г. Тым больш, што сродкі ў памеры 10 тыс. рублёў былі выдзелены толькі ў 1774 г. Выдзеленыя расійскім урадам грошы на той час былі значнай сумай і давалі магчымасць весці будаўнічыя работы без асаблівых затрымак. Акрамя таго гадавое шасцітысячнае ўтрыманне епіскапа, на нашу думку, таксама спрыяла гэтаму. Таму ёсць усе падставы лічыць датай завяршэння будаўніцтва архірэйскага палаца прыблізна 1780 г. На карысць гэтага гаворыць і той факт, што ў 1785 г. была ўжо закончана пабудова двухпавярховага мураванага корпуса семінарыі, аб чым сведчыў надпіс на яго франтоне, зроблены па жаданню Каніскага.

Праўда, даследчыкі В.Чантурыя і Т.Чарняўская прытрымліваюцца іншых меркаванняў і даволі катэгарычна называюць часам пабудовы магілёўскага архірэйскага дома 1762–1763 гг. ці 1762–1785 гг.

Сапраўды, праект на яго будаўніцтва хутчэй за ўсё быў распрацаваны Глаўбіцам пад час дабудовы Спаскай царквы, ці ва ўсякім разе да 1767 г. (год смерці архітэктара). Больш таго, атрымаўшы даволі значную суму на дабудову Спаскай царквы, а таксама чатырохгадовае ўтрыманне, Каніскі сапраўды мог на гэтыя грошы заказаць праект Глаўбіцу і на пабудову палаца. Аднак, на думку Н.Пятровіч, зусім не лагічна выводзіць гэтакі доўгабуд паловы 18 ст. ці тое, што палац быў пабудаваны раней за царкву. 13 лютага 1795 года Г.Каніскі памёр, пражыўшы ў палацы каля дзесяці год.

З архірэйскім палацам шчыльна злучаны яшчэ некалькі старонак магілёўскай гісторыі. 29 чэрвеня 1812 года ў Магілёў і яго ваколіцы ўвайшоў 80-тысячны корпус французскага маршала Даву. Апошні прыняў на сябе пасаду губернатара, прызначыўшы сваім намеснікам польскага генерала Пакоша, які «квартировал в архиерейском доме со всем своим экипажем, дворовыми чиновниками и служителями». Архірэйскі палац французы меркавалі перадаць у асабістую маёмасць князю Панятоўскаму, а Спаскую царкву зрабіць яго прыдворным касцёлам.

Відаць, у час французскага нашэсця будынак архірэйскага палаца калі і быў пашкоджаны, то вельмі незначна, бо ў верасні 1813 г. пры ўступленні на Магілёўскую катэдру епіскап Данііл адзначыў, што ў архірэйскім доме грошы і рызніцы захаваліся ад спусташэння, але зніклі 8 пушак, падараваных архірэйскаму дому для вырабу звону.

На жаль, ні друкаваныя, ні архіўныя гістарычныя крыніцы, якія ў нас ёсць, не даюць магчымасці прасачыць, як ішло будаўніцтва магілёўскага палаца, не ўтрымліваюць таксама праекта будаўнічых планаў яго. Але пэўнымі даследчыкамі на падставе розных гістарычных крыніц, малюнкаў, апісанняў, фотаздымкаў зроблена планіроўка паверхаў і фасадаў будынка. Як жа ён выглядаў?

Мураваны трохпавярховы будынак (трэці паверх – атыкавы ў цэнтральнай частцы), прамавугольны ў плане з сіметрычнымі двухпавярховымі рызалітамі па баках, накрыты высокім ламаным дахам. Галоўны і дваровы фасады (з глыбокім гарызантальным рустам сцен, руставанымі пілястрамі на вуглах) маюць крывалінейныя пераходы да рызалітаў, прамавугольныя аконныя праёмы з

ліштвамі, філянговыя нішы, тонкапрафіляваныя карнізы. Галоўны ўваход (з боку архірэйскага двара) вылучаны арачным парталам з казырком на металічных калонках. У інтэр'еры цэнтральнае месца займаў вестыбюль з трохмаршавай лесвіцай. На першым паверсе знаходзілася парадная зала для прыёмаў і службовыя пакоі, на другім – пакоі архіепіскапа: спальня, кабінет, бібліятэка, на трэцім – гаспадарчыя памяшканні. Такое падрабязнае апісанне выклікана тым, што палац – гэта унікальная пабудова Магілёва канца 18 ст., выкананая ў стылі беларускага барока па праекту славутага архітэктара І.Глаубіца.

Пасля кастрычніцкага перавароту 1917 г. некаторы час палац магілёўскіх архірэяў выкарыстоўваўся па свайму першапачатковаму прызначэнню, але ў канцы 1918 г. у ім размесцілася магілёўская губернская надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй (губчэка). Існавала да сакавіка 1919 г. Ёсць падставы сцвярджаць, што пад час, так званай, ліквідацыі ў горадзе «контрреволюционной» арганізацыі, у будынку бываў на допытах Магілёўскі каталіцкі біскуп Святаполк–Мірскі. Арыштаваны беспадстаўна як кіраўнік арганізацыі, якая быццам бы памагала зброяй гетману Скарападскаму, Святаполк–Мірскі быў растраляны. Ёсць, непадцверджаныя дакументальна, сведчанні, што ў сутарэннях палаца, пад час дзейнасці губчэка, было закатавана 18 чалавек.

Па звестках краязнаўцы І.І.Філіповіча, у час вайны 1941–1945 гг. значна быў пашкоджаны дах будынка.

З 1946 г. архірэйскі палац выкарыстоўваўся як звычайны жылы дом. З 1982г. знаходзіўся ў аварыйным стане. Пасля высялення людзей у будынку планавалася размясціць экспазіцыю музея гісторыі Магілёва. Аднак насуперак логіцы, палац у музея адабралі і перадалі Магілёўскай праваслаўнай епархіі, дзе плануецца размясціць музей Каніскага, бібліятэку і іншае. У 2005 годзе з шматлікімі парушэннямі правіл рэстаўрацыі царквою быў зроблены бягучы рамонт будынка, праламаны капітальная сцяна і на гэтым месцы ўсталяваны гаражныя вароты, у выніку якога палац як помнік архітэктуры эпохі барока перастаў існаваць.

Незайздросны лёс культавых і часткі грамадзянскіх пабудоў Магілёва. Атрымаўшы ў спадчыну на пачатку апошняга стагоддзя другога тысячагоддзя цудоўныя помнікі мінуўшчыны, мы ў большасці не захавалі іх і таму, рушыўшы ў трэцяе тысячагоддзе, мусім рупліва аберагаць хаця б тыя, што засталіся.

**2. Магілёўская школа іканапісу.** Творы іканапісу і жывапісныя роспісы мелі вялікае значэнне ў культурным жыцці горада. Імі былі упрыгожаны ўсе храмы Магілёва. Магілёўскія абразы 17-18 стст. вызначаюцца асаблівасцю пісьма, іканаграфічным тыпажом, арнаментам, які нагадвае сетку або дыван раслінных матываў. Прафесіяналізм выканання абразоў сведчыць аб росквіце Магілёўскай школы іканапісу як значнай гісторыка-мастацкай з′явы ў старажытнабеларускім жывапісе. У 18 ст. у Магілёве у розны час працавала 30 жывапісцаў. Найбольш вядомыя: Міхаіл Багамаз, манахі Пётр, Лук′ян, Рыгор, Макар Акулініч, Петр Яўсіевіч, Афанасій Пігарэвіч, Мірон Пігарэвіч і інш. Сярод захаваўшыхся да нашых дзён твораў варта адзначыць: „Нараджэнне Маці Божай“ (1649)

П.Яўсіевіча, „Дэісус“ (к. 17 ст.), „Маці Божая з дзіцяці“, „Сцэна жыція св. Георгія“ (I пал. 17 ст.), „Спас“, „Мікола“ (сяр. 17 ст.) і інш.

У 16–18 ст. Магілёў з’яўляўся адным з буйнейшых цэнтраў мастацкай культуры Вялікага княства Літоўскага. Побач з кнігадрукаваннем, гравюрай – «дрэварытам» і «медзярытам» – разьбой па дрэве высокага ўзроўню дасягнула ў горадзе «малярства» – майстэрства жывапісу і іканапісу. У Магілёўскай брацкай друкарні працавалі майстры-граверы і мастакі іканапісцы (Афанасій Пігарэвіч і іншыя). Праваслаўнае брацтва клапацілася аб адпаведнасці выяў у кніжнай графіцы мясцовым традыцыям праваслаўнага іканапісу, ідэалам «даўніны». Таму кампазіцыі гравюр Магілёўскіх выданняў блізкія да твораў іканапісу. Дакументы і іншыя гістарычныя і архіўныя крыніцы змяшчаюць вялікую колькасць імён мастакоў, якія працавалі ў Магілёве. У дакументах Магілёўскага магістрата за 1578–89 гг. сустракаецца 6 імён мясцовых мастакоў, у 17 ст. – 8. У інвентарах Магілёва за 1736 г. ўпамінаецца 5 імён «маляроў», «мастакоў» і «багамазаў», за 1765 г. – 6. У 18 ст. ў Магілёве ў розны час працавала 30 жывапісцаў. Як і прадстаўнікі іншых прафесій, Магілёўскія мастакі навучаліся традыцыйным шляхам, характэрным для сярэдневяковай рамеснай вытворчасці - майстры бралі вучняў на пэўны тэрмін, абавязваліся навучыць іх свайму рамяству і неслі за іх адказнасць. Напрыклад, у 1578 г. «маляр» Ісак Івановіч звяртаўся ў магістрат з просьбай вызваліць яго ад абавязкаў у адносінах да свайго вучня, які знаходзіўся ва ўцёках. Вядомы прыклады наследавання прафесіі (Міхаіл Багамаз вучыўся ў свайго дзеда). Большасць мастакоў з’яўлялася «мяшчанамі Магілёўскімі». Былі мастакі і духоўнага звання (манахі Пётр, Лук’ян і Рыгор са Спаскага манастыра). Некаторыя мастакі займаліся не толькі іканапісам, але і збытам сваіх абразоў у навакольных вёсках і бліжэйшых гарадах, працавалі на рынак (Міхаіл Багамаз), выконвалі і іншыя жывапісныя работы: Акулініч Макар, які жыў у канцы 16 ст., «прадаў ярчак (сядло) маляваны, з пазалотай», Афанасій Пігарэвіч (канец 17 – пачатак 18 ст.) рабіў фрэскі, насценныя размалёўкі, напісаў таксама абразы «Евангелісты», «Маці Боская», упрыгожыў размалёўкамі ратушу па заказе магістрата, выканаў пазалотныя работы. Творы іканапісу і жывапісныя размалёўкі мелі вялікае значэнне ў культурным жыцці горада. Паводле сведчання «Магілёўскай хронікі», устанаўленне на «Алейнай браме» горада ў пачатку 18 ст. абраза «Маці Боская» (мастак Мірон Пігарэвіч) замест старажытнай, якая згарэла, суправаджалася вялікай колькасцю народу і вылілася ў значную грамадскую падзею. Інтэр’еры цэркваў упрыгожвалі разныя шмат’ярусныя іканастасы (зберагалася разьба іканастаса Мікалаеўскай царквы), насценныя размалёўкі, брацкія і цэхавыя абразы. У сярэдзіне 17 – пачатку 18 ст. фрэскавыя размалёўкі былі ў Богаяўленскай і Мікалаеўскай цэрквах. Твораў Магілёўскага іканапісу таго перыяду захавалася мала. Шмат абразоў, якія экспанаваліся на выстаўках у Мінску ў 1918 г. і 1926 г., загінулі ў час вайны 1941-45 гг. Ацалелыя абразы Магілёўскіх мастакоў знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі ў Мінску, а таксама ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі. У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі зберагаюцца абраз П.Яўсіевіча «Нараджэнне Маці Божай» (1649), у кампазіцыі якога выкарыстана мноства

этнаграфічных дэталей і прадметаў мясцовага побыту, і аднайменны абраз пачатку 18 ст., блізкі па кампазіцыі да абраза Яўсіевіча, што сведчыць аб пераемнасці ў Магілёўскай школе іканапісу. У Музеі старажытнабеларускай культуры экспануецца буйнафарматны абраз «Дэісус» канца 1-й палавіны 18 ст., які напісаны на высокім прафесійным узроўні, у Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі – 3 абразы 1-й палавіны 17 ст. «Маці Боская з дзіцем», «Святы Ілья», «Сцэна жыція святога Георгія». 3 абразоў Магілёўскай школы іканапісу, што захоўваюцца ў цэрквах Быхава, Магілёва і іншых населеных пунктаў, найбольш ярка выяўляюць асаблівасці мясцовай іканапіснай традыцыі творы «Спас», «Маці Боская Адзігітрыя», «Мікола» (сярэдзіна 17 ст.). Яны аднаго фармату з рэльефнай разьбой на фонах і размяшчаліся, магчыма, у адным іканастасе. Для ўсіх трох твораў характэрна багатая дэкаратыўнасць і паслядоўнасць у адлюстраванні праваслаўнага канона. Магілёўскія абразы 17–18стст. вызначаюцца асаблівасцю пісьма, іканаграфічным тыпажом, фонавым арнаментам, які нагадвае сетку або дыван раслінных матываў Арнамент фонаў магілёўскіх абразоў мае высокі рэльеф са скругленым злёгку контурам і дадатковымі штрышкамі на паверхні арнаментальных матываў. Насечка ў прабелах арнаменту часам адсутнічае, бо сетка яго вельмі густая. Прафесіяналізм выканання абразоў сведчыць аб росквіце Магілёўскай школы іканапісу як значнай гісторыка-мастацкай з’явы ў старажытнабеларускім жывапісе. Самабытны і арыгінальны, з багатай палітрай фарбаў жывапіс Магілёўскай школы ў сваёй аснове зберагае традыцыйны іканапісны канон, у вобразах пераважаюць гуманістычныя пачаткі. Магілёўскі іканапіс у параўнанні з іканапісам іншых рэгіёнаў (палескі, мсціслаўскі, слуцкі і віцебскі) вызначаецца болылай жывапіснасцю і цягай да арнаментыкі. Арнамент у магілёўскіх абразах прадстаўлены не толькі рэльефам на фонах, але і багатымі ўзорнымі і кветкавымі матывамі ў адзенні персанажаў, што збліжае Магілёўскую школу іканапісу з украінскай. Тыпажом і прапорцыямі фігур магілёўскія абразы блізкія да абразоў віцебскіх і мсціслаўскіх

### 3. Магілёўская школа гравюры

У асяроддзі мастацтвазнаўства даўно ведаюць аб існаванні Магілёўскай школы гравюры канца 17 – 1-й палавіны 18 стст. Мастакі гэтай школы працавалі ў друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва, дзе выдаваліся літургічныя і свецкія кнігі на беларускай, польскай, грэчаскай і лацінскай мовах. Усе выданні гэтай друкарні, як правіла, мелі тытульныя лісты, а тэксты кніг багата ўпрыгожваліся ілюстрацыямі, застаўкамі, канцоўкамі. У аснове мастацкіх прынцыпаў майстроў гравюры Магілёўскай школы былі традыцыі беларускага народнага мастацтва, асабістыя назіранні за навакольным жыццём, смелае ўнясенне ў кампазіцыі рэлігійнага зместу характэрных тыпажоў магілёўскіх жыхароў, іх адзення і прадметаў хатняга побыту. Гэта рабіла іх творы рэалістычнымі, жыццёва-пераканаўчымі, надавала ім свецкі характар. Галоўную ролю ў фарміраванні прынцыпаў школы гравюры адыгралі жыхары Магілёва Максім Вашчанка і яго сын Васіль. Максім Вашчанка нарадзіўся ў 2-й палавіне 17ст., адукацыю атрымаў у Віленскай езуіцкай акадэміі, куды паступіў у 1660-х

гадах. 21 лістапада 1672 г. ён здаў экзамен на бакалаўра свабодных мастацтваў, а 14 ліпеня наступнага года атрымаў званне магістра філасофскіх навук. Відаць, у Віленскай акадэміі Вашчанка цудоўна асвоіў справу мастака-гравёра і праз некалькі гадоў у родным Магілёве наладзіў работу па ілюстраванні і выданні кніг. Першай кнігай, дзе з’явіліся гравюры Максіма Вашчанкі, быў зборнік «Манархія Турэцкая», выдадзены ў 1678 г. Слуцкай друкарняй.

Ілюстрацыі да «Манархіі Турэцкай» сталі прыкметнай з’явай у беларускім кніжным мастацтве. Гэта быў свецкі цыкл графічных работ з незвычайнай для таго часу рэалістычнай перакананасцю. У адных гравюрах мастак дакладна ішоў за тэкстам, іншыя ствараў незалежна ад канвы апавядання.

У ілюстрацыях, якія адносяцца непасрэдна да тэксту кнігі, найбольш поўна праявілася творчая фантазія мастака, яго асабістыя назіранні за жыццём сваіх землякоў-беларусаў з горада Магілёва. Высокіх і зграбных турэцкіх наложніц, як адзначаў у свой час публіцыст А.Сайкоўскі, Вашчанка ператвараў нярэдка ў магілёўскіх маладзіц.

З яго імем звязана з’яўленне гравюр у беларускім кнігадрукаванні, якія выкананы разцом на медных пласцінках. Праўда, спроба вырабу такіх гравюр была зроблена раней магілёўцам Спірыдонам Собалем. Да 1690-х гадоў у друкарнях Беларусі ні адна кніга кірылічнага шрыфту не была праілюстравана гравюрамі-медзярытамі.

У 1693 г. Магілёўская брацкая друкарня выдала кнігу «Акафісты і каноны», дзе было больш за 3 дзесяткі ілюстрацый-медзярытаў Вашчанкі. Гэта кніга – лепшае беларускае выданне тых часоў і па мастацкім афармленні, і па паліграфічным выкананні. Усе ілюстрацыі склалі самы багаты новазапаветны цыкл гравюр аб жыцці Ісуса Хрыста. З зайздроснай творчай фантазіяй магілёўскі мастак выканаў шматфігурныя кампазіцыі ў выглядзе звычайных сцэн жыцця сваіх землякоў-магілёўцаў. Усе ілюстрацыі да «Акафістаў і канонаў» носяць ярка выражаны жанравы характар, насычаны беларускім нацыянальным каларытам. Гэтыя медныя пласціны з гравюрамі праз 35 гадоў былі выкарыстаны пры перавыданні кнігі ў 1728 г. Памёр М.Вашчанка ў 1708 г.

Традыцыі мастака прадаўжаў яго сын Васіль Максімавіч Вашчанка, які стаў адным з самых вядомых майстроў Магілёўскай школы гравюры. Па кнігах, што ён ілюстраваў, можна меркаваць, як працаваў ён у друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва ў 1694– 1730 гг. Сярод творчай спадчыны В.М.Вашчанкі ёсць работы з аўтографам і без аўтографа мастака. Выканаў загалоўныя лісты ў кнігах «Дыоптра» (1698), «Неба новае», «Перла мнагацэннае» (абодва 1699), «Кніга жыцій святых» (1702), а таксама гравюры «Іаан Дамаскін», «Нараджэнне Хрыста» для кнігі «Асмагласнік» (1730) і інш. Гэта тонкая разьба, вельмі дакладная штрыхоўка, з дапамогай якой мастак мадэліруе фігуры персанажаў, настолькі дасканалыя, што амаль усе гэтыя работы – шэдэўры графічнага мастацтва пачатку 18 ст.

Да лепшых твораў Вашчанкі належыць тытульны ліст «Кнігі жыцій святых». Фігуры дзеючых асоб і анёлаў выгравіраваны тут з вялікім майстэрствам. Гранічна адточана іх пластыка, прыдумана кампазіцыя кожнага ліста. Характэрна, што ўнізе малюнка адлюстраваны куточак сярэдневяковага

Магілёва. Гэта, бадай, адзін з самых першых выпадкаў у паліграфіі, калі ў кнізе царкоўнага характару рэалістычна паказаны гарадскі пейзаж. У наступных сваіх гравюрах Вашчанка дасягнуў найвышэйшага мастацкага майстэрства. З ранейшай выразнасцю лінейных рытмаў ён абагаціў свае ксілаграфіі святлоценявымі эфектамі. Тыпажы яго работ простанародныя і прыцягваюць гледача выразнасцю і чысцiней свайго ўнутранага свету (кнігі «Асмагласнік», «Тайная вячэра»). Пра незвычайную мастацкую каштоўнасць твораў Вашчанкі сведчыць і той факт, што некаторыя яго гравюры выкарыстоўваліся паўторна ў шэрагу кніг. Так, напрыклад, ксілаграфія «Вадахрыст», якая з'явілася першы раз на старонках кнігі «Дыоптра» ў 1698 г., друкавалася пазней у кнігах «Неба новае», «Перла мнагацэннае» і «Кніга жыцій святых».

Сярод прадстаўнікоў Магілёўскай школы гравюры пасля бацькі і сына Вашчанкаў па сваіх мастацкіх каштоўнасцях лічацца работы іх земляка Фёдара Ангілейкі. Як сведчаць яго аўтографы на ксілаграфіях, Ангілейка працаваў у Магілёўскай брацкай друкарні ў 1700–03 гг. За 3 гады выйшлі ў свет 2 кнігі з яго ілюстрацыямі – «Ермолой сиречь Осмогласник» (1700), «Часослов сиречь Последование службы» (1703). Ксілаграфіі з адлюстраваннем цара Давіда, Іаана Прадцечы, Ісуса Хрыста і іншых персанажаў, пра якія вядзецца апавяданне ў гэтых царкоўных кнігах, па манеры графічнага выканання блізкія да работ Васіля Вашчанкі. Гравюрам Ангілейкі характэрны прастата тэхнічных прыёмаў і нескладанасць кампазіцыі, што набліжае іх да твораў народнага мастацтва. У пачатку 18 ст. ў друкарні Магілёўскага Богаяўленскага брацтва акрамя названых мастакоў працавалі Мікіта Антушкевіч, Апанас Вашчанка, Янка Стральбіцкі і Апанас П.

Арнаментальныя матывы магілёўскіх гравюр пазней з'явіліся ў маскоўскіх выданнях. Гэта не дзіўна. Магілёўскія майстры кнігадрукавання даволі часта бывалі ў Кіеве і Маскве, дзе дзяліліся ўласным вопытам.

Кнігі, выдадзеныя Магілёўскай брацкай друкарняй, з'яўляюцца найцікавейшай старонкай гісторыі беларускага кнігавыдання, а прозвішчы першых магілёўскіх кнігадрукароў занялі дастойнае месца сярод славянскіх асветнікаў 17–18 стст.

### 4. Заняткі, жытло і адзенне магілёўцаў

Магілёў з даўніх часоў вядомы як буйны цэнтр рамёстваў і мастацкіх промыслаў. Як адзначае даследчык С.Бяспанскі, у 14–16 стст. тут развіваліся кавальства, ткацтва, мастацкая апрацоўка дрэва, скуры, металаў (ліццё, коўка, чаканка), ружэйная справа, ювелірнае мастацтва. Ювелірнае рамяство старажытнага Магілёва прадстаўлена шклянымі пазалочанымі пацеркамі, пярсцёнкамі, медальёнамі з выявамі святых і хрысціянскай сімволікай. Вытанчанасцю і прыгажосцю вылучаюцца бранзалеты, засцежкі, спражкі, фігурныя шпількі і іншыя бытавыя вырабы. Вялікая ўвага надавалася інкрустацыі каляровымі і высакароднымі металамі, чаканцы. Вырабы з косці (розныя накладкі, грабяні, дзяржанні нажоў) упрыгожваліся пераважна цыркульным узорам. У 17ст. у сувязі з арганізацыяй кавальскіх цэхаў высокага ўзроўню ў Магілёве дасягнула мастацкае ліццё і коўка металу. Выраблялі алавянны посуд, ліхтары, гарматы,

званы, пазалочаныя і пасярэбраныя рэчы з медзі, жалеза і інш. У Магілёве і ваколіцах былі пашыраны разьба па дрэве, выраб керамікі: посуду, цацак, свяцільняў, кафлі, цэглы, рукамыйнікаў і іншых прадметаў хатняга ўжытку. Гаршкі з прамой шыйкай і касым або закругленым краем венчыка, макітры ў канцы 15–16 стст. аздаблялі хвалістым арнаментам або наколкамі, насечкамі. У 17–18 стст. выраблялі гаршкі, кубкі, куфлі, міскі, глякі, талеркі. Паліваны посуд (міскі і талеркі) упрыгожвалі арнаментам у выглядзе кругоў і кветак, збаны з вялікай ручкай – адбіткам пальцаў на яе краях і арнаментам у выглядзе наляпных кветак на плечуках, куфлі – з выявамі гарадскога герба і пакрывалі зялёнай палівай. У 2-й палавіне 17–18 стст. посуд (талеркі, збаны) аздаблялі размалёўкай пераважна з геаметрычным і раслінным арнаментам.

Вялікім попытам карысталася магілёўская кафля. Паводле тыпаў і прызначэння магілёўская кафля падзялялася на сценавую, карнізную (простую, складаную і інш.), паясную, вуглавую, кафлі-перамычкі, гарадкі (каронкі). У аздабленні пераважалі раслінны (выява букета кветак у вазе, дубовыя і лаўровыя лісты, бутон хмелю і інш.) і геаметрычны (зігзагі, сетка, «рыбіна луска» і інш.) арнаменты, сюжэтныя, зааморфныя, геральдычныя, міфалагічныя выявы (ільвы, арлы, грыфоны, анёлы, коннікі, гербы і інш.). Некаторыя кафлі датаваныя. Кафля канца 17 – пачатку 18 стст. вылучалася так званым «дывановым арнаментам», рэльефнымі выявамі, у канцы 18–19 стст. яна мела гладкую вонкавую пласціну, якая была пакрыта пераважна зялёнай палівай. У канцы 19 – пачатку 20 стст. паверхню вонкавай пласціны аздаблялі складаным рэльефным малюнкам.

У 17–19 стст. сваім майстэрствам славіліся Магілёўскія шкловыдзімальшчыкі. Сталовы посуд выраблялі часцей за ўсё свабодным фармаваннем з бясколернай і слаба афарбаванай масы (зеленаватага, светла-зялёнага і светла-жоўтага колераў), пасудзіны для лякарстваў, захоўвання і транспартавання вадкасцей – з бясколернай, часцей зеленаватай масы. Вырабы 19 ст. адрозніваліся пячаткамі з нізкарэльефнымі надпісамі. Цыліндрычныя бутлі мелі паддоны і высокія вузкія шыйкі, у шарападобных яны адсутнічалі. Збаны былі шара- і грушападобнай формы. Кварты выдзімалі розных памераў з кароткімі шыйкамі і пераважна прамымі плечукамі, шкляніцы – цыліндрычныя на хвалепадобных і кальцавых паддонах. Чаркі і шклянкі канічныя і цыліндрычныя фармаваліся адвольна з жалабатымі сценкамі. Шклянкі ў 18 ст. гравіравалі. У 17ст. магілёўскае шкло вывозілі на продаж у Маскоўскую дзяржаву.

С.Бяспанскі падкрэслівае, што ў Падняпроўі склаўся свой традыцыйны комплекс беларускага адзення, так званы «Магілёўскі строй». Летні жаночы гарнітур уяўляў сабой пераважна 2 варыянты-комплексы: кашуля, спадніца, фартух; кашуля, спадніца, фартух, гарсэт. Кашулю шылі з прамымі плечавымі ўстаўкамі і adносна вузкім рукавом, адкладным, радзей вузкім стаячым, каўняром. Арнамент натыкання і вышыўкі ў большасці сваёй чырвоны з украпінамі чорнага, кампанаваўся ў палосы на плечавых устаўках і рукавах (паралельна лініі ўточкі), на каўняры. Аднак пераважалі геаметрычныя (ромбы, крыжы, зорачкі) і раслінныя (валошкі, бярозка) узоры. Суконная спадніца (андарак, саян) была чырвона-малінавая з белай, зялёнай, сіняй, чорнай клеткай, палатняная (бяляк) – гладка-белая ці клятчастая шэра-белая з арнаментальным шлякам на падоле.

Падпяразваліся магілёўцаўкі вузкім дэкаратыўным поясам. Фартух-трыпольнік складаўся з трох полак белага палатна. Гарсэт (кабат) шылі з сіняга, чырвонага аксаміту, шарсцянкі з баскай у выглядзе клінкоў або прышывалі да спадніцы, аздаблялі нашыўкамі тасьмы. Галаўныя ўборы – чапец, намітка, даматканая хустка, якія ўпрыгожваліся вышытымі пацеркамі, абразкамі, крыжыкамі або нашыўкамі мохрыкаў.

Комплекс мужчынскага адзення – кашуля з багата вышытай манішкай і беласуконнымі нагавіцамі, суконныя ці палатняныя камізэлькі са стаячым каўняром. Насілі таксама шыйныя даматканыя хустачкі-шалікі з вышытым чырвоным арнаментам на канцах. Галаўныя ўборы – каўпаковыя магеркі альбо футраванкі. Мужчынскае і жаночае адзенне дапаўнялі белыя світы з вышыўкай, нашыўкай тасьмы і шнура. Гэтыя комплексы адзення, напэўна, былі занесены з вёсак, бо на кірмашах і святах сяляне і гараджане выглядалі амаль аднолькава. Гэта тычыцца толькі часткі гараджан. Безумоўна, найбольш заможная частка магілёўцаў імкнулася апранацца згодна модзе, якая існавала ў асяродку шляхты. З 17 стагоддзя пачынаецца працэс фарміравання гарадскога стылю аддзення, які адрозніваўся ад вясковага. Жыхары горада больш нагадвалі па адзенню шляхціца, чым селяніна. У 19 ст. аддзенне жыхароў горада стала канчаткова не падобным на сялянскае. Прычым неабходна адзначыць, што ў 19 ст. гарадская патомная шляхта імкнулася апранацца ў так званы “сармацкі строй”, а яўрэйскае насельніцтва апраналася згодна ўласных нацыянальных традыцый, якія адрознівалі яго ад карэннага насельніцтва краю. У той жа час некаторыя гараджане апраналіся захоўваючы элементы “народнага стылю”.

Такім чынам, адзенне было вельмі разнастайным. Мужчыны насілі даламаны, дылеі, кабенякі, аднарадкі, жупаны, кунтушы. Жанчыны – саяны, сукні, панёвы, сукманы і інш. Трэба адзначыць, што пераважная большасць мяшчанаў шыла верхняе адзенне з імпартных тавараў – нямецкага, чэшскага, італьянскага, галанскага, англійскага суна, з шоўку і аксаміту. Беларускае палатно пры шыцці верхняга адзення звычайна скарыстоўвалі на падкладку.

У Падняпроўі, як і па ўсёй Беларусі, тканіны для вырабу адзення і прадметаў хатняга ўжытку былі пераважна даматканыя. Сыравінай здаўна служылі лён, воўна. Ткацтва з’яўлялася адным з галоўных заняткаў жанчын. Усе работы па апрацоўцы сыравіны і падрыхтоўцы яе да ткання выконваліся ўручную. Для тканін Падняпроўя характэрна яркая дэкаратыўнасць, арнаментальная насычанасць, выкарыстанне розных тэхнік ткання. З 18 ст. вядомы магілёўскія ручнікі. Ткалі іх з ільняных і баваўняных нітак даўжынёй 300 – 450 см, шырынёй 35 – 40 см, арнамент займаў 30 – 80 см на кожным канцы. На канцах па 3 – 5 гарызантальных палос, што аддзелены адна ад адной гладказатканымі палосамі. З аднаго краю ўздоўж праходзіць суцэльная арнаментальная паласа, праз пэўныя прамежкі чаргуюцца вытканыя або вышытыя асобныя арнаментальныя матывы: чатырохвугольнік, ромб, крыжык, трохвугольнік, зорачка і інш. На канцах ручнікоў белыя карункі (часам чырвоныя) з кутасамі.

З 16 ст., калі Магілёў атрымаў Магдэбургскае права, галоўную частку насельніцтва горада складалі рамесна-купецкі люд і мяшчане праваслаўнага, уніяцкага і каталіцкага веравызнання, увесь час паціху павялічвалася колькасць

яўрэйскага (іудзейскага) насельніцтва. Апошняе стала пераважаць ў горадзе, пачынаючы з “разні” магілёўцаў расійскім войскам у 1708 годзе і асабліва хуткімі тэмпамі з часу уваходжання і знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. У канцы 19 ст. ў горадзе было амаль 10 тысяч мяшчан хрысціянскага веравызнання (7701 карэнных і 2267 прыпісных, пераважна праваслаўных). У небагатых мяшчан быў свой уклад жыцця і побыт, але шмат чаго агульнага яны мелі і з простым людам. Мяшчанскі двор у асноўным чатырохвугольны, з хатай, надворнымі будынкамі, варотамі з брамкай. Асноўным тыпам жылля магілёўцаў быў двух- альбо трохкамерны дом. З 17 ст. хутка развівалася мураванае дойлідства. Асноўным тыпам жылля магілёўцаў быў двух- альбо трохкамерны дом. З 17 ст. хутка развівалася мураванае дойлідства.

Дом звычайна падзяляўся на чыстую палавіну – святліцу і рабочую хату з каморай. Абагравалася святліца грубкай, хата – рускай печчу. Падлога фарбавалася ў белы колер. На вокнах кветкі, каля ганка лаўка для адпачынку. На падворку стаялі свіран, хлявы, хлевушкі, павеці і абавязкова баня, побач трымалі сабаку на ланцугу. Усе будынкі былі драўляныя, таму ў Магілёве неаднаразова здараліся знішчальныя пажары. Пры мяшчанскім двары знаходзіўся агарод, сад, на ўскраіне горада большасць гараджан мела другі агарод ці луг. Пры першай магчымасці кожная сям’я імкнулася прыдбаць дадатковы кавалак зямлі, «бо яна не гарыць і ня тоне», так казалі магілёўцы. Дом, агарод, сенажаці, жывёла, рамесныя прылады працы былі галоўным багаццем мяшчан.

З цягам часу, у залежнасці ад дастатку гаспадаркі, мянялася і адзенне мяшчан. У 17 ст. можна было сустрэць мужчыну ў суконным сурдуце, пад якім была атласная камізэлька, чорная шаўковая касынка на шыі і чорны картуз на галаве, суконныя шаравары, скураныя боты. Зімой заможны мешчанін ганарліва хадзіў у каракулевым футры. Жанчыны паступова сталі апранаць паркалёвыя сукенкі з фартухом, галаву павязвалі хусткай, маладыя светлай, старэйшыя цёмнай. Зімой мяшчанкі з заможных сем’яў насілі футравыя шубкі. Кожны член сям’і меў будзённае і святочнае адзенне.

### 5. Жыццёвыя звычаі гараджан

Былі ў мяшчан і свае асаблівасці ў вядзенні гаспадаркі. Большасць з іх не трымала коней. Яны казалі: “зімой конь каня з’ёсць”. Меркавалі, што больш выгадна купіць каня ў Чавусах ці Шклове, адпрацаваць на ім лета, а ўвосень прадаць. Мяшчане трымалі кароў, частку малака прадавалі, у малако крыху дабаўлялі вады, інакш “карова не будзе здарова”. Існавала таксама павер’е, што залішняя хвала спажыўцом малака магла сурочыць жывёліну. У гаспадарцы заможнага мешчаніна было 5–7 свіней: для сваіх патрэб, на продаж і на развод. Кожны гаспадар меў пад павеццю сані, калёсы, збрую, а ў падполлі бочкі, кадкі, цэбры і інш. Нельга не адзначыць вялікую ашчаднасць і нават скупасць магілёўскіх мяшчан. Яны заўсёды прыхоўвалі грошы на чорны дзень. Прадаўшы тавар, ніколі не гаварылі сапраўдную цану, заўсёды яе памяншалі, розніцу прыхоўвалі. Здаралася, што пасля смерці каго-небудзь з гаспадароў у хаце ў розных месцах знаходзілі прыхаваныя грошы, іншы раз – у латках старога адзення, якое было выкінута ці аддадзена жабракам. Заможныя мяшчане

харчаваліся добра, шмат у каго быў самавар для чаю. Усе гараджане мяшчанскага саслоўя абавязкова займаліся якім-небудзь рамяством, выгаднай для сям'і справай.

Жыццёвыя звычаі гараджан рэгуляваліся царкоўнымі канонамі і прадпісаннямі, якія строга і старанна выконваліся. У вялікі пост, напрыклад, магілёўскія мяшчане адпраўляліся на багамолле ў Кіеў. Група з 15–20 чалавек дабіралася туды за тыдзень і гавела ў Кіева-Пячэрскай лаўры. Там багамольцы набывалі царкоўныя кнігі, абразы, крыжы. У горадзе цяжка было знайсці сям'ю, якая б не ўдзельнічала ў такіх вандроўках. Мяшчане пасціліся вельмі строга, нават у часы халерных эпідэмій ў Магілёве ў 1848, 1849 і 1871 г., калі духавенства дазваляла спажываць мясную ежу. «Лепш памру, але не парушу святога посту», – гаварыла адна з хворых мяшчанак.

У Духаўскія дні па 2–3 сям'і, у якіх былі хлопцы ці дзяўчаты, выходзілі ў прыгарадныя гаі на так званыя «маёўкі», дзе пілі чай, гарэлку, розныя наліўкі. Вярталіся дамоў добра «падгуляўшыя». Цікава, што магілёўскія мяшчане не спявалі ў гасцях ці дома. Тых, хто спрабаваў спяваць на «маёўках», супакойвалі, палохалі паліцыяй. Затое і малыя, і старыя шмат спявалі ў царкоўных харах. Сярод мяшчан была пашырана мянушка «кулажнік». Тлумачылася гэта тым, што некалі ў горадзе для простага люду выраблялася немудрагелістая прысмака – кулага, густая мешаніна з ягад каліны, жытняй мукі і мёду. У час продажу яе гаспадар кулагі апускаў руку па самы локаць у месіва і здымаў прыліплае цеста пакупніку. Гэта была своеасаблівая мерка. Звычайна вырабам і продажам кулагі займаліся бяднейшыя, дробныя гандляры, якія вылучаліся сварлівым характарам, крыклівасцю, не заўсёды былі сумленныя. Вось іх і празвалі кулажнікамі, пасля такая мянушка прысвойвалася ўсім, хто ўдзельнічаў у базарных сварках.

Сур'ёзнай справай у мяшчан было вяселле. Хлопцу, які збіраўся жаніцца, будавалі двор, дзяўчыне збіралі пасаг. Рабілі для таго, каб маладыя адразу станавіліся на ўласную гаспадарку. Да жаніцьбы бацькі маладых складалі шлюбны кантракт, дзе агаворвалі ўсе пытанні вяселля і далейшага жыцця маладых. Даследчыкі мінулага вылучылі агульныя рысы магілёўскіх мяшчан – набожнасць, працалюбівасць, ашчаднасць, п'янства, недахоп адукацыі. Вельмі абразлівым у іх асяроддзі было слова «гультай».

Даволі значнай этна-культурнай часткай насельніцтва Магілёва былі яўрэі. У горадзе яны вядомы з 16 ст., займаліся вінакурэннем, півапарэннем, мёдаварэннем, трымалі корчмы і заезныя дамы, утрымлівалі ў сваіх руках аптовы гандаль, медыцыну, многія рамёствы. Сутыкненне інтарэсаў яўрэйскай абшчыны з хрысціянскай гандлёва-рамесніцкай часткай гараджан выклікала канкурэнтную барацьбу. З увядзеннем у Расійскай імперыі мяжы аселасці колькасць яўрэйскага насельніцтва ў горадзе значна павялічылася і складала, напрыклад, у 1909 г. 27474 чалавекі з 53518 усіх магілёўцаў. Жыццё яўрэяў рэгулявала абшчына. Як адзначае С.Бяспанскі, ад астатніх гараджан яўрэі адрозніваліся адзеннем. Мужчыны заўсёды насілі вузкі чорны балахон, шырокі чорны пояс, белыя ці сінія панчохі да каленяў, чорныя скураныя туфлі, на галаве чорны каўпак-ярмолку. Галаву галілі, пакідаючы на скронях валасы-пэйсы, якія спадалі да плячэй. Бароды ніколі не галілі. Яўрэйкі насілі рознакаляровыя без таліі сукенкі, на галаве вялікія хусткі,

якія павязвалі накшталт чалмы, шыю ўпрыгожвалі ніткамі жэмчугу, на ногі абувалі туфлі, якія ляпалі ў час хадзьбы па пятах. Замужнія жанчыны, як і мужчыны, галаву галілі і насілі парыкі. Яўрэйскі хлопчык лічыўся паўналетнім у 13 гадоў, дзяўчынка – у 12 гадоў і адзін дзень. У шлюб хлопцы звычайна ўступалі ў 18, дзяўчаты – у 16 гадоў. Маладыя год жылі ў бацькоў нявесты, пасля будавалі свой дом. Дамы яўрэі не агароджвалі, у двары нічога не расло. Уваход у дом рабіўся пасярод яго, ацяпляліся дамы рускай печчу, драўляную падлогу ў дамах мылі толькі 2 разы на год (вясной і восенню), у той жа час у Дубравенцы мылі драўляную мэблю. Больш заможныя сем'і трымалі кароў, бяднейшыя – коз. Вельмі шанавалася ў яўрэяў субота. У гэты дзень яны не працавалі, нават чай у самавары гатавала хрысціянская прыслуга. Яўрэі верылі ў многія прыкметы. Ведаючы пра гэта, жартаўнікі, праваслаўныя ці католікі, часта насміхаліся з іх. Напрыклад, калі некалькі яўрэяў ехалі на калёсах, жартаўнік услых пачынаў лічыць іх. Яўрэі мітусіліся, спрытнейшыя хаваліся, бо верылі, калі той, хто лічыць, назаве правільную лічбу, хто-небудзь з падарожнікаў хутка памрэ. Трэба адзначыць, што яўрэі былі пазбаўлены права на вышэйшую адукацыю і дзяржаўнае кіраўніцтва, але яны практычна ўтрымлівалі ў сваіх руках аптовы гандаль, піцейныя ўстановы, вытворчасць алкаголю, добра ведалі рыначную кан'юнктуру.

З іншых слаёў насельніцтва ў розныя часы ў Магілёве пражывала ў значна меншай колькасці шляхта, праваслаўнае, каталіцкае і уніяцкае духавенства, казакі, салдаты, рабочыя. Усе яны ўносілі свае адметныя асаблівасці ў культуру горада, яго архітэктуру і аблічча.

## 6. Святкаванні ў Магілёве

Святкаванні агульнагарадскіх падзеяў (выбары гарадской рады 20 снежня), рэлігійных свят, сустрэчы знакамітых і важных персон праваздзіліся вельмі пышна і ўрачыста. Як агульнагарадскія святкаваліся і праваслаўныя і рыма-каталіцкія святы, на працягу іх забаранялася працаваць.

Святкаванні важнейшых рэлігійных святаў, падкрэслівае даследчык І.Марзалюк, праводзіліся вельмі пышна. Перад кожным з іх абавязкова падмяталіся вуліцы, падтрымлівалася чысціня ў дамах і гарадскіх установах. Перад тройцай звычайна для аздаблення набывалі «май», г. зн. бярозкі. Падкрэслім, што, як агульнагарадскія, святкаваліся і праваслаўныя, і рыма-каталіцкія святы, на працягу іх забаранялася працаваць.

Падчас святаў салютавалі гарматы, а па вуліцах паважна ішлі працэсіі ўсіх гарадскіх цэхаў з уласнымі харугвамі. Наперадзе лунала гарадская харугва. Яна была «... чырвоная, з крыжом нябескім [г. зн. блакітным]». Кожны з магілёўскіх цэхаў таксама меў свой адметны герб. Апісанні асобных з іх дайшлі да нас. Так, цэх краўцоў меў «... харугву, на каторой за герб крыж жолты і ножыцы кравецкіе ў белым полі», магілёўскім кавалям была нададзена «... за герб Пагоня...», цэх гарбароў меў права «за герб вобраз Панны Найсвяцейшай... мецъ», цэх рымараў, седляроў і шубнікаў ужываў «... герба Грыфа», магілёўскія ювеліры - "злотнікі" на сваёй харугве мелі «герб Льва за кратамі». Магілёўскія купцы мелі аж два герба – згодна са статутам купецкага брацтва 1636 г. ужывалі ў якасці герба выяву

Святога Хрыстафора, але ўжо ў 1654 г. купцам быў нададзены герб з выявай анёла «з вагамі і крыжом стоячага».

Асаблівай пашанай карысталася свята Св. Міколы. У дзень «святого отца Николы великого» гэтак, як і «зимнего» альбо «осеннего», існаваў звычай змацоўваць грашовыя пагадненні, лічылася, што грашовыя дамовы, падпісаныя ў гэты дзень, будуць мець большы поспех і спрыянне. Падобнае значэнне мела свята апосталаў Пятра і Паўла, прарока Ільі. Таксама святкавалі «Рождество Яна Крестителя», Святога Афанасія (у студзені), Св. Марціна (у красавіку і кастрычніку), восеньскія Дзяды – «Дмитриева Суббота» і «день Маковея» (жнівень).

Вельмі шырока святкаваліся «Крещение Господа Иисуса Христа», «Звеставанне пані Марыі», Уваход Гасподні ў Ерусалім (іншыя назвы – Вербная альбо «цветная неделя»), Вялікдзень, Радуніцу, «Вознесенье Христово», Дзень Святога Духа, Святога Спаса (жнівень), «День Пречистое» (Успенне Багародзіцы) і «Нараджэння Прэсвятой Багародзіцы», «День Святой Покровы» ці «Святого Покрова» (Дзень Покрыва Багародзіцы) і Дзень Ражства Хрыстова.

Святочна адзначалі «сёмую суботу» і «дзесятую пятніцу». Перад Ражствам, Пасхай, Пятром і Спасам адпраўлялі «запусты», за якімі ішоў пост (запусты «Піліпавы», «масляныя», «Пятровы» і «Святога Спаса»).

Вельмі пышна сустракалі знакамітых, важных персонаў. Падчас такіх сустрэчаў гараджане мусілі апранацца належным чынам. Статут купецкага брацтва абавязваў, «каб у выпадку агляду альбо сустрэчы пры ўездзе ў горад яго вялікасці караля альбо высакароднага сенатара... мы, усе купцы,.. павінны будзем выступаць конна, па-гусарскі, са сцягам і барабанам, усе без выключэння».

Уплывовым гараджанам, а таксама іх дарослым дзецям і жонкам перад самым Новым годам магістрат звычайна падносіў падарункі – «волочобное», якое складалася з дарагіх прыпраў, прадуктаў харчавання, грошаў. Шырока практыкавалася магістратам і іншае абавязковае прынашэнне – «каляда». Штогод у снежні найбольш уплывовым людзям горада рабіліся калядныя грашовыя падарункі.

Падчас вялікіх святаў ладзіліся забавы як для гарадскога патрыцыяту, гэтак і для ўсіх астатніх мяшчанаў. Так, 30 снежня 1699 г. «панове майстровые», прыйшоўшы ў ратушу «для веліків забав мескіх», нават не пайшлі дахаты абедаць, настолькі захапляючымі былі «забавы». Хуценька падсілкаваўшыся ў ратушы, яны спехам накіроўваліся даглядваць канец паказу. Гэта не было выключэннем, паколькі падобнае адбывалася і ў шэрагу іншых выпадкаў. Тэатральныя відовішчы ладзіліся не толькі ў ратушы, але і ў цэрквах.

Неафіцыйная частка святаў, як агульнагарадскіх, гэтак і цэхавых, адзначалася ўсёй цэхавай «брацяй». Гэтыя святкаванні і мелі назву «братчыны». У святкаванні маглі ўдзельнічаць «братчыкі», запрошаныя асобы і асобы, «вкупившиеся» на час свята. У кола гасцей уваходзілі як іншасаслоўныя, гэтак і іншаверцы – праваслаўнае і каталіцкае духавенства, шляхта. Удзельнікі святаў не павінны былі напівацца, разліваць мёд, сварыцца, лаяцца, уваходзіць у дом са зброяй, спрачацца з-за месца, стараста (цэхмістр) мусіў даваць месцы «па стану».

Усе спрэчкі і сваркі, узнікшыя падчас свята, вырашаліся «браццямі» і старастай, і не падлягалі аніякаму іншаму суду – ні духоўнаму, ні свецкаму.

У час сярэднявечча у нашым горадзе існавалі навучальныя ўстановы, якія давалі высокі ўзровень ведаў. Гэта ў першую чаргу праваслаўныя брацкія школы і з 18 ст. езуіцкі калегіум. Сярод іншых дысцыплін вывучалі стараславянскую, старабеларускую, грэчаскую, лацінскую, польскую мовы. Дзякуючы атрыманым ведам асобныя жыхары Магілёва атрымлівалі вышэйшую адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах. Сярод іх Ф.Іеўлевіч, Ігнаці Іеўлевіч, Максім Вашчанка і інш.

## Лекцыя 4. Гісторыя і традыцыі харчавання

1. Асновы харчавання магілёўцаў.
2. Кулінарныя традыцыі.
3. Гатункі напояў.
4. Магілёўскае піва.

### 1. Асновы харчавання магілёўцаў

Вялікую ролю ў жыцці чалавека адыгрываюць лёсавызначальныя падзеі не толькі з асабістага жыцця, але і агульначалавечага, агульнадзяржаўнага і рэгіянальнага. Яны прываблiваюць даследчыка, цікавяць кожнага. Вельмі часта па-за ўвагаю застаюцца побытавыя моманты з нашага жыцця. Варта больш падрабязна прыпыніцца на гісторыі і традыцыях харчавання. Бо цікава даведацца, што елі і пілі магілёўцы. Даследавалі гэтае пытанне Клімуць Ж.Я., Марзалюк І.А., Пушкін І.А., Чапялінская Ж.І. і інш. За аснову возмем матэрыялы Ж.Клімуць і Ж.Чапялінскай.

Кожны народ мае сваю гістарычна вызначаную кухню, якая характарызуецца пэўным спосабам іх прыгатаваня і ўжывання, смакавымі якасцямі, сістэмай харчавання, этнічнымі і сімволіка-абрадавымі функцыямі. Ежа – гэта не толькі натуральная патрэба здаровага арганізма, ежа – гэта культурная з’ява, якая адлюстроўвае духоўныя традыцыі, гаспадарча-бытавы уклад, народныя веды, мараль, этыкет, звычаі і абрады, мясцовую экалогію, стан грамадства.

Весці гаворку пра кухню магілёўцаў немагчыма без уліку агульных традыцый, якія панавалі ў тую ці іншую эпоху і нацыянальных асаблівасцей насельніцтва. Напрыклад, цяжка ўявіць, але факт, што ў Магілёве сярод іншага вырошчвалі абрыкосы, кавуны, дыні, у той жа час вішні з´яўляліся дэлікатэсам.

Нацыянальны характар ежы і яе якасныя ўласцівасці вызначаюцца не толькі наяўнасцю тых ці іншых прадуктаў у данай мясцовасці, але і кулінарнымі традыцыямі, схільнасцю таго ці іншага народа да пэўных прадуктаў і страў, бытавымі звычаямі, духоўна-рэлігійнымі ўяўленнямі, вераваннямі, абярэгамі.

Спіс страў, якія мы знаходзім на традыцыйным стале, быў багатым і разнастайным. Заможныя людзі, у прыватнасці ў асяродку гараджанаў, і шляхта складалі сабе харчовы рацыён, спіс страў на цэлы год наперад, распісваючы яго па святах і буднях, па перыядам мясаедаў і пастоў, з улікам сваіх гурманскіх схільнасцей, асабістых густаў і запатрабаванняў.

Па сваіх характарыстыках, як адзначае Ж.Чапялінская, ежу можна падзяліць на раслінную і нераслінную (мясную), постную і скаромную. Да постнай адносіліся ўсе стравы раслiннага паходжання, а таксама рыба i рыбныя прадукты. Асноўную ролю ў харчаванні адыгрывалі раслінныя прадукты. Аднак іх суадносіны з нераслiннай ежай ("скаромінай") не паддаюцца дакладнаму вызначэнню, бо большасць вядомых страў уключала кампаненты як раслiннага, так і жывёльнага паходжання. Зыходзячы з гытых акалічнасцей усю ежу мэтазгодна падзяліць на: паўсядзенную; святочную; абрадавую.

Да апошняй адносяцца стравы і кулінарыя вырабы, якія суправаджалі тыя ці іншыя абрадавыя святы і ў адпаведнасці з устаноўленым звычаем былі неабходным атрыбутам абрадавых дзействаў, – хлеб, бліны, пячэнне, кашы, яйкі, яешня, мяса, мёд, віно.

У постныя дні з рацыёнаў харчавання выключаліся тлустыя і мясныя прадукты, смятана, малако. Негледзячы на працяглыя перыяды пастоў, апошнія тым не менш вытрымліваліся веруючымі людзьмі і мелі пэўнае выхаваўчае значэнне.

Луста шэрага хлеба – гэта цудоўнейшая вынаходка чалавецтва. Тут увасобіліся жыццёвы вопыт і мудрасць многіх народаў і шматлікіх пакаленняў.

Павага, з якой ставіліся са старажытных часоў да хлеба на Беларусі, тлумачыцца тым, што ён быў асноўным прадуктам харчавання як сельскага, гэтак і значнай часткі гарадскога насельніцтва. Неўраджай прыводзіў да массавага голаду, за якім былі хваробы і смерць. Хлеб увасабляў заможнасць, дастатак, працавітасць і вызначаў адпаведны статус і аўтарытэт сям'і.

У некаторых месцах Беларусі яшчэ ў 19 стагоддзі захоўваліся старажытныя светаўяўленні, калі ўсе стравы, якія спажываліся з хлебам (боршч, капуста, супы, малако і інш.), расцэньваліся не як асноўныя, а як дадатак ("прыварак") да хлеба. Хлеб вызначаў не толькі матэрыяльны дастатак, але і звычаёвыя, маральна-прававыя адносіны, ён пранізваў духоўнае жыццё хлебароба, напаўняў яго рэальным сэнсам. Хлеб быў неабходным атрыбутам шматлікіх звычаяў і абрадаў. Хлебам-соллю сустракалі дарагіх гасцей, маладых у час вяселля. Збожжам абсыпалі шлях маладым. Хлеб і збожжа выкарыстоўвалі пры агледзінах нівы (провідкі), адкрыцці першай баразны (заворванне), зажынках, дажынках, будаўніцтве дома (закладзіны) і інш. У якасці абярэга і рытуальнага (ахвяруючага) матэрыялу хлеб вядомы ў многіх народаў.

Аснову харчавання складаў жытні (чорны) хлеб. Ен меў мноства гатункаў, што было звязана з сортам і якасцю збожжа, яго памолам, наяўнасцю дадатковых кампанентаў (дамешкаў, прыправы) тэхналогіяй закваскі цеста і спосабам выпякання. Хлеб выпякалі ў хатніх печах на чыста вымеценым подзе. Часам пад боханы сцялілі капусны, дубовы, кляновы ліст, а таксама аір. Прыгатаванне хлеба ў традыцыйных уяўленнях лічылася свяшчэнным дзействам, з якім было звязана мноства звычайных правіл, абрадавых норм, павер'яў, абярэгаў.

Ж.Чапялінская падкрэслівае, што перш чым мясіць цеста (расчыніць хлеб), жанчына павінна была чыста памыцца і перахрысціцца, прызваўшы ў сведкі бога, каб хлеб удаўся і добра падышоў. Не раілася расчыняць хлеб у кепскім настроі, бо гэта, паводле павер'яў, уплывала на яго якасць ("цеста будзе вадзяное і хлеб у

печы расплывецца”). Пры пасадцы хлеба непажадана было каму-небудзь знаходзіцца на печы. Калі хлеб выпякаўся, не раілася ў гэты час гучна размаўляць, спрачаца, прымаць у доме выпадковых людзей (“хлеб можа патрэскацца”). З такой жа сакральнай дэлікатнасцю і пашанай адносіліся і да начыння, якім карысталіся для прыгатавання хлеба, асабліва дзяжы. Апошнюю трымалі ў пэўным месцы на падсцілцы (падкладзеным пад яе ручніку, кажуху ці саломцы), заўсёды накрыўшы зверху. Яе не дазвалялі пазычаць у другі дом: па павер’ю, яна магла за гэта пакрыўдзіцца і перастаць даваць добры хлеб.

Хлеб пяклі адзін або два разы ў тыдзень. Звычайна за адзін раз выпякалі ад пяці да васьмі боханаў вагою 10-15 фунтаў. Пасля таго як печ выпалілася, у яе садзілі (з дапамогай драўлянай лапаты) некалькі вялікіх боханаў, адзін малы (бонда), адзін паскрэбыш (бондачка), а часам яшчэ некалькі маленькіх булачак у форме птушак (“гусачка”) для дзяцей.

Хлеб быў галоўным харчам простага люду таго часу. Найбольш распаўсюджана была выпечка хлеба з жытняй мукі. Жытні хлеб быў таннай і “дэмакратычнай” ежай. Яго спажываў і жабрак, і збяднелы месціч, і чалавек з сярэднімі даходамі. Жабракі, нават, рабілі своеасаблівы “бізнес”, перапякаючы нажабраваны хлеб і гандлюючы ім на рынку. Заможныя гаражане маглі сабе дазволіць хлеб з пшанічнай мукі. У асаблівай пашане былі пірагі, абаранкі, аладкі. Шырокараспаўсюджанымі стравамі былі кашы з аўсяных, грэцкіх круп.

Ад старажытных часоў мяса – неад’емны элемент багатага стала. Мясныя прадукты заўсёды прысутнічаюць у выдатках магістрата. Ужывалася “мяса ялавіча”, “мяса кабанова”, куры, каплуны, вэнджаныя кумпякі. Вельмі папулярнымі мяснымі прадуктамі былі каўбасы і сала. Сяляне ўжывалі свежае мяса толькі падчас забою жывёлы. На працягу ж года у ежу ішла саланіна (пераважна свіная). Мясныя каўбасы, у прыгатыванні якіх беларускія жанчыны былі вялікія ўмельцы, на сялянскім стале з’яуляліся толькі ў калядныя і вялікодныя святы. Мяса хатняй птушкі рэдка ўжывалася ў ежу сялянамі.

Істотную ролю ў харчаванні сельскага насельніцтва іграла рыба, на якую былі багатыя рэкі і азёры Беларусі. Рыбу ужывалі ў ежу ў свежым, вяленым і сушаным выглядзе. Са свежай рыбы гатавалі юшку, рыбны халадзец.

Наогул рыба была шырока распаўсюджаным прадуктам харчаваня сярод розных сацыяльных груп гарадскога насельніцтва.

Спажывалі разнастайныя прадукты з гародніны і садавіны – агуркі, салату, капусту, цыбулю, рэдзьку, гарох, рэпу, яблыкі, слівы, грушы, маліну, вішні. Шырока ўжываліся ў ежу гарох, бабы, чачавіца. З іх гатавалі поліўкі, кашы, кісялі. Вырошчвалі розныя расліны, якія выкарыстоўвалі ў якасці прыправаў (мята, пятрушка, кмін, кроп, хрэн, мак). Прыгатаваным з маку “макавым малаком” паўсюдна прыпраўлялі стравы ў час пастоў.

З прадуктаў раслiннага паходжання гатавалі не толькі штодзённую, святочную і абрадавую ежу, але і напіткі, з якіх больш распаўсюджанымі былі хлебны квас і фруктовыя “ўзвары”. Трэба адзначыць, што ніводнае цэхавае або магістрацкае пасяджэнне не абыходзілася без такіх напояў, як піва і мёд. Яны былі даступны практычна ўсім беларусам. На сялянскім стале часта можна было убачыць ежу, прыгатаваную з грыбоў.

**2. Кулінарныя традыцыі**

Важным аспектам нацыянальнай культуры, заўважае Ж.Клімуць, з'яўляюцца кулінарныя традыцыі. Нацыянальная кухня фарміруецца пад уздзеяннем традыцый харчавання розных слаёў грамадства, на якія ў сваю чаргу ўплываюць умовы пражывання (кліматычныя і геаграфічныя), ступень адкрытасці грамадства, наяўнасць цесных знешнепалітычных і гандлёвых сувязей з блізкімі і далёкімі суседзямі, асаблівасці побыту і традыцый.

Магілёўская кухня фарміравалася ва ўмовах цесных гандлёвых і культурных сувязей беларускага народа з суседзямі. Дзякуючы існаванню ў межах адной дзяржавы, нацыянальныя кухні украінцаў, палякаў, беларусаў і літоўцаў маюць шмат агульнага. У той жа час для кожнай з іх характэрны свае адметнасці, якія замацаваліся ў кулінарыі яшчэ ў 18 стагоддзі.

Асаблівасцю беларускай нацыянальнай кулінарыі з'яўляецца падзел тэхналагічных прыёмаў гатавання на тушэнне і запяканне. Прычым прадукты расліннага паходжання пераважна тушыліся ці варыліся, а мясныя смажыліся (запякаліся). Другая адметнасць нацыянальнай кухні – выкарыстанне цэлых, не здробленых, кавалкаў мяса. Усе запечаныя стравы з мяса ці птушкі з'яўляліся святочнымі.

Згодна даследаванняў Ж.Клімуць, вылучаюць мясцовую кухню з шэрагу іншых, таксама прываркі і закалоты, закрасы і прысмакі. Закраса – заправа з нутранога свінога тлушчу (здору), які таўклі (расціралі) з часнаком, соллю і прыправамі. Для яе прыгатавання існаваў спецыяльны посуд – макацёр. Сваёй формай нагадвае гаршчок з пукатымі бакамі і прамым горлам без венчыка. На Магілёўшчыне закрасу рабілі са свежага нутранога тлушчу і захоўвалі працяглы час у абалонцы, знятай са здору. Дабаўлялі закрасу ў капусту, боршч, шчаўе.

Прысмакамі называлі прадукты, якія змянялі смак стравы (напрыклад, грыбы). Закалоты – разведзеная вадой мука, якой згушчвалі рэдкія стравы.

Шэраг страў беларускай кухні мае старажытнае паходжанне, калі асновай харчавання з'яўляліся розныя вырабы з жытнёвай мукі, і ў першую чаргу хлеб. У гарадах на продаж выпякалі белы хлеб, баранкі і пірагі. Пірог з начынкай называўся крэпаны. Звычайна ў якасці начыння выкарыстоўвалі мак, а часам запякалі яйкі.

Спажывалі магілёўцы супы са шчаўя, крапівы, грыбоў, гарбузовую кашу і аўсяны кісель. Добра ім былі вядомы - свежыя агуркі з мёдам, печаныя яблыкі і грэцкія бліны.

Пяклі ў горадзе бліны. Цеста для іх таксама рабілі на заквасцы, як і на хлеб. Муку выкарыстоўвалі жытнюю, ячную або грэцкую, а яшчэ і аўсяную. Пры выпячцы скварадУ (патэльню) змазвалі куском сала, таму бліны атрымліваліся сухімі. На стол іх падавалі са здорам, тварагом, смятанай, малаком або верашчакай (мачанкай).

Даследчык Ж.Клімуць адзначае якія стравы з'явіліся ў нас на працягу 19-20 стст. У другой палове 19 ст. з польскай кухні да нас прыйшлі танюсенькія пшанічныя бліны – налісні. Спачатку начынкай для іх служыў тварог. Пазней у налісні загортвалі цёрты мак, мятыя ягады, мёд, скваркі.

Захаваўся і старажытны спосаб прыгатавання мучных вырабаў з уторнага цеста (заквашанага, але не падыйшоўшага). Гэта добра вядомыя аладкі, а таксама скавароднік ці перапечка. Назва апошняга залежыла ад спосабу выпякання: на патэльні (скварадзе), на агні, або на чэрані печані, на вуголлі.

У ходзе гістарычнага развіцця некаторыя рэцэпты і тэхналогіі прыгатавання відазмяніліся. З гэтай нагоды можна назваць такую агульную для ўсіх страву, як калдуны. Першапачаткова яны ўяўлялі сабой галушкі з начынкай, часцей за ўсё ў якасці якой выкарыстоўвалі грыбы або кавалачкі сала. Цеста на калдуны гатавалі з жытняй ці грэцкай мукі. Вырабы варылі, адцэжвалі і запраўлялі смятанай або тлушчам.

У другой палове 19 ст. галушкі з начынкай атрымалі назву вушкі. Акрамя сала, загортвалі ў цеста сыр, цыбулю, мак, грыбы. Падавалі ў выглядзе вадкай стравы ці запечаныя.

З сярэдзіны 19 ст. калдуны сталі рабіць з дранай бульбы. Гэта страва вядома пад назвай клёцкі. Іх гатавалі без начынкі. Сустракаецца ў двух варыянтах: вадкая забеленая страва або адвараныя і запраўленыя шкваркамі з цыбуляй. У 20 ст. пад назвай калдуны распаўсюдзілася смажаная страва з дранай бульбы. Уяўляе сабой аладкі, начыненыя мясным фаршам.

Бульба распаўсюдзілася на тэрыторыі ВКЛ на пачатку 18 ст., але толькі ў канцы стагоддзя сталі складвацца адметныя бульбяныя стравы нацыянальнай кухні. Першапачаткова бульбу варылі ў лупінах і спажывалі з кіслым малаком. Звычай выкарыстоўваць для прыгатавання драную бульбу запазычаны з Нямеччыны. Там добра вядомы бліны з дранай бульбы, якія на Беларусі называюцца дранікі.

Адметнай стравай беларускай нацыянальнай кухні з’яўляецца бульбяная бабка, прыгатаваная ў латцы. Латка ўяўляе сабой нешта сярэдняе паміж гаршком і міскай: мае круглыя бакі, якія звужаюцца да нізу, і ўтвараюць своеасаблівую ножку. Першапачаткова ў ёй гатавалі кулеш і кулагу. Для бабкі драную бульбу змешвалі з тлушчам і ставілі таміцца ў печ.

Аналогіі з нямецкай кухняй мае і традыцыя прыгатавання каўбас і іншых страў са здробленага мяса (каўбух, вантрабянка).

Адной з самых улюбёных нашых традыцыйных страваў была, ёсць, дый, бадай, і застанецца каўбаса. Радавод гэтага слова даволі цьмяны. Відаць, што гэта праславянскі тэрмін. У беларусаў ён мае два вымаўленні – асноўнае – «каўбаса» і дыялектнае – «кілбаса» (ад польскага слова).

Каўбаса – найстаражытнейшы прысмак. Умелі яе вырабляць і вельмі любілі старажытныя грэкі і рымляне. Нашыя продкі таксама ад іх у гэтым не адставалі. Ад найдаўнейшых часоў, частуючы гасцей, ставілі на пачэснае месца каўбасу. Ад яе пачыналіся сняданкі і абеды, без яе не абыходзіліся вялікія святы.

Самая простая каўбаса ўяўляла сабой свіную кішку, набітую сечаным ці рэзаным мясам, прыпраўленым соллю, перцам, а часта і часнаком. Набіванне гэтай кішкі пальцам дало гэтаму тыпу каўбасы свойскую назву «пальцам пханая» ці «пальцоўка», якая дакладна перадае ўсю тэхналогію яе вырабу. Рэцэпт вырабу вельмі просты і агульнавядомы. Яе робяць так: пасля таго як закалолі свінню, мяса павінна астыць, таму яго выносяць на мароз. Робіцца гэта для таго, каб яно

потым добра рэзалася на дробныя кубікі. Важна, каб мяса было менавіта астылае, а не замарожанае, бо ў апошнім выпадку значна зніжаецца якасць прадукту – набітыя марожанымі кубікамі кішкі хутка пачынаюць цвісці і не захоўваюцца доўга. Мяса на каўбасы абрэзваецца з рэбраў і хрыбта, а калі хочуць атрымаць болей прадукту – то рэжуць яшчэ і лапатку. Кішкі вываварочваюць, счышчаюць з іх слізь да празрыстасці, а затым кладуць у падсоленую ваду. Наступны крок – падрыхтоўка спецыяў: таўкуць муштарду, каляндру, перац, соль, часнок. Апошні рэжуць вельмі дробна – 5 зубкоў на 1 кг мяса, астатняе дадаюць паводле густу. Таўкуць спецыі ў адмысловай ступцы, а пасля дадаюць у мяса. Усё перамешваюць і пакідаюць для прапіткі на 3 гадзіны. Потым падрыхтаваным фаршам набіваюць кішкі. Раней кішку нацягвалі на шкляную трубку ад газавай лямпы і пальцам пхалі ў яе фарш. Сёння выкарыстоўваюць мясарубку. Спачатку робяць маленькую каўбаску. Яе смажаць і спрабуюць – калі нейкіх спецыяў нехапіла, то іх можна яшчэ дадаць у мяса паводле густу. Пасля каўбасы вяжуць кольцамі вызначаных памераў і вешаюць на «вожаг» – круглы кій, які не рабіў каўбасам перагібаў. Пакідаюць так яе на 2 дні для прасушкі, а затым паварочваюць, каб каўбасы прасохлі зверху і знізу. Пасля гэтага «пальцоўка» гатовая. Некаторыя яшчэ вэндзяць яе ў коміне, каб прыдаць прадукту адмысловы смак.

Цікава, што такія вырабы як біткі і катлеты, распаўсюджаныя ва ўкраінскай нацыянальнай кухні, з’явіліся на Беларусі, адпаведна і ў Магілёве, толькі ў 20 ст. Як ужо адзначалася, перавага аддавалася запечаным вялікім кускам мяса або цэлай тушцы парасяці ці птушкі. Асаблівасцю мясных страў беларускай нацыянальнай кухні з’яўляецца пераважнае ўжыванне свініны і значна меншае ялавічыны.

Ж.Клімуць прыводзіць гісторыю, распаўсюджанай у беларускай і літоўскай кухнях верашчакі. На пачатку 18 ст. пры каралеўскім двары служыў кухмістр па прозвішчу Верашчака. Аднойчы ён падаў да стала каўбасу пад вострым соусам, якую трэба было есці лыжкамі. Страва атрымала імя аўтара і з каралеўскіх апартаментаў распаўсюдзілася ў магнацкія пакоі і шляхецкія сядзібы рознага дастатку. За час свайго падарожжа верашчака змяніла соус на добра вядому закалотку – рэдкую страву з мукі. Разам з каўбасой смажаць свіныя рабрынкі і кавалачкі сала і запраўляюць падкалочанай мучной запраўкай. Вядома таксама пад назвай мачанка і падаецца разам з блінамі.

На стале магілёўскіх сем’яў былі зацірка і разнастайныя кашы. Найбольш распаўсюджанымі былі грэчка, проса, ячневая і аўсяная крупа. Рысавая крупа з’явілася на землях ВКЛ у 16 ст., але большую папулярнасць набыла на Украіне. Спачатку рыс называлі “сарачынскае проса”. Гэта скажоны выраз “сарацынскае проса”, што азначала турэцкае альбо арабскае.

Была вядома рэдкая крупяная страва – крупнік, якую гатавалі як з дабаўкамі (прысмакамі), так і без іх. У ролі прысмакаў часцей за ўсё выкарыстоўвалі грыбы або мяса, рэдка – рачную рыбу. У канцы 19 ст. з’явіўся крупнік забелены – малочны суп з круп. Крупы разам з фасоляю тамілі ў печы, а пры падачы на стол залівалі малаком. На Магілёўшчыне такую страву называюць груца.

Самай старажытнай гароднінай, безумоўна, з’яўляюцца буракі. Ужывалі іх у свежым і квашаным выглядзе. Страва са свежых буракоў насіла аднаіменную назву, а з кіслых – боршч. Часам яго яшчэ называлі боршч літоўскі. Лічылася, што боршч лечыць ад гарачкі і наталяе смагу пасля перапою.

У 18 ст. шляхецкая кухня пераняла моду на макароны і на Беларусі, у тым ліку Магілёве, распаўсюдзілася лапша. Спажывалі яе ў выглядзе рэдкай стравы – мясной або малочнай. У другой палове 19 ст. на Магілёўшчыне з’явілася разнавіднасць лапшы – локшыны. Для іх прыгатавання спачатку выпякалі тонкія бліны з крахмальнага цеста, пасля рэзалі ў выглядзе лапшы. Выраб залівалі малаком і тамілі ў печы. Такая страва лічылася ласункам.

Прататыпам макаронаў у нас можна лічыць лазанкі. Для іх прыгатавання цеста з жытнёвай або грэцкай мукі рэзалі на кавалкі, адварвалі і залівалі шкваркамі з цыбуляй, тоўчаным семем, цёртым макам. На Магілёўшчыне падобная страва называлася ламанцы. Іх выпякалі ў выглядзе невялікіх коржыкаў.

Самым старажытным салодкім печывам можна лічыць пернікі. Яны вылучаюцца з іншых печаных страў сумессю разнастайных вострых прыпраў. Пернікі выраблялі не толькі ў Цэнтральнай Еўропе, але і ў Заходней, а таксама на Прыбалтыйскіх землях. Адрозніваюцца гэтыя вырабы наборам спецый. Так, латышы і эстонцы клалі больш перцу, палякі – кардамону і гваздзікі, рускія – імбіру, цынамону і бадзяну. На Беларусі самымі спажываемымі прыправамі для пернікаў былі цынамон, гваздзіка, імбір, а таксама цэдра цытрона і апельсіна.

У 18 ст. з’явіліся мельшапайсы, вядомыя цяпер пад назвай яблычнай бабкі. Гэта салодкія пірагі з цеста, крупаў, хлеба, сухароў, у якія дадавалі яблыкі, грушы, слівы, іншую садавіну і гародніну. Іх радзімай лічыцца Саксонія.

У канцы 18 ст. узрос уплыў французскай кухні, ад якой былі запазычаны “цесты, фаршыраваныя мясам і гароднінай”. Пазней гэтыя вырабы сталі называць паштэцікі. Рабілі іх са слаёнага цеста ў выглядзе маленькіх пірагоў – акруглых ці падоўжаных, у форме ромбаў, рулетаў, трохкутнікаў.

Такім чынам, можна сказаць, што магілёўцы спажывалі вельмі разнастайныя стравы. Прычым ужывалася ежа нацыянальнай кухні, а з другога боку, запазычваліся стравы і тэхналагічныя прыёмы прыгатавання прадуктаў іншых народаў. Але гэта не быў працэс простага капіравання. Многія рэцэпты відазмяняліся згодна нацыянальным традыцыям харчавання, ўклада жыцця і схільнасцей магілёўскіх кулінараў. Асартымент страў сведчыць аб іх разнастайнасці і багатых традыцыях народнай кухні. Магілёўскія гаспадыні, для якіх кулінарнае майстэрства было справай прэстыжу не толькі ў сям’і, але і сельскай грамадзе, умелі шляхам розных тэхналагічных прыёмаў і камбінацый ператвараць простыя прадукты харчавання ў далікатэсныя стравы; характар страў і сістэма харчавання гарманічна стасаваліся з бытавой сітуацыяй, са святочным ці будзёным настроем, з сімволікай каляндарных свят, утвараючы выпрабаваны вякамі аддзіны рытм гаспадарчага і духоўнага жыцця.

### 3. Гатункі напояў

З напояў у Магілёве шырока ўжывалі сбітні, кісялі, квас, а таксама алкагольныя - піва, мёд, гарэлку: простую і „аквавітаўку“. “Аквавітаўка” (у

перакладзе з латыні – “вада жыцця”) – гэта гарэлка, якую настойвалі на анісе і яшчэ раз перагнаная праз апарат. Пілі магілёўцы звычайна пры правядзенні прац і на святах. Да нашага часу гісторыя захавала шэраг рэцэптаў алкагольных напояў першай паловы 19 ст., якія магілёўцы гатавалі для хатняга ўжытку.

Гарэлка падзялялася на “светлую, празрыстую” і на “гарэлкі цёмнага колеру”. Першая больш ці менш нам вядома. Другую рыхтавалі наступным чынам: бралі тройчы перагнаны спірт (не болей і не менш), меншай часткай яго, разведзенай напалову з мягкай (кіпячонай) вадою, залівалі прыправы, затым ставілі ў цёмным месцы на час болей дзесяці дзён, у залежнасці ад прыпраў. Далей адцэжвалі і дабаўлялі спірт у наступнай прапорцыі – на кожныя 2,8 л спірта 2,1 л вады.

Як бы ўпрыгожылі меню магілёўскіх кавярняў і рэстаранаў гатункі гарэлак, вырабленых па рэцэптах 19 ст. Вось напрыклад некаторыя з іх:

✓ міндалеўка – на 8,4 л спірту, двойчы перагнанага, бяруць 2,8 л мяккай вады, 560 гр горкага міндалю – старога, прагорклага, ачышчанага і патоўчанага, 23,5 гр карыцы, 12 гр гваздзікі. Усё дыстылююць у перагонным кубе, потым дадаюць на кожныя 2,8 л міндальнага спірту па 1,4 л вады і 600-700 гр цукру і запраўляюць гарэлку;

✓ крываўнікавая ці блакітная – калі крываўнік цвіце, збіраюць яго кветкі, запаўняюць імі больш паловы куба і заліваюць вадой да першага загібу. Пераганяюць звычайным спосабам. У лейку, праз якую вада будзе сцякаць у бутэльку, кладуць кавалак чыстай ваты. На ёй асядзе нешта падобнае на блакітны алей. Вадкасць гэту потым выціскаюць у спірт, дзе вымочваюць нават вату, пакуль з яе не выдзеліцца ўвесь масляны экстракт, што надае гарэлцы цудоўны блакітны колер, а таксама водар, прыемны і карысны, асабліва для тых, хто хварэе на гемарой. Пасля змешвання масла са спіртам нельга сыпаць шмат цукру, бо тады праз колькі месяцаў гарэлка з цудоўна блакітнай ператворыцца ў непрыгожую зялёную. У самым чыстым спірце водарны алей цэлы год захоўвае свой колер і толькі тады пачне яго зменьваць, калі ў наступным годзе зацвіце крываўнік. Таму не варта пераганяць яго больш, чым можна выкарыстаць на працягу года;

✓ мелісаўка – на кожныя 2,8 л спірту бяруць вады 0,7 л і свежай лімоннай мяты 110,7 гр, а таксама скуркі, зрэзанай з лупіны лімона, адзін 11,7 гр Вымочваюць тры дні гэтыя прыправы ў спірце, пераганяюць і дабаўляюць у гарэлку, як гаварылася вышэй;

✓ кававая – 2 кг кавы пражанай, як звычайна для варкі, змалоць, заліць 8,4 л двойчы перагнанага спірту і 2,8 л вады. Няхай тыдзень у цяпле настоіцца. Пасля спірт належыць перагнаць і заправіць гарэлку;

✓ апельсінаўка – дабаўляюць у гарэлку апельсінавы алей ці пераганяюць ваду альбо спірт, добра настоены на патоўчаных галках з апельсінавых лупін, якіх бяруць 180 гр на 2,8 л спірту і дабаўляюць яшчэ 180 гр апельсінавых тонкіх скурак, зрэзаных з лупін (на іх не павінна быць белай мякаці). Хто хоча атрымаць такую гарэлку цёмнага колеру, няхай не пераганяе яе праз куб, а пасля таго, як яна настоіцца два тыдні (абавязкова часта мяшаць і боўтаць), працэдзіць праз суконны мяшок і заправіць цукрам. Толькі тады ўжо неабходна браць спірт,

тройчы перагнаны. Магчыма таксама спіртам заліць апельсінавыя лупіны на некалькі дзён, каб нацягнулі ў цяпле, і запраўляць гарэлку, не пераганяючы яе ў кубе. Яна набудзе прыгожы жаўтаваты колер і моцны водар;

✓ малінаўка – чыстыя свежыя маліны ўсыпаюць у бутэльку, заліваюць тройчы перагнаным спіртам так, каб ён толькі пакрыў ягады, і ставяць на сонцы. Праз два-тры дні спірт зліваюць і дадаюць на кожныя 2,8 л яго 0,7 л вады і 0,5 кг цукру;

✓ англічанка – у 2,8 л спірту сыплюць 66 гр англійскага перцу, груба патоўчанага, некалькі тыдняў настойваюць у цяпле і пераганяюць праз куб. Абавязкова льюць кварту вады на кожныя 2,8 л спірту;

✓ кардамонаўка – гатуюць яе накшталт англічанкі. Бяруць 55 гр кардамону на 2,8 л спірту;

✓ аераўка – на 8,4 л спірту – 2,8 л вады, 130 гр сухога аеру, а калі ён свежы, дык у паўтара ці два разы больш, 6 гр карыцы, столькі ж кардамону, 11 гр апельсінавых лупін. Спосаб перагону і запраўкі глядзі вышэй;

✓ анісаўка – 2,6 л спірту, 2,1 л вады, добрая жменя анісу, 5 гр карыцы, столькі ж гваздзікі, 11 г. лімонных лупін;

✓ лімонаўка – 8,4 л спірту, 2,8 л вады, 100 гр вонкавых сухіх лімонных лупін, 15 гр карыцы – усё пераганяюць разам. Ці, абрэзаўшы верхнюю тонкую скурку са свежых лімонаў, заліваюць яе тройчы перагнаным спіртам і на некалькі месяцаў ставяць у цяпло. Пасля, не пераганяючы праз куб, запраўляюць цукрам.

Пілі магілёўцы і іншыя гатункі гарэлкі, лікёраў. Былі яны добрай якасці і не шкодзілі здароўю.

### 4. Магілёўскае піва

Без гэтага цудоўнага пітва немагчыма ўявіць гісторыю Магілёва. Як вядома, для гатавання піва неабходна прыгатаваць солад. У Магілёве гэтай справай з 1578г. займаліся не асобныя людзі, а цэлы цэх, у 1591 г. у ім працавала 17 саладоўнікаў. Але дзейнасць цэха, напэўна, не задавальняла цалкам патрэбы горада, таму паводле граматы караля Жыгімонта III 1604 г. дазвалялася ўсялякаму магілёўцу гатаваць піва і іншае пітво, але толькі для ўласнага спажывання, а не на продаж.

Як сведчыць інвентар Магілёўскага замка за 1604 г., кіраўніцтва Магілёўскага староства, якое месцілася тут, таксама не магло абысціся без піва. Сярод замкавай маёмасці, акрамя пякарні і карчмы згадваецца і мураваны бровар. Бровары былі і ў гараджан. Так, у 1638 г. магілёўскі бурмістр Цімафей Гапановіч ахвяраваў Богаяўленскаму брацкаму манастыру сваю маёмасць – 2 зямельныя пляцы, студню, а таксама бровар з лісцем, катлом піўным і ўсім начыннем для варэння піва.

Амаль ніводнае пасяджэнне магістрата, брацтваў і цэхаў не абыходзілася без гэтага пітва. Кожная старонка гарадскіх прыходна-расходных кніг сведчыць пра колькасць піва, назвы гатункаў і яго кошт. Сустракаюцца нават цэлыя рэестры, якія складзены ў Магілёўскім магістраце, пра прыгатаванне і продаж піва. У 17–18 стст., асаблівым попытам карысталіся гатункі піва «Тутэйшае» («Магілёўскае»), «Лупалаўскае» і «Простае», а таксама «Аршанскае», «Белае», «Кралеўскае», «Гданьскае».

Шмат піва было зварана ў час Паўночнай вайны, прычым, як адзначана ў «Запісках ігумена Арэста», піва розных гатункаў як для рускіх войскаў і іх камандзіраў, так і для шведскіх. Даследчык З.Яцкевіч у сваіх публікацыях прыводзіць некалькі красамоўных прыкладаў. 10.12.1708 г. Пётр I знаходзіўся ў Копысі і, як меркаваў магістрат, мог завітаць у Магілёў. Таму было прыгатавана шмат віна, мёду, піва і розных прадуктаў. Але цар не даехаў да Магілёва, і членам магістрата прыйшлося ўсе прыгатаванае выпіць і з’есці, каб не сапсавалася і дарма не прапала. Вядомы і другі цікавы факт. Пасля бітвы пад Галоўчынам 3.7.1708 г. галоўнае шведскае войска ўвайшло ў горад і з кожнай яго часткі (іх было 15) запатрабавала па 12500 фунтаў хлеба 1960 гарнцаў піва. У сістэме мер Вялікага княства Літоўскага вядомы малы, ці просты гарнец, які змяшчаў 2,8 л, і вялікі, ці цэхавы, – 5,6 л. Невядома, якімі гарнцамі запатрабавалі шведы, але калі і малымі, то гэта больш за 2500 л з кожнай часткі горада. Вядома, што з галадухі нельга злоўжываць ежай і пітвом, аднак шведы, відаць, пра ўсё забыліся, і, як піша летапісец, шмат іх тады ад пераядання памёрла.

У Магілёве, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, піва ў 17–18 ст. каштавала па 4–6 грошаў за гарнец. Толькі фірменнае, накшталт «Лавіцкага» ці «Варшаўскага», – ад 8 грошаў да 1 злотага 16 грошаў. У час Паўночнай вайны кошт піва (як і іншых прадуктаў) у Магілёве павысіўся і яно каштавала 1 злоты за гарнец.

Калі ў 1772 г. Магілёў увайшоў у склад Расійскай імперыі, рамесніцкі выраб піва пастунова стаў мануфактурным і заводскім. У 1783–84 гг. у горадзе дзейнічала 7 піваварных заводаў. Адзін з дакументаў сведчыць пра існаванне старога замкавага бровара ў вусці р. Дубравенка ў 1837 г. У 2-й палавіне 19 ст. ў Магілёве дзейнічала некалькі піваварных заводаў. Адзін з іх, які быў заснаваны ў 1862 г., і належыў вядомаму на Беларусі купцу, уладальніку піваварных заводаў, баварскаму падданаму Францу Міхайлавічу Лекерту. У 1879 г. завод размяшчаўся ў былым Маскоўскім (раней Лупалаўскім) прадмесці на вул. Шашэйнай у двухпавярховым мураваным будынку са скляпеннямі і млынамі для перамолвання соладу. У 1880 г. завод тэлефанізаваны, у канцы 19 ст. абсталяваны 2 паравымі машынамі, паравым катлом, меў водазабеспячэнне, а таксама ледавік для захоўвання піва. У 1913 г. на заводзе працавала 50 рабочых, якія выпускалі прадукцыі на 170 тыс. рублёў за год, у сярэднім каля 100 тыс. вёдзер. Найбольш вядомымі былі тры гатункі: «Бок-біра» (вышэйшы гатунак, вядро каштавала 2 руб.), «Баварскае» (2-і гатунак, 80 кап.), «Рускае» (3-і гатунак, 75 кап.). У тым жа прадмесці ў 1870 г. заснаваны яшчэ адзін піваварны завод, які ў 1910–13 гг. меў 3 паравыя рухавікі. На ім працавала каля 50 рабочых, выпускалася каля 150 тыс. вёдзер піва за год. Уладальніцай завода была Э.Яннік.

Завод Яннікаў адлюстраваны на адным са здымкаў пачатку нашага стагоддзя, што змешчаны ў экспазіцыі абласнога краязнаўчага музея. Побач знаходзяцца і фірменныя бутэлькі завода з 5 медалямі з разнастайных выставак. Зразумела, што магілёўскае піва сапраўды было лепшым, калі заслужыла гэтыя ўзнагароды. Прозвішчы ўладальнікаў адлюстраваліся і ў мясцовай тапаніміцы. У раёне сучасных праспектаў Шміта і Пушкіна побач з так званым пасёлкам Абісінія раней знаходзіўся Яннікаў луг, дзе для патрэб завода вырошчвалі хмель. Раён уздоўж праспекту Пушкіна і бліжэй да пачатку вуліцы Маўчанскага зваўся –

лекертчызна. Менавіта там па вул. Габраўскай была адчынена харчовая крама пад назвай “Леккерт”, якая ў 2006 г. змяніла профіль і стала звацца “Бабруйскмебель”.

## Лекцыя 5. Магілёў у віхуры ваенных падзей

1. Магілёў у час войнаў Расіі і Рэчы Паспалітай.
2. Магілёўскае паўстанне 1661 года.
3. Магілёў у час Паўночнай вайны. Вынікі знаходжання ў горадзе Пятра І, А.Меншыкава, Карла ХІІ.
4. Айчынная вайна 1812 года ў гісторыі Магілёва.
5. Вайсковыя адзінкі пад назвай “Магілёўскія”.

### 1. Магілёў у час войнаў Расіі і Рэчы Паспалітай

У 16-18 стст. паміж ВКЛ (беларуска-літоўскай дзяржавай), а пазней Рэччу Паспалітай і Вялікім княствам Маскоўскім (Вялікарускай дзяржавай) ішло збройнае змаганне. Неабходна ведаць, што ў эпіцэнтры гэтага змагання знаходзіліся беларускія землі, і першы ўдар маскоўскіх (рускіх) вайскоў прыходзіўся на Усходнюю Беларусь, адпаведна на горад Магілёў. Магілёўцы зведалі ад гэтых войнаў толькі гора і страты.

У 1518, 1519, 1535 гг. пад сценамі Магілёва з’яўляліся маскоўскія ратнікі, пустошачы наваколле і сеючы смерць. Праўда, падчас гэтых выправаў горад ані разу не быў узяты штурмам.

Як адзначае даследчык І.А.Марзалюк, сур’ёзнае выпрабаванне чакала магілёўцаў падчас Лівонскай вайны. 27 чэрвеня 1581 г. да Магілёва падышла вялікая групоўка маскоўскіх войскаў. Паводле пісьмовых крыніц, яе колькасць вагалася ў межах ад 30 да 45 тысяч чалавек. Маскоўскія войскі з ходу ўварваліся ў неўмацаваныя магілёўскія пасады, «...палячы ўсё на сваім шляху». Зыркім полымем гарэлі пасады за Дубравенкай, Лупалава, Падміколле... Нягледзячы на колькасную перавагу ворагаў, гарнізон Магілёўскага замка і мяшчане мужна адбівалі напады і не дапусцілі чужынцаў у Стары горад.

А да Магілёва ўжо спяшаліся на дапамогу жаўнерскія конныя роты пад кіраўніцтвам паноў Троцкага, Казаноўскага і Цемрукова. Першай на дапамогу прыйшла рота Казаноўскага. 200 добра ўзброеных вершнікаў імкліва ўдарылі па чужынцам і нападалі на ворага «цэлых сем гадзін, так што не дазволілі падыйсці да горада». У хуткім часе прыспела і рота Цемрука. У маскоўскіх воінаў склалася ўражанне, што на дапамогу абаронцам Магілёва ідуць вялікія сілы, і таму «пільнуючыся... прыбыцця вялікіх сілаў з нашага боку, пабеглі і даехаўшы да Дняпра, сталі праз яго перапраўляцца. Нашы на пераправе білі іх і гналі, прычым захапілі некалькі палонных». Так няўдала закончылася спроба захопа Магілёва. Абаронцы святкавалі перамогу ды падлічвалі свае страты. Найбольшыя страты панеслі роты, што змагаліся з ворагам у полі.

Значна лепш былі справы ў непасрэдных абаронцаў – воінаў замкавага гарнізона і гараджан. Маскоўскія войскі, «спаліўшы колькі сот дамоў, у людзях ніякай шкоды не ўчынілі,... на той час нікога ад нас не злавілі, толькі двух

застрэлілі, а вялікія страты і ўпадак у людзях сваіх ад стралянiны так у замку, як і з астрога мескага мелі».

Не здабыў славы і поспеху пад час аблогі горада маскоўскім войскам цяпер добравядомы Ермак Цімафеявіч, які з ватагаю ўдзельнічаў у штурме Магілёва. З-пад Магілёва ён накіраваўся на ўсход і ў хуткім часе пакарыў Сібір і спрычыніўся да далучэння яе да Маскоўскай дзяржавы.

У сярэдзіне 17 ст. значны ўплыў на магілёўцаў мела вайна 1648–54 гг. украінскага і беларускага народаў супраць пануючых уладаў Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам Б.Хмяльніцкага. У складзе паўстанцкіх атрадаў былі выхадцы з Магілёва. Пасля бітвы пад Корсунем 16(26).5.1648 г. Хмяльніцкі накіраваў пад Магілёў надзейных казакоў, ураджэнцаў тых месцаў. Пераапранутыя гандлярамі, жабракамі, манахамі, яны заклікалі да сумеснай барацьбы супраць магнатаў і шляхты. Летам 1648 г. рамеснікі Магілёва адкрыта заявілі, што чакаюць казакоў на дапамогу. У кастрычніку 1648 г. атрады паўстанцаў дзейнічалі каля Магілёва рабуючы маёмасць заможных і шляхты, не шкадуючы нават праваслаўныя святыні.

У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–67 гг. прыхільнік рускай арыентацыі магілёўскі шляхціц К.Ю.Паклонскі з групай аднадумцаў перайшоў на бок рускага цара Аляксея Міхайлавіча, які даў яму чын палкоўніка. Паклонскі сфарміраваў 6-тысячны полк. Магілёў не быў гатовы да абароны (будаўніцтва абарончых збудаванняў расцягнулася на некалькі гадоў і не было завершана), жыхароў напалохаў лёс мсціслаўцаў (за супраціў рускія войскі пагалоўна выразалі ўсіх жыхароў Мсціслава, не пашкадаваўшы жанчын і дзяцей), да таго ж магілёўцам паабяцалі захаваць усе ранейшыя правы і вольнасці, - таму 24.8.(3.9) 1654 г. жыхары горада адчынілі браму перад рускімі войскамі і палком Паклонскага і здаліся. Спачатку гараджане хітравалі, цягнулі час, але зразумеўшы, што дапамогі не дачакацца, здалі горад. На здачу горада таксама істотна паўплывала рэлігійная барацьба папярэдніх дзесяцігоддзяў, калі магілёўскія праваслаўныя вернікі дыскрымінаваліся ўніяцкім духавенствам, у іх адбіраліся цэрквы. Таму агітацыя часткі праваслаўнага духавенства на карысць здачы не магла не выклікаць станоўчы рэзананс значнай часткі магілёўцаў.

Нягледзячы на тое, што горад здаўся, ён не пазбег рабаўніцтваў. Аб шырыні і размаху гэтых рабункаў сведчаць шматлікія чалабітныя гараджан і магілёўскай шляхты ў жніўні-верасні 1654 г. да маскоўскага цара. Казакі Паклонскага ў гэты час абрабавалі і знішчылі большасць яўрэйскага насельніцтва горада.

У лютым 1655 г. 20-тысячнае войска пад камандаваннем гетмана Януша Радзівіла падышло да Магілёва і пачало яго асаду. Горад абараняла каля 7 тысяч узброеных людзей і казакоў. У самы крытычны момант Паклонскі здрадзіў асаджаным і адчыніў браму, упусціўшы войска Радзівіла за вонкавы земляны вал. Тры месяцы насельніцтва Магілёва самааддана абараняла горад. Спробы Радзівіла ўзяць яго штурмам былі адбіты. Зразумеўшы безнадзейнасць асады і небяспеку з боку ўкраінскіх казакоў наказнога гетмана І.Залатарэнкі, Радзівіл 1(11).5.1655 г. адыйшоў ад горада. Да гэтых падзей непасрэднае дачыненне мае гісторыя цудатворнага абраза Маці Божай Магілёва-Братскай, які шануецца як каталікамі, так і праваслаўнымі.

Многія магілёўцы не пажадалі застацца ў занятым маскоўскім войскам горадзе і добраахвотна сышлі з горада разам з войскам Вялікага княства Літоўскага.

## 2. Магілёўскае паўстанне 1661 года

Шэсць гадоў горад знаходзіўся пад расійскай уладай. Нягледзячы на абяцанні цара захаваць у непарушнасці Магдэбургскае права, нормы гарадскога кіравання, вайсковая адміністрацыя груба ўмешвалася ў гарадскія справы, імкнучыся дыктаваць сваю волю магістрату. Дадайце сюды няспынныя рабаўніцтвы разгульнай запарожскай вольніцы, бясчынствы і рабункі маскоўскіх войскаў, рабаванне праваслаўных храмаў. Магілёўскую царкоўную маёмасць вывозілі ў Маскву. Аматары лёгкай спажывы абдзіралі іканастасы ў цэрквах. Магілёўская праваслаўная брацкая школа была разрабавана цалкам. Вывезлі ўсё – кнігі, друкарню і нават настаўнікаў.

Усё гэта не магло не выклікаць паўстання. Бо сярод гараджан ужо не заставалася тых, хто меў нейкія ілюзіі наконт маскоўскага самадзяржаўя. Магілёўцы толькі і чакалі зручнага моманту, каб падняцца на паўстанне. Папярэдне быў распрацаваны план, паводле якога ўсе гаспадары, у якіх жылі па хатах маскоўскія ратнікі, павінны былі абясшкодзіць іх стрэльбы – дастаць крэмені з замкоў. Паўстанне пачалося 1 лютага 1661 г., калі на рынку маскоўскія стральцы пачалі крыўдзіць і зневажаць магілёўскіх гандлярак. Загуў ратушны звон, бурмістр Язэп Левановіч, узброены «мечам катаўскім», закрычаў «Пара! Пара!..» – і паўстанне пачалося. На дапамогу мяшчанам прыйшлі вызваленыя ваеннапалонныя, і за некалькі гадзін маскоўскі гарнізон быў знішчаны амаль дарэшты, ацалела толькі некалькі чалавек.

Пасля Магілёўскага адбыліся паўстанні і ў іншых гарадах усходу Беларусі. Быў пакладзены пачатак вызваленню. За свой учынак многія магілёўцы атрымалі шляхецтва, горад ізноў зраўнялі ў правах з сталіцай – Вільняй. Магілёву быў нададзены новы герб, які зараз з’яўляецца гербам горада.

Гэта адбылося ў чэрвені 1661 г., калі кароль Рэчы Паспалітай Ян Казімір пацвердзіў права мяшчан выбіраць войта, даў гораду новы герб: на блакітным полі тры гарадскія вежы, у сярэдняй, адкрытай, браме – рыцар з узнятым мячом, уверсе – коннік («пагоня»).

Аднак ваенныя дзеянні нанеслі Магілёву значныя страты, скарацілася колькасць насельніцтва, затрымалася развіццё рамеснай вытворчасці.

## 3. Магілёў у час Паўночнай вайны. Вынікі знаходжання ў горадзе Пятра I, А. Меншыкава, Карла XII

У 1700 годзе пачалася Паўночная вайна. Шведы на чале з Карлам XII змагаліся з рускімі вайскамі Пятра I на абшарах Беларусі. У выніку гэтай вайны беларускае насельніцтва страціла кожнага трэццяга. На магілёўшчыне адбыліся значныя бітвы: каля вёскі Галоўчын (1706 г.), вёскі Лясная (1708 г.). Горад Магілёў і мяшчане пакутвалі ад пастояў рускага, саксонскага і шведскага войскаў, бо яны ўтрымліваліся за кошт гаражанаў. Магілёўцы былі безабароннымі перад шматлікімі войскамі, бо ў 1706 г. усе гарадскія гарматы былі вывезены ў Маскву.

У гэты час у Магілёве пабывалі з візітамі Пётр І, А. Меншыкаў, Карл ХІІ, Марта Скаўронская (будучая жонка Пятра І і імператрыца Кацярына І). Гараджане належным чынам, з павагаю і вялікімі выдаткамі, сустракалі венцаносных асоб. Асабліва ababraў горад А.Меншыкаў за час свайго знаходжання ў Магілёве ў 1708 г.

Чытаючы гістарычную літаратуру яшчэ нядаўніх часоў і аглядаючы экспазіцыю Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея, можна зрабіць для сябе выснову: Паўночная вайна пакінула ў Магілёве памяць пра дзве падзеі. Трактуюцца яны, яшчэ да сёння, адна як станоўчая, другая як адмоўная. Станоўчая – наведанне горада Пятром І, адмоўная – рабаванне горада войскамі Карла ХІІ. Аднак у Магілёўскіх хроніках ёсць шмат звестак пра Паўночную вайну. Яны датычаць не толькі Магілёва, але і ўсёй Беларусі.

У канцы 17 - пачатку 18 стст. Магілёў быў даволі вялікім горадам. Ён меў больш за 10000 жыхароў, каля 3000 жылых дамоў і іншых будынкаў. Яго ўпрыгожвалі 4 праваслаўныя і 2 каталіцкія кляштары, 13 цэркваў і 2 касцёлы. З гледзішча эканамічнага ён – адзін з найбуйнейшых цэнтраў рамеснай вытворчасці і гандлю, асветы і мастацтва.

У 1700 годзе распачалася Паўночная вайна. Да восені 1704 яна не закранала Беларусі, калі не браць пад увагу праход часткі шведскіх войскаў праз Гародню ў Польшчу і Саксонію.

У Вялікім княстве Літоўскім напрыканцы 17 ст. паўстала група на чале з Казмірам Сапегам, якая планавала пры дапамозе Швецыі аддзяліцца ад Польшчы, утварыўшы незалежную дзяржаву з манархічнай формай кіравання. У процівагу ёй сфармаваўся блок рэспубліканцаў (канфедэратаў).

19 лістапада 1700 года на Віленшчыне каля Алькенікаў сышліся войскі Сапегаў і канфедэратаў, у бітве сапежынцы пацярпелі паражэнне.

Рэспубліканцы таксама вырашылі выкарыстаць зручны момант і аддзяліцца ад Польшчы, запрасіўшы на княскі пасад Аўгуста ІІ, які абяцаў больш волі буйным магнатам і быў саюзнікам Пятра І у ягоным змаганні супраць Швецыі. Для Аўгуста ІІ планавалася ўтварыць спадчыннае каралеўства. Са згоды магнатаў на Беларусь і Літву ўвайшлі саксонскія войскі. Гэта справакавала шведскага караля Карла ХІІ і той рушыў свае войскі на Беларусь.

Яўная ваенная перавага Карла ХІІ падштурхнула канфедэратаў падпісаць ваенны саюз з Расеяй. Пётр І паабяцаў ім вайсковую і грашовую дапамогу. Расейскія войскі ўвайшлі на Беларусь і Літву. Гэта былі значныя сілы - каля 60000 саддат, падзеленых паміж Меншыкавым і Агільві.

Усе гэтыя сваркі паміж магнатамі прывялі да таго, што лёс Беларусі, як і Літвы, і Польшчы, стаў залежаць ад Расіі і Швецыі, пра што вельмі яскрава сведчыць напісаны ў мастацкай форме «карнавал» ці «пасквіль», размешчаны ў Магілёўскай хроніцы Трафіма Раманавіча Сурты і Юры Трубніцкага. Прычым у хроніцы добра адзначана яшчэ адна прычына уводу расейскіх войскаў на Беларусь і Літву – гэта каранацыя ў 1705 годзе С.Ляшчынскага, якога падтрымліваў Карл ХІІ, і адрачэнне Аўгуста ІІ, саюзніка Пятра І.

Падрыхтоўка на выпадак расійскай агрэсіі на Магілёўшчыне, дзе дзейнічалі паплечнікі Сапегі - Юрэвіч, Хмара, Більдзюкевіч, - пачалася загадзя. У горадзе

дадаткова ўзмацнялі абарончыя збудаванні. У запісках ігумена Арэсты знаходзім: “1704 года, когда был собран собственный городской Могилевский гарнизон и расставлен как в самом городе по местам, так и по городским дальним воротам ... по воле и повелению магисгратскому ... деланы были деревянные стены, огражденные двумя эаметами, а внутри между заметами, близко один от другого стоячие, землею насыпанные валы с воротами и башнями, от горы Гвоздовки по берегу Дебри до самого Днепра и в Днепре были побиты дубовые пали до половины Днепра против Дебренской деревянной стены, так же и с другой стороны Днепра от Луполова пали сии, такия укрепления учинены и на нижней стороне Днепра и в конце города за Папинскою частию”.

Работы яшчэ не былі скончаныя, як на Беларусь уварваліся расійскія войскі разам з прыхільнікамі скінутага караля Аўгуста II. Спачатку яны рушылі ў раён Полацка, а ў хуткім часе быў заняты і Магілёў - “Год шчасліва наступіўшы тысяча семсот шосты, – пісаў Трубніцкі, – пакінуў гораду нешчаслівую спадчыну, бо адбываліся ў гэтым годзе пераходы і пераезды розных войскаў, будаўніцтва мастоў праз Днепр, прысутнасць у горадзе знатых асоб, засыланне інспекцый з павета, зборшчыкаў падаткаў і дэпутатаў з-за чаго была ў горадзе вялікая блытаніна.”

Асабліва пакутавалі магілёўцы ад неабходнасці ўтрымліваць за свой кошт расійскае войска, якое знаходзілася ці ў горадзе, ці побач з ім. Са скрухай пісаў той жа летапісец: “...мусілі у гэты ж час даць на маскоўскае войска правіянт сенам і аўсом...

...гэтага ж году 1706. Мая чатырнаццатага дня быў заказаны гораду правіянт на дывізію генерала Баура... Магістрат адкупіўся грашыма, даўшы хабар генералу. ... мая 25 дня... за гарадскі кошт банкет генералам Валконскаму і Гагарыну...

..У гэты ж час будавала масква праз Днепр мост, на што дадавана з горада людзей і грошай. Было гэта будаўніцтва для горада вялікай мукай...”

У чэрвені рыхтуючыся да сустрэчы ў горадзе Пятра I, ізноў далі грошы генералу Бауру, каб задобрыць яго. Пётр I застаўся вельмі задаволены сустрэчай. Але ж якіх выдаткаў гэта каштавала гараджанам! Усё больш занепадаў горад.

“Год 1707. У гэтым годзе пастаянна ці ў Літву праз Магілёў, ці з Літвы за Магілёў прагульваліся маскоўскія войскі, адсюль бранне коней на падводы, даванне правіянту, кармленне праезджых драгунаў і пяхотных салдатаў, пачынка мастоў...”

У жніўні гэтага года па загадзе генерала Рапніна вывезлі з Магілёва ўсе гарматы, вайсковы рыштунак і прыпасы ў Смаленск. Горад стаў практычна безабаронным і таму абіраўся то па загадзе Шарамецева, то Рамаданоўскага, то іншых. Скаргі і пасольствы да Пятра I былі безвыніковымі.

На пачатку 1708 года Карл XII распачаў генеральны рух на усход. Расійскае войска, адступаючы, кацілася ў тым жа накірунку. Сярод яго была і кавалерыя генерал-паручніка А.Меншыкава. Вось як апісваецца ягонае з’яўленне ў горадзе ў Магілёўскай хроніцы Сурты і Трубніцкага:

“..Месяца сакавіка 14 дня Аляксандр Данілавіч Менчык, маскоўскі князь і першы царскі дарадца, з вельмі пышнай кавалькадай і помпай з многімі вайсковымі аксэсуарамі і з немалой вайсковай світай уехаў у Магілёўскі замак.

Шасціконных зкіпажаў ішло некалькі дзесяткаў, на вярблюдах і мулах праводжаны ўюкі, вакол рабы. І ён заняў сабе і свайму двару пакоі ў замку, і іншыя афіцэры сталі па багагых і сярэдніх дамах.

Тады магісграт, ведаючы і чуючы. што гэты чалавек ліхі, чэрствы масквіцін, клапоцячыся, каб быў літасцівы, пайшлі да яго ў замак з хлебам, з соллю, з прыправамі, віном і цукрам. Яму ж пры іншых паднашэннях завезлі бочку венгерскага віна і падаравалі апраўлены ў серабро крыштальны куфзрак гданьскай работы, які каштаваў тысячу злотых.

Назаўтра сакратар Менчыка, прыбыўшы ў ратушу да ўсяго магістрата, загадаў, каб тут жа і штодзённа выдаваліся з горада ўсе харчы ад самай вялікай і аж да найменшай рэчы. Таму горад, сціснуты адусюль бедамі, мусіў, што толькі было з харчоў, выдаваць і карміць князя і яго войска. І як толькі выйшаў загад, давана фураж, бочкамі французскае і венгерскае віно, мёд і піва, вараныя буракі, капуста, соль, сала бочкамі, шюдзённа жывога вала, некалькі дзесяткаў баранаў, гусі і куры даваны чародамі, хлеба сітнага і свежага па боханаў сто, гарэлку звычайную і сівуху мернікамі, мыла на хусткі штотыдзень па некалькі дзесяткаў фунтаў, рыбы марожанай вазамі, а жывой – колькі можна было дастаць. А калі 6 не давана чаго, тады адразу браны магістрат пад варту і караны. Вэнджанай рыбы давана штукамі, масла пастаянна кадушкамі, баравікі тысячамі, розныя прыправы, разынкі, міндаль дзесяткамі фунтаў, крокусы, кветкі, мускатавыя арэхі ношамі штодзённа, жалеза на каванне коней і экіпажаў пудамі, цыбулю, пятрушку і іншую гародніну ношамі, перац, імбір і іншыя вастрэйшыя прыправы фунтамі, цытрыны і алівы скрынямі, муку пшанічную, як найлепшую, меркамі, цукар шюдзённа галовамі, асятрыну цэлымі і пасечанымі асятрамі, таксама і саміну, па некалькі дзесяткаў фунтаў, выпечаныя ў горадзе пірагі штодзённа, у гэты час, нават не зважаючы на дні святых, шгодзённа давана з рынка некалькі дзесяткаў грачаных аладак. Таксама давана і харчавана з горада краўцоў. шорнікаў, якія шылі дпя двара сукні, рабілі шоры, і за работу ім з горада плочана. І юфты, і шкуры дпя абіўкі экіпажаў, калёсаў і шораў куплена ... мусіш ты са слязамі дзівіцца. як мог горад Магілёў вынесці такія кары і іншае на гэта падобнае, калі гэты пракляты чарвяк са сваім дваром стоячы ў замку ад сакавіка 14 да мая 19 тачыў і абядаў горад, і якому на харч і на паднашэнні страчана вялікая сума”.

За гэтае Меншыкаў замест удзячнасці надумаў іншае:

«Гэты князь Менчык, будучы ў Магілёве, меў ці намер і часта думаў якім бы чынам адпомсціцца гораду Магілёву за парубанне перад гэтым у Магілёве масквы і якім бы чынам, каб высекчы горад пад корань, нацкаваць на гэта цара ягамосць».

7 чэрвеня шведы распачалі чарговы наступ на Маскву. 3 ліпеня ў баі пад Галоўчынам яны разбілі расійскае войска, а 7-га ўвайшлі ў Магілёў. У запісах ігумена Арэсты занатавана, што напярэдадні ўваходу шведаў у Магілёў: “Россияне хотели выжечь город Могилёв, но таковое повеление отклонили могилёвские граждане от города значительными подарками”.

У жніўні 1708 г. Магілёў быў заняты войскамі Карла XII. За дапамогу расійскаму войску шведы начале з Карлам XII абрабавалі горад. Яны падзялілі горад на 15 кварталаў, кожны з якіх павінен быў штодзённа пастаўляць па 312

пудоў хлеба і 960 гарцаў (3 тысячы літраў) піва. Шведы рабавалі цэрквы і кляштары, вывезлі з горада больш за 9 пудоў серабра. На працягу 6-тыднёвага знаходжання захопнікі адабралі ў насельніцтва Магілёва ўсе запасы харчавання.

Карл XII, празваны магілёўцамі "сатаной", канфіскаваў усе каштоўнасці і вывез з Магілёва болей 9 пудоў золата і серабра.

Ад першай спробы расійскага войска знішчыць Магілёў адкупіліся грашыма. Але ж другі раз не атрымалася.

У жніўні 1708 г. шведскія войскі рушылі ў накірунку Мсціслава. Расійскае войска адыходзіла далей на ўсход. У той час дзейнічаў загад цара Пятра I: "... везде провиант и фураж, тако ж хлеб стоячий на поле и в гумнах и в житницах по деревням... жечь, не жалея и строения... уничтожать мосты, мельницы, а жителей со скотом переселять в леса..."

Не паспеў яшчэ шведскі кароль рушыць на Старадуб і Палтаву, як царскія пажараносцы з боку Горак падышлі пад Магілёў: "Года 1708 месяца верасня 8-га... горад Магілёў, нягледзячы на тое, што быў разрабаваны шведам, але застаючыся збудаваным у дамы, крамы, на Божыя святы абярнууся за адзін дзень праз агонь у попел і тло, бо з указу цара Пятра Аляксеевіча масква, калмыкі, татары... роўна з усходам сонца, акружылі горад з усіх бакоў... прошана літасці, але дарэмна, толькі дадзена гадзіна вольнага часу і прыстаўлена варта, пакуль пазношаны з ратушы ў склеп гарадскія кнігі. Тут калмыкі крамы адбіваюць, рабуюць, з другога канца паляць, заўважым між іншым, людзей з адзення абіраюць, грошы мацаюць, цэрквы адчыняюць, рабуюць... А калі агонь заняўся з усіх бакоў, разрабаваўшы горад дашчэнту, ад'ехалі прэч... У гэты час пабожны і акамянелы люд мусіў выплакаць апошнія слёзы, бачачы, як аздобленыя Божыя святыні, арнаментаваныя крыжы, Божыя цэрквы паціху, разгарэўшыся ў агні, валяцца на зямлю, царкоўныя купалы, адрамантаваныя з немалымі выдаткамі, гараць, а бляхі ад агнёвага імпэту лётаюць па паветры як птушкі, званы самі звоняць, гаспадарскія дамы без аніякага паратунку ў тло абарочваюцца."

Запіскі ігумена Арэсты дапаўняюць звесткі хронікі Сурты і Трубніцкіх: «...Часы, бывшие на Братской колокольне, сгорели, также икона большая Богородичная, стоящая от древнейших времён на браме Олейной, сгорела. Колокола кафедральной Спасской церкви большие, мелодичные растопились. Церковь ближне-Воскресенская до основания сгорела и колокол расопился. На церкви Николаевской красивые куполы, а внутри оной хоры и двери все, погорели... колокол большой упал на окошко и, опершись на било, раскололся."

Ад усяго горада ацалела толькі прадмесце Лупалава, бо татары і калмыкі не здолелі пераправіцца праз Днепр. Той жа Арэста сцвярджае, што калі б магілёўцы толькі паспрабавалі б супраціўляцца ці абараняцца, то іх бы ўсіх пакаралі мячом. На гэты выпадак у дзесяці вёрстах ад горада стаялі некалькі аддзелаў расійскага войска.

Як ні дзіўна, Беларусь ад расійскай навалы тады выратавала Турцыя. У 1711 годзе, 25 лютага ў Маскве ва Успенскім саборы была аб'яўлена няўдалая для Расіі вайна з Турцыяй. Пасля акружэння 11 ліпеня на рацэ Прут расійскага войска П.Шафіраў падпісаў з Турцыяй мір, адзін з пунктаў якога засведчыў, што Расія не

мае права ўмешвацца ў справы Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Але ж гэты пункт не заўжды выконваўся.

Пётр I заклаў яшчэ адну міну замаруджанага дзеяння, якая праз колькі год прывяла да падзелу Рэчы Паспалітай і страты незалежнасці нашай Бацькаўшчыны.

З 1685 года Кіеўская праваслаўная мітраполія, якая прызначала епіскапаў на Магілёўскую праваслаўную епархію, перайшла пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхата. Гэта было пацверджана дамоваю 1686 года паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай Абодвух Народаў і ратыфікавана соймам толькі ў 1710 годзе пад моцным ціскам Пятра I. Быў дадзены дазвол Маскоўскаму патрыярхату прызначаць епіскапаў на адзіную праваслаўную епархію Рэчы Паспалітай – Магілёўскую.

Але ж у 1700 годзе памёр патрыярх Андрыян, які не ладзіў з Пятром I. Цар прызначыў «местоблюстителем патриаршего престола» мітрапаліта Стэфана Яворскага. А ў 1721 годзе 25 студзеня адбылася царкоўная рэформа ў Расіі. Паводле царскага маніфесту была ўтворана Духоўная калегія ці Свяцемшы Урадавы Сінод. Ён ураўнаваў членаў Сінода з чыноўнікамі іншых дзяржаўных устаноў. Такім чынам епіскапы Магілёўскія сталі дзяржаўнымі чыноўнікамі Расіі.

Улічваючы, што менавіта Пётр I справакаваў у 18 ст. дысідэнцкае пытанне пра некатолікоў (К.Маркс пісаў, што пад ціскам Пятра I, дзеля ўмацавання ўлады ягонага саюзніка Аўгуста II, на сейме 1717 года былі абмежаваныя палітычныя правы некаталіцкай шляхты, прычым законы пра пазбаўленне палітычных правоў дысідэнтаў Расія прадыктавала польскаму сейму 1717 года, абапіраючыся на 60000 рускіх і 30000 саксонскіх штыкоў), можна з упэўненасцю казаць, што менавіта гэты цар прыклаў шмат намаганняў да знішчэння незалежнасці Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. I гэта нягледзячы на тое, што ў выніку вайны паміж Швецыяй і Расіяй на тэрыторыі Беларусі загінулі 700000 мясцовых жыхароў ці кожны трэці, а край наш, як адзначалася на сейме 1712 года, нагадваў край дзікіх пустэчаў, зарослых палёў, жалобнага выгляду.

У выніку горад толькі к сярэдзіне 18 ст. здолеў аднавіць свой эканамічны і сацыяльны патэнцыял.

### 4. Айчынная вайна 1812 года ў гісторыі Магілёва

Вядомыя падзеі адбыліся пад Магілёвам у час Айчыннай вайны 1812 г. У першую чаргу неабходна адзначыць падзеі пад горадам каля вёскі Салтанаўка, увайшоўшыя у гісторыю пад назвай "бітва пад Салтанаўкай" і ушанаваныя ў 1912 годзе помнікам у выглядзе капліцы.

7(19) ліпеня, Баграціён адправіў з Бабруйска на Магілёў 7-ы пяхотны корпус (камандзір генерал-лейтэнант М.М.Раеўскі) і частку 4-га кавалерыйскага корпуса (камандзір генерал-маёр К.К.Сіверс), 8(20) ліпеня ў тым жа напрамку рухаўся 8-ы пяхотны корпус (камандзір генерал-лейтэнант М.М.Бараздзін) з часцямі кавалерыі Сіверса, якія прымкнулі да яго. На маршы армія расцягнулася. 9(21) ліпеня, калі асноўныя сілы войск Раеўскага знаходзіліся пад Старым Быхавам, казацкі полк з 2 тысяч чалавек (камандзір палкоўнік Сысоеў), што наступаў у авангардзе конніцы Сіверса, наблізіўся да Магілёва. Сысоеў, які

даведаўся пра адступленне з горада атрада Грэсера і ўступленне туды французскіх войск, пасля падыходу яшчэ 2 казацкіх і 2 драгунскіх палкоў працягваў рух наперад. За 6 км ад Магілёва рускі авангард сустрэўся з высланым на Старабыхаўскі шлях 3-м конна-егерскім палком корпуса Даву. Адбылася перастрэлка, у якой казакі акружылі конных егераў і нанеслі ім цяжкія страты: каля 500 чалавек было забіта, больш за 200 трапіла ў палон, астатнія кінуліся наўцёкі. У час праследавання праціўніка казацкі авангард Сысоева быў спынены каля в. Буйнічы агнём французскай артылерыі. Баграціён вырашыў атакаваць праціўніка сіламі корпуса Раеўскага і авалодаць Магілёвам, дзе была пастаянная пераправа цераз Дняпро, а ў выпадку няўдачы арганізаваць пераправу каля Новага Быхава і хоць 11(23).7.1812 г. у бітве каля в. Салтанаўка рускія вонскі з вялікімі для сябе стратамі знішчылі полк кавалерыі праціўніка, аднак прабіцца да Магілёва не здолелі.

Горад баранілі невялікія сілы, якія размясціліся на заходняй ускраіне горада на Віленскім полі пад прыкрыццём землянога вала. Першая атака французскіх конных егераў была адбіта, аднак пасля прыбыцця пяхоты праціўніка барацьба стала няроўнай. Частка французскай пяхоты рушыла ў абход правага фланга абаронцаў горада да Шклоўскай брамы, а другая пайшла ў штыкавую атаку. Салдаты магілёўскага батальёна пачалі арганізаванае адступленне на поўдзень, абходзячы цэнтр горада. Калі прайшлі Быхаўскую заставу, праз Буйнічы адышлі да в. Дашкаўка. У баі за Магілёў страты рускіх (разам з забітымі і параненымі) склалі 40 – 50 чалавек, 200 чалавек трапілі ў палон.

У Магілёў 8 (20) ліпеня ўступілі французскія войскі на чале з маршалам Даву. Вышэйшае чыноўніцтва, у тым ліку губернатар Д.Талстой і віцэ-губернатар Юсупаў, разам з некалькімі заможнымі жыхарамі пакінулі горад. Услед ім была выслана пагоня французаў, якая вярнула частку збеглых чыноўнікаў і гараджан і пасадзіла іх у склеп пад Кармяліцкім касцёлам. Дарэчы, бежанству перашкаджала і сама расійская армія, якая адступала вельмі шпарка і не давала часу цывільным грамадзянам на роздум. Адступаючы, расійцы палілі за сабой масты, чым канчаткова ліквідавалі магчымасць больш-менш масавага бежанства.

Такім чынам, у адрозненне ад многіх гарадоў заходняй і цэнтральнай Беларусі Магілёў сустрэў французаў не ўрачыстасцямі, а залпам гарнізоннага батальёна ўнутранай варты.

Французы авалодалі мастом праз Днепр, вялікай колькасцю буйной рагатай жывёлы, харчовым магазінам, які, адступаючы, рускія не здолелі падпаліць. Пры ўездзе ў горад маршала Даву сустрэў маршалак дваранства П.Кроер, а па прыездзе на плошчу – і прадстаўнікі гарадскіх уладаў. Маршал выступіў перад гараджанамі з прамовай, якую перакладаў на польскую мову Кроер. Госцю ўручылі ключы ад горада.

Пасля заняцця Магілёва на вернасць Напалеону прысягнулі не толькі магілёўцы рыма-каталікі, але і праваслаўныя на чале з праваслаўным архіепіскапам В. Шышацкім.

Згодна сцвярджэнняў даследчыка А.Агеева, нягледзячы на замацаваныя ў гістарычнай літаратуры традыцыйныя ўяўленні аб паводзінах французскай арміі, аб разрабаванні Магілёва, ва ўспамінах сведкаў вайны згадак аб масавых

рабунках французаў у гарадах Магілёўшчыны, як правіла, няма. Больш таго, амаль усе адзначалі карэктныя паводзіны французаў. Так, жыхары Магілёўскай губерні пісалі ў сваіх успамінах: “... французы ўвогуле вялі сябе прыстойна і не было нараканняў на іх”, “... не магу сказаць, каб гэтыя атрады займаліся рабункамі і гвалтам...”.

У этнічна-французскіх злучэннях была даволі высокая дысцыпліна. Марадзёрства імкнуліся выкараняць у зародышу. Ужо ў Вільні Напалеон загадваў расстрэльваць марадзёраў. На чацвёрты дзень знаходжання Даву ў Магілёве па загаду «жалезнага» маршала былі расстраляны французскія марадзёры. Ігумен Арэст так згадваў акт расстрэлу марадзёраў у Магілёве: “Урад французскі за крадзяжы французскімі радавымі салдатамі ў Магілёўскіх мяшчан некаторых рэчаў асудзіў оных, адчаго асуджаных чатыры салдаты прыведзены былі ў завулак бліз валу супраць варот архірэйскай канюшні... і па прачытанні на французскай мове прысуду, завязаўшы вочы асуджаным, паставіўшы іх на калені, стрэлілі ў іх з ружжаў, кої ў тую ж мінуту пападалі мёртвымі і зарылі іх там ж у валу».

Расстрэл марадзёраў сведчыць як аб барацьбе з гэтай з’явай, так і аб яе наяўнасці. Калі французы паводзілі сябе збольшага прыстойна, то нямецкія злучэнні “асабліва ласкавым абыходжаннем з жыхарамі Магілёва не запомніліся”. Баяздольнасць і дысцыпліна ў іх былі ніжэйшыя. Гэтую асаблівасць адзначаюць і некаторыя расійскія гісторыкі. Так, Н.Троіцкі непасрэдна піша, што чынілі рабункі і гвалты «галоўным чынам не французскія часці, а ў першую чаргу нямецкія: вестфальскія, баварскія і інш.».

Французская армія, безумоўна, эксплуатавала рэсурсы краю, аднак, на думку А.Агеева, памеры рабавання ў літаратуры відавочна перабольшваліся. Так, у Магілёве не было рабунку, хаця многія лаўкі яўрэяў былі ўзламаныя. Хто тут больш шчыраваў – войскі, марадзёры ці мясцовыя рабаўнікі, – цяжка сказаць. Вось, напрыклад, у Чавусах яўрэйскія кабакі былі «разбіты» пасля ўцякання рускіх войскаў і яшчэ да прыходу французскіх. Такім чынам, да з’яўлення французаў «чернь» паспела ўдосталь пакарыстацца дармавой гарэлкай. З прыходам французаў усталяваўся пэўны парадак. Многія заможныя жыхары самі запрашалі французаў да сябе з мэтай аховы сваіх дамоў ад зладзеяў і рабаўніцтва.

Як ні дзіўна, аб марадзёрах больш пісалі ў сваіх лістах і ўспамінах з вялікім жалем самі французскія афіцэры, бо калі ў гарадах падтрымліваўся парадак, пастаўкі ў французскую армію і падаткі больш-менш справядліва размяркоўваліся, то іншая сітуацыя склалася ў вёсцы. Яна пацярпела як ад адступіўшай рускай арміі (многія жыхары скардзіліся французам на тое, што казакі звялі апошнюю жывёлу), так і ад рэквізіцый французскай. Тут было больш свавольства і марадзёрства, таму сяляне вымушаны былі масава хаваць жывёлу ў лясах.

У пачатку жніўня 1812 г. быў зацверджаны новы адміністрацыйны парадак, створана Магілёўская грамадзянска-ваенная камісія на чале з Галынскім. Губерня перайменавана ў дэпартамент, паветы – у прэфектуры. Мэрам Магілёва стаў падкаморы Венцлавовіч, у паветах з мясцовага дваранства прызначаны падпрэфекты. Акупацыйныя ўлады зрабілі спробу правесці камплектаванне

ўзброеных сіл. Паводле загаду Напалеона ў кожным павеце ствараліся атрады так званай «нацыянальнай гвардыі» і жандармерыі, але яны вылучаліся нізкімі баявымі якасцямі і слабай дысцыплінай. Сяляне і рамеснікі, якія былі мабілізаваны ў «нацыянальную гвардыю», хутка разбегліся. Рэкруцкі набор у корпус Панятоўскага на тэрыторыі Магілёўскай губерні таксама пацярпеў правал.

У пачатку лістапада 1812 г. галоўныя сілы французскай арміі пасля паражэнняў у Расіі адступілі са Смаленска праз Оршу да Бярэзіны. Рускія войскі, якія праследавалі праціўніка, рухаліся на поўдзень праз Горкі і Копысь. Каб перарваць сувязі непрыяцеля з Магілёвам, дзе была буйная прадуктовая база французаў, галоўнакамандуючы рускай арміяй М.Кутузаў загадаў атраду падпалкоўніка Давыдава і калужскаму апалчэнню генерал-лейтэнанта Шэпелева выйсці да горада з паўночнага і паўднёвага бакоў, а атраду генерал-лейтэнанта Гудовіча пасля пераправы цераз Дняпро рухацца ў напрамку Бялыніч. Непасрэдна для заняцця Магілёва вылучаны атрад генерал-лейтэнанта А.Ажароўскага. Калі ён даведаўся пра намер французаў спаліць Магілёў, то паскорыў прасоўванне атрада і ўвечары 12(24).11.1812 г. авалодаў горадам. У якасці трафеяў захоплены армейскія магазіны з вялікім запасам прадуктаў і фуражу.

Дарэчы варта адзначыць, што нарыхтоўкай фуражу і правіянту на тэрыторыі Магілёўскай губерніі займаўся Анры Мары Бейль, тады афіцэр французскай арміі, а пазней вядомы французскі пісьменнік, класік французскай літаратуры – Стэндаль. За сваю дзейнасць па нарыхтоўцы правіянту нават атрымаў падзяку ад Напалеона.

Пасля вызвалення Магілёва атрад Ажароўскага быў накіраваны ў бок Бярэзіны для праследавання праціўніка. У Магілёве для аховы вайсковых складоў і палонных французаў засталося калужскае апалчэнне генерала Шэпелева. Сюды, як у адзін з неразбураных гарадоў, адводзіліся на адпачынак рускія войскі.

## 5. Вайсковыя адзінкі пад назвай "Магілёўскія"

Магілёўцы адзначыліся пад час войнаў 19 ст. Распачаць трэба з таго, як восенню 1805 г. у рускай арміі ўзнікла новая вайсковая частка. У мястэчку Навагрудак Мінскай губерні пад камандаваннем генерал-маёра Лявонцьева быў сфарміраваны полк, які атрымаў назву Магілёўскага мушкецёрскага. У тыя часы існавала традыцыя – прысвойваць новым фарміраванням імя той мясцовасці, адкуль папаўняўся асноўны кантынгент яго складу, а ў новым палку пераважная колькасць рэкрутаў была з Магілёва і Магілёўскай губерні.

Хутка Магілёўскі мушкецерскі полк быў перакінуты ў Польшчу. Ішла руска-пруска-французская вайна 1806–07 гг. У пачатку 1807 г. полк атрымаў першае баявое хрышчэнне ў кровапралітнай бітве пры Прэйсіш-Эйлаў. Салдаты і афіцэры праявілі вялікую мужнасць і гераізм, шмат з іх загінула. Усе ўдзельнікі бітвы былі ўзнагароджаны: салдаты – спецыяльна зацверджаным медалем (на ганаровай георгіеўскай стужцы надпіс «За працу і храбрасць», на адваротным баку – «Перамога пры Прэйсіш-Эйлаў 27 студзеня 1807 года»), афіцэры – баявымі ордэнамі. Вясной таго ж года Магілёўскі полк увайшоў у склад рускага экспедыцыйнага корпуса пад камандаваннем фельдмаршала М.Каменскага. У баях пад крэпасцю Данцыг магілёўцы правялі імгненную атаку, у выніку якой

французскія войскі адступілі, пакінуўшы ўсю артылерыю. Пасля заканчэння вайны Магілёўскі полк прыбыў на зімовыя кватэры ў Віцебскую губерню.

У час руска-шведскай вайны 1808–09 гг. полк тэрмінова быў перакінуты ў Фінляндыю, дзе на долю воінаў выпалі цяжкія выпрабаванні. У баях пры Рэвалаксе і Пулкіна палку давялося ваяваць з праціўнікам, што ў восем разоў перавышалі яго. Асабліва вылучыліся два Магілёўскія партупей-прапаршчыкі, якія паспелі сарваць з дрэўка і схаваць батальённыя баявыя сцягі. Выдатны подзвіг здзейсніў радавы Пятроў. Ён літаральна вырваў палкавы сцяг з рук ворага і схаваў яго. Яшчэ неаднойчы вызначаліся воіны-магілёўцы ў баях. У пачатку верасня 1808 г. яны штурмам авалодалі варожымі пазіцыямі пры Аравайсе. У маі 1809 г. полк па тонкім лёдзе Батанічнага заліва, які пачаў раставаць, зайшоў у тыл шведам і прымусіў іх скласці зброю.

У 1811 г. полк называўся Магілёўскім пяхотным. Пад такой назвай ён уступіў у вайну 1812 г. з Напалеонам, уваходзіў у 5-ю пяхотную дывізію 1-й рускай арміі, якой камандавай Барклай-дэ-Толі. Потым перайшоў у склад корпуса Вітгенштэйна, які павінен быў не прапусціць французскія войскі да сталіцы Расіі – Пецярбурга. Магілёўцы разам з іншымі часцямі рускай арміі ў жорсткіх баях у ліпені 1812 г. праявілі ўзоры мужнасці і ратнай доблесці. Магілёўскі полк удзельнічаў у баях пад Полацкам, каля Чашнікаў, на рацэ Бярэзіна, дзе былі канчаткова разгромлены рэшткі некалі вялікай арміі Напалеона, у 1813 г. – каля Люцзна і Баўцэна, у славутай «бітве народаў» каля Лейпцыга, у Парыжы каля Бельвільскіх вышынь. Ратныя подзвігі Магілёўскага пяхотнага палка ў руска-турэцкай вайне былі адзначаны ганаровай баявой узнагародай воінскіх часцей – сярэбранымі трубамі з надпісам «За вайну з Турцыяй». Вылучыўся пюлк таксама ў баях пад Варнай і каля крэпасці Кюстэнджы. Пазней ён называўся 26-м Магілёўскім пяхотным. У сакавіку 1854 г. пад моцным агнём праціўніка полк імгненна фарсіраваў Дунай і штурмам авалодаў турэцкімі ўмацаваннямі. У адным з баёў камандзір палка палкоўнік І.Цяжальнікаў быў паранены, але не пакінуў поля бою. За гэты подзвіг яму датэрмінова прысвоілі званне генерал-маёра. Партрэт І.Цяжальнікава, які выканаў І.Рэган, адзін з лепшых партрэтаў рускіх военачальнікаў мінулага стагоддзя.

Магілёўскі полк удзельнічаў і ў легендарнай абароне Севастопаля ў 1855 г. Уваходзіў у склад гарнізона горада, вылучыўся ў баях каля Чорнай рэчкі і Фядзюнінскіх вышынь.

Мужна змагаўся полк і ў першай сусветнай вайне. Геройскі подзвіг здзейсніў тады Магілёўскі прапаршчык Яфрэм Хахлюшкін, за што быў узнагароджаны ордэнам Георгія.

## Лекцыя 6. Магілёў у складзе Расійскай імперыі

1. Развіццё Магілёва напрыканцы 18 – першай палове 19 стст.
2. Па дарозе ў ссылку.
3. Магілёўскі друк.
4. Эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё горада ў другой палове 19 – пачатку 20 стст.

**1. Развіццё Магілёва напрыканцы 18 – першай палове 19 стст.**

З курса «Гісторыі Беларусі» вядома, што ў 1772 годзе ў выніку гвалтоўнага падзелу Рэчы Паспалітай Магілёў аказаўся ўключаным у склад Расійскай імперыі. Ён з´яўляўся цэнтрам Магілёўскай правінцыі (да 1775 г.) і Магілёўскай губерніі, з 1778 года – Магілёўскага намесніцтва, з 1776 года – павета Беларускай, з 1802 года – Магілёўскай губерніі. Пасля далучэння да Расіі ў горадзе было практычна ліквідавана самакіраванне. Так, у 1775 годзе Магілёў быў пазбаўлены Магдэбургскага права. Элементы адноснай дэмакратыі былі заменены на сістэму жорсткага самаўладдзя. У Магілёве знаходзіліся рэзідэнцыі праваслаўнага і каталіцкага архіепіскапаў Г.Каніскага (з 1775) і С.Богуша-Сестранцэвіча (з 1782).

22.11.1773 г. Кацярына ІІ сваім загадам утварыла рыма-каталіцкую епархію з цэнтрам у Магілёве. У наступныя дзесяцігоддзі епархія стане найбуйнейшай у свеце – у склад Магілёўскай мітраполіі ўваходзілі касцёлы ад Магілёва да Сахаліна. Напачатку яе ўзначальваў Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч.

У маі 1780 года ў нашым горадзе адбылася сустрэча расійскай імператрыцы Кацярыны ІІ і аўстрыйскага імператара Іосіфа, падчас якой вырашаўся лёс Рэчы Паспалітай і сумеснай барацьбы супраць туркаў.

Захаваліся шматлікія ўспаміны сучаснікаў тых падзей. Паспрабуем на іх аснове даць кароткае апісанне знаходжання і сустрэчы венцаносных асоб у нашым родным горадзе.

Імператрыца спачатку пажадала быць у Магілёве на працягу сямі дзён. Для таго, каб яна не сумавала, з Пецярбурга ў Магілёў прыехала прыдворная італьянская опера, канцэрт давалі лепшыя музыканты і артысты, сярод якіх была вядомая на той час спявачка Бонафіка. Быў пабудаваны тэатр і вялікая зала па плану архітэктара Брыгонцыя.

Спецыяльна для сустрэчы рыхтаваліся вайсковыя манеўры. Кіраваць імі павінен быў генерал-паручнік Сцяпан Мацвеевіч Ржэўскі, вядомы сваімі ведамі ў тактыцы і вайсковымі сачыненнямі. Дзеля гэтага быў сабраны корпус з лепшых палкоў: першага кірасірскага, двух гусарскіх, аднаго драгунскага, пяці пяхотных, пяцідзесяці гармат палявой артылерыі і двух палкоў данскіх казакоў.

Ужо за месяц да прыезду імператрыцы ў Магілёў пачалі з’язджацца міністры, частка двара, вялікая колькасць іншаземцаў, мясцовай шляхты. Горад па свайму мнагалюддзю стаў больш нагадваць сталіцу, чым губернскі цэнтр. Увесь час былі балі, сваткаванні.

Імператар Іосіф прыехаў у Магілёў за дзень да Кацярыны. Ён звычайна рабіў свае вандроўкі па Еўропе інкогніта. У расійскую імперыю ён прыбыў пад прозвішчам графа Фалкенштайна. У Магілёве спачатку ніхто не звяртаў увагу на афіцэра ў зялёным гарнізонным мундзіры, які хадзіў паміж народа адзін. Пазнаў імператара губернатар Пасек, выпадкова сутыкнуўшыся з ім на вуліцы. Пасек асабіста ведаў Іосіфа ІІ. Гэта адбылося тады, калі імператар, падняўшыся на вежу магістрацкую (ратушы), каб аглядзець горад і зышоўшы ўніз, пайшоў сярод натоўпу людзей да замка. Па шляху яго знянацку і сустрэў генерал-губернатар.

Жыў аўстрыйскі імператар у доме магілёўскага гандляра. Будынак захаваўся па-сёняшні дзень, у ім размешчаны музей В.Бялыніцкага-Бірулі.

Імператар Іосіф пакінуў гаспадару дома, дзе ён жыў, партрэты: свой і сваёй маці. Партрэты захоўваліся ў Магілёўскім музеі і зніклі ў пачатку вайны.

Расійская імператрыца праз Пскоўскую і Полацкую губерні прыбыла ў Магілёўскую. Па шляху яе паўсюль пышна сустракалі. Апасля Шклова, на наступны дзень, яе чакалі каля Магілёва.

Сустрэча была раскошная. У трох вярстах ад горада ў бок Шклова была пабудавана трыумфальная брама, багата аздобленая, паміж ёю і горадам стаялі войскі, з аднаго боку, з другога - народ і гараджане з цэхавымі харугвамі. Каля брамы Кацярыну ІІ сустракаў беларускі намеснік граф З.Чарнышоў з чыноўнікамі і шляхтай. У суправаджэнні шляхты і знатных асоб імператрыца прыехала ў сабор, дзе яе сустрэў Георгі Каніскі архіепіскап Магілёўскі. Пабыўшы на малебне і прыклаўшыся да абразоў, імператрыца адправілася ў дом намесніка, дзе павінна была жыць у горадзе. Там сустрэлася з рыма-каталіцкім архіепіскапам С.Богуш-Сестранцэвічам і святарамі, а пазней - са шляхетнымі дамамі.

На другі дзень аглядала адміністратыўныя ўстановы, пазней ёй былі прадстаўлены ўсе чыноўнікі і шляхта. У абед яна сустрэлася з імператарам Іооіфам ІІ. Вечарам быў бал.

Падчас наведвання каталікі і праваслаўныя былі вельмі ўражаны паводзінамі Кацярыны ІІ у саборнай царкве. Вядома, што імператрыца была народжана і выхавана ў законе евангельскім, а грэка-расійскі прыняла толькі перад шлюбам. Але ж яна ўразіла ўсіх тым, з якой набожнасцю і маральнай чысцінёй яна падышла да алтара, прымала таямніцы веры, клала на сябе поўны крыж і схілялася ў паклоне так нізка, як дазваляла чалавецкае цела. Гэта заўважылі веруючыя розных канфесій. На пяты дзень у гонар сустрэчы паміж імператарамі была закладзена царква св. Іосіфа. Храм быў пабудаваны ў стылі класіцызму. Для яго аздобы вядомы расійскі мастак У.Баравікоўскі стварыў для сабора шэраг высокамастацкіх абразоў. На іх у выглядзе святых і анёлаў былі выявы фаварытаў Кацярыны і яна сама.

Адразу пасля закладкі царквы расійская імператрыца выехала з Магілёва. Вынікам спаткання імператараў у Магілёве з’явілася сумесная барацьба дзвюх дзяржаў супраць туркаў і падрыхтаваны другі падзел Рэчы Паспалітай.

У канцы 18 ст. ў Магілёве 22 вуліцы, 32 завулкі, 2 тысячы дамоў; у 1783–84гг. працавалі 33 прамысловыя прадпрыемствы, у тым ліку 22 гарбарныя, 7 бровараў, 2 цагельныя заводы, 2 вадзяныя млыны. У 1780 г. тут было 748 майстраў-рамеснікаў: слесараў, кавалёў, меднікаў, залатых спраў майстроў, гарбароў (жылі пераважна ў задняпроўскай частцы горада – Лупалаве), шаўцоў, сядзельнікаў, краўцоў, хлебнікаў, мяснікоў, цесляроў, сталяроў, цагельнікаў і інш.

У 1785 г. у горадзе было 479 купцоў, больш за 240 крамаў, праводзіліся 3 таргі на тыдзень. Павелічэнню аб’ёму гандлю з Масквой, Рыгай, Пецярбургам, Кіевам і іншымі гарадамі спрыяў тракт Пецярбург–Кіеў праз Магілёў, ажыўленне суднаходства па Дняпры пасля пабудовы Бярэзінскага канала (1797– 1805), які злучыў басейны Дняпра і Заходняй Дзвіны.

У 1825 г. у Магілёве пражывалі 5675 мужчын і 5957 жанчын, былі 51 мураваны і 1506 драўляных дамоў, 18 цэркваў, 5 кляштараў, 7 навучальных і 9

богаўгодных устаноў, 81 фабрыка і завод, 260 крам, карчма, 150 піцейных дамоў, 8 лазняў.

З Магілёвам была звязана дзейнасць многіх рэвалюцыянераў-дзекабрыстаў. На будынках горада, якія маюць дачыненне да дзейнасці і імёнаў дзекабрыстаў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі.

### 2. Па дарозе ў ссылку

У гэтыя ж гады горад Магілёў і Прыдняпроўскі край двойчы наведаў сусветнавядомы, славуты рускі паэт А.С.Пушкін.

У сямідзесятыя гады 19 стагодцзя ў Расіі пачала ўздымацца моцная хваля цікавасці да творчасці і асобы А.Пушкіна. У тыя гады ў друку з’яўляецца вялікая колькасць артыкулаў, успамінаў пра паэта, ствараюцца падрабязныя яго біяграфіі. Якраз тады з’яўляюцца і ўспаміны аб знаходжанні А.Пушкіна ў Магілёве. Трэба адзначыць, што паэт наведаў горад двойчы. Першы раз у 1820 г., калі накіроўваўся з Пецярбурга ў Кішынёў. Другі раз шлях Пушкіна ляжаў у Міхайлаўскае, пад нагляд паліцыі.

Аб першым візіце ў Магілёў успамінаў не захавалася. Аб апошнім наведванні існуюць успаміны сведкаў гэтай падзеі А.Куцынскага і А.Распопава, якія ў той час служылі ў Лубенскім палку, што быў раскватараваны ў Магілёве.

Абодва аўтары ў чымсьці супярэчаць адзін аднаму, называюць розныя даты і маршруты шпацыравання паэта па горадзе, але, з другога боку, пацвярджаюць і дапаўняюць адзін аднаго. Гэта выклікана тым, што ўспаміны былі напісаны і пабачылі свет амаль праз пяцьдзесят год пасля падзеі. Так, А.Распопаў, маючы 73 гады, надрукаваў свае мемуары ў 1876 г. у часопісе “Русский архив”.

Куцынскі згадваў (тут яго падтрымліваў і Распопаў), што магілёўцы адразу звярнулі ўвагу на Пушкіна, які хадзіў па горадзе, апрануты ў рускую кашулю і боты, на плечы быў накінуты вайсковы шынель, на галаве – ярмолка. Побач з ім звычайна шпацыраваў слуга, апрануты турчанём. Такі выгляд быў экзатычным для Магілёва тых гадоў, які яшчэ жыў успамінамі аб Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў і дзе большасць высакародных месцічаў-шляхты ведалі Міцкевіча, а не Пушкіна. Таму, убачыўшы эксцэнтрычную асобу, назвалі яе проста: вар’ят.

Зусім іншай была рэакцыя часткі рускіх афіцэраў мясцовага гарнізона. Прычым невялікая па колькасці, асноўная частка была “верная цару” і не рызыкнула ўшанаваць апальнага паэта. Даведаўшыся аб прыбыцці Аляксандра Пушкіна, некаторыя афіцэры падрыхтавалі паэту ўрачыстую сустрэчу. Адбылася гулянка, якая працягвалася да чатырох гадзін раніцы. У час яе Пушкін чытаў вершы, шмат якія з іх былі імправізацыяй.

Да сённяшніх дзён у Магілёве спрачаюцца, дзе ж знаходзіўся той балкон, з якога паэт быццам бы чытаў свае вершы магілёўцам. У Магілёве нічога не захавалася ад паштовай станцыі, куды прыбыў Пушкін, няма і будынка губернскай паштовай канторы. Але частка будынкаў, якія захавадіся ад першай паловы 19 ст. у старой частцы Магілёва, могуць несці на сабе адбітак ценю вялікага рускага паэта.

Даследчыкі творчасці А.Пушкіна адзначаюць, што найбольш выдатныя творы паэта былі напісаны ў час або адразу пасля яго вандраванняў, паэт з

цяжкасцю пераносіў знаходжанне на адным месцы. У час вандровак Пушкін убіраў у сябе наваколле як уважлівы назіральнік, запамінаў тое, што бачыў. Яго падарожжа па Усходняй Беларусі было важным і таму, што паэт ніколі не быў у Еўропе, а гэтыя землі ўсяго за 50-60 год да яго візіту развіваліся ў агульнаеўрапейскім рэчышчы і адчувалі на сабе ўплыў культурных і грамадскіх працэсаў Еўропы. Такім чынам, паэт меў магчымасць пабачыць і адчуць еўрапейскасць часоў сярэдневякоўя толькі ў гарадах Усходняй Беларусі.

Шлях Пушкіна ў 1820 і 1824 гг. ляжаў праз беларускія гарады і мястэчкі: Оршу, Шклоў, Гомель, Прапойск, Чачэрск, Быхаў, Буйнічы і інш. Пушкін, як і іншыя падарожнікі таго часу, мог адчуць уласцівыя беларусам рысы характару. Бедната сялян, іх галеча, прыгнёт не ўплывалі на іх высокую маральнасць. Ім уласціва была ціхасць, цярплівасць, працавітасць. Нават п’яныя, яны не ўчынялі злачынстваў. Падарожнікі пісалі: “У Беларусі можна было пакінуць на ноч воз пад голым небам, не баючыся, што яго абкрадуць мужыкі”.

Адчуў Пушкін і сакавітасць, трапнасць беларускай мовы. У 1825 г. (на наступны год пасля вяртання ў Міхайлаўскае) паэт піша сваю самую знакамітую трагедыю “Барыс Гадуноў”. З вуснаў чарнеца Варлаама гучаць беларускія прымаўкі і выслоўі. Чамусьці лічыцца, што гэтую слоўную “музыку” Пушкін пераняў ад свайго ўпраўляючага. Але з такім жа поспехам можна выказаць меркаванне, што ў час свайго падарожжа паэт чуў гэгыя выразы, запомніў і выкарыстаў у сваёй творчасці.

У Палыкавічах, каля Магілёва, А.Пушкін мог паспрабаваць вады са славутай і тады і сёння мінеральнай крыніцы. Да яе збіралася шмат набожных, якія верылі ў гаючую сілу вады.

У 1820 г. А.Пушкін трапіў у Магілёў праз Пакроўскі пасад, затым - Касцерня, па Багародзічнай вуліцы (Дваранская, Камсамольская) на Ветраную (Вялікая Садовая, Ленінская), затым на Паштовую (цяпер – К.Лібкнехта) вуліцу. З Магілёва на поўдзень ён ехаў праз той жа Пакроўскі пасад, па Старачарнігаўскай вуліцы (Спартыўная, І.Чыгрынава) да Чарнігаўскай брамы (скрыжаванне сучасных вуліцы Астроўскага і праспекта Пушкіна, дзе стаіць помнік паэту) і далей – на поўдзень. У 1824 г. ён паўтарыў гэты шлях – толькі ў адваротным накірунку. Калі падымаліся тады на Касцерню, крыху збоку заставалася славутая сінагога, якую праз колькі год распісаў дзед сусветна вядомага мастака М.Шагала. Дарэчы, у тыя гады ў Магілёве, дзякуючы мяжы аседласці, што існавала ў Расійскай імперыі, было шмат яўрэяў. Яны жылі сваім кагальным ладам і відаць не звярнулі ніякай увагі на славутага паэта. На думку некаторых даследчыкаў яго шлях на поўдзень і назад праходзіў праз Буйнічы.

Дазволім сабе выказаць меркаванне, на што мог звярнуць увагу сам паэт, гуляючы па Магілёву. На цэнтральнай вуліцы горада ён мог зайсці ў Іосіфаўскі кафедральны сабор. Безумоўна, гэты будынак, увесь ансамбль саборнай плошчы маглі ўразіць Пушкіна. Аляксандр Сяргеевіч, безумоўна, заўважаў, што праваслаўныя храмы Магілёва непадобныя на аналагічныя ў цэнтральнай частцы Расіі. Магілёў знаходзіўся на скрыжаванні культур. Праваслаўныя цэрквы будаваліся тут у традыцыях візантыйскай школы, але пад уплывам заходнееўрапейскага мастацтва.

Цікавасць Пушкіна да мясцовага праваслаўя магла быць выклікана і шырока вядомай справай архіепіскапа магілёўскага Варлаама Шышацкага, які ў 1812 г. разам з большасцю кліра і вернікаў прысягнуў Напалеону. Здаецца, невыпадкова ў 1835 г., пасля таго, як у Санкт-Пецярбургу выйшлі творы архіепіскапа магілёўскага Георгія Каніскага, Пушкін напісаў і апублікаваў у часопісе «Современник» рэцэнзію, у якой, высока ацэньваючы дзейнасць і творчую спадчыну архіепіскапа, назваў яго “самым достопамятным человеком 18 столетия”. Верагодна, у Магілёве Аляксандр Сяргеявіч чуў аповеды аб гэтым унікальным чалавеку, які абараняў інтарэсы праваслаўя на чале адзінай праваслаўнай епархіі ў Рэчы Паспалітай–Магілёўскай. Г.Каніскі звярнуў увагу Пушкіна і сваёй разнастайнай дзейнасцю як вучоны-гісторык і філосаф, як асветнік, што адкрываў семінарыі і народныя школы, стварыў тэатр, для якога сам пісаў п’есы. Акрамя таго, што Пушкін мог чуць аповеды пра дзейнасць Каніскага, ён, магчыма, яшчэ зайшоў у адзін з найпрыгажэйшых сабораў горада – Спаскі, дзе ў правым прыдзеле стаяла труна з нятленнымі мошчамі свяціцеля (гэта засведчылі французы ў 1812 г. і апошні расійскі імператар Мікалай II, у 1993 г. Каніскі быў далучаны праваслаўнай царквой да ліку святых).

Мог Пушкін у 1820 г. завітаць і ў езуіцкі касцёл, пазней перароблены ў Васкрасенскую царкву, – якраз у гэтым годзе імператар прыняў пастанову аб выгнанні езуітаў з Расіі (штосьці падобнае якраз адбывалася з паэтам). Тым больш, што сярод сяброў-дзекабрыстаў Пушкіна былі выхаванцы езуітаў. Шпацыруючы ўздоўж калегіума езуітаў, паэт не ведаў, што праз колькі год менавіта пад яго скляпеннямі будуць дапытваць блізкіх яму па духу людзей, удзельнікаў дзекабрысцкага руху ў Расіі.

Пачуў ён на Магілёўшчыне, відаць, на нешматлікіх прыпынках і аб так званых “разборах шляхты”. Пасля падзей 1812 г., калі частка шляхты падтрымала Напалеона, іх маёнткі былі канфіскаваны і падараваны расійскім дваранам. У адносінах да мясцовага насельніцтва, у тым ліку і дробнай шляхты, новыя гаспадары вельмі часта паводзілі сябе як захопнікі. Таму, на маю думку, не толькі шляхціц П.Астроўскі стаў правобразам Дуброўскага. Гэта мог быць збіральны вобраз.

### 3. Магілёўскі друк

Вялікі ўклад унесла Магілёўшчына ў станаўленне і развіццё друку на Беларусі. У 1616–1773 гг. (з перапынкамі) існавала Магілёўская брацкая друкарня. Выпусціла звыш 50 кніг розных назваў. Кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV выдаў Магілёўскаму брацтву прывілею на права адкрыцця друкарні і друкавання навучальных і іншых кніг на беларускай, грэчаскай і польскай мовах.

У Магілёўскай брацкай друкарні друкаваў свае кнігі і сын магілёўскага бургамістра, усім вядомы Спірыдон Собаль. Ён адкрыў друкарню ў Кіеве (1628г.), у Куцейне пад Воршай, Буйнічах. У Магілёве выдаў «Буквар языка славеньска» (1636), «Псалтыр» (1636-38 гг.) і інш. Разам з ім вялікую ролю ў развіцці беларускай кнігі адыграў ігумен Магілёўскага Багаяўленскага брацтва ІаільТруцэвіч.

У 1690–1708 гг. друкарню ўзначаліў Максім Вашчанка, які з 1698 г. выдаваў кнігі ад свайго імя. У 1708 г. брацтва мела свае правы на друкарню. У канцы 17 – пачатку 18 стст. друкарня выдала царкоўныя, навучальныя і палемічныя творы: «Псалтыр» і «Акафісты і каноны» (абодва 1693 г.), «Малітваслоў» (1695), «Часаслоў» (1697), «Евангелле вучыцельнае» (1697), «Перла мнагацэннае» (1699), «Дыептра» (1698), «Неба новае» (1699) Іанікія Галятоўскага, «Трыфалапен, або Цветаслоў» (1748) і іншыя, шмат з іх перавыдавалася. У друкарні працавалі мастакі і гравёры Васіль Вашчанка (сын М.Вашчанкі), Федар Ангілейка, Афанасій П., М.Антушкевіч.

Напрыканцы 18 ст. была адкрыта Магілёўская друкарня, заснаваная архіепіскапам С.Богуш-Сестранцэвічам і якая паклала пачатак грамадзянскаму друкаванню не тодькі на Магілёўшчыне, а нават і на Беларусі. Яна працавала ў 1774–1844 гг. З 1776 г. друкаванне вялося на рускай мове грамадзянскім шрыфтам, распрацаваным беларусам Ільёй Капіевічам. Менавіта ў гэтай друкарні ў 1777 годзе і была выдадзена першая на тэрыторыі Беларусі кніга на рускай (расійскай) мове “Учреждения для управления губерний”. Паводле ўказа Кацярыны II друкарня павінна была друкаваць афіцыйныя матэрыялы, выконваючы функцыі губернскай. Вядома 60 назваў выдадзеных кніг, у тым ліку 43 на польскай, 12 на лацінскай, 8 на рускай, па адной на французскай і нямецкай мовах. Сярод іх падручнікі «Кароткая французская граматыка» (1784, 1796), вучэбныя праграмы, даведачная літаратура – «Каляндар беларускіх намесніцтваў на 1783 г.» (1782), «Беларускія календары» (1784–95), «Дырэкторыумы» (царкоўныя календары са спісамі парафій і службовых асоб Магілёўскай епархіі; святочныя малітвы, традыцыйныя астранамічныя звесткі, 1807–44), «Каталогі» (спісы каталіцкага духавенства Расіі, 1784–1802), афіцыйныя выданні – «Трактат вечнага міру і дружбы» (1792), «Установы для кіравання губерняў» (1774, 1777, 1795), навуковыя працы – «Кароткія нататкі пра некаторыя азіяцкія дзяржавы» (1791) В.Галынскага, «Пра Заходнюю Русь» (1793) і «Пра паходжанне сарматаў і славян» (1810) Богуша-Сестранцэвіча, трактат «Тры кнігі пра паэтычнае майстэрства» (1786) Ф.Пракаповіча і інш., мастацкія творы – трагедыя «Гіцыя ў Таўрыдзе» (1783), пропаведзі, прамовы і панегерычныя вершы Богуша-Сестранцэвіча, пераклад на польскую мову А.Голанда «Гісторыі Сіндбада-Марахода» і інш. У Магілёўскай друкарні быў выкарыстаны грамадзянскі шрыфт, які паклаў пачатак грамадзянскаму кнігадрукаванню на Беларусі.

У 18 ст. таксама эпізадычна займалася кнігадрукам і ваеннапаходная друкарня Галоўнага штаба 1-й расійскай арміі. У ёй была надрукавана манаграфія славутага магілёўца і вядомага ў Еўропе лекара, доктара медыцыны і хірургіі К.І.Грум-Гржымайла “О колтуне (plica)” (1828 г.).

Трэцюю частку ўсяго друку ў другой палове 19 – пач. 20 стст. выпускала Магілёўская губернская друкарня (1833-1917 гг.).

Патрэбна адзначыць такія выданні, як «Памятныя кніжкі Магілёўскай губерніі» (1861-1916), «Агляды Магілёўскай губерніі» (1879-1915), «Вопыт апісання Магілёўскай губерніі» пад рэдакцыяй А.С.Дамбавецкага (кн.1-3, 1882-1884) і іншыя. Аднак побач з ёй у другой палове 19 ст. у Магілёве з’явіліся

прыватныя друкарні: Х.Эліяшберга, Фрыдланда, Я.Падземскага і інш. У 1910 г. было 7 прыватных друкарняў. Яны актыўна і шмат працавалі.

Наогул у пачатку 20 ст. Магілёў стаў буйным цэнтрам друку Беларусі (на другім месцы апасля Мінску). У горадзе за 1801 -1917 гг. надрукавана было каля 800 выданняў (больш за 1300 тамоў). Пры чым у 1908 г. выходзіла 15 кніг у год, у 1911 - 51. Нават і блізка нельга праводзіць параўнанні з сённяшнім днём. Да таго ж, у той час было адчынена 10 паліграфічных прадпрыемстваў: А.Шнэйдэра (1901-12 гг, надрукавана 6 назваў кніг), А.Сыркіна (1904,1), І.Клаза і М.Кагана (1910-17,16), Іофе (1920,1), А.Шнэйдэра і Ш.Шэйна (1911,1), І.Клаза (1913-1917,22) і г.д. У дзяржаўнай і прыватных друкарнях выдавалася літаратура на расійскай мове, а таксама на сумесных пачатках з выдаўцамі іншых гарадоў па-польску, у прыватнасці творы Ю.Крашэўскага, У.Сыракомлі, Ю.Кажанеўскага і інш.

Акрамя кніг, у Магілёве выходзілі выданні перыядычныя (газеты, часопісы, розныя зборнікі). Першая газета ў горадзе – “Магілёўскія губернскія ведамасці” – друкавалася у 1838-1917 гг. у губернскай друкарні. Яе традыцыі працягвае сёння буйнейшая газета вобласці «Магілёўскія ведамасці». У 1883-1917 гг. выходзілі – “Магілёўскія епархіяльныя ведамасці” з дадаткам - рэлігійна-маральным часопісам “Воскресенье”. Выданне епархіяльных ведамасцей адноўлена ў 1990-я гады уладыкам Максімам. Папярэднікам розных сучасных рэкламных газет былі два нумары “Магілёўскага лістка аб’яў” (рэдактар - выдавец А.Сыркін), выйшаўшыя ў 1901 годзе. “Губернскія ведамасці” ў 1901, 1902-05 гг. выдавалі дадаткі “Сельскагаспадарчы лісток” і “Магілёўскі лісток сельскай гаспадаркі і палявання”. Выходзіў у 1906-1917 гг. “Магілёўскі веснік”. Гэта была штодзённая грамадска-палітычная газета. Было шмат іншых перыядычных выданняў. Асабліва на рубяжы 1917-1918 гг. Але, як і выданні першых гадоў савецкай улады, яны былі недаўгачаснымі.

Са студзеня 1919 г. па май 1925 г. выходзіла ў Магілёве грамадска-палітычная і літаратурная газета “Саха і молат”, з кастрычніка 1924 па лістапад 1929 г. на рускай і беларускай мовах газета “Магілёўскі селянін”, у 1929-1941 гг. “Камунар Магілёўшчыны”. Пасля вызвалення Магілёва ад гітлераўскіх захопнікаў выдавалася газета “За Радзіму”, якая з 1956 г. выходзіць пад назвай “Магілёўская праўда”.

Увесь доўгі час “росквіту сацыялізма”, абмежаваную інфармацыю несла гараджанам толькі адна газета (не лічачы раённых і вузка прафесійных шматціражак). Але ж працэс развіцця дэмакратыі і галоснасці, грамадска-палітычнай актыўнасці людзей прывёў да аднаўлення даўніх традыцый у друку перыядычных выданняў на Магілёўшчыне. Аднымі з першых былі газеты: “Ратуша”, “Магілёў таймс”, “Метрапалітэн” і інш.

Варта ўзгадаць, што ў 1818 годзе Ф.Ф.Орля-Ашмянец у Магілёве выдаў часопіс ”Отечественный памятник” (трэці выпуск, друкаваўся ў друкарні Маскоўскага універсітэта), які з’яўляецца першым рускамоўным часопісам у Беларусі. У наш час гэтыя традыцыі працягваюць: магілёўскі рэгіянальны часопіс “Магілёўская даўніна”, “Магілёўскі мерыдыян”, “Веснік МДУ імя А.Куляшова” і інш.

**4. Эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё горада ў другой палове 19 – пачатку 20 стст.**

Напярэдадні сялянскай рэформы 1861 г. Магілёў – адзін з буйнейшых гарадоў Беларусі. Насельніцтва, паводле перапісу 1841 г., складала 19 669 жыхароў, з іх 11064 мужчыны і 8065 жанчын. Кожны трэці будынак у ім быў мураваны (740 з 2259). У горадзе былі 44 манахі і манастырскія служкі, 161 святар і царкоўны служка, 3 генералы, 157 штабс-афіцэраў і обер-афіцэраў, 1689 ніжніх ваенных чыноў, з 392 служачых гарадскіх ведамстваў - 194 былі жанчыны, 36 акцёраў і тэатральных служачых, 77 купцоў, 417 сялян, 54 замежныя і 2 ганаровыя грамадзяніны. У гарадской турме ўтрымліваліся 1841 мужчына і 81 жанчына. Вуліц было 24, у тым ліку 9 брукаваных, 1 грамадскі і 241 прыватны сад, 1979 агародаў.

У 1854 г. працавалі 27 цагельных заводаў, 4 мукамольна-крупадзёрныя прадпрыемствы, лесапілка, 34 невялікія маслабойні, развівалася ганчарная, піваварная, суконная, табачная і іншыя галіны вытворчасці. У 1841 г. пабудаваны адзін з першых на Беларусі мукамольны завод, дзе пераважала наёмная праца; прадпрыемства мела паравы рухавік, ад якога працавала лесапільня. У горадзе на той час было каля 2500 рамеснікаў, 189 саматужных прадпрыемстваў (1859), з іх больш за 100 гарбарных, дзе занята было каля 1000 чалавек. Існавалі мужчынская гімназія (з 1809), павятовае і прыходскае вучылішчы і 3 прыватныя жаночыя школы. У 1833 г. адкрыта першая публічная бібліятэка (60 кніг). У 1847 г. колькасць памершых перавысіла колькасць народжаных на 396 чалавек, у 1855 г. – на 261. Аднак несельніцтва горада павялічвалася за кошт прытоку з навакольных вёсак і мястэчак.

Паўстанне 1863–64 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве закранула Магілёў. Непадалёку ад горада размяшчалася 3-я зводная рэзервовая артылерыйская брыгада, а ў яе падраздзяленнях створана ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя. Члены яе (А.В.Алендскі, браты М.А. і І.А.Манцэвічы) у красавіку 1863 г. сфарміравалі Чарнаруцкі паўстанцкі атрад, які дзейнічаў на тэрыторыі Магілёўшчыны. 6.6.1863 г. у Магілёве ўлады расстралялі 4 афіцэраў, у тым ліку і братоў Манцэвічаў, якія змагаліся на баку паўстанцаў. Падтрымліваў паўстанне старшыня палаты крымінальнага суда ў Магілёве, прадстаўнік старажытнага шляхецкага роду Ігнацій Валовіч, за што і быў высланы ў чэрвені 1864 г. у Енісейскую губерню, дзе і памёр.

Пасля адмены ў 1861 г. прыгонніцтва паскорылася эканамічнае развіццё Магілёва, ажывіліся прамысловасць і гандаль. У 1885 г. ў горадзе 124 прадпрыемствы (270 рабочых, гадавы аб'ём прадукцыі 319 тысяч рублёў), у 1900 – 220 (790 рабочых, гадавы аб'ём прадукцыі 1098 тысяч рублёў). Па аб'ёме прадукцыі пераважалі гарбарная, маслабойная, піваварная і тытунёвая вытворчасць.

У канцы 19 – пачатку 20 стст. у Магілёве існавалі 3 групы крэдытных устаноў: камерцыйнага крэдыту (аддзяленні Дзяржбанка Расіі, Таварыства ўзаемнага крэдыту, 2 прыватныя банкірскія канторы Цукермана і Ратнера), зямельнага крэдыту (аддзяленні Дзяржаўнага дваранскага зямельнага банка, Сялянскага пазямельнага банка, аддзяленні Маскоўскага і Віленскага

акцыянерных зямельных банкаў), дробнага крэдыту (крэдытныя і пазыкова-ашчадныя таварыствы, касы - губернская земская дробнага крэдыту, для служачых Магілёўскага губернскага праўлення, служачых мужчынскай гімназіі, казеннай палаты, акцызнага ўпраўлення Магілёўскай губерні і інш ). Працавалі 3 друкарні (52 рабочыя), механічныя майстэрні. У 1888 г. узведзены будынак тэатра. У 1867 г. пры Магілёўскім губернскім статыстычным камітэце быў заснаваны Магілёўскі музей. У 1893 г. у ім быў створаны гісторыка-археалагічны аддзел. Вялікі ўклад у развіццё музея зрабілі А.Дамбавецкі, Е.Раманаў, С.Чалоўскі. У музеі было больш за 1500 экспанатаў, сярод іх кальчуга з Анэлінскага кургана Быхаўскага павета, калекцыі манет Вялікага княства Літоўскага 16–17 стст., а таксама арабскіх і заходнееўрапейскіх, рускія асігнацыі пачатку 19 ст., памятныя медалі, старажытная зброя, раннія друкаваныя кнігі, рукапіснае евангелле 15 ст., каралеўскія граматы, сані, што пакінуў Напалеон у час уцёкаў з Расіі, атлас 1823 г. з планамі гарадоў Магілёўшчыны, узоры нацыянальнага адзення з вёсак Магілёўшчыны, батлейка з Быхаўскага павета, мадэлі сялянскага двара з Рагачоўскага павета, сельскагаспадарчыя прылады працы, вялікая калекцыя дзіцячых цацак, гербарыі і інш. Большая частка экспанатаў была перададзена пазней у Магілёўскі губернскі музей (з 1938 г. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей).

У 1870–80-я гады Магілёў – буйны цэнтр народніцкага руху ў Беларусі. Упершыню народніцкія групы рэвалюцыйна-асветніцкага характару ўзніклі ў горадзе ў пачатку 1870-х гадоў. Цэнтрам пашырэння народніцкіх ідэй у Магілёве была мужчынская гімназія. У 1872 г. тут сфарміраваны гурток гімназістаў Гурэвіча, братоў Левенталей, Цукермана, Аксельрода, якія пад выглядам самаадукацыі вывучалі рэвалюцыйную тэорыю, гісторыю, сацыялогію, палітычную эканомію. У 1874–75 гг., у час масавага «хаджэння ў народ», у гімназіі існаваў гурток, што ажыццяўляў прапагандысцкія функцыі. Ён быў заснаваны ўраджэнцам Беларусі, студэнтам Пецярбургскага універсітэта Б.Ержыковічам. Аб’ядноўваў больш за 20 чалавек, сярод іх Р.Ісаеў, П.Пятроў, Н.Забела, В.Геранімус, В.Світыч, Л.Дабравольскі, Л.Залкінд. Сувязі з гуртком падтрымлівалі - С.Кавалік і дзеяч міжнароднага рэвалюцыйнага руху, вучоны-прыродазнавец, ураджэнец Магілёва Мікалай Судзілоўскі, які пазней стане першым прэзыдэнтам Гавайяў.

У час дзейнасці народніцкіх арганізацый «Зямля і воля» (1876–79) у Магілёве існавалі тры нелегальныя гурткі, у якіх было больш за 50 чалавек. Члены гурткоў вялі прапаганду ў Магілёве і навакольных вёсках, распаўсюджвалі нелегальную літаратуру. Сярод іх найбольш актыўным і папулярным быў гімназіст Забела, які дасканала ведаў беларускую мову. У 1882 г. народніцкія гурткі Магілёва ўвайшлі ў Паўночна-Заходнюю арганізацыю «Народнай волі». У 1882–83 гг. у Магілёве былі створаны гурткі народавольцаў-афіцэраў, якія падпарадкоўваліся непасрэдна ваенна-рэвалюцыйнаму цэнтру «Народнай волі» і вялі прапаганду сярод афіцэраў з мэтай падрыхтоўкі ваенных кадраў для будучага паўстання. Яны былі строга законспіраваны і засталіся нераскрытымі царскімі ўладамі.

У 19 – пач. 20 ст. працягваў развівацца эканамічны патэнцыял горада, утвараліся прамысловыя прадпрыемствы. На тэмпы роста вытворчасці паўплывала правядзенне праз горад у 1902 годзе чыгункі. У 1859 г. у Магілёве пачаў дзейнічаць першы тэлеграфны аппарат, з 1879 года водаправод, з 1910 года першая гарадская электрастанцыя, з 1911 года таксі, з 1904 года гарадская тэлефонная сетка і г.д. З 1802 г. дзейнічае гарадская бальніца, з 1809 г. мужчынская гімназія, з 1888 г. гарадскі тэатр, у 1913 г. першая ВНУ – Магілёўскі настаўніцкі інстытут. Змяніўся нацыянальны склад горада: у першае дзесяцігоддзе 20 ст. палову жыхароў Магілёва складалі яўрэі; з другога боку, на перапісу 1897г., амаль 52% патомнай шляхты горада назвалі ў якасці роднай мовы – беларускую.

Горад – гэта перш-наперш людзі, якія ў ім жывуць і надаюць месцу непаўторнае аблічча. У Магілёве, згодна дадзеным першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года, жыло 43119 чалавек, у тым ліку 21520 асоб мужчынскага і 21559 - жаночага полу. На момант перапісу ў ім знаходзілася таксама 1244 чалавек “часова знаходзіўшыхся ў месцы перапісу”, 77 “замежных падданых”. У 1913 г. насельніцтва Магілёва ўжо складала 69707 чал. Горад меў прадмесці: Маскоўскае, Пелагееўка, Карабанаўка і шэраг іншых. Сёння, у пачатку 21 ст., колькасць магілёўцаў дасягнула 370 тыс. чалавек і вырасла ў 8,6 раза ў параўнанні з першым перапісам 1897 года.

Магілёў з’яўляўся буйнейшым горадам Магілёўскай губерні. У іншых павятовых гарадах было ў сярэднім па 4-10 тыс. чалавек. Адзіны Гомель (36 775 чал.), які хутка рос у другой палове 19 ст., набліжаўся да губернскага цэнтра. У Магілёве жыло 29,29% усяго гарадскога насельніцтва губерні. На тэрыторыі сучаснай Беларусі па колькасці жыхароў ён саступаў толькі Мінску (90,9 тыс.), Віцебску (65,9 тыс.), і Брэсту (46,6 тыс.).

Яўрэйскую мову лічылі роднай 21453 чал. (49,75%), польскую - 1325 (3,07%), беларускую, рускую (вялікарускую) і ўкраінскую (маларускую) - 19772 (45,85%). З апошніх 12847 (29,79%) назвалі роднай беларускую мову. Трэба падкрэсліць, што сярод іншых губернскіх цэнтраў “Паўночна-Заходняга краю” Магілёў быў самым беларускім горадам. У Мінску ў канцы мінулага стагоддзя беларускую мову назвалі роднай толькі 9% жыхароў, а ў Віцебску і Гродна - ля 12%.

Найбольшай рэлігійнай абшчынай былі іўдзеі -21547 чалавек (49,97%), а сярод хрысціян - праваслаўныя -18992 чал. (43,88%). Рыма-каталікоў было 2279 чал. (5,28%), стараабрадцаў і тых, хто ўхіляўся ад праваслаўя - 107 чал. (0,25%), пратэстантаў - 255 (0,59%), мусульман - 6. Яўрэі на 99,9% вызнавалі іўдзейства. Немцы і латышы ў большасці былі пратэстантамі. Найбольш рыма-каталікоў было сярод палякаў (99%), а праваслаўных - сярод беларусаў (96,6%) і рускіх (93,9%).

Па саслоўях насельніцтва горада дзялілася наступным чынам: 4167 - дваране, 845 - духавенства, 730 - купцы, 29 428 - мяшчане, 6988 - сяляне, 77 - замежныя падданыя і 884 - прадстаўнікі іншых саслоўяў. Такім чынам, патомнае і асабістае дваранства складала амаль дзесятую частку жыхароў горада.

Палавая структура насельніцтва была ў той час амаль ідэальнай. Таго дысбалансу (колькаснай перавагі жанчын над мужчынамі), які склаўся пасля дзвюх сусветных войнаў і захоўваецца да сённяшняга часу, не існавала. Жанчын было толькі на 0,18% болей, чым мужчын. Для параўнання: сёння прадстаўніц «слабага полу» значна болей за прадстаўнікоў "моцнага". Большасць сем'яў мела 5-10 сваякоў. Разводы былі выключна рэдкай справай, на ўвесь горад разведзенымі прыходзіліся 21 мужчына і 98 жанчын. А вось удаўцоў і ўдоў было даволі многа (548 і 2158 адпаведна). Большасць разведзеных адносілася да купцоў, мяшчан ды іншых гарадскіх саслоўяў, а па нацыянальнаму складу да яўрэяў - 107 з агульнай колькасці ў 119 чал. Праблему ўтварэння ўласнай сям'і большасць юнакоў і дзяўчат вырашала ва ўзросце 20-29 гадоў. Дарэчы, у паветах губерні шлюбны ўзрост быў ніжэйшым, дзяўчаты раней, чым у гарадах, выходзілі замуж.

Цікава прасачыць і заняткі жыхароў нашага горада, крыніцы іх існавання. У канцы стагоддзя (па дадзеных перапісу) у Магілёве пражывала 13040 мужчын і 6026 жанчын, якія мелі самастойныя заняткі. На прыватнай службе, у тым ліку прыслугай і падзёншчыкамі, працавалі 971 мужчына і 2242 жанчыны (разам 3213 чал.). Другой па колькасці групай былі вайскоўцы - 2626 чал. На трэцім месцы знаходзіліся гандляры - 1314 мужчын і 735 жанчын (2049). Яны гандлявалі сельскагаспадарчай прадукцыяй і металам, будаўнічымі матэрыяламі і прадметамі побыту, тканінамі і жывёлай, прадметамі раскошы і культу. Некаторыя займаліся гандлем увогуле, без дакладнага вызначэння тавара. 59 гандляроў займаліся піцейным гандлем.

Да іншых масавых заняткаў адносіліся: вытворчасць адзення (1324 мужчыны і 600 жанчын), апрацоўка дрэва (559 і 3), земляробства (360 і 115), апрацоўка жывёльных прадуктаў (376 і 5), металу (252 і 1), раслінных і жывёльных харчовых прадуктаў (290 і 121). У паліграфіі было занята 185 мужчын і 24 жанчыны, у вучэбнай дзейнасці - 370 і 153 адпаведна, у навуцы, літаратуры і мастацтве - 49 і 10, на будаўніцтве - 554 і 2, у ізвозным промысле - 364 і 3. Вялікую групу складалі кіраўнікі розных рангаў. Да адміністрацыі, суда і паліцыі адносіліся 735 чалавек. Усе яны мужчыны. Займаліся богаслужэннем хрысціянскага і нехрысціянскага спавядання - 132 чал. Прастытуцыяй займаліся 28 чалавек: 1 мужчына і 27 жанчын. Усяго ў губерні, дарэчы, гэтым промыслам было занята 96 чалавек (2 і 94).

Магілёўскіх мяшчан 19 стагоддзя патрэбна падзяляць на дзве часткі: карэнныя жыхары горада і прыпісныя, перайшоўшыя ў мяшчане з іншых саслоўяў: дваравых, шляхты, адстаўных жаўнераў, габрэяў і г.д. Будзем весці гаворку аб карэнных жыхарах Магілёва.

Галоўнай маёмасцю мяшчан горада былі дом і агароды, з якіх адзін знаходзіўся побач з домам, а другі – за горадам. Зямельная ўласнасць шанавалася мяшчанамі, лічылася асновай дабрабыту, і кожны, назбіраўшы колькі грошай, імкнуўся набыць агарод ці сенакосную лугавіну. Гэта рабілася таму, "што зямля ні гарыць і ня тонець". Акрамя гэтага, гараджане мелі і жывёлу, але ўтрымлівалі яе вельмі цікава. Напрыклад, коней яны ўтрымлівалі, у большасці, толькі вясну-восень. Штогод вясной, калі ўжо была трава, набывалася 2–3 кані, а ўвосень на

кірмашах іх прадавалі. Кароў таксама мелі, пакуль яны давалі малако, “ад цялёнка да цялёнка”. Увосень карову прадавалі на мяса і набывалі “зімовую карову”, якая ўжо ацялілася. Малака мяшчане ўжывалі мала, у асноўным мелі яго на продаж. Усе, нават бедныя, утрымлівалі шмат свіней, бо было шмат таннай бульбы і мукі.

Магілёўскія мяшчане былі вельмі працавітымі (словы “гультай” або “гультайка” лічыліся крыўднымі і абразлівымі) і набожнымі.

Акрамя таго, мяшчанам, за рэдкім выключэннем, была ўласціва вялікая ашчаджальнасць, нават скупасць. Яны заўжды мелі ў запасе грошы. Усе ўпотайку рабілі зберажэнні. З цягам часу атрымліваліся значныя сумы. Аддаваць у банк на захоўванне іх не любілі, а хавалі недзе ў хаце, найчасцей сярод старызны. У выніку адбываліся смешныя выпадкі.

Адна мяшчанка сталага ўзросту была ноччу абрабавана. Злодзей залез праз акно і прыхапіў вісеўшыя на цвіку сукенкі, старую вопратку, якая ляжала ў куце за куфрам. Раніцай мяшчанка са слязьмі прыйшла ў паліцыю і заявіла аб крадзяжы. Яна апісала свае рэчы, асабліва апісвала старую “куртку” (кофту), на якой звонку былі “два лапіка”, а ўнутры – “тры лапіка”. Паліцыя пачала пошук. Увечары мяшчанку паклікалі і сказалі, што пачалі адшуквацца рэчы. Ды вось толькі напачатку знайшлі “нейкую дрэнь”. “Ці не твая гэта кофта?” – пытаюцца. Тая дрыжачымі рукамі хапае вопратку, аглядае і ў радасці крычыць: “Мая, мая, слава Богу!” Усе здзівіліся з гэтай радасці. А мяшчанка кажа прыставу: “Дазвольце ножык”. Потым яна адпорвае лапікі, а пад імі было зашыта ўсяго 300 рублёў асігнацыямі.

Да другой мяшчанкі ў Магілёве, падчас адсутнасці дома мужа, зайшоў знаёмы жабрак. Пакарміўшы таго, яна запыталася: “Ійдзе твая шапка?” Той адказаў, што сабакі парвалі. Узгадаўшы, што ў бакоўцы (частка хаты) ляжыць старая зімовая шапка мужа, якую той даўно не носіць, адшуквае яе і дае старому жабраку. Той дзячыць, апранае і выходзіць. Але раптам на вуліцы яго сустракае гаспадар, пазнае сваю шапку і са здзіўленнем запытвае: “Ійдзе ты ўзяў гэту маю шапку?”. “Дзякую, твая гаспадыня падаравала”, - адказвае жабрак. “Во, дурная баба, – кажа гаспадар, – летам дарue зімовую шапку, на во лучшы маю”. Дае свой картуз і паспешліва забірае старую. Вяртаецца дадому. Сустракае жонку і б’е яе. “Як ты смееш раздаваць мае вешчы!?” – крычыць ён. Тая апраўдваецца, што шапка старая і нічога не каштуе. У адказ гаспадар падпорвае шапку і, на здзіўленне жонкі, дастае з той пачак грошаў.

Але найбольшай бядою для мяшчан у 19 ст. была гарэлка. Галоўным недахопам было п’янства. Падчас якога гаспадарамі прагульваліся вялікія грошы. “У мяне і каровы, у мяне і свіней многа, толькі Стэхван (муж Сцяпан) гарэлку п’е, жыць не дае”, – казала калісьці адна з гаспадынь. Да яе слоў і ў той час, і зараз можа далучыцца не адна магілёўская жанчына.

Зусім іншае было ў час, калі Магілёў меў самакіраванне (16-18 стст.). Маецца на ўвазе тое, што калі мужчына і жанчына бралі шлюб, маёмасць кожнага дакладна ўлічвалася і запісвалася ў магістрацкія кнігі. Маёмасць жонкі заставалася яе ўласнасцю. Муж меў магчымасць распараджацца сваёю і жонкінай толькі з яе згоды. Таму жанчыны ў Магілёве пачувалі сябе даволі ўпэўнена і не

былі “рабынямі” сваіх супругаў. Калі жонка памірала бяздзетнай, муж павінен быў вярнуць яе пасаг назад да жончынага бацькі, калі яго ўжо не было – брату.

У канцы 19 -пачатку 20 стст. прыдняпроўскі горад хутка развіваўся. Па свайму добраўпарадкаванню і тэхнічнаму стану Магілёў імкнуўся не адставаць ад іншых губернскіх гарадоў Беларусі і Расіі. У пачатку 20 стагоддзя горад меў водаправод, тэлеграф, тэлефон, электрычнае асвятленне. Не толькі возчыкі, але і конка, таксі развозілі пасажыраў па горадзе. А рэгулярная пошта з’явілася ў Магілёве яшчэ тады, калі ён знаходзіўся ў складзе Рэчы Паспалітай. Напрыклад, з 1667 г. праз горад адбываўся абмен карэспандэнцыяй з Масковіяй па маршруту Вільня-Мінск-Магілёў-Смаленск-Масква. У канцы 18 ст. праз Магілёў праходзіў Канстанцінопальскі тракт, які далей вёў у Асманскую імперыю.

У сярэдзіне 19 ст. наш горад атрымаў дарогі новага тыпу, якія больш надзейна звязвалі яго з іншымі гарадамі, мелі дакладна спланаванае палатно, абочыны, кюветы. На іх пасярэдку ладзілася пакрыццё са шчэбню шырынёй 2,5 сажані (5,25 м). У 1849 г. адкрыўся рух па шашы Магілёў-Віцебск, а ў 1851 г. - Магілёў-Доўск. У 1850 г. завершана будаўніцтва шашы Магілёў-Бабруйск, а ў 1851 г. - Маскоўскага тракта праз Крычаў-Доўск-Бабруйск-Слуцк. Тракты абсаджваліся ў два рады бярозамі, уздоўж іх ставіліся верставыя слупы круглага сячэння і вышынёй 4,125 аршына (3 м). Для зручнасці карыстання друкаваліся “паштовыя дарожнікі” - даведнікі з указаннем маршрутаў, адлегласці і назваў станцый, колькасці коней пры іх (своеасаблівыя прадвеснікі атласаў аўтамабільных дарог). У другой палове 19 ст. назіраўся спад у развіцці дарожнай сеткі. На першае месца выходзіць будаўніцтва чыгунак. Толькі ў 20 ст. з развіццём аўтамабільнага транспарту значэнне дарог зноў узрасло. У 1928-1932гг. была пабудавана дарога Мінск-Магілёў, а ў другой палове стагоддзя былі рэканструяваны старыя тракты.

Транспартнае значэнне Дняпра хаця і зменшылася, але ў канцы 19 ст. рака па-ранейшаму заставалася эканамічнай воссю Магілёўскай губерні. Магілёўскі порт іграў важную ролю як у пасажырскіх, так і ў таварных перавозках. Ужо з 1860 г. паміж Магілёвам і Шкловам хадзіў параход “Русалка” з рухавіком магутнасцю 25 конскіх сіл. Яшчэ больш інтэнсіўна зносіны здзяйсняліся з партамі, якія знаходзіліся ніжэй па Дняпру, у тым ліку з Кіевам. У 1907 г., напрыклад, за навігацыю, якая працягвалася з 30 сакавіка па 26 кастрычніка, па Дняпру ў межах губерні было перавезена 56406 чалавек і 229457 пудоў грузу. Рэйсы здзяйснялі 11 грузапасажырскіх параходаў.

З параходным рухам звязана падзея па перанясенню святых мошчаў Прэпадобнай князёўны Еўфрасінні з Кіеўскіх пячор у г. Полацк, якая адбылася ў 1910 годзе. Па шляху рака з мошчамі на працягу трох дзён знаходзілася ў Магілёве. З Кіева да Оршы яна перавозілася на параходзе па Дняпры.

У гонар прыбыцця ў наш горад мошчаў Еўфрасінні Полацкай адбыліся ўрачыстасці, у якіх брала ўдзел вялікая колькасць веруючых як шляхетнага, так і простага звання. Да іх рыхтаваліся ўсе – святары, народ, урад.

Раніцай 30-га красавіка (13 мая) тры параходы (на адным знаходзіліся мошчы, два другіх выконвалі функцыю суправаджэння) чакаліся ў Магілёве. У той дзень было добрае сонечнае надвор’е. Рынкі, нягледзячы на гандлёвы дзень,

амаль што пуставалі. Гарадскія вуліцы былі запоўнены багамольцамі, якія прыбылі на ўрачыстасці.

Узбярэжжа Дняпра было ўпрыгожана сцягамі. Бакавая алея саду Дамбавецкага (сёння частка Савецкай плошчы і парк імя Горкага) таксама сустракала сцягамі і слупамі, што былі абвітыя зялёнай ігліцай. На казённай прыстані выдавалася багата аздобленая арка з надпісам "Гряди во славу Божию Преподобная Мати", гербам Магілёўскай губерні і дзяржаўнымі расійскімі сцягамі. Падобныя аркі былі таксама ў пачатку і ў канцы Дняпроўскага – імя Пятра I – спуску, які начынаўся каля прыстані і цягнуўся ўгару да ратушы і далей, ля Васкрасенскай царквы ды на рагу вул. Дваранскай (сучасная Камсамольская) і Дняпроўскага пр-ту (сёння – вул. Першамайская).

Ля Іосіфскага кафедральнага сабора мураваная брама была аздоблена не толькі ігліцай. Па версе былі зроблены электрычныя лямпачкі. Насупраць брамы знаходзіліся адзінкавая і патройная аркі, упрыгожаныя гірляндамі і гербамі. Багата выглядала і паперць сабора. Каля саборнай званіцы шпарка вёўся гандаль абразамі Прэпадобнай Еўфрасінні ды раздавалі рэлігійныя брашуры. Далей па перыметры, за саборам, стаяла апошняя аздобленая арка. Упрыгожанымі таксама былі і цэнтральныя вуліцы, асабліва будынкі губернатара і губернскага праўлення (не захаваліся; знаходзіліся на сучаснай Савецкай плошчы).

Ранішнія цягнікі прывезлі ў горад новыя натоўпы багамольцаў. На вуліцах з'яўлялася ўсё больш вясковых святароў, якія прыбылі з сем'ямі з аддаленых куточкаў краю, каб аддаць пашану вялікай святыні Беларусі. А чатырнаццатай гадзіне раздаліся гукі званоў усіх храмаў горада – ішлі крыжовыя хады, якія ўзначальвалі святары ў залатых шатах. Накіроўваліся да шануемага магілёўцамі Брацкага Багаяўленскага манастыра (не захаваўся). Праз паўгадзіны насустрач святыні да прыстані пайшлі епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Стэфан, архімандрыт Мікалай і ігумен Бялыніцкага манастыра Арсеній. За імі – святарства і народ.

Дакладна ў тры гадзіны да прыстані наблізіўся казённы параход "Галавачоў" са святымі мошчамі. Яго сустрэлі гукі хору. На параход узышлі епіскап Стэфан, архімандрыты і старэйшыя святары, каб узняць ды несці святыя мошчы.

Пад гукі званоў і вайсковага аркестра рака са святымі мошчамі была знесеная на зямлю Магілёўшчыны. На спецыяльных насілках яе ўрачыста панеслі да Іосіфскага сабора. Акрамя святарства, іх суправаджалі прадстаўнікі ўраду, начальнік губерні А.Пільц ды іншыя значныя асобы. Вакол працэсіі рушыў ланцуг войска і паліцыі. Багамольцаў было прыкладна 15–20 тысяч. На шляху працэсіі, нават на дахах, было шмат цікаўных, якія маліліся. Вакол быў узорны парадак. Спачатку адбылося набажэнства на вуліцы, потым пачалася ўсяночная. Мошчы ўнеслі ў храм. Да іх падыходзілі багамольцы, якіх падпускалі невялікімі гуртамі.

На наступны дзень раніцай у саборы адбылася ўрачыстая літургія, пасля заканчэння якой адбыўся крыжовы ход з мошчамі вакол сабора. У другой палове дня ў храме з'явіліся навучэнцы і выкладчыкі навучальных устаноў горада, каб укленчыць перад святыняй і адправіць малебны. Увечары зноў пачалася

ўсяночная. Прычым гэта адбывалася ў суботу 1-га (14) мая, у горадзе з'явілася шмат вяскоўцаў. Як узгадваюць сведкі падзеяў, сярод прысутных сяляц, былі нават мінскія і чарнігаўскія. Маляўніча выглядала ўначы саборная плошча, асветленая электралямпачкамі. Багамольцы былі паўсюль, не было і кавалачка вольнага месца. Каля мошчаў бесперапынна знаходзіліся два святары і чатыры манахіні Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра. Усю ноч просты люд прыкладаўся да святыні, усю ноч не спыняўся гандаль абразамі, брашурамі, свечкамі.

Раніцай 2-га (15) мая пакланіліся мошчам жаўнеры мясцовага гарнізону. Затым была апошняя літургія, якую правіў епіскап Стэфан. А шаснаццатай гадзіне пад гукі званоў, спевы і музыку рака з мошчамі была вынесеная з сабора, і ўрачыстая працэсія рушыла да прыстані. Уздоўж вуліц стаяла вялікая колькасць народу, асабліва шмат людзей было на гарадскім вале. Наперадзе ішоў народны хор, які ўвесь час спяваў. Раку з мошчамі неслі святары і прадстаўнікі ўраду. Лесвіца прыстані была ўсыпаная кветкамі. Пад гукі гімна “Коль славен” святыня была ўнесеная на параход. А васемнаццатай гадзіне “Галавачоў” мякка адшвартаваўся ад прыстані. На ўсю раколіцу было чуваць толькі ўхваленне Прэпадобнай. Потым ад прыстані адышлі параходы суправаджэння «Смаленск» ды «Гомель». Некалькі кіламетраў натоўп народу суправаджаў параходы па беразе Дняпра. Па падліках сведкаў, у Магілёве за тры дні ўрачыстасцяў пабыло больш за 75 000 багамольцаў.

Трэба адзначыць, што ўрачыстасці ў гонар святых мошчаў Прэпадобнай Еўфрасінні Полацкай пакінулі значны след у духоўным жыцці горада і надоўга захаваліся ў памяці магілёўцаў.

Пасля адкрыцця ў 1830 г. руху па чыгунцы Ліверпуль-Манчэсцер пачалася эпоха чыгуначных дарог. У 1851 г. у Расіі была пабудавана лінія С.-Пецярбург-Масква, а ў канцы стагоддзя Магілёў ужо быў, напэўна, адзіным губернскім цэнтрам Еўрапейскай часткі Расіі, які ўсё яшчэ не меў гэтага прагрэсіўнага віду транспарту. Магілёўская гарадская дума, губернскае кіраўніцтва, а з 90-х гадоў і Магілёўскае таварыства сельскай гаспадаркі, Магілёўскае таварыства ўзаемнага крэдыту неаднаразова звярталіся ў дэпартамент чыгуначных дарог, міністэрства фінансаў, прыватныя кампаніі з прашэннямі і праектамі аб злучэнні горада з чыгуначнай сеткай Расіі.

Згодна даследаванняў А.Агеева, гарадское і губернскае кіраўніцтва шмат разоў лабіравала ў вышэйстаячых інстанцыях праекты пракладвання стратэгічных чыгуначных ліній праз Магілёў. У канцы 1860-х гадоў лёс, здаецца, усміхнуўся гораду. Праект Маскоўска-Варшаўскай дарогі з лініі Смаленск-Бабруйск-Брэст быў зменены на карысць Магілёва і Мінска. У Магілёве ж прадугледжвалася злучэнне будучай Лібава-Роменскай дарогі з Маскоўска-Варшаўскай. Гэта аўтаматычна зрабіла б Магілёў адным з буйнейшых транспартных вузлоў Беларусі (з улікам ролі Дняпра і стратэгічнай важнасці гэтых магістраляў) і забяспечыла б шпаркі рост прамысловага патэнцыялу і насельніцтва горада. У сваю чаргу апошняе, верагодна, яшчэ больш пачало б падпітваць амбіцыі прыдняпроўскага града на ролю культурнага, эканамічнага і, хто ведае, мажліва, і палітычнага цэнтра Беларусі... Але ўсе выгады ад гэтых праектаў дасталіся Мінску. У 1870 годзе ў камітэце чыгуначных дарог накірунак Лібава-Роменскай

дарогі быў падкарэкціраваны на Гомель-Бабруйск-Мінск. Тады ж быў зменены і праект Маскоўска-Варшаўскай дарогі на карысць лініі Смаленск-Орша-Мінск, што дазволіла скараціць яе даўжыню і выдаткі на будаўніцтва. Мінск стаў транспартным сэрцам Беларускага краю, што шмат у чым вызначыла яго эканамічны ўздым, а пазней - і сталічны статус.

Па розных прычынах не былі рэалізаваныя і іншыя праекты 1880-90-х гг. з удзелам акцыянерных таварыстваў. Дзяржаўныя ж сродкі ў канцы стагоддзя ішлі пераважна на будаўніцтва знакамітай Транссібірскай магістралі. Толькі праект дарогі, якая павінна была злучыць С.-Пецярбург з Кіевам і Адэсай, дапамог вырашыць праблему. У 1900 г. Мікалай II зацвердзіў палажэнне аб дазволе пабудовы чыгункі з Віцебска да Жлобіна. Яе будаўніцтва было завершана ў 1904 годзе, а праз Магілёў яна прайшла ў 1902 г. У гэтым годзе з цэглы быў пабудаваны будынак чыгуначнага вакзала. А вось лінія Крычаў-Магілёў-Асіповічы стала дзейнічаць ужо ў гады савецкай улады. Пасля з'яўлення чыгункі горад атрымаў моцны штуршок да эканамічнага развіцця, росту тэрыторыі за кошт забудовы пустакі палеткаў уздоўж Дняпроўскага праспекта (вул. Першамайскай), які вёў да вакзала.

Як адзначае даследчык А.Агееў, у гэты час значна палепшыўся стан камунальнай гаспадаркі горада. Яшчэ ў 1878 г. інжынер Герц і купец Валкоўскі падпісалі з гарадской управай кантракт на будаўніцтва водаправода. Усе выдаткі ўзялі на сябе падрадчыкі, за што водаправод павінен быў быць іх уласнасцю да 1928 года. Да гэтага гараджане бралі ваду з калодзежаў і карысталіся вадой Дняпра і Дубравенкі. Яе катастрафічна не хапала падчас пажараў. Адразу пасля пуску ў 1879 г. з гараджан сталі за карыстанне водаправодам узымаць па капейцы за кожныя два вядры вады. Водазабор ажыццяўляўся каля маста праз Днепр. Магістральныя трубаправоды былі праведзены па Дняпроўскім праспекце (вул. Першамайская), па вул. Вялікая Садовая (вул. Ленінская), па Быхаўскай і Паштовай (вул. К.Лібкнехта). Спачатку з-за адсутнасці ачышчальных прыстасаванняў якасць водаправоднай вады была не заўсёды здавальняючай. Практычна гэта была звычайная вада з ракі. Пасля 1908 г. былі пабудаваны адстойнікі з фільтрамі, а ў 1915 годзе прасвідраваны дзве артэзіянскія свідравіны, што значна палепшыла якасць вады.

У 1910 г. пачала выпрацоўваць электрычную энергію першая гарадская электрастанцыя, якая працавала ад дызельнага рухавіка. У 1913 г. сумарная магутнасць 4-х яе генератараў складала 330 кВт. Уздоўж галоўных вуліц горада ўсталёўваліся слупы і ладзілася электрычнае асвятленне. З'явілася яно і ў дамах. Працуючыя сёння цеплаэлектрацэнтралі былі ўведзены ў эксплуатацыю ў 1933 г. (ЦЭЦ-1 па вул. Чалюскінцаў, 103) і ў 1969 г. (ЦЭЦ-2 ля в. Навасёлкі).

Асноўную частку ўнутрыгарадскіх перавозак здзяйснялі рамізнікі. У Магілёве так і не быў пабудаваны электрычны трамвай, як, напрыклад, у Віцебску ў 1898 г. Але трэба заўважыць, што Віцебск - трэці горад Расійскай імперыі, які атрымаў гэты прагрэсіўны від гарадскога транспарта тады, калі электрычнага трамвая не было ні ў Маскве, ні ў С.-Пецярбургу. Ён быў толькі ў Ніжнім Ноўгарадзе і Кіеве. Ва многіх іншых гарадах дзейнічала конка - трамвай на конскай цязе. Існавала яна ў пачатку стагоддзя і ў Магілёве. У 1911 г. мешчанін

Самуіл Сагал атрымаў ад паліцэйскага ведамства дазвол на арганізацыю аўтамабільных пасажырскіх маршрутаў ад вакзала да казарм інжынернага ведамства (цяпер завод імя Куйбышава) і да Нова-Чарнігаўскай брамы (вул. Пушкінская) на Лупалава. Так у Магілёве з'явілася таксі.

Тэлеграфная сувязь з'явілася на Беларусі ў 1859 г., калі пачала дзейнічаць першая тэлеграфная лінія Мінск-Бабруйск. Тады ж першы тэлеграфны апарат пачаў дзейнічаць і ў Магілёве.

Тэлефонная сувязь у першыя дзесяцігоддзі 20 ст. імкліва пашыралася як у Магілёве, так і ў губерні. Паводле А.Агеева, пасля таго, як ураджэнец Шатландыі прафесар фізіялогіі органаў мовы Бостанскага універсітэта Аляксандр Грэхем Бел запатэнтаваў 7 сакавіка 1876 г. вынаходніцтва на тэлефон, а ў 1877 г. - на мембрану, у свеце імкліва пашыралася прымяненне тэлефоннай сувязі. У 1878 г. у Нью-Хэйвене (ЗША) была створана першая тэлефонная станцыя, а ўжо праз чатыры гады (у 1882 г.) яны з'явіліся і ў Расіі - у С.-Пецярбурзе, Маскве, Адэсе, Рызе. У 1896 г. была пабудавана першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі тэлефонная станцыя ў Мінску, а да 1917 г. яны з'явіліся яшчэ ў 16 гарадах Беларусі, у тым ліку ў Магілёве, Гомелі, Оршы, Рагачове Магілёўскай губерні, Бабруйску тады Мінскай губерні, а зараз - Магілёўскай вобласці.

Пасля ўвядзення ў 1904 годзе гарадской станцыі ў Магілёве жыхары горада даволі хутка разабраліся ў перавагах тэлефоннай сувязі. Згодна кнізе-даведніку «Весь Могилев на Днепре» на 1912 г., тэлефоны былі як у дзяржаўных установах, так і ў многіх магазінах, страхавых кампаніях, грамадскіх таварыствах, прыватных дамах, рэкламных канторах, заводах, банках і г. д. Часта адным апаратам карысталіся некалькі ўстаноў. Больш за ўсё індывідуальных абанентаў жыло на Дняпроўскім праспекце (вул. Першамайская), на вуліцах Вялікая Садовая (вул. Ленінская); Малая Садовая (вул. Піянерская), Пажарная і Паштовая (вул. К.Лібкнехта), Дваранская (вул. Камсамольская). Былі абаненты і на Быхаўскай, Нова-Чарнігаўскай (Пушкінскі пр-т) вуліцах, у Пячэрску.

У канцы 19 - пачатку 20 стст. значна павялічылася колькасць навучальных устаноў markdown рознага тыпу. У 1907 г. у Магілёўскай губерні было 2049 навучальных устаноў, у якіх вучылася 108 761 чал., з іх 86 884 – мужчынскага полу. 91 установа знаходзілася ў губернскім горадзе, а навучэнцаў у ім было 6023 чал., з іх 4056 - мужчынскага полу. У Магілёве дзейнічалі 2 дзяржаўныя (мужчынская і жаночая) і 2 прыватныя (жаночыя) гімназіі, праваслаўная семінарыя, жаночае епархіяльнае вучылішча, рэальнае вучылішча, 14 гарадскіх і прыхадскіх вучылішчаў, мужчынскае духоўнае вучылішча, 7 царкоўна-прыхадскіх школ, фельчарская і павівальная школы, дзве прыватныя першаразрадныя 8-класныя навучальныя ўстановы, нядзельная жаночая школа. Сваю асобую сістэму адукацыі мелі яўрэі. Яны ўтрымлівалі 54 школы розных тыпаў, у якіх вучыліся 1244 чалавекі.

Нядзіўна, што даволі высокай была пісьменнасць жыхароў губернскага цэнтра: 47,7% яго жыхароў валодалі граматай, у той час калі ў сярэднім па Магілёўскай губерні іх колькасць складала 16,9%. Пісьменнасць сярод мужчын (56,4%) была значна вышэйшай, чым сярод жанчын (39%). Найлепш адукаваным было маладое пакаленне: 76,3% хлопцаў ва ўзросце ад 10 да 19 гадоў і 61,2%

дзяўчат. Сярод мужчын 40-49 гадоў пісьменных было толькі 63,6%, а сярод жанчын - 36,1%.

У 1909 г. горад адсвяткаваў 100-гадовы юбілей сваёй найстарэйшай навучальнай установы - мужчынскай гімназіі. Яна была заснавана яшчэ ў 1789 г. як галоўнае народнае вучылішча, а з 1809 г. набыла статус гімназіі. У пачатку 20 стагоддзя яна мела 13 класаў і больш за 500 навучэнцаў. Выпускнікі ўстановы станавіліся знакамітымі вандроўнікамі, навукоўцамі, урачамі, пісьменнікамі, прадпрымальнікамі розных рангаў. Пасля рэвалюцыі пэўны час яна была яўрэйскай школай, сярэдняй школай № 3, а з 1991 г. зноў атрымала статус гімназіі №3 г. Магілёва.

У навучальных установах існавалі зацверджаныя правілы паводзін навучэнцаў, за выкананнем якіх пільна сачыла адміністрацыя. Дысцыпліна была строгай. Навучэнцаў розных устаноў лёгка было пазнаць нават на вуліцах, бо ў сярэдніх навучальных установах, як правіла, насілася форменнае адзенне. Гэта дысцыплінавала і па-за сценамі школы. Настаўнікі і выкладчыкі карысталіся часцей за ўсё вялікай павагай і часта паводзілі сябе даволі аўтарытарна. Вучоба была даступная далёка не ўсім, і навучэнцы ганарыліся і даражылі ёю. Тым не менш, дзеці ёсць дзеці, і правілы нярэдка парушаліся. Парушэнні фіксаваліся ў спецыяльных журналах. Асабліва пільна назіралі за палітычнымі настроямі навучэнцаў.

Школа ў тыя часы была адным з інструментаў палітыкі русіфікацыі краю. Усе прадметы выкладаліся на рускай мове. Яшчэ ў студзені 1864 г. па распараджэнню міністэрства асветы ў сценах навучальных устаноў увогуле забаранялася размаўляць на родных мовах. Дазвалялася толькі гаварыць на рускай, нават на перапынках. У 1867 г. спецыяльным указам было забаронена друкаванне кніжак на беларускай мове. У пачатку 20 ст. моўная палітыка крыху памякчэла. У 1904 г. былі адменены абмежаванні адносна «мясцовых» моў у дзевяці заходніх губернях Расіі. Тым не менш, праблему стварэння беларускамоўнай школы царызм так і не вырашыў.

У пачатку 20 стагоддзя на Магілёўшчыне, як і па ўсёй Беларусі, назіраўся значны недахоп кваліфікаваных настаўнікаў, які быў выкліканы перш-наперш хуткім пашырэннем сеткі пачатковых і слабаразвітай сістэмай падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

Цікавым сюжэтам гарадской гісторыі пачатку стагоддзя з’яўляецца барацьба Магілёва за права адкрыцця настаўніцкага інстытута. Найбольш цікава і поўна пра гэта распавядае ў сваіх даследаваннях А.Агееў: “У лютым 1909 г. апякун Віленскай вучэбнай акругі паведаміў гарадскім уладам аб рашэнні адкрыць у акрузе настаўніцкі інстытут ў Віцебску або ў Магілёве. Паміж двума гарадамі пачалося сапраўднае спаборніцтва за новую навучальную ўстанову. Улады гарадоў разумелі, якую вялікую асветніцкую, навуковую, культурную карысць будзе мець адкрыццё інстытута і спадзяваліся з цягам часу давесці яго да тыпу вышэйшай навучальнай установы. Магілёў абяцаў бясплатна адвесці ўчастак зямлі для будаўніцтва і штогод выдзяляць 1000 руб. Такую ж грашовую падтрымку абяцала губернскае земства. Віцебск быў гатовы да большых «ахвяр». У выніку ў 1910 г. настаўніцкі інстытут быў адкрыты ў Віцебску.

Магілёўскія губернскія і гарадскія ўлады не змірыліся з няўдачай і праз 3 гады дамагліся адкрыцця ў Магілёве з 1 (14) ліпеня 1913 г. інстытута з «гарадскім пры ім вучылішчам». Ён лічыўся сярэдняй навучальнай установай з 3-гадовым тэрмінам навучання і рыхтаваў настаўнікаў для вышэйшых пачатковых вучылішчаў. Распачаў сваю дзейнасць інстытут у двухпавярховым будынку, які знаходзіўся на Быхаўскай вуліцы і належаў стацкаму саветніку Рыгору Мікалаевічу Гартынскаму...”

Згодна даследаванняў А.Агеева ў верасні 1913 г. адбыліся першыя ўступныя экзамены. Патрабаванні да будучых студэнтаў былі даволі сур’ёзныя. Калі сёння абітурыенты звычайна здаюць 3-4 іспыты, то ў пачатку стагоддзя яны за 15 дзён павінны былі прайсці медыцынскі агляд, напісаць 3 пісьмовыя работы і здаць вусныя іспыты па дзевяці прадметах! У першы год дзейнасці было пададзена 163 прашэнні на паступленне, дапушчана да экзаменаў 106 чалавек, а прынята ў першы клас 35 студэнтаў. Плата за навучанне была ўстаноўлена ў памеры 25 руб. у год. 30 студэнтаў атрымоўвалі стыпендыі па 150 руб. на год. Выпускнікі інстытута, якія атрымоўвалі стыпендыі, абавязаны былі адпрацаваць не менш за 6 гадоў на пасадзе настаўніка вышэйшага пачатковага вучылішча па ўказанню вучэбнага начальства (па 2 гады за кожны год выплаты казённай стыпендыі). Былі таксама гарадскія, земскія, прыватныя стыпендыяты, а таксама «своекоштныя выхаванцы». Сённяшнія два гады адпрацоўкі па размеркаванню пасля пяці гадоў вучобы не здаюцца задужа вялікім тэрмінам у параўнанні з дарэвалюцыйным часам.

Заробкі ў супрацоўнікаў інстытута былі даволі высокія і дазвалялі весці прыстойны лад жыцця. Дырэктар атрымоўваў 2400 руб. у год і кватэрныя, выкладчыкі навук - па 1440 руб. Для параўнання адзначым, што сярэдні заробак па Магілёўскай губерні ў 1913 г. складаў 198 руб. 11 кап. у год. У месяц гарадскія рабочыя атрымоўвалі па 30-40 руб., машыністы паравозаў (рабочая арыстакратыя) - да 80 руб., а заробак выкладчыка навук складаў 120 руб. у месяц. Шкадуючы месца на пералік тавараў, які мелі магчымасць набыць выкладчыкі на свае аклады, заўважым толькі наступнае: абед у шынку каштаваў 20 кап., яйкі ішлі па 2 кап. за адно, бохан хлеба - 4-8 кап., боты - 3 руб., наём жылля - ад 2 да 10 руб. у месяц у залежнасці ад якасці і плошчы. Са сваіх невялікіх заробкаў нават маючыя вялікія сем’і, рабочыя на харчаванне выдаткоўвалі ўсяго 40-50% уласнага сямейнага бюджэту (жонка часцей за ўсё не працавала). Як адзначае А.Агееў і з гэтым нельга не пагадзіцца, пры ўсёй умоўнасці параўнання напрыканцы 20 стагоддзя, дацэнты Магілёўскага універсітэта могуць набыць харчовых тавараў і адзення значна меней, чым выкладчыкі навук Магілёўскага настаўніцкага інстытутаў 1913 годзе. Пры гэтым трэба мець наўвазе, што заробкі розных катэгорый настаўнікаў у тыя часы істотна розніліся. Найвышэйшымі ў Магілёве яны былі ў выкладчыкаў гімназій. Значна меншыя - у настаўніцкім інстытуце, а менш за ўсіх атрымоўвалі настаўнікі пачатковых вучылішчаў. Сёння гэтая навучальная ўстанова вядома, як Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.Куляшова.

У 1888 г. быў пабудаваны гарадскі тэатр, рэстаўрацыя якога была завершана ў наш час у 2002 годзе. Тады ж гэта была знамянальная падзея гарадскога і губернскага жыцця. У ім выступалі многія зоркі расійскага тэатра. А ў пачатку 20

стагоддзя ў Магілёве з'явілася і «сінема». Першыя паказы кіно адбыліся ў 1903 г., а ўжо ў 1909 г. быў пабудаваны кінатэатр «Чары». На яго месцы ў 1930 г. быў узведзены будынак кінатэатра “Чырвоная зорка”.

Магілёў у 1910-я гады жыў напружаным працоўным і крыху правінцыйна-патрыярхальным жыццём. Але эканамічныя буры, палітычныя, ваенныя катаклізмы, стыхійныя бедствы таксама не абміналі горад. У 1900-1903 гг. сусветны эканамічны крызіс прывёў да закрыцця многіх дробных прадпрыемстваў, скарачэння прамысловай вытворчасці. З 1890-х гадоў пачаў назірацца рост забастовачнай барацьбы рабочых. Найбольшага памеру дасягнула ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. У 1914 г. Магілёву давялося вытрымаць новае выпрабаванне - Расійская імперыя ўвязалася ў Першую Сусветную вайну. Тысячы мужчын былі прызваны на фронт, а ў Расію з фронта праз Магілёўскую губерню прайшло больш за 1 млн. уцекачоў. У гэтым сэнсе, напэўна, самым спакойным быў час з 1908 па 1913 гг., калі пасля эканамічнай дэпрэсіі пачаўся перыяд бурнага эканамічнага ўздыму, палепшыўся дабрабыт насельніцтва, прыціхлі класавыя супярэчнасці.

Але і ў тыя гады лёс не даваў гаражанам часу на млявасць і супакой. Магілёўская трагедыя 1910 г. стала вядома ў большасці краін свету. На Магілёў абрынулася велізарнае няшчасце - пажар знішчыў каласальную колькасць пабудоў: 6 (19) чэрвеня на Маскоўскім прадмесці (Лупалава) згарэла 624 жылых дамы і 2 цэрквы, а 7 (20) чэрвеня - яшчэ 3 мураваных і 73 драўляных дамы. Страты склалі 2 мільёны 290 тысяч рублёў (для параўнання: у Гомелі за ўвесь год яны раўняліся 18 тыс. руб.). Цэлыя вуліцы пераўтварыліся ў попел, сотні людзей сталі жабракамі. Гарадскіх рэсурсаў на аказанне дапамогі не хапала. Каб пакрыць усе страты, неабходна было б 5 гадоў выдаткоўваць увесь гарадскі прыбытак на аказанне дапамогі ахвярам пажару. Але ж у горада былі і іншыя выдаткі.

Як адзначае А.Агееў, вестка аб гэтым бедстве абляцела ўвесь свет. І трэба адзначыць, што людзі ў розных краінах не засталіся абыякавымі да трагедыі. У камітэт дапамогі паступілі даволі вялікія ахвяраванні і з Нью-Йорка, і з Парыжа, і з Мельбурна, і з глухога Вес'ягонска... Усё гэта дапамагло паступова забудаваць спустошаныя часткі горада новымі дамамі з выкананнем правіл пажарнай бяспекі: больш шырокімі вуліцамі і г. д. Безумоўна, спрыяла прытоку дапамогі і яўрэйская салідарнасць. Многія пагарэльцы былі «жыдамі». У 1911 г. камітэт па аказанню дапамогі пагарэльцам-яўрэям губернскага горада Магілёва выдаў у друкарні Зусмана асобную справаздачу аб выдаткаванні ім атрыманых сродкаў.

Усяго ў той год у Магілёве адбылося 4 пажары, якія знішчылі 734 дамы. Цікава, што год пачынаўся вельмі спакойна. У зімовыя і вясновыя месяцы ў горадзе пажараў увогуле не было. Затое ў летнія агонь выйшаў з пад кантролю. Усе 4 пажары здарыліся летам і ахапілі па некалькі дзесяткаў дамоў. Дзве трагедыі адбыліся з-за “дурнога устройства печей и труб”, дзве - па неасцярожнасці. Восенню зноў было спакойна. Толькі, прычына, відаць, была ў іншым: амаль не было чаму гарэць.

У адрозненне ад прадмесцяў цэнтральная частка горада была забудавана пераважна мураванымі будынкамі. І вялікія пажары тут былі ўжо рэдкай з'явай. У дваццатае стагоддзе Магілёў уваходзіў, маючы прывабны вонкавы выгляд. У

даведніку за 1912 год “Весь Могилев на Днепре” аўтары без сумневу занатавалі: “Типичный польско-литовскій городъ, Могилевъ, действительно полонъ старины...”, і тым самым яскрава падкрэслілі яго адметнасць і еўрапейскасць. Складальнікі мелі на ўвазе, у першую чаргу, архітэктурнае аблічча горада. Сапраўды, дойлідства – лепшы сродак агітацыі і прапаганды. Таму гэтую адметнасць і еўрапейскасць у 20 стагоддзі заўзята нішчылі, стваралі аднатыпнасць у забудове з адмаўленнем традыцый мінулага.

У складзе Расійскай імперыі найвялікшы росквіт горада прыпадаў на час кіравання Магілёўскай губерніяй – губернатара А.Дамбавецкага. За дваццаць адзін год сваёй дзейнасці (1872-1893 гг.) ён пакінуў гораду будынак жаночай гімназіі, рэальнае вучылішча, будынак тэатра, водаправод, пры ім пачалася тэлефанізацыя. Менавіта ён спрыяў правядзенню археалагічных даследаванняў, адкрыццю першага музея, арганізаваў сбор матэрыялаў і выдаў “Опыт описания Могилёвской губернии” у 3 тамах і г.д.

## Лекцыя 7. Магілёў у час першай сусветнай вайны і рэвалюцый

1. Знаходжанне ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага Расійскай арміі.
2. Магілёў падчас рэвалюцый і акупацый.
3. Падтрымка ідэі стварэння Беларускай народнай рэспублікі (БНР).
4. Укаранаваныя асобы і Магілёў.

### 1. Знаходжанне ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага Расійскай арміі

У 1914 годзе распачалася Першая Сусветная вайна. Неабходна памятаць, што пад такой назвай яна стала вядома пазней. У Расійскай імперыі ад пачатку яна называлася “другая айчынная” (першая – вайна 1812 года), або “германская”. Тысячы магілёўцаў былі мабілізаваны ў войска. У Расію з франтавой паласы праз Магілёўскую губернію прайшло больш за 1 млн. уцекачоў. Ад пачатку вайны Магілёўская губернія была аб´яўлена на ваенным становішчы.

У час вайны, у сувязі з перамяшчэннем баявых дзеянняў на ўсход, з Баранавіч у Магілёў была перанесена Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання рускай арміі. 7 жніўня 1915 г. сюды прыбыў поезд галоўнакамандуючага вялікага князя Мікалая Мікалаевіча Раманава са штабам, а з 23.08.15г. абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве прыняў на сябе імператар Мікалай II.

Стаўка размясцілася на Губернатарскай плошчы. У будынку губернскага праўлення (не захаваўся) размясцілася ўпраўленне генерал-кватэрмайстра па аператыўных пытаннях, дзе пражывалі начальнік Генеральнага штаба генерал М.Аляксееў і вышэйшыя афіцэры штаба. Тут жа знаходзіўся і рабочы кабінет цара. Дом губернатара (не захаваўся) заняў імператар. Разам з ім размясціўся міністр імператарскага двара граф Фрэдэрыкс. У будынку цяперашняга краязнаўчага музея размяшчаліся ўпраўленне дзяжурнага генерала, начальнік ваенных шляхоў зносін, ваенна-марское ўпраўленне і камендант галоўнай

кватэры, якому падпарадкоўваліся ўсе ваеннаслужачыя ў раёне Стаўкі і ўстановы сувязі.

Для аховы Стаўкі кожны дзень выкарыстоўвалася каля 1500 чалавек. Акрамя гэтага, была створана другая лінія аховы ў 20 км ад горада, дзе размяшчаліся вайсковыя часці. Для прыкрыцця Стаўкі ад нямецкіх самалётаў "цэпелінаў" на будынках былі ўстаноўлены вышкі для стральбы з кулямётаў. У ратушнай вежы была размешчана магутная радыёстанцыя.

Адметнасцю жыцця горада ў гэты час было і тое, што тут знаходзіліся ваенныя прадстаўнікі ўсіх саюзных дзяржаў: Англіі, Францыі, Італіі, Бельгіі, Японіі. На вуліцах горада можна было ўбачыць элегантаых ваенных у розных, нязвыклых для вока гараджаніна, формах, што выклікала значную цікавасць з іх боку. У сваёй кнізе "Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве 1915 - 1918 гг." М.Бяляўская на падставе асабістых ураджанняў і ўспамінаў расказвае: "При Николае Николаевиче Ставка была лагерем, деловым и строгим. С первых же дней приезда Государя она внешне потеряла этот облик. Сразу всё изменилось. Приехала оперетка..., театр был до отказу набит дамами и ставочными офицерами... Приехали Великие князья, которых раньше не было, а если и были, то незаметно работали в штабе. Теперь на улицах Могилёва то и дело можно было видеть Царицу, наследника, князей: Дмитрия Павловича, Бориса Владимировича и других лиц Царского Дома и свиты. Вместо Ставки Могилёв приобрёл вид резиденции царской семьи, и война отходила на второй план, забывалась..."

Зіма 1917 г. была надзвычай снежнай і суровай. Баявыя дзеянні прыпыніліся. Салдаты галадалі, пачалася эпідэмія. Армія страціла каля 100 тысяч забітымі і памёршымі. У такім стане яе і застала Лютаўская рэвалюцыя. Відавочца гэтых падзей у Магілёве М.Бяляўская працягвае: "Началась великая русская революция... В Могилёве было иначе. Все эти дни ярко светило весеннее солнце, текли ручьи, и весёлая толпа наполняла улицы, радуясь наступлению весны. Переворота ждали давно, но когда он наступил, то никто этому не поверил...Но уже ночью этого дня Государь выехал в Петербург (дзе 2 сакавіка 1917 г. на станцыі Дно Пскоўскай губерні адрокся ад трона) и вернулся в Могилёв из Пскова уже не Императором Всероссийским, а полковником Романовым". Тут ён развітаўся са штабам Стаўкі, маці Марыяй Фёдараўнай, якая была ў Магілёве праездам з Кіева, вялікімі князямі і 8 сакавіка выехаў у Царскае сяло (г. Пушкін), дзе быў арыштаваны.

Летам 1917 г. Вярхоўным Галоўнакамандуючым быў ужо генерал Л.Г. Карнілаў, які ўзначаліў узброены мяцеж супраць урада А.Ф.Керанскага. Аднак хутка мяцеж быў ліквідаваны, а яго кіраўнікоў: Л.Г.Карнілава, генералаў Дзянікіна, Лукомскага, Маркава, Раманоўскага арыштавалі і ўзялі пад варту ў Магілёве, дзе яны знаходзіліся спачатку ў гасцініцы «Метраполь», а потым былі перавезены ў Быхаўскую крэпасць.

Падчас знаходжання Стаўкі ў Магілёве тут кароткі час служыў і Сяргей Ясенін. Рускі паэт-лірык, знаўца народнай мовы і душы, у 1915 годзе быў прызваны ў армію, дзе атрымаў спецыяльнасць санітара і быў прызначаны ваенным санітарам асабістага поезда яе вялікасці імператрыцы Аляксандры Фёдараўны. 5 красавіка 1916 г. у складзе вялікай світы імператрыцы Ясенін

прыбыў у Магілёў. Праз некаторы час ён дэзерціраваў. Каля двух месяцаў дабіраўся Ясенін да радзімы (в. Канстанцінава Разанскай губерні), дзе ціхенька адседжваўся, бо яму паграджаў ваенны трыбунал. Толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ён пераехаў у Маскву, а потым у Петраград. Існуе меркаванне, што Ясенін падчас знаходжання ў Магілёве пазнаёміўся з магілёўкай Надзеяй Вольпін, і паміж імі завязаўся раман. Пазней Н.Вольпін стала вядомай літаратурнай перакладчыцай Дж. Галсуоры, Р.Уэлса, Конан Дойля.

## 2. Магілёў падчас рэвалюцый і акупацый

Магілёў з΄яўляўся трэццім горадам Расійскай імперыі (пасля Петраграда і Масквы), у якім вырашаўся лёс рэвалюцыі. Таму ў горадзе імкліва адбываліся і мяняліся падзеі: утварэнне саветаў, Карнілаўшчына, кастрычніцкі пераварот у Петраградзе (Кастрычніцкая рэвалюцыя), падзеі ў Стаўке, ліквідацыя Стаўкі, набліжэнне да горада атрадаў бальшавікоў і ўстанаўленне ў горадзе іх улады, пагроза атрадаў Ю. Доўбар-Мусніцкага, германскага войска, уцёкі бальшавікоў, спачатку акупацыя Магілёва войскам Ю.Доўбар-Мусніцкага, а затым германскім, аднаўленне савецкай улады.

Перыяд паміж Лютаўскай рэвалюцыяй і кастрычніцкім пераваротам у гісторыі Магілёва адзін з самых напружаных і разам з тым цікавых. Магілёў быў у той час трэцім (пасля Петраграда і Масквы) цэнтрам, які вырашаў зыход рэвалюцыі.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі на прадпрыемствах Магілёва і ў воінскіх часцях быў выбраны Магілёўскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ён размяшчаўся ў доме губернскага прадвадзіцеля дваранства. 22.3(4.4).1917 г. адбыўся ўстаноўчы сход аб’яднанага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасць месцаў у савеце атрымалі эсэры, меншавікі і бундаўцы (больш за 90%). Старшынёй выканкома стаў меншавік Вятроў, з кастрычніка 1917 г. левы эсэр Тураў. Друкаваны орган – газета “Молот”, з 10.1.1918 г. яна мела назву “Известия Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов”.

Дэпутаты савета падтрымлівалі Часовы ўрад, Стаўку Вярхоўнага галоўнакамандуючага, лозунг пра вайну да пераможнага канца. Пад кіраўніцтвам савета праводзіліся некаторыя дэмакратычныя пераўтварэнні, ствараліся прафсаюзы, салдацкія камітэты, устанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

3(16).3.1917 г. на сходзе Магілёўскага сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда і меншавікоў была створана Магілёўская аб’яднаная арганізацыя РСДРП, так званая «аб’яднанка», але да жніўня бундаўцы стварылі самастойную арганізацыю, якая ўсё ж падтрымлівала сувязі з аб’яднанкай. У савеце, прафсаюзах, органах кіравання Бунд разам з меншавікамі і эсэрамі падтрымліваў палітыку Часовага ўрада. Пасля выхаду з аб’яднанкі бундаўцаў у ёй засталіся ў асноўным меншавікі-інтэрнацыяналісты і «абаронцы», супярэчнасці паміж імі абвастрыліся. Пасля ліпеньскага крызісу колькасць Магілёўскай аб’яднанай арганізацыі павялічылася за кошт далучэння да бальшавіцкай платформы рэвалюцыйна настроеных рабочых і салдат, што выклікала размежаванне бальшавікоў з меншавікамі. У склад камітэта новай аб’яднанай арганізацыі ад

бальшавікоў увайшлі А.Залманзон і Чарніцкі, ад інтэрнацыяналістаў – Калмансон і З.Лазінскі.

У Магілёве па-мінуламу размяшчалася Стаўка. Гэта спрыяла таму, што ў горадзе жылі і працавалі пэўны час, альбо з візітамі бывалі такія добравядомыя асобы як генерал А.Брусілаў, эсэр-кіраўнік Часовага ўраду А.Керенскі, Б.Савінкаў і інш.

У жніўні 1917 г. пачалася падрыхтоўка контррэвалюцыйнага мяцяжу пад кіраўніцтвам вярхоўнага галоўнакамандуючага Л.Г.Карнілава, які намерваўся ўстанавіць ваенную дыктатуру. У Магілёў сцягваліся найбольш верныя Стаўцы вайсковыя часткі. Былі забаронены мітынгі, сходы, уведзена ваенная цэнзура, на дарогах у горад выстаўлены заслоны. Усе дзяржаўныя і грамадскія памяшканні занялі салдаты карнілаўскага ўдарнага палка. 25 жніўня (7 верасня) змоўшчыкі пачалі рухаць на Петраград 3-і конны корпус пад камандаваннем генерала Крымава. У ноч на 27 жніўня (9 верасня) Карнілаў аб'явіў сябе дыктатарам, заклікаў насельніцтва не выконваць рашэнняў Часовага ўрада. Палескі камітэт бальшавікоў стварыў у Магілёве надзвычайную «пяцёрку» для барацьбы з карнілаўшчынай. Пад уздзеяннем гэтай агітацыі салдаты батальёна Георгіеўскіх кавалераў, карнілаўскага ўдарнага палка і іншых вайсковых часцей адмовіліся падпарадкоўвацца сваім камандзірам. Змова генерала Карнілава была ліквідавана. Карнілава і яго паплечнікаў генералаў Дзянікіна, Лукомскага, Маркава, Раманоўскага і іншых арыштавалі і ўзялі пад варту ў Магілёве ў гасцініцы "Метраполь", потым перавялі ў Быхаў, дзе зняволеныя знаходзіліся ў будынку былой гімназіі, адкуль былі пераведзены ў крэпасць. Але яшчэ знаходзячыся пад арыштам у гасцініцы "Метраполь" (трохпавярховы будынак з чырвонай цэглы захаваўся, на рагу вуліц Першамайскай і К.Лібкнехта) генералы складалі планы ўзброенага змагання. Якія былі пераўтвораны ў рэальнасць пасля кастрычніцкага перавароту, здзейсненага бальшавікамі ў Петраградзе. Таму варта казаць аб тым, што "белая гвардыя", антыбальшавіцкі ўзброены рух бярэ свой пачатак з Магілёва.

З пачаткам карнілаўскага мяцяжу Стаўка аб'явіла пра роспуск Магілёўскага савета. Сакратар і некаторыя члены савета былі арыштаваны. Большасць дэпутатаў перайшла на нелегальнае становішча і стварыла рэвалюцыйнае бюро па барацьбе з контррэвалюцыяй. У адной з друкарняў тайна была надрукавана і распаўсюджана адозва «Да працоўных і салдат», якая заклікала да абароны рэвалюцыі. Пасля ліквідацыі карнілаўскага мяцяжу савет узнавіў работу.

Як адзначае даследчык М.Лысенка, у верасні 1917 г. ў выканкам Магілёўскага савета былі кааптаваны бальшавік А.Залманзон і сацыял-дэмакрат-інтэрнацыяналіст З.Лазінскі. Частка дэпутатаў ад мелкабуржуазных партый пачала падтрымліваць бальшавісцкія лозунгі. Дэлегатамі на II Усерасійскі з'езд саветаў выбраны сацыял-дэмакрат-інтэрнацыяналіст С.Гонікман і левы эсэр В.Пятроў. Савет, асабліва яго кіраўніцтва, увогуле падтрымліваў палітыку Часовага ўрада. Гэта вызначыла адмоўныя адносіны большасці дэпутатаў да кастрычніцкага ўзброенага паўстання ў Петраградзе.

Сярод гэтых падзей варта вылучыць некалькі, якія надоўга засталіся ў памяці магілёўцаў. Была зроблена спроба аднавіць манархію – "быў пакліканы на

царства" нейкі Мітрафан. У лістападзе 1917 года прадстаўнікі розных палітычных партый спрабавалі ўтварыць у Магілёве агульнарасійскі ўрад на чале з В.Чарновым.

Выконваючы абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, генерал М.Духонін падцягваў да Магілёва верныя Стаўцы вайсковыя часці: ударныя батальёны, палкі корпуса генерала Ю.Доўбар-Мусніцкага, казацкую дывізію. Абарону Магілёва і падрыхтоўку ваеннага выступлення супраць урада бальшавікоў Духонін даручыў генералу Л.Карнілаву, які знаходзіўся пад арыштам у Быхаве. У Магілёве згрупаваліся вядомыя дзяржаўныя і палітычныя дзеячы – былыя міністры Часовага ўрада Мілюкоў і Вярхоўскі, лідэры меншавікоў і эсэраў Чарноў, Цэрэтэлі, Скобелеў, Гац, а таксама прадстаўнікі Антанты, якія адмовіліся прызнаць савецкі ўрад. Усе яны аб'ядналіся вакол Стаўкі і агульнаармейскага камітэта і спрабаваліператварыць горад у апорны пункт барацьбы супраць савецкай улады. У Магілёве распрацоўваліся палітычныя планы, у ажыццяўленні якіх разам з генералітэтам Стаўкі актыўна ўдзельнічаў Духонін. 7 лістапада камісар Часовага ўрада пры Стаўцы Станкевіч склікаў нараду лідэраў буржуазных і дробнабуржуазных партый, прадстаўнікоў агульнаармейскага камітэта, камітэта выратавання Радзімы, некаторых членаў Часовага ўрада, генералаў і афіцэраў Стаўкі, на якой было прынята рашэнне пра неадкладнае стварэнне новага ўрада Расіі на чале з эсэрам Чарновым.

Пасля нарады агульнаармейскі камітэт у сваёй адозве «Ад імя ўсіх франтоў» заявіў аб незаконнасці савецкага (бальшавіцкага) ўрада і прапанаваў усім армейскім арганізацыям прыняць удзел у стварэнні новага. Аднак разасланыя ва ўсе часці дзеючай арміі тэлеграмы, паводле якіх армейскія камітэты павінны былі браць на сябе ініцыятыву стварэння новай улады, уплыву не мелі, салдацкія масы не падтрымалі гэтыя дырэктывы.19.11.(2.12)1917 г. горад быў заняты атрадамі рэвалюцыйных войск пад камандаваннем М. Крыленка.

Поўныя трагізму драматычныя старонкі Магілёўскай гісторыі перыяду акупацыі горада атрадамі корпуса легіянераў генерала Доўбар-Мусніцкага і войскамі немцаў пасля зрыву Брэсцкіх мірных перагавораў.

Асноўныя сілы корпуса Доўбар-Мусніцкага размяшчаліся ў Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай, Калужскай і Смаленскай губернях са штабам у Мінску, з канца 1917 г. – у Бабруйску. Пасля кастрычніцкага перавароту яны былі сканцэнтраваны ў раёне Жлобіна, Рагачова, Бабруйска.

У момант ліквідацыі Стаўкі Доўбар-Мусніцкі спрабаваў аказаць ваенную дапамогу Духоніну, садзейнічаў уцёкам з Быхава генерала Карнілава і іншых генералаў. Доўбар-Мусніцкі адмовіўся прызнаць савецкую ўладу, не выканаў пастанову савецкага ўрада аб дэмакратызацыі арміі, выступаў у абарону землеўладанняў памешчыкаў у Беларусі, падтрымаў патрабаванні польскіх нацыяналістаў аб далучэнні Мінскай і Магілёўскай губерняў да Польшчы. Наогул, ён ставіў мэту аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Таму калі яго жаўнеры занялі Магілёў, на ратушы была ўсталявана дошка з тэкстам аб аднаўленні Рэчы Паспалітай.

12(25).1.1918 г. Доўбар-Мусніцкі падняў антысавецкі мяцеж і пачаў наступленне на Магілёў і Мінск. Легіянеры разганялі саветы, расстрэльвалі савецкіх і партыйных работнікаў, вярталі маёнткі памешчыкам.

Выканком Магілёўскага губернскага савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў прымаў рашучыя меры супраць мяцежнікаў, выдаў дэкрэт аб арышце прадстаўнікоў памешчыкаў і тых лідэраў кадэтаў і «Саюза зямельных уласнікаў», якія дапамагалі ці спачувалі корпусу Доўбар-Мусніцкага. У Магілёве былі арыштаваны і аддадзены пад суд рэвалюцыйнага трыбунала кіраўнікі контррэвалюцыйнай змовы (так іх кваліфікавалі бальшавіцкія ўлады, на самой жа справе гэта былі звычайныя заложнікі, якія былі ні ў чым не вінаватыя, гэтай жа думкі прытрымліваецца і даследчык М.Лысенка) – каталіцкі епіскап князь Святаполк-Мірскі, былы Магілёўскі губернатар барон Карл Нолькен, магнат Сігізмунд Лявіцкі і інш. 19 лютага ў час пасяджэння трыбунала група прыхільнікаў арыштаваных спрабавала, паводле афіцыйнай версіі, вызваліць сваіх аднадумцаў, але была разагнана чырвонагвардзейскім атрадам Арыштаваных рэўтрыбунал прыгаварыў да расстрэлу. Які і быў выкананы. Закладнікаў расстралялі ў лясочку на ўскрайку горада. Гэтае месца знаходзіцца цяпер па праспекту Дзімітрава, насупраць мясакамбінату, дзе стаіць памятны крыж у гонар ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Пасля заняцця горада атрадамі Доўбар-Мусніцкага адбылося перазахаванне епіскапа на каталіцкіх могілках па цяперашняй вуліцы Лазарэнкі (раней Віленская), у 2004 годзе намаганнямі магілёўцаў там быў пастаўлены помнік Святаполк-Мірскаму.

Для барацьбы з польскімі легіянерамі Магілёўскі губрэўком сфарміраваў чырвонагвардзейскія атрады з рэвалюцыйных салдат, рабочых і сялян. Былы унтэр-афіцэр А.Старасотнікаў узначальваў работу па фарміраванні 1-га Магілёўскага чырвонагвардзейскага палка. Аб’яднаныя сілы Магілёўскага, Мінскага і Віцебскага атрадаў, латышскіх стралкоў і рэвалюцыйных матросаў у сярэдзіне лютага 1918 г. ў раёне Жлобіна–Рагачова разграмілі 1-ю Польскую дывізію і нанеслі паражэнне 2-й дывізіі, прымусіўшы іх адступіць да Бабруйска. Магілёўскі губрэўком 16 лютага выступіў з адозвай да легіянераў корпуса, у якой заклікаў салдат “пераходзіць на бок рэвалюцыйных сіл”.

18.2.1918 г. пасля заканчэння тэрміну дагавору аб перамір’і Германія аднавіла ваенныя дзеянні супраць савецкай рэспублікі. Разам з нямецкімі войскамі наступалі і часткі корпуса Доўбар-Мусніцкага. Паводле закліку ВРК у Магілёве і на тэрыторыі Магілёўскай губерні разгарнулася актыўная работа па фарміраванні падраздзяленняў Чырвонай гвардыі. З Магілёва, Петраграда ў паветы і воласці губерні было накiравана каля пяцідзесяці партыйных агітатараў і арганізатараў. Як піша М.Лысенка, 23.2.1918 г. газета “Правда” паведамляла, што на тэрыторыі Магілёўскай губерні фарміруецца некалькі чырвонагвардзейскіх палкоў. З набліжэннем да Магілёва германскіх войск на пасяджэнні губрэўкома паўстала пытанне пра абарону горада. Але губрэўком не меў дастатковай узброенай сілы, знаходзіўся ў стане панікі і разгубленасці, і было вырашана пакінуць горад без бою і пераехаць у Мсціслаў. Рэўком, губвыканкам і іншыя губернскія ўлады, якія не апавясцілі насельніцтва горада пра сваё рашэнне, спешна пакінулі Магілёў, іх ад’езд, на думку І.Філіповіча і з якой нельга не

пагадзіцца, больш нагадваў уцёкі. Пры чым уцекачы не забыліся прыхапіць з сабой банкаўскую казну, у якой было больш за 64 млн. руб. і грашовыя сумы надзвычайнага падатку, які быў тэрмінова сабраны напярэдадні ўцёкаў. Грошы тыя былі падзелены паміж некалькімі асобамі і ў значнай меры былі растранжыраны. Нязначная частка іх трапіла ў банкі гарадоў Арол, Сімбірск, Сызрань. У далейшым новы Магілёўскі губвыканкам, створаны ў Мсціславе, спрабаваў вярнуць вывезеныя грошы і пакараць вінаватых у казнакрадстве і не арганізацыі абароны горада, але поспеху не меў. Хтосьці з вінаватых загінуў, а кагосьці (напрыклад Аронава і інш.) пазбавілі адказнасці, улічваючы іх “вялікія рэвалюцыйныя заслугі”.

12.3.1918 г. у Магілёў увайшлі легіянеры генерала Доўбар-Мусніцкага, 26.5.1918 г. – германскія войскі.

У горадзе і губерні былі разагнаны савецкія і партыйныя органы, вернуты да ўлады дума і земская ўправа, забараняліся мітынгі і сходы, устаноўлены каменданцкі час, уведзена пакаранне смерцю за захаванне зброі, пашкоджанне тэлефонных правадоў, чыгункі. Пачалі выходзіць газеты “Могилевский вестник”, “Труд”, “Жизнь” і “Эхо”.

Ва ўмовах акупацыі ў маі – кастрычніку 1918 г. дзейнічаў Магілёўскі падпольны раённы камітэт РКП(б) на чале з А.Брэгманам (Жалезняком), які кіраваў дзейнасцю Шклоўскага і Быхаўскага падраённых камітэтаў РКП(б). У будынку побач з Губернатарскай плошчай, які меў шыльду “Пральня”, знаходзілася канспіратыўная кватэра камітэта, а ў будынку былога казначэйства – падпольная друкарня, кіраваў ёю старшыня рабочага камітэта друкароў П.Васільеў.

Магілёўскі раённы падпольны камітэт РКП(б) праводзіў актыўную работу сярод насельніцтва горада і нямецкіх салдат, распаўсюджваў бальшавісцкія лістоўкі, газеты, здабываў зброю, арганізоўваў і кіраваў партыйным падполлем і партызанскім рухам. Падпольны камітэт быў звязаны з партызанскімі атрадамі А.Арлова, Мельнікава, С.Дзергачова, Карпава, Ксяндзова, Карташова і інш., што дзейнічалі ў Магілёўскім, Быхаўскім і Шклоўскім паветах. Аб’яднаныя сілы партызанскіх атрадаў 23.5.1918 г. вызвалілі задняпроўскую частку горада – Лупалава. Асабліва вылучыўся Чавускі атрад І.Якубава (камандзір, потым стаў ваенным камендантам Лупалава). 18.5.1918 г. быў створаны Лупалаўскі савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

### 3. Падтрымка ідэі стварэння Беларускай народнай рэспублікі

Сёння стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ў гісторыі Беларусі разглядаецца як першая спроба стварэння незалежнай беларускай дзяржавы ў 20 стагоддзі. Але малавядомы факт аб тым, што Магілёў быў адзіным буйным горадам, дзе на прадстаўнічым сходзе было падтрыма стварэнне незалежнай БНР. Гісторыя падзеі была наступнай.

Апасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 году ў Магілёве ўтварыўся Беларускі гурток. У чацвёртым нумары (1917 г.) “Вестника Могилевского земства” паведамлялася, што арганізацыйнае паседжанне “кружка могилёвских Белоруссов” адбылося на кватэры прысяжнага паверанага Рэута 31.03.1917 г.

Гурток утварылі асобы з мэтай “возродить Белоруссию к самостоятельной свободной жизни”. Планавалася ў будучыні стварыць “Союз белоруссов”, які выпрацуе правілы будучага ладу Беларусі і яе адносіны да Расіі, Польшчы і Літвы. Але напачатку сябры гуртка вырашылі прыняць удзел у працы Ўсебеларускага кангрэсу ў Мінску. Ад гуртка вылучаліся на з’езд: пробашч Магілёўскага касцёла Лапошка (ад беларусаў-каталікоў) і настаўнік рэальнага вучылішча М.Кахановіч (ад беларусаў-праваслаўных).

Колькі слоў пра Міхала Кахановіча (1884-1934). Беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, да першай сусветнай вайны выкладаў гісторыю ў гімназіях Вільні, з’яўляўся сапраўдным сябрам Паўночна-Заходняга аддзелу Расійскага Імпэратарскага геаграфічнага таварыства. У 1915 г. прыехаў у Магілёў, дзе працаваў у рэальным вучылішчы (зараз там знаходзіцца корпус МДУ імя А.Куляшова на плошчы Арджанікідзе). Адзін з лідараў беларускага руху ў Магілёве, старшыня Беларускага нацыянальнага камітэту. Пазней быў першым дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі. У жніўні 1933 г. органамі ДПУ арыштаваны і 9 студзеня 1934 г. прыгавораны “тройкой” да растрэлу.

Лепшыя сілы беларускай інтэлігенцыі, не страціўшыя нацыянальнага пачуцця, 15.04.1917 г. стварылі ў Магілёве Беларускі нацыянальны камітэт (Магілёўскі беларускі камітэт). Першым выпрабаваннем для новага грамадскага аб’яднання сталі выбары ў мясцовую думу. Трэба ўлічыць, што на той час большасць насельніцтва горада складалі яўрэі і ім было гарантавана 30 месцаў з 62-х. На астатнія, акрамя іншых грамадскіх аб’яднанняў, прэтэндавалі і вайсковыя арганізацыі. Ва ўпартай барацьбе БНК заваяваў шэсць мандатаў, што сведчыла аб ладнай падтрымцы ідэяў камітэту сярод мясцовага насельніцтва.

У канцы красавіка 1918 г. былі атрыманы весткі з Мінску, што 25 сакавіка Беларуская рада абвесціла незалежнасць Беларусі. Магілёўцы сталі абгаворваць паміж сабой пытанне, якім спосабам найбольш урачыста адсвяткаваць у горадзе гэтую падзею. Вырашана было правесці ўрачысты сход.

І вось 12 ліпеня 1918 году ў вялікую залу акруговага суда, а шостай гадзіне ўвечары сталі прыбываць прадстаўнікі ўсіх магілёўскіх устаноў: ад земства губернскага, павятовага, ад мясцовай думы, ад нацыянальных, прафесійных, культурна-асветніцкіх і палітычных арганізацый. Усяго сабралася каля 400 прадстаўнікоў. На павестцы стаяў толькі адзін пункт – аб незалежнасці Беларусі. Пасля доўгіх дэбатаў пытанне было пастаўлена на галасаване і прайшло абсалютнай большасцю галасоў (супраць было 2, устрымалася 9). Такога рэзультату, нават сярод свядомых беларусаў-магілёўцаў, ніхто не чакаў. Гэта быў поўны трыумф дзейнасці БНК, перамога ідэі беларускай незалежнасці. Магілёў – адзіны з буйных гарадоў краіны, хто рашуча падтрымаў Акт 25 сакавіка аб стварэнні незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі! Існуе меркаванне, што менавіта за гэта савецкая ўлада пазней пераўтварыла Магілёў з губернскага цэнтру ў павятовы.

У 1920-30-я гады ў Магілёве ўгодкі БНР, па вядомых звестках (і па зразумелых прычынах), не адзначаліся. У часы гітлераўскай акупацыі 1941-44 гг. найбольшай нацыянальнай свядомасцю вызначылася адна з першых адміністрацый горада, утвораная захопнікамі. Але і яна не паспела адзначыць

гэтую падзею, бо ў пачатку 1943 года большасць сябраў адміністрацыі на чале з бурмістрам былі казнены немцамі. Гэта адбылося яшчэ да таго, як у Мінску ідэі БНР узялі на ўзбраенне тагачасныя лідэры беларускага руху ва ўмовах акупацыі.

У 1970-80-х гг. угодкі БНР святкаваліся свядомымі беларусамі нашага гораду ў вузкіх колах, на прыватных кватэрах. Напрыканцы 1980-х, нехта абклеіў улёткамі з нагоды ўгодкаў БНР аўтобусны прыпынак "аўтазавод імя С.Кірава". У 1990 г. некалькі сябраў культурна-асветніцкай суполкі беларусаў Магілёва "Машэка" прынялі ўдзел у святкаванні ўгодкаў БНР у Мінску. А першае масавае, грамадскае святкаванне ўгодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі адбылося 22 сакавіка 1991 года. У гэты дзень сябры суполкі "Машэка" наладзілі вечарыну ў памяшканні абласнога мастацкага музея (тады яшчэ карціннай галерэі). Прысутнічала каля 70 асобаў. Выступіў гісторык Анатоль Сідарэвіч, спявачка Кася Камоцкая (абодва з Мінску), магілёўскі бард Мікола Журо і паэт М.Укружанскі. Яшчэ больш урачыста і шматлюдна "Машэка" адзначыла Дзень Волі ў тым жа месцы на наступны год. Адбыўся вялікі канцэрт. Апазыцыйныя партыі гораду наладзілі агульнагарадскі мітынг толькі да 75-х угодкаў – 20 сакавіка 1993 г., і з таго часу так ці інакш адзначаюць гэтае свята.

### 4. Укаранаваныя асобы і Магілёў

Трэба адзначыць, што ў горадзе напрацягу яго гісторыі бывалі каранаваныя асобы: каралі Аляксандр, Ян-Казімір, Уладзіслаў IV, цар Аляксей Міхайлавіч, імператары Пётр I, Карл XII, Кацярына II, Мікалай I, Аляксандр II, Іосіф II і інш. Па вуліцах крочылі славутыя пісьменнікі, грамадска-палітычныя дзеячы, прадстаўнікі культуры: А.Пушкін, Т.Шаўчэнка, М.Гогаль, У.Караленка, С.Ясенін, Ф.Шаляпін і інш. Горад ганарыцца магілёўцамі: Ф.Іяўлевічам, І.Арэста, Т.Суртай, М.Гартынскім, М.Судзілоўскім, О.Шмідтам, П.Шэйнам, Р.Фраерманам, І.Жоравым, А.Пысіным, І.Шклярэўскім і інш. Звесткі аб некаторых можна знайсці ў розных выданнях. Славутыя магілёўцы варты асобнай кнігі. Мы прыпынімся толькі на тым, як Магілёў сустракаў каранаваных асоб.

Сярод тысяч людзей, якія за шматвяковае існаванне Магілёва наведалі яго, ёсць шэраг "венцаносных", што ўплывалі на палітыку тагачаснай Еўропы. Візіт іх у Магілёў, як кропля з ракі старадаўнасці, адлюстроўвае часам крывавую і трагічную або велічную і пампезную гісторыю Магілёўшчыны.

4.9.1617 г. у Магілёве быў кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV, які ішоў з войскам на Масковію. А пад 1607 г. Баркулабаўскі летапіс паведамляе пра візіт у наш край Ілжэдзмітрыя II "месяца мая, после семое суботы ишол со Шклова и з Могилева на Попову Гору якийся Дмитр Иванович. Мнил себе быти оным царем московским, который первей того Москву взял и там же оженився".

Да падзей вайны Расіі з Рэччу Паспалітай сярэдзіны 17 ст. адносяцца звесткі пра візіт у Магілёў цара Аляксея Міхайлавіча. У 1655 г. ў Магілёў прыбыў цар Аляксей Міхайлавіч. Ён пацвердзіў вольнасці і правы гараджан. Калі ў 1656 г. ён вяртаўся з-пад Рыгі, прабыў у Магілёве 2 тыдні. У 1664 г. з 20 сакавіка да 8 красавіка ў Магілёве чакаў маскоўскіх паслоў, каб падпісаць мір, кароль Ян-Казімір, але з-за раптоўнага пажару выехаў з горада.

У час Паўночнай вайны раніцай 22 чэрвеня 1706 г. на байдаку з Оршы ў Магілёў прыбыў цар Пётр І і стаў ва ўрочышчы Грабёж каля рачулкі Дзебра. Гарадскі магістрат, сустракаючы цара, паднёс яму 2 сярэбраныя з пазалотай блюды з вялікім пірагом і сітніцай. Цар распарадзіўся даставіць хлеб на кватэру, а сам адразу накіраваўся да войска. Пасля вайсковага агляду цара са світай вітаў гарматны салют з усіх бастыёнаў. Пальба спадабалася Пятру І, які прамовіў "Право, изрядно". Цар наведаў Брацкую царкву, пасля чаго накіраваўся да бурмістра Анташкевіча. Там члены магістрата з паклонам паднеслі яму хлеб-соль. Ад яўрэйскай абшчыны яму ўручаны быў хлеб і жывы асётр. Пётр І даручыў свіце ўзяць і гэтыя падарункі. Пад вечар цар заехаў да генерала Кікіна, пазнаёміўся з гаспадаром дома Федарам Казановічам, успомніў падзеі 1661 г. "не пугайся, я знаю, что при твоем батюшке здесь москвитян выбили, но ведь тогда война была". Потым развітаўшыся з войскам і на сваім байдаку адплыў у Кіеў. У 1707 г. праз горад праязджаў царэвіч Аляксей Пятровіч.

6.7.1708 г. Магілёў занялі шведы на чале з Карлам XII. Кавалерыю яны размясцілі на правым беразе Дняпра, а пяхоту – на высотах ад горада да Буйніч. Шацёр караля стаяў паміж горадам і Буйніцкім манастыром на ўзгорку, які пасля празвалі "Карлавай далінай". На горад ускладаліся грашовая і харчовая кантрыбуцыі для шведскага войска. Карл XII сам наведаў Магілёўскія цэрквы для агляду сярэбраных рыз на абразах і другіх каштоўных рэчаў. Нехта падказаў каралю, што найбольш каштоўнае царкоўнікі схавалі, і Карл XII загадаў выдаць каштоўнасці, пагражаючы Магілёву рабаўніцтвам і пажарам. Гараджане выдалі больш за 9 пудоў схаванага серабра, якое шведы ў абозе пераплавілі на манеты, але войска рабавала насельніцтва і пасля гэтага 14 жніўня "сатана", як празвалі магілёўцы Карла XII, пераправіўся на левы бераг Дняпра. Шведскі пастой абышоўся гораду ў 507512 бітых талераў.

У 1780 г., праз восем гадоў пасля ўваходжання Магілёва ў склад Расійскай імперыі, у горадзе адбылася сустрэча імператрыцы Кацярыны II з аўстрыйскім імператарам Іосіфам II. Пра свой візіт у Магілёў Кацярына II пісала "бавіла час весела, аднойчы смяялася 5 гадзін запар".

2.10.1781 г. у Магілёве праездам быў вялікі князь (пазней імператар) Павел Пятровіч з жонкай Марыяй Фёдараўнай. У 1802 г. 15 чэрвеня ў 6 гадзін вечара горад наведаў імператар Аляксандр І. 16 чэрвеня на Лупалаўскім полі адбыўся царскі агляд фанагрыйскага палка, які тут кватараваў, пасля чаго Аляксандр І выехаў у Санкт-Пецярбург.

У 1839 г. у Магілёве захварэў наследнік прастола вялікі князь Аляксандр Мікалаевіч (Аляксандр II) і паўтара месяца правёў у доме дваранства. У час хваробы паводле яго загаду магілёўцам у якасці міласціны было раздадзена 20 тысяч рублёў асігнацыямі і створаны стыпендыяльны фонд у 1500 рублёў.

Апошнім каранаваным візіцёрам у Магілёў быў цар Мікалай II. У 1-ю сусветную вайну 21 жніўня 1915 г. сюды прыехаў Мікалай II, які прыняў на сябе вярхоўнае камандаванне. 5.5.1916 г. у Стаўку прыехала царыца Аляксандра Фёдараўна з дзецьмі. Вось яе першае ўражанне пра Магілёў "Так, сумны і грязны горад". Жылі ў горадзе – спадчыннік царэвіч Аляксей і дочкі імператара, у тым ліку і Анастасія, лёс якой (быццам бы цудам уратавалася ад бальшавіцкага

растрэлу) натхніў кінадзеячоў на стварэнне славутага і дабравядомага дыснеяўскага мультфільма "Анастасія".

6 сакавіка паводле тэлеграмы Часовага ўрада Мікалаю II з сям'ёй дазвалялася выехаць за мяжу. 7 сакавіка ў другой тэлеграме Часовага ўрада загадвалася былога цара з сям'ей арыштаваць і даставіць у Царскае Сяло. 8 сакавіка ў 10 гадзін раніцы Мікалай II пры развітанні з афіцэрамі штаба у вялікай зале сказаў "Карысць радзімы і неабходнасць прадухілення жахаў міжусобіцы і грамадзянскай вайны, а таксама стварыць магчымасць накіраваць усю моц для працягу барацьбы на фронце прымусілі мяне адрачыся ад прастола на карысць майго брата вялікага князя Міхаіла Аляксандравіча, але, улічваючы абставіны, якія склаліся, вялікі князь, у сваю чаргу, адрокся ад прастола. Заклінаю вас, панове, павінавацца Часоваму ўраду і прыкласці ўсе намаганні дзеля працягу вайны з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй да пераможнага канца". Многія з прысутных плакалі, некаторыя страцілі прытомнасць. Не вытрымаўшы, Мікалай II са слязамі на вачах выйшаў з залы. Каля Стаўкі стаяў натоўп гараджан з непакрытымі галовамі. Былы цар развітаўся з людзьмі і з сям'ёй на аўтамабілі накіраваўся да вакзала. На Дняпроўскім праспекце толькі некалькі жанчын, якія пазналі цара, з плачам кінуліся да яго аўтамабіля. Болей жалю ніхто не выказваў ні па дарозе, ні на вакзале. Апоўдні цягнік з падканвойным грамадзянінам Раманавым рушыў з Магілёва ў Петраград.

З Магілёвам шчыльна злучаны лёс апошняга з нашчадкаў Крымскіх ханаў, які быў афіцэрам стаўкі. Маецца ўскосная інфармацыя аб візіце ў горад аднаго з членаў японскай імператарскай сям'і. У гісторыі Магілёва яшчэ шмат белых плям.

Такім чынам, у гады першай сусветнай вайны Магілёў фактычна стаў ваеннай сталіцай Расійскай імперыі. У Магілёве з 8 (21).05.1915 па 25.02.1918 г. знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага. З 23.08.1915 г. па 8.03.1917 г. у Магілёве жыў апошні расійскі імператар Мікалай II разам з спадчыннікам царэвічам Аляксеем. 31.03.1917 г. у горадзе адбыўся арганізацыйны сход гуртка свядомых патрыётаў магілёўцаў-беларусаў. 15.04.1917г. у Магілёве быў утвораны Беларускі нацыянальны камітэт (Магілёўскі беларускі камітэт). 12.07.1918 г. у горадзе адбыўся сход прадстаўнікоў усіх магілёўскіх арганізацый (каля 400 чалавек), на якім абсалютнай большасцю галасоў была падтрымана ідэя суверэнітэту беларускай дзяржаўнасці (стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, Акт ад 25 сакавіка 1918 года).

## Лекцыя 8. Магілёў у 1920 – 1930-я гады

1. Усталяванне савецкай улады ў Магілёве.
2. Эканамічнае і культурнае жыццё горада ў 1920-я гады.
3. Сродкі на індустрыялізацыю.
4. У рытме пяцігодак.
5. Сталінскія рэпрэсіі. Закрыццё храмаў.
6. Спробы перайменавання Магілёва.
7. Напярэдадні вайны. Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў.

**1. Усталяванне савецкай улады ў Магілёве**

31.10.1918 г. у Магілёве была аднаўлена савецкая ўлада. 23.12.1918 г. распачаў працу Магілёўскі гарадскі савет. Студэнтам неабходна ведаць, што да 1.01.1919 г. горад уваходзіў у склад Заходняй камуны РСФСР, затым БССР, а з 26.04.1919 па 3.03.1924 г. з´яўляўся цэнтрам павету Гомельскай губерніі РСФСР. 7.03.1924 г. Магілёў вернуты ў склад БССР. З´яўляўся цэнтрам акругі і раёну. 15.01.1938 г. была ўтворана Магілёўская вобласць. 1920 – 30-я гады ў гісторыі Магілёва – перыяд стваральнай працы і значных разбурэнняў у горадзе.

26.10(8.11).1917 г. ў памяшканні губернскага земства адбылася надзвычайная нарада грамадзянскіх і палітычных арганізацый Магілёва, у якой удзельнічалі прадстаўнікі Магілёўскага савета, гарадской управы, кадэты, эсэры, меншавікі, бундаўцы. Яны асудзілі дзеянні бальшавікоў у Петраградзе.

Пасля таго як бальшавікі і інтэрнацыяналісты неўзабаве пакінулі гэту нараду, быў створаны цэнтр аб'яднання сіл супраць кастрычніцкага перавароту – "Грамадскі камітэт выратавання рэвалюцыі". 28.10(10.11).1917 г. на пленуме савета правы эсэр урач Капыцінскі, салдат Бялевіч, старшыня губернскага савета сялянскіх дэпутатаў М.Гольман заявілі, што пераварот у Петраградзе – "ваенная авантура". У прынятай на ім рэзалюцыі адхілялася палітыка бальшавікоў, рэкамендавалася стварыць "аднародны сацыялістычны ўрад". Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага дзейнічала ў цесным кантакце з Магілёўскім саветам і адмовілася прызнаць Савет Народных Камісараў (СНК).

Выконваючы абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, генерал М.Духонін адмовіўся выканаць распараджэнне савецкага ўрада ад 7(20).11.1917г., дзе яму прадпісвалася неадкладна звярнуцца да германскага камандавання з прапановай спыніць ваенныя дзеянні і пачаць перамовы аб замірэнні. 9(22).11.1917 г. загадам СНК ён быў зняты з гэтай пасады, а замест яго прызначаны бальшавік, прапаршчык М.Крыленка.

Нягледзячы на зняцце Духоніна, камандаванне Стаўкі спадзявалася сканцэнтраваць у Магілёве свае сілы. 9 лістапада Духонін слаў па ўсіх франтах тэлеграмы: «Буду змагацца супраць гвалту да ўтварэння ўрада, які прапанаваны ўсёй краінай». Урады краін Антанты працягвалі падтрымліваць адносіны з Духонінам, яны патрабавалі ад Стаўкі невыканання распараджэнняў савецкага ўрада.

Для спынення контррэвалюцыйнай дзейнасці Стаўкі СНК накіраваў у Магілёў эшалоны зводнага атрада матросаў, салдат і чырвонагвардзейцаў пад камандаваннем М.В.Крыленкі, а таксама фарміраваныя Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам (ВРК) Заходняга фронту паўночны атрад пад камандаваннем Р.І.Берзіна і паўднёвы атрад, які ўзначаліў член ВРК 2-й арміі Я.І.Лысякоў, баявыя атрады з Віцебска, Гомеля, Мінска, Оршы, Жлобіна, Полацка. У гэтых умовах Духонін загадаў камандуючаму 5-й арміяй генералу Болдыраву затрымаць цягнік Крыленкі на станцыі Дзвінск. Аднак салдаты адмовіліся выконваць загад генерала, а сам Болдыраў быў арыштаваны. Не ўдалося затрымаць і эшалоны рэвалюцыйных сіл у Віцебску, Оршы, Шклове. 17 лістапада ў Магілёве агульнаармейскі камітэт тэрмінова склікаў нараду франтавых камітэтаў, якія

спрабавалі захаваць ваенную ўладу ў руках Стаўкі. Было вырашана эвакуіраваць Стаўку ў Кіеў, новага "глаўкаверха" не прызнаваць, а яго эшалоны адправіць назад у Петраград. Але рэальнай сілы, каб процістаяць рэвалюцыйным войскам, у Стаўкі не было. Адначасова была атрымана тэлеграма ад камандуючага Заходнім фронтам бальшавіка Каменшчыкава, якая заклікала магілёўскі гарнізон да разгрому Стаўкі і арышту Духоніна. Эвакуацыя Стаўкі ў Кіеў была спынена.

Бальшавікі актывізавалі работу сярод жыхароў горада і салдат гарнізона. Вечарам 18.11(1.12).1917 г. адбылося пашыранае пасяджэнне выканкома Магілёўскага савета, які прыняў рашэнне аб прызнанні СНК і пераходзе ўсёй улады ў рукі Магілёўскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Як піша ў кнізе "Памяць" даследчык М.Лысенка, старшынёй выканкама стаў левы эсэр Тураў. Новы выканкам павінен быў забяспечыць перавыбары савета. Да перавыбараў савета ўся ўлада перадавалася ВРК. У склад ВРК увайшлі прадстаўнікі выканкама савета, часцей Магілёўскага гарнізона і 111-й арміі. Старшынёй выбраны эсэр-максімаліст Усанаў, таварышы старшыні – бальшавік Феерабенд і левы эсэр Пятроў, сакратар – сацыял-дэмакрат-інтэрнацыяналіст Гонікман (абодва дэлегаты II Усерасійскага з’езда Саветаў). Члены ВРК – бальшавікі Брыльён, Забкоў, Хахлоў, Якаўлеў. 19.11(2.12).1917 г. ВРК заявіў пра ўзяцце ўлады ў Магілёве і губерні, прызнаў Вярхоўным галоўнакамандуючым прапаршчыка бальшавіка Крыленку. Прадстаўнікі Часовага ўрада Духонін, Станкевіч, Вырубаў былі ўзяты пад хатні арышт. Агульнаармейскі камітэт, які быў варожа настроены да савецкай улады, быў распушчаны, яго функцыі ўзяў на сябе Магілёўскі ВРК як орган улады агульнафрантавога значэння. Для ажыццяўлення гэтых функцый, а таксама для кантролю над Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве былі вылучаны камісары. 21.11(4.12).1917 г. для палітычнага і арганізацыйнага кіраўніцтва франтамі 1-й сусветнай вайны створаны часовы рэвалюцыйны орган – ВРК пры Стаўцы.

19.11(2.12).1917 г. у Магілёў прыбыў Крыленка са штабам новай Стаўкі. 20.11(3.12).1917 г. Стаўку занялі рэвалюцыйныя войскі. У той жа дзень раз’юшаны натоўп салдат і матросаў выцягнуў са штабнога вагона генерала М.Духоніна і забіў яго – распяўшы на дзвярах чыгуначнага вагона. Стаўка была рэарганізавана, начальнікам штаба прызначаны генерал М.Дз.Бонч-Бруевіч. 23.11(6.12).1917 г. пры рэвалюцыйнай Стаўцы створаны ВРК, які фарміраваў баявыя атрады супраць атамана Каледзіна, Украінскай рады і інш. Узначаліў ВРК У.Антонаў-Аўсеенка. 16(29).12.1917 г. ў Магілёве адбыўся агульнаармейскі з’езд, на якім ВРК рэарганізаваны ў Цэнтральны Камітэт дзеючай арміі і флоту, узначаліў яго М.Рагадзінскі. На гэтым жа з’ездзе М.Крыленка стаў Вярхоўным галоўнакамандуючым узброенымі сіламі савецкай Расіі. У Магілёве з 26.11(9.12).1917 г. пачала выходзіць газета «Рэвалюцыйная Стаўка».

28.11(11.12).1917 г. Магілёўскі ВРК выдаў загад пра ўзяцце на ўлік і перадачу зямельным камітэтам памешчыцкіх маёнткаў. Усе зямельныя камітэты губерні былі абавязаны апісаць і ўзяць на ўлік маёмасць, скласці спісы асоб, якія вінаваты ў парушэнні пастановы пра яе захаванасць. Былі праведзены мерапрыемствы па абмежаванню правоў буржуазіі, пачата работа па ліквідацыі ўстаноў Часовага ўрада.

У 2-й палавіне снежня 1917 г. адбылося размежаванне бальшавікоў Магілёва з меншавікамі-інтэрнацыяналістамі. 20.12.1917 г. (2.1.1918 г.) быў створаны гарадскі камітэт Магілёўскай арганізацыі РСДРП(б) з 6 чалавек (старшыня М.Т.Максімаў).

У лістападзе – снежні 1917 г. склад Магілёўскага савета папоўніўся дэпутатамі-бальшавікамі, прадстаўнікамі рэвалюцыйных вайсковых часцей. Выканком савета пачаў праводзіць у жыццё дэкрэты СНК. Бальшавіцкая фракцыя ў савеце была самая моцная, 2-е месца па колькасным складзе займала фракцыя Бунда. У савет уваходзілі левыя эсэры, польскія сацыялісты (левіца), інтэрнацыяналісты, прадстаўнікі прафсаюзаў, вайсковых часцей.

Пагроза акупацыі Магілёва атрадамі Доўбар-Мусніцкага і нямецкімі войскамі выклікала паніку сярод членаў Магілёўскага савета. Прыхапіўшы грошы яны ў паніцы, не арганізаваў абароны Магілёва, нават болей – раззброілі рабочую дружыну чыгуначнікаў, збеглі з горада. У часе акупацыі Магілёўскія савецкія органы ўлады дзейнічалі ў Мсціслаўлі.

31.10.1918 г. пасля адыходу нямецкіх войск Магілёў занялі часткі Чырвонай Арміі. Уся ўлада ў горадзе перайшла да губернскага рэвалюцыйнага камітэта, які адразу прыступіў да аднаўлення савецкіх органаў і навядзення рэвалюцыйнага парадку: была распушчана гарадская дума, забаронены апазіцыйныя газеты. Адначасова ўзмацнілася агітацыйна-прапагандысцкая работа. Губком РКП(б) стварыў агітацыйна-асветніцкія саветы, якія арганізоўвалі камуністычныя ячэйкі, розныя гурткі, хаты-чытальні, клубы, распаўсюджвалі палітычную літаратуру. Апрача барацьбы з ідэйна-палітычнымі праціўнікамі ўлады вялі рашучую барацьбу з бандытызмам, самагонаварэннем, спекуляцыяй хлебам. Насельніцтва забяспечвалася прадуктамі харчавання, рабіліся першыя крокі па наладжванні прамысловасці.

У снежні 1918 г. былі праведзены выбары ў гарадскі Савет, які пачаў працаваць 23 снежня. Большасць у Савеце належала бальшавікам і іх прыхільнікам. У выканкам, што быў выбраны праз два дні, увайшлі выключна бальшавікі. З завяршэннем работ па аднаўленні савецкай улады на вызваленай тэрыторыі Магілёўшчыны губернскі ВРК быў скасаваны. Пасля спынення яго дзейнасці перастала выходзіць і газета “Известия Могилевского губернского революционного комитета”. Апошні яе нумар выйшаў 31.12.1918 г. У далейшым газета друкавалася пад назвай “Соха и молот” як орган павятовых камітэта РКП(б), выканкама савета і бюро прафсаюзаў.

Калі тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад акупацыйных кайзераўскіх войск, паўстала пытанне аб нацыянальна-дзяржаўным ладзе Беларусі. 25.3.1918 г. ў Мінску Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з’езда абвясціў аб утварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі. 30.12.1918 г. 4-я Паўночна-заходняя канферэнцыя РКП(б) у Смаленску аб’явіла сябе I з’ездам КП(б)Б, а 1.1.1919 г. ў гэтым горадзе быў абвешчаны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі аб утварэнні БССР, куды ўвайшла і Магілёўская губерня. Аднак праз месяц на I Усебеларускім з’ездзе Саветаў, які адбыўся ў Мінску 2–3.2.1919 г. была прынята дэкларацыя пра аб’яднанне савецкіх сацыялістычных рэспублік Літвы і Беларусі. Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел). Магілёўская губерня ў склад

новага ўтварэння не ўвайшла, у красавіку скасавана наогул, а Магілёў стаў павятовым горадам Гомельскай губерні РСФСР.

Складанае становішча на франтах грамадзянскай вайны вымушала савецкае кіраўніцтва праводзіць масавыя мабілізацыі, у першую чаргу камуністаў і камсамольцаў. Вясной і летам 1919 г. на Усходні фронт працоўныя Магілёва праводзілі 3 маршавыя роты. Асабліва значнымі былі мабілізацыі на Заходні фронт. Для правядзення агітацыйна-прапагандысцкай і арганізацыйнай работы ў Магілёў у ліпені 1919 г. прыбыў з агітцягнікам "Кастрычніцкая рэвалюцыя" М.І.Калінін. Як член Рэўваенсавета 16-й арміі, штаб якой размяшчаўся ў Магілёве, летам таго ж года ў горадзе больш месяца працаваў Р.Арджанікідзе. У пачатку савецка-польскай вайны Магілёў стаў прыфрантавым горадам. На барацьбу з польскімі інтэрвентамі было накіравана каля 20% камсамольцаў Магілёва. Паводле закліку прафсаюзаў праводзілася мабілізацыя рабочых горада, а ў Магілёве ўведзена ваеннае становішча. У ліпені 1920 г., калі пасля наступлення польскіх войск склалася напружанае становішча на Заходнім фронце, у Магілёве была аб'яўлена чарговая мабілізацыя камуністаў і камсамольцаў. З іх ліку быў створаны батальён асобага прызначэння, некалькі партызанскіх атрадаў. У барацьбе з акупантамі многія магілёўцы праявілі самаадданасць і гераізм. Нямала іх загінула.

## 2. Эканамічнае і культурнае жыццё горада ў 1920-я гады

За час акупацыі Магілёў быў разрабаваны і разбураны. Пасля вызвалення пачалося аднаўленне прамысловых прадпрыемстваў, жылля. У горадзе праводзіліся камуністычныя суботнікі, працоўныя добраахвотна прадаўжалі рабочы дзень. У пачатку 1919 г. дзейнічалі чыгуналіцейна-механічны, маслабойны, піваварны і 2 мылаварныя заводы, лесапілкі, гарбарныя прадпрыемствы, тытунёвая і гільзавая фабрыкі, гарадская друкарня, электрастанцыя. У 1920 г. пасля капітальнага рамонту пачалі працаваць цагельны завод і каўбасная фабрыка, рамантаваліся старыя і новыя масты, шашэйныя дарогі і чыгункі. З улікам становішча на франтах грамадзянскай вайны ў горадзе праводзіліся пэўныя арганізацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы. У 1920 г. у Магілёве прайшлі "Тыдзень Заходняга фронту", "Тыдзень Паўднёвага фронту", "Тыдзень фронту і транспарту", "Тыдзень хворага і параненага чырвонаармейца".

У час правядзення гэтых кампаній сабраны грашовыя сродкі, бялізна, перавязачныя матэрыялы, медыцынскія прэпараты, салдацкае адзенне, абутак, тытунь, харчовыя прадукты перадаваліся ў армію, шпіталі і маламаёмасным чырвонаармейскім сем'ям. Праводзіўся рамонт казармаў, бальніц, шпіталяў. Шавецкія майстэрні таксама працавалі пераважна на патрэбы фронту.Значную дапамогу аказваў горад і сялянскім гаспадаркам, асабліва бяднейшым. Гараджане дапамагалі ў правядзенні палявых работ і ўборцы ўраджаю.

Аднак цяжкія ваенныя гады ў Магілёве не спынілі развіцця культурнага жыцця. Значна павялічылася колькасць школ і іншых агульнаадукацыйных і культурных устаноў. У 1920 г. у горадзе працавала 49 школ першай і 22 школы другой ступеней. Была аб'яўлена барацьба з непісьменнасцю, адкрыта 136 школ для непісьменных дарослых. Дзейнічалі трохгадовыя палітэхнічныя курсы,

створаны групы па вывучэнню друкарскай справы, падрыхтоўкі паштова-тэлеграфных работнікаў, каморнікаў, фармацэўтаў, настаўнікаў. У горадзе была адкрыта вышэйшая навучальная ўстанова – Інстытут народнай адукацыі, які рыхтаваў настаўнікаў для школ. Працавалі музычная школа (якая была першай дзяржаўнай музычнай школай у Беларусі), краязнаўчы музей, некалькі чырвонаармейскіх і маладзёжных клубаў, хаты-чытальні, перасоўныя бібліятэкі, тэатральныя і музычныя гурткі, тэатр, студыя выяўленчага мастацтва і кінатэатр.

Як ужо адзначалася, пад час акупацыі Магілёва інтэрвентамі горад быў разрабаваны і разбураны. Разам з холадам і голадам людзей даймалі хваробы, эпідэміі. Тавары першай неабходнасці прадаваліся па высокіх цэнах. Пайка ў 200гр хлеба магілёўцам, якія працавалі, выдавалася нерэгулярна. У горадзе панавала транспартная разруха, большасць прадпрыемстваў было спынена з-за адсутнасці сыравіны, паліва і абсталявання, больш як 2 тыс. рабочых былі беспрацоўныя.

Да лета 1921 г. становішча яшчэ больш пагоршылася. Не хапала прадуктаў, з-за адсутнасці грошай месяцамі не выплачвалі зарплату. З-за голаду многія гараджане падаліся ў вёску, іншыя заняліся саматужнымі промысламі. Адсутнічаў гандль. Са 139 крам у павеце працавалі толькі 4 у Магілёве. На рынку існаваў просты тавараабмен. Адзін пуд жыта, напрыклад, абменьвалі на 8–9 аршынаў паркалю або на 2–3 фунты цукру, на 18–19 фунтаў солі і інш. Да восені на рынку з'явіліся некаторыя сельгаспрадукты, але па вельмі высокіх цэнах. Такія цэны былі не па кішэні нават гараджанам, якія працавалі. Эканамічныя цяжкасці выклікалі незадаволенасць насельніцтва, што, натуральна, спрабавалі выкарыстаць у сваіх мэтах апазіцыйныя камуністам партыі. Яны заклікалі рабочых і служачых не падтрымліваць бальшавікоў, не галасаваць за іх на выбарах у органы ўлады, лічылі іх няздольнымі вывесці з разрухі і голаду. Адказам улад на гэта было ўзмацненне барацьбы з "контррэвалюцыйнымі вылазкамі". Актыўна дзейнічала ЧК выкрываючы яўных, прыхаваных ворагаў, калі-нікалі цярпелі ад яе дзейнасці і нявінныя. Ва ўмовах эканамічнай нестабільнасці ў горадзе пашырыўся арганізаваны крымінальны бандытызм. Банды дэзерціраў і крымінальнікаў рабавалі гандлёвыя крамы, прадуктовыя склады. У барацьбе з імі гінулі чэкісты і супрацоўнікі міліцыі.

Дарэчы варта адзначыць, што не ўсе жыхары горада і Магілёўшчыны былі задаволены новай уладаю. Па розных прычынах і матывах у той час на Усходзе Беларусі працягваўся антысавецкі ўзброены супраціў, які насіў ярка выражаную палітычную афарбоўку. У 1919-21, 1928-29, 1930 –х гадах адбываліся выступленні сялян са зброяй у руках супраць савецкай улады і нават баявыя сутычкі ў Краснапольскім, Горацкім, Прапойскім (Слаўгарадскім), Быхаўскім і іншых паветах. Існавалі штабы паўстанцаў, дзейнічала "Чорная ЧК" (у адрозненні ад "чырвонай" ЧК), былі спробы наступу на Магілёў і г.д. Узброеныя атрады (у савецкай гістарыяграфіі вядомы пад назвай "банды") антысавецкага накірунку дзейнічалі на тэрыторыі Магілёўскага павету да 1934 года.

Вялікія надзеі па выхадзе з гаспадарчага тупіка і палітычнага крызісу ўскладаліся на новую эканамічную палітыку (НЭП). Першыя крокі ажыццяўлення НЭПа пачалі даваць свае станоўчыя вынікі. Ажывілася грамадскае і гаспадарчае

жыццё, задымелі трубы кацельняў прадпрыемстваў, перададзеных у арэнду прыватным уладальнікам, а тыя, што знаходзіліся ў падпарадкаванні мясцовых і рэспубліканскіх органаў кіравання, атрымалі значныя субсідыі.

У 1922 г. пасля капітальнага рамонту дала ток гарадская электрастанцыя, пачалі выпускаць прадукцыю швейныя і шавецкія майстэрні, цагельны і тарфяны заводы, каўбасны цэх мясакамбіната. У гады аднаўлення народнай гаспадаркі шырокі размах у горадзе набыла работа на суботніках і нядзельніках. Прыкметны пералом у рабоце прамысловасці горада наступіў у 1923 г. Да канца года было адноўлена каля 70% даваенных вытворчых магутнасцей. Пачалі працаваць тытунёвая і гільзавая фабрыкі, чыгуналіцейны завод "Чырвонае адраджэнне", лесапільны завод, прадпрыемства прыватнага прадпрымальніка Лекерта і маслабойны завод. Актыўна працавала дробная вытворчасць саматужнікаў па 40 відах. Расла зарплата рабочых і служачых. На спад пайшло і беспрацоўе. Набіраў сілу кааператыўны рух у гандлёва-збытавой сферы.

3.3.1924 г. Магілёў быў перададзены з РСФСР у БССР, што стварыла спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця горада, для атрымання больш значных сродкаў на капітальнае будаўніцтва, на расшырэнне прамысловай вытворчасці. Як піша ў кнізе "Памяць" даследчык А.Косцераў, рэалізуючы ідэі нэпа, магілёўцы пераважна развівалі лёгкую і харчовую прамысловасць на базе мясцовай сыравіны. Гэта былі дробныя прадпрыемствы, якія працавалі на ўстарэлым абсталяванні. На большасці прадпрыемстваў працавала малая колькасць рабочых. Так на электрастанцыі было 48 чалавек, на абутковай фабрыцы «1 Мая» – 88, металазаводзе – 44, цагельна-бетонным заводзе – каля 83 чалавек. У канцы 1927 г. мукамольны завод "Чырвоная зорка" штодзённа выпускаў 7 тыс. пудоў мукі, працавала на ім 85 чалавек, месячная зарплата якіх складала ў сярэднім 48 руб. Чыгуналіцейны завод "Чырвонае адраджэнне" (братоў Маззя) ў 1925 г. перайшоў у падпарадкаванне кіраўніцтва гарадскімі прадпрыемствамі пры камунальнай гаспадарцы. У 1926–27 гг. ён быў раканструяваны. Тут працавала 87 чалавек, якія атрымлівалі ў сярэднім 80 руб. зарплаты. Прадпрыемства выпускала некаторыя часткі для сельгасмашын, вагі, конныя прыводы, абсталяванне для вінакурных заводаў. У далейшым прадпрыемства было перапрафілявана ў металаапрацоўчы завод, але яшчэ доўгі час працавала на старым абсталяванні.

У такой складанай эканамічнай і палітычнай сітуацыі горад знаходзіў магчымасць аказваць дапамогу тым, каму яна была вельмі патрэбна. Працоўныя Магілёва прынялі рашэнне аддаць у фонд дапамогі галадаючым Паволжа 20% заробку, працавалі звышурочна, каб сума дапамогі была больш значнай. Так было сабрана 1,2 млн руб. Рабочыя аказвалі пасільную дапамогу вёсцы. Да лета 1925 г. прамысловыя прадпрыемствы ажыццяўлялі шэфства над 40 вёскамі Магілёўскага павета. Вайна пакінула нявырашанай яшчэ адну праблему – дзіцячую беспрытульнасць. У горадзе быў арганізаваны Камітэт дапамогі дзецям, а з 17.2.1924 г. праведзены Тыдзень дапамогі беспрытульнаму дзіцяці. Пачаўся збор сродкаў па падпісных лістах ад грамадзян, прадпрыемстваў і кааператываў на арганізацыю ў горадзе Дома беспрытульнага дзіцяці і сельскагаспадарчай камуны.

Ва ўмовах складанай эканамічнай і палітычнай абстаноўкі пачынала фарміравацца адміністрацыйна-камандная сістэма з жорсткім цэнтралізмам,

заснаваным на безагаворачным выкананні рашэнняў вышэйстаячых органаў, пачала абмяжоўвацца ўнутрыпартыйная дэмакратыя.

З уваходам Магілёва ў БССР у 1924 г. паўсталі праблемы нацыянальнага адраджэння з улікам гістарычных традыцый, сацыяльных і этнаграфічных умоў. У якасці раўнапраўных дзяржаўных моў былі прызнаны беларуская, яўрэйская, руская і польская.

Нягледзячы на прыкметныя зрухі, становішча ў прамысловасці заставалася складаным, паўсталі праблемы са збытам прадукцыі, цэны на яе завышаліся і яна асядала на складах. Купляць сыравіну не было за што, зарплата рабочым таксама не выплачвалася. Крыху палегчыла сітуацыю грашовая рэформа. Калі ў 1923 г. на рынках Магілёва пуд жыта каштаваў 40 кап., пуд гатунковага жалеза – 3,4 кап., аршын паркалю – 60 кап., пачак запалак – 16 кап., то ў 1925 г. пуд жыта прадаваўся за 1,3 руб., аршын паркалю – за 32 кап.

У 1925 г. прамысловасць горада дасягнула даваеннага ўзроўню па аб’ёме валавой прадукцыі. У тым жа годзе. было пабудавана 140 камунальных кватэр. Рабочым упершыню сталі даваць адпачынкі з захаваннем зарплаты, за лета ў дамах адпачынку пабывала 596 магілёўцаў.

У канцы 1925 г. партыя аб’явіла курс на індустрыялізацыю народнай гаспадаркі. План індустрыялізацыі, які стаў на практыцы пераўтварацца ў рэальнасць з пачатку выканання першага пяцігадовага плану, быў устаноўкай на бясспрэчнае выкананне і правядзенне яго ў жыццё. Ставілася мэта найхутчэй, любымі сродкамі, пераадолець адсталасць у эканоміцы, забяспечыць надзейную абарону краіны, павысіць жыццёвы ўзровень народа. Ідэі нэпа пакрысе адыходзілі на другі план, больш актыўна пачала праводзіцца палітыка выцяснення прыватніка з прамысловасці. Да 1928 г. прыватны капітал быў выцеснены з прамысловасці, валавы аб’ём прадукцыі на прадпрыемствах дзяржаўнага сектара склаў 88,1%, у кааперацыі – 6,2, на прадпрыемствах, што знаходзіліся ў распараджэнні рабочых калектываў, – 5,7%. У Магілёве дзейнічала 21 прадпрыемства.

### 3. Сродкі на індустрыялізацыю

Неабходна мець на ўвазе, што напрыканцы 1920-х гадоў у савецкай краіне перамог стыль кіраўніцтва народнай гаспадаркай, які абапіраўся на партыйны апарат камуністычнай партыі бальшавікоў. Для забяспячэння так званай праграмы індустрыялізацыі і першага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1928/1929 - 1932/1933 гг., патрэбна было пераадолець вялікія цяжкасці, звязаныя з недахопам грашовых сродкаў. Адкуль іх было ўзяць? Толькі за 1926 - 1929 гг. на індустрыялізацыю Беларусі з агульнасаюзнага бюджэта было выдзелена больш за 19 млн руб. Але патрэбна было яшчэ больш. Грошай не хапала, як у краіне, так і на месцах, у прыватнасці ў Магілёве. Было вырашана іх узяць у прадстаўнікоў прыватнага сектара ў эканоміцы, які на рубяжы 1926-1928 гг. амаль спыніў сваю прадпрымальніцкую дзейнасць пад ціскам той жа партыі бальшавікоў. Дык адкуль жа браліся па-сапраўднаму матэрыяльныя сродкі на вырашэнне вялікіх і малых гаспадарчых задач у тыя гады?

Яскравым прыкладам знаходжання сродкаў і вырашэння палітычных пытанняў з’яўляліся аперацыі (налёты) па выяўленню і канфіскацыі сродкаў у неплатнікаў дзяржаўных падаткаў, да якіх былі аднесены прадстаўнікі спыняючага сваю дзейнасць прыватнага сектара (знясіленага павялічваючыміся дадатковымі і ўскоснымі падаткамі і ў выніку не маючага моцы плаціць наогул падаткі). Аперацыі, па планах арганізатараў, павінны былі даць магчымасць “праз бюджэт пасіліць (шляхам экспрапрыяцыі) фонды індустрыялізацыі, калектывізацыі, перабудовы ўсяе нашае гаспадаркі на новы сацыялістычны лад”.

Аперацыі ці налёты на неплатнікаў дзяржаўных падаткаў праводзіліся ў 1929-1930 гг. па ўсёй СССР, таксама, зразумела, на Беларусі і ў Магілёве ў прыватнасці. Налёты праводзіліся ў форме абыходжання дамоў ці кватэр, з абавязковым вобшукам і выняццем каштоўнасцей і маёмасці.

Прыклад правядзення нечаканых налётаў, як заўжды, падала Масква. Быццам бы ініцыятыва зыходзіла знізу ад рабочых. Але ж у лістах, інструкцыях, цыркулярах, якія дасылаліся на месцы пад грыфам «сакрэтна» адзначалася адваротнае: “в Москве **по нашему предложению** (выдзелена мною – І.П.) рабочими электрозавода организованы бригады по проверке взимания недоимок с частника... (подпіс Арджанікідзе)”.

Асаблівы націск рабіўся на выкрыццё так званых недаабкладзеных. Гэта людзі, якія ўнеслі падаткі, але ж з іх можна было нешта ўзяць. Дзень і час правядзення “абследавання” і вобыска ўстанаўліваўся адзіны. Для падрыхтоўкі арганізоўваліся штабы. Яны павінны былі загадзя загатовіць спісы ўсіх недаімшчыкаў па горадзе, а таксама спісы асоб, па якім маюцца меркаванні, што яны недаабкладзены. З гэтам мэтай абследавалі і мелі веды аб укладах і бягучых рахунках, вызначаных для праверкі прыватнікаў.

Так па Магілёву была складзена даведка па Магілёўскаму таварыству ўзаемнага крэдыта і вызначаны спісы асоб, якія мелі ўклад з сумай па 1000 руб., спіс асоб з Цэнтральнай ашчаднай касы, якія мелі пэўныя ўклады і г.д.

Для непасрэднага выканання аперацыі ўтвараліся брыгады. Яны ізымалі грошы, каштоўнасці, дываны, тканіну, рухомую маёмасць (мэблю, жывёлу, шавецкія машыны і г.д.). Існаваў загад пад грыфам “сакрэтна”: “...Ва ўсіх выпадках, калі сумы вынятых у абысканых і вырučаныя ад рэалізацыі маёмасці перавысяць недоімку, праз падатковага інспектара, вытварыць дадатковае абкладамне падаткамі”. Мала таго – “... пры знаходжанні пры вобыску значнай маёмасці, павінна быць вытварана на падставе гэтага пераабкладанне ў павышаных нормах з суадпаведным налічэннем штрафу і пені… Усе адабраныя пры вобыску рэчы значнай маёмасці, каштоўнасць якіх перавышае суму належачага плацяжу, паколькі гэта сведчыць аб злоснасці неплацельшчыка, безагаворачна **цалкам канфіскуюцца** (выдзелена мною - І.П.) у фонд дзяржавы”. Што і рабілася.

Налёт па горадзе Магілёве вытвараўся першы раз 30 снежня 1929 г. і паўтарыўся 12 студзеня 1930 года. Па астатніх гарадх і мястэчках Магілёўшчыны - 30 снежня і 22 студзеня.

З дакументаў па выніках налёту бачна цікавая акалічнасць. На той момант па гораду Магілёву лічылася 1102 недоімшчыка (тых хто не заплаціў падаткаў у

поўным аб'ёме) з сумай недоімкі 105042 руб. Пад час налёту была ахоплена 435 асоб, з якіх усяго 240 былі недоімшчыкамі. Сабралі грошай, маёмасці і каштоўнасцяў на агульную суму 245477 рублёў. Перавыканалі план збору сродкаў амаль у 2,5 разы! Але ж з 240 недоімшчыкаў здолелі ўзяць каштоўнасцяў усяго толькі на суму 9802 рублі, а астатняе, што перакрыла агульную суму недоімкі, узялі з 150 сумленна разлічыўшыхся з падаткамі раней. Неабходны рабунак ?

Што канфіскоўвалі пад час налёту.

1. За 1926-1927 гг. стварылася недоімка ў памеры 196 р. 04 кап. за царкоўным саветам Брацкага Сабору. Апісалі дом у папа Турава і маёмасць старшыні царкоўнага савету Афанасьевай.

2. У інваліда Гвоздава Ф.І. за недоімку 130 руб. (за 1928-30 гг) забралі і былі прададзены рэчы.

3. Рыжыкаў Г. меў недоімку 124 р. 38 к. Ён памёр, засталіся сіроты. Аднак у іх забралі дом і прадалі. Што стала з дзецьмі – невядома.

Дарэчы, усяго больш за 20 чалавек лішылася сваіх дамоў, іх канфіскавалі і перадалі ў веданне камунальнай гаспадаркі горада.

Сярод пакараных – старуха 75 год і іншыя. Між так званых недоімшчыкаў былі не толькі былыя гандляры (73 асобы), але і святары, урачы, сябры арцелі, рамеснікі, сапожнікі, сталяр, слесар, гравёр і іншыя.

Як ужо адзначалася, самай моцнай групай абшуканых аказалася група з адзнакай недаабкладання. Гэта значыць іх даабкладалі падаткамі на суму із'ятай маёмасці. 150 асоб далі 235675 рублёў. Як рабілася. Прайшліся па хатах, дзе добра жылі. Так, Чарняк Н.П. - мела падатку 95 р. 31 к., прылічылі - 505 р. 71 к.; Кармазін М.З. - меў 86 р. 81 к., прылічылі - 737 р. 85 к.; Карытка К.І. - 43 р. 95 к. і адпаведна 342 р. 85 к., і інш.

Вось і ўтварыліся недоімшчыкі для справаздачы, у якіх можна апісаць маёмаоць, рэалізаваць яе і атрымаць грошы на індустрыялізацыю, а саміх зрабіць класавымі ворагамі, абвінаваціўшы ў сакрыцці даходаў.

Недаабкладзеныя, гэтыя сумленныя людзі, падвергліся праверцы і рэпрэсіўным мерам таму, што на думку арганізатараў налёта ў Магілёве, жылі даволі заможна, а значыцца ўкрывалі даходы. Што ж сведчыла аб "шыкоўным" жыцці? Гэта бачна з дакументаў налёта:

"...у Слуцкіна Ізраіля - даабкласці падаткам на із'ятую маёмасць - карову - 1... Мінькіна. О. - даабкласці на ўсю із'ятую маёмасць і каштоўнасці: паліто жан. - 1, самавар нікіл. - 1, шкап - 1, хромавую шкуру - 1, пруты жалезныя - 8 і г.д.... Кролікава В. - даабкласці на маёмасць: чарку сярэбраную - 1. самавар нікіл. - 1, ложак нікіл. - 2, кушэтку мяк. - 1, машынку шавецкую -1, паліто - 1, карову - 1, сукно - 4, воўну - 1,5 ф. ..."

Як бачым, забіралі ўсё - апошнюю карову і ложак, самавары і паліто. У каго ж не было маёмасці - забіралі дом, а гаспадароў выкідвалі на вуліцу.

І яшчэ абураліся, што з боку асобных абшукваемых былі спробы "правакацыі і варожых навуськіванняў". Так, калі да грамадзяніна Маркітана з'явіліся ізымаць маёмасць, ён, здзержваючы злобу і купіўшы літру гарэлкі, сеў снедаць і зваў да сябе прыбыўшых на выняцце маёмасці супрацоўнікаў. На супярэчанні жонкі ў час із'яцця злобна адказваў: "Няхай бяруць, з міру па нітцы -

голаму рубашка". І яго можна зразумець, бо калі чытаеш далей дакументы налёта: "... у Палякова Пэйсаха – апісаць: паднос фарфоравы - 1, таз медны - 1, шкап плацяны - 1, кашуль дамскіх - 9, панталон дамскіх - 7, спадніц дамскіх - 2, кашуль мужчынскіх - 1, сукенак дамскіх - 4,... навалак -4, блузак дамскіх - 2, пінжак - 1, цукру - 6 кіло, чаю - 3/4 фунта..." і г.д.

Можна канстатаваць, што існаваўшыя ў 1920-30-я гады камуністычныя органы ўлады для вышуквання матэрыяльных сродкаў выкарыстоўвалі ўсемагчымыя сродкі. У тым ліку і вышэй разгледжаны налёт на неплацельшчыкаў дзяржаўных падаткаў. Пад час якога найбольш пацярпелі добрасумленныя людэі.

**4. У рытме пяцігодак**

За гады першай пяцігодкі (1928/29 – 1932/33 гг.) на развіццё прамысловасці горада было накіравана 38 млн руб. Галоўным аб'ектам, які быў уведзены ў строй у гэтыя гады, стала фабрыка штучнага шоўку (цяпер завод штучнага валакна імя В.Куйбышава). 1.5.1929 г. 200 дэлегатаў акруговага з'езда саветаў разам з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый заклалі першы камень у фундамент фабрыкі. Будаўніцтва ішло ўдарнымі тэмпамі. Навізна справы натхняла людзей. Былі і цяжкасці, звязаныя з недахопам цэглы, цэменту, вопытных спецыялістаў. Пафас камуністычнай працы і энтузіязму лунаў над будаўнічай пляцоўкай. Рабочыя адмаўляліся ад выхадных, працавалі па 10–12 гадзін у суткі. Дапамагалі будоўлі пасланцы Віцебска, Гомеля, іншых гарадоў і сёл рэспублікі. Начальнік будаўніцтва В.Враб'ёў, галоўны інжынер Е.Магілёўцаў, рабочыя Вінаградаў, Зак, Богун, Сацін, Шавялёў, Ткачоў і іншыя працавалі творча, з выдумкай, вялі за сабою другіх. 7.11.1930 г. адбыўся ўрачысты пуск фабрыкі. Многія будаўнікі засталіся працаваць на фабрыцы, 700 з іх аб'ядналіся ў дзяржразліковыя брыгады. Да канца 1932 г. на фабрыцы працавала 1942 рабочыя, за год імі было выпушчана прадукцыі на 31,2 млн. руб.

За гады 1-й пяцігодкі колькасць прадпрыемстваў Магілёва павялічылася з 21 да 38. Сярод буйных прадпрыемстваў адзначаліся трубаліцейны завод імя А.Мяснікова, які асвоіў выпуск чыгунных водаправодных труб дыяметрам 100–300 мм, швейная фабрыка імя Валадарскага. На базе дробных гарбарных арцелей вырас гарбарны завод імя Сталіна. Расшырыліся магутнасці, павысілася механізацыя вытворчых працэсаў практычна на ўсіх прадпрыемствах горада.

Як адзначае даследчык А.Косцераў, за гады 1-й пяцігодкі Магілёў стаў адным з буйных прамысловых цэнтраў рэспублікі. Насельніцтва горада вырасла амаль удвая, у асноўным за кошт вяскоўцаў, што прыехалі ў горад на будаўніцтва прадпрыемстваў, а пасля засталіся працаваць на іх. Гэта патрабавала значнага будаўніцтва аб'ектаў сацыяльна-бытавой сферы. Але сродкі на гэтыя мэты адпускаліся мізэрныя. За пяць гадоў у горадзе было здадзена ў эксплуатацыю толькі 20 тыс. м$^2$ жылля, пабудаваны дзіцячыя яслі на шаўковай фабрыцы, рэканструяваны будынак цэнтральнай амбулаторыі, зроблены капітальны рамонт бальніцы, крыху расшырана пральня.

Каб забяспечыць выкананне высокіх паказчыкаў вытворчасці, планаў партыі, прадпрыемствам патрэбна было ўсё больш і больш рабочых рук. У аснове ж працы заставаліся цяжкія фізічныя затраты. Невыкананне тых або іншых

заданняў аб'яўлялася падкопамі правых апазіцыянераў і іншых "ворагаў народа", якія быццам толькі і думалі, як нашкодзіць і сарваць планы партыі. Барацьба са шкодніцтвам, безумоўна, праводзілася пры "шырокай падтрымцы" насельніцтва. Гэтай барацьбой улады імкнуліся апраўдваць свае пралікі і недахопы, прыкрыць сваю нікчэмнасць.

Палітыку калектывізацыі вёскі магілёўцы падтрымалі таксама. Гараджане аб'яўлялі паходы "За ўраджай", ствараліся ўдарныя брыгады для выезду ў падшэфныя вёскі на дапамогу ў рамонце тэхнікі, зборы попелу, вялі ідэалагічную работу. У ходзе ўборачнай кампаніі 1930 г. гараджане адпрацавалі ў калгасах акругі каля 700 тыс. чалавека-дзён, сфарміравалі і накіравалі ў вёскі 250 брыгад.

У 1934 г. ўсе прадпрыемствы горада былі ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам. 15 лістапада кіраўніцтва горада рапартавала ўраду аб датэрміновым выкананні прамфінплана. Да канца года было выпушчана прадукцыі звыш задання на 7 млн руб. Галоўнай будоўляй 2-й пяцігодкі стаў аўтарамонтны завод. 9.7.1935 г. ён быў уведзены ў дзеянне на 4 месяцы раней установленага тэрміну. Узначаліў завод былы камандзір Дняпроўскай ваеннай флатыліі А.Панамароў. У 1937 г. ўступіў у строй косцеперапрацоўчы (клеявы) завод, які пачаў выпускаць клей, касцявую муку і азотныя ўгнаенні. На кандытарскай фабрыцы, трубаліцейным і металаапрацоўчым заводах быў асвоены выпуск новых відаў прадукцыі, у т.л. электраматораў, ліставога жалеза. Павялічыўся асартымент тавараў народнага ўжытку на буйных прадпрыемствах. Гарбарны завод наладзіў выпуск тавараў каляровай галантарэі, швейная фабрыка імя Валадарскага асвоіла вытворчасць коўдраў, дзіцячага адзення, галаўных убораў, мэблевая – тумбачак, вешалак, аўтарамонтны завод – бытавых інструментаў, вучэбных дапаможнікаў, трубаліцейны – жаровень, бітонаў, вёдзер і інш.

У 1938 г. ў горадзе дзейнічалі 53 прадпрыемствы саюзнага, рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, дзе працавала 14109 чалавек. Паколькі ў аснове развіцця прамысловасці ляжалі па-ранейшаму экстэнсіўныя метады, расла і колькасць занятых у прамысловасці: у параўнанні з 1928 г. яна вырасла ў 4 разы. У горадзе было ліквідавана яўнае беспрацоўе. Сталі расці фонды сацыяльнага страхавання, заработная плата. Але давалася ўсё гэта цяжкай і напружанай працай. Для павышэння яе прадукцыйнасці шырока выкарыстоўваліся ідэалагічныя метады і працоўны энтузіязм: сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, стаханаўскі рух і інш. Як адзначае А.Косцераў, ударніцтвам і стаханаўскім рухам былі ахоплены многія прадпрыемствы. У пачатку 1936 г. было 1590 стаханаўцаў, ці 21% ад усіх працуючых. Праз год гэта лічба складала ўжо 39,8%, а ў першы год 3-й пяцігодкі за права звацца стаханаўцамі змагалася 89,3% рабочых. Вядома, што было тут шмат паказухі, казёншчыны і фармалізму, аднак былі і прыклады працоўнай кемлівасці, рацыяналізатарства і нават гераізму. Прадзільшчык шаўковай фабрыкі Камароў перайшоў на абслугоўванне трох машын і выконваў нормы выпрацоўкі на 200–215%. Матальшчыцы фабрыкі Новікава, Шумская, Шувалава за змену намотвалі па 900 і больш бабін шоўку замест 700 па норме. Прыклады ўзорнай працы паказвалі наватары Майсей Сярэбраны і Аляксей Наважонаў. Многія рабочыя,

якія асвоілі тэхніку і тэхналагічныя працэсы вытворчасці, былі назначаны кіраўнікамі на адказныя ўчасткі работы. На трубаліцейным заводзе, напрыклад, начальнікамі змен сталі стаханаўцы А.Батурын, Ц.Драздоў, Р.Германовіч, майстрамі змен А.Бачкоў, П.Вішнякоў, узначаліла брыгаду М.Чуйко. У паравозным дэпо сваёй працай вызначыўся машыніст А.Грушніцкі, ён узначаліў стаханаўскі рух, за высокія паказчыкі быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. На аўтарамонтным заводзе працавала 7 ударных маладзёжных брыгад. Маладыя рабочыя Нязнанскі, Рыбакоў, Кубанаў, Фёдараў выконвалі нормы выпрацоўкі на 250–300%, інжынер Бутэнка ў асабісты час падрыхтаваў каля 100 шафёраў-аматараў.

Вялікія планы па развіцці эканомікі і сацыяльнай сферы намячаліся на 3-ю пяцігодку. Па ініцыятыве прафсаюзаў былі перагледжаны ўстарэлыя нормы выпрацоўкі, зменены расцэнкі, прыняты меры па павышэнні тэхнічных ведаў рабочых і служачых. Практычна на ўсіх фабрыках і заводах працавалі вытворча-тэхнічныя гурткі, цэхавыя школы па навучанні і здачы тэхмінімуму, былі створаны ўмовы для завочнага навучання ў тэхнікумах і інстытутах. Дзякуючы гэтым мерапрыемствам значна ўзрасла прадукцыйнасць працы.

У тыя гады ўсе мерапрыемствы праводзіліся з вялікім уздымам і ідэалагічным пафасам. Часцяком яны былі звычайнай "паказухай". На сходах працоўныя абмяркоўвалі праект новай Канстытуцыі СССР, уносілі свае заўвагі і прапановы, якія ў прынцыпе нічога не значылі. 39 магілёўцаў былі ўдастоены ўрадавых узнагарод у сувязі з 20-годдзем утварэння БССР.

За перыяд з 1926 г. да 1941 г. падвоілася насельніцтва горада, яно складала больш за 100 тыс. чалавек. Гэта патрабавала значных укладанняў у інфраструктуру горада. За 12 км ад цэнтра па Віцебскай шашы вырас рабочы пасёлак аўтарамонтнага завода. Побач з жылымі дамамі размясціліся магазіны, школы, дзіцячыя сады і яслі, палац культуры. Вуліцы і плошчы горада зведалі перапланіроўку, узводзіліся масты і пераходы праз яры і рэкі, ствараліся новыя архітэктурныя ансамблі, прычым у пэўных выпадках адначасова знішчаліся помнікі архітэктуры мінулага (будынкі калегіума езуітаў, Іосіфаўскі сабор і Пакроўская царква). Такім чынам, многія з гэтых мерапрыемстваў праводзіліся бяздумна і безадказна.

### 5. Сталінскія рэпрэсіі. Закрыццё храмаў

Безумоўна, 1920-я і 30-я гады былі пэўным росквітам у жыцці Магілёва - развівалася эканоміка, асвета, культура, ахова здароўя. Але гэтыя гады былі і вельмі трагічнымі. Сотні лепшых прадстаўнікоў народа сталі ахвярамі беззаконнасці, былі загублены ў ходзе масавых рэпрэсій. Палітыка беларусізацыі, пачатая ў 1920-я гады, завяршылася ў 30-я гады барацьбой з "нацдэмаўшчынай". У горадзе было арыштавана і засуджана больш за 30 прадстаўнікоў інтэлігенцыі, сярод іх настаўнікі школ, выкладчыкі навучальных устаноў, літаратары, журналісты, работнікі навуковых і культурных устаноў. Былі знішчаны лепшыя прадстаўнікі магілёўскай і беларускай эліты.

Вялося непрыхаванае змаганне з рэлігіяй. Закрываліся храмы, растрэльваліся святары. Пачатак паклала забойства каталіцкага ксяндза

Святаполк-Мірскага, затым арышт і высылка Магілёўскага біскупа Балеслава Слоскана. Пакутлівым і ахвярным было жыццё ў нашым горадзе Магілёўскага праваслаўнага архіепіскапа Паўліна (Крашэчкіна). Ён быў безпадстаўна абвінавачваны, арыштаваны, а затым растраляны. Разам з ім ахвярамі рэпрэсій сталі шэраг праваслаўных святароў і магілёўцаў. У 2000 годзе архіепіскап Паўлін пастановаю юбілейнага сабору РПЦ быў далучаны да ліку святых.

У канцы 1990-х гадоў сталі адраджацца калісьці існаваўшыя прыходы веруючых розных канфесій. Ім вяртаюцца раней канфіскаваныя цэрквы, касцёлы, сінагогі, малітоўныя дамы і г. д. Аднаўляецца справядлівасць, маёмасць вяртаецца сапраўдным гаспадарам. Але ўзнікаюць шматлікія пытанні. Напрыклад, як даказаць, што гэты будынак раней належаў веруючым і быў гвалтоўна ад іх адабраны? Хто і калі прымаў рашэнні? Знайсці адказ на гэта стала магчыма толькі ў апошнія гады. Даследчыкі атрымалі права працаваць у архівах з матэрыяламі, да якіх раней доступ быў абмежаваны.

Адказ на гэтыя пытанні мажліва знайсці на пажоўклых старонках пратаколаў камуністычнай арганізацыі прэзідыума гарадскога савета Магілёва, на якіх пазначаны працэс канфіскацыі будынкаў, належачых вернікам розных канфесій у 1929-1930-х гадах.

Патрэбна падкрэсліць, што ўсе храмы на момант прыняцця рашэнняў дзейнічалі і канфіскоўваліся ад груп веруючых існаваўшых прыходаў. Характэрным з’яўляецца тое, што пры прыняцці рашэнняў робяцца спасылкі на агульныя сходы рабочых і служачых горада, на якіх выказваліся запатрабаванні аб канфіскацыі ўсіх малітоўных дамоў, цэркваў і г. д. Але ж мы ведаем, як тады праводзіліся такія сходы і як прымаліся на іх пастановы, і чаго яны вартыя.

З пратаколаў можна даведацца аб дакладнай даце прыняцця рашэння аб зняцці ўсіх званоў (калакалоў) з цэркваў горада. Гэта было зроблена якраз перад Калядамі (Ражством Хрыстовым) – 3 студзеня 1930 года.

16 красавіка 1929 года: прынялі рашэнне аб канфіскацыі ад групы веруючых Васкрасенскай царквы (раней касцёл езуітаў) і перадачы яе Магпрамсаюзу; сінагогу Кносо-Ізраіль пад культурныя мэты Акрпрафбюро. 22 снежня 1929 года сінагогу “Шыра-Шырым” аднялі ў вернікаў і будынак перадалі 17-й школе. 3 студзеня 1930 года, акрамя зняцця званоў, вырашылі канфіскаваць сінагогу “Гнэсэз-Ізраіль” і перадаць у распараджэнне інваліднай кааперацыі. 24 студзеня 1930 года: Кафедральны Малы і Вялікі саборы былі канфіскаваныя і Вялікі перадалі пад клуб рабочых хлебазавода; Трохсвяціцельскую царкву па Першамайскай вуліцы – пад клуб рабочых чыгункі і завода “Адраджэньне”; сінагогу “Купечаскую” (Паштовая вул, д. 4) пад клуб беспрацоўных; сінагогу “Тылім” (Віленская, д. 2) пад клуб членам жыллёвай кааперацыі; сінагогу “Бэйс-Іосіф” (вул. Ульяна-Крупская, д. 45) пад клуб перанератрада чыгункі; Троіцкую царкву на Лупалава пад культурныя мэты; сінагогу “Шура” пад клуб 16-га сапбата; Васкрасенскую царкву і капліцу ў Пячэрску: першую – пад клуб “Чырвонага механіка”, а капліцу пад клуб рабочых псіхалячэбніцы. 17 лютага 1930 года сінагогу “Сагал” (Быхаўская, д. 6) канфіскавалі і перадалі яе патрэббазе.

Прынцыповыя рашэнні аб закрыцці і канфіскацыі храмаў напачатку прымалі мясцовыя кіраўнічыя органы камуністычнай партыі. Перадавалі будынкі

пад культурныя і гаспадарчыя патрэбы розным установам і прадпрыемствам. Прымалі рашэнне і прысутнічалі пры гэтым наступныя асобы: Рубінец, Сільвестраў, Пундзік, Нямірскі, Кіштымаў, Пруднікава, Розенберг, Цыперман, Нісневіч, Крывулін, Файштэйн, Жданко, Смількенсон, Клеонская, Каханавер, Ляшчынскі, Вінаградаў, Дурдолава, Кантар, Хаськін, Эльгесне, Айзінсон, Гофман, Лейзаровіч, Карасін.

Амаль усе згадваемыя будынкі ў наступныя гады былі знішчаны. Гэта тычыцца сінагог, Троіцкай царквы на Лупалава, Іосіфскага сабора (Вялікі кафедральны), Спаскага (Малы кафедральны), Васкрасенскай царквы. Захаваліся толькі будынкі: сінагогі “Купечаскай” – цяпер дом боксу, і Трохсвяціцельскай царквы, дзе быў клуб, а зараз зноўку царква.

**6. Спробы перайменавання Магілёва**

У Гомельскім абласным архіве ўтрымліваюцца дакументы, у якіх змешчаны звесткі аб грамадска-палітычным, эканамічным і гаспадарчым жыцці горада Магілёва за 1919-1924 гг. Сярод іх і пратакол паседжэння прэзыдыума гарсавета ад 29.01.1924 г., з тэксту якога можна даведацца, як пры абмеркаванні плана пабудовы ў Магілёве помніка У.Леніну, член прэзыдыума Эпштэйн прапанаваў перайменаваць Магілёў ва «Владимир – Ильинский». Прапанова знайшла пылкую падтрымку з боку другога члена прэзыдыума Хаськіна, але ім запярэчылі Волкаў, Сапрыцкі, Кардашэнка. У выніку пытанне перайменавання перанеслі на разгляд пленума гарадскога савета. Маецца ў архіве і пратакол пленума гарсавета ад 29.01.1924 г., які праходзіў у будынку Дома Працы. На разгляд пленума паступілі дзве прапановы: перайменаваць горад Магілёў ва Уладзімір-Ільінскі, а Лупалава, якое на той час мела асобны ад Магілёва адміністратыўны статус, у Леніна. Пасля абмеркавання прысутныя на пленуме пагадзіліся, што Магілёў перайменаваць варта, але спачатку трэба выпрацаваць новую назву і даручыць гэта камісіі ў складзе Хаськіна, Эпштэйна, Янкоўскага. Лупалава вырашылі не перайменоўваць. Але ў хуткім часе адбылося ўзбуйненне БССР, горад Магілёў быў вернуты ў склад Беларусі (з 1919 па 1924 гг. Магілёў – цэнтр павета ў РСФСР) і захаваў сваю старажытную назву.

У 1930-я гады Магілёў мог стаць горадам Шмідтам. Пасля таго, як параход “Чалюскін” затануў у Чукоцкім моры, наш зямляк – кіраўнік няўдалай палярнай экспедыцыі 1933-1934 гг. Ота Шмідт праз Амерыку і Еўропу вярнуўся ў Савецкі Саюз. Ён і ўвесь экіпаж парахода атрымалі ўзнагароды і сталі героямі. У іх гонар складаліся вершы, пісаліся песні. У 1934 г. у Магілёве Быхаўская шаша атрымала назву вуліцы Чалюскінцаў. Як сцвярджае А.Агееў савецкая прапаганда змагла трагедыю пераўтварыць ў трыумф моцы духу савецкіх людзей.

Падчас урачыстай сустрэчы Ота Шмідта на чыгуначным вакзале ў г.Мінску, паэт Андрэй Аляксандровіч прачытаў верш, у якім прапаноўваў змяніць назву горада Магілёва на Шмідт! Аляксандровіч на той момант быў вядомым і ўплывовым паэтам. Ён дазваляў сабе зняслаўляць вядомых беларускіх літаратараў: В.Дуніна-Марцынкевіча, Ф.Багушэвіча, М.Багдановіча, Я.Купалу, Я.Коласа ды інш. Ужо на другі дзень верш быў апублікаваны ў органе ЦК КП(б)Б – газеце “Звязда” на самым пачэсным месцы. Трэба ўзгадаць, што перайменаванні

назваў савецкіх гарадоў у 1930-я гады былі масавай з’явай. Перайменоўвалі іх не толькі ў гонар партыйных і савецкіх дзеячоў, але і герояў сацыялістычнага будаўніцтва. Некаторыя чытачы беларускіх газет падтрымалі прапанову Аляксандровіча. Тым не менш лёс назвы горада вырашаўся не на старонках “Звязды”, а ў самых высокіх кабінетах. Магілёву тады пашчасціла застацца Магілёвам.

### 7. Напярэдадні вайны. Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў

Да 1939 года сталіца Беларусі – горад Мінск – знаходзіўся ўсяго за 30 км ад дзяржаўнай мяжы. Гэта было небяспечна са стратэгічнага пункту гледжання на выпадак вайны.

Канец 1930-х гадоў знамянальны ў магілёўскай гісторыі тым, што горад мог стаць сталіцай БССР. У 1937-1939 гг. распрацоўваўся і пачаў рэалізоўвацца праект пераносу сталіцы Беларусі з горада Мінска ў Магілёў, так як: “Минск находится очень близко от польской границы…, слабо связан железнодорожными и шоссейными магистралями, как с центрами Союза, так и, особенно, с районами республики…

Могилев же находится в центре республики, имеет достаточную индустриальную базу, выгодно отличается от Минска в стратегическом отношении, в особенности, и по своим природным условиям имеет большие перспективы для дальнейшего развития”.

Быў распрацаваны перспектыўны план рэканструкцыі Магілёва пад сталіцу. Новая планіроўка Магілёва павінна была адпавядаць выгляду сацыялістычнага горада, яго адміністрацыйна-палітычнаму прызначэнню. Адпаведна ў Магілёве не павінны былі застацца архітэктурныя помнікі, якія б нагадвалі аб мінулым. Планавалася знесці: ратушу, дом губернатара, губернскага праўлення, архірэйскі палац, Багаяўленскі, Спаскі саборы, Трохсвяціцельскую, Васкрасенскую, Мікалаеўскую цэрквы, касцёлы Св. Антонія і Св. Станіслава, шэраг іншых гістарычных будынкаў. Адзін з самых вядомых сабораў – Іосіфскі, пабудаваны ў стылі класіцызму (архітэктар М.Львоў), быў узарваны ў 1938 годзе, каб на яго месцы пабудаваць гасцініцу для гасцей сталіцы.

Цэнтральнай плошчай павінна была стаць былая Базарная (цяпер пл.Леніна). На ёй планавалася размясціць Дом урада, адміністрацыйныя будынкі. Ад тых часоў да нашых дзён дайшлі пабудаваныя, падобны на мінскі Дом Саветаў (праект архітэктара І.Лангабарда), будынак НКУС (цяпер Беларуска-Расійскі універсітэт) і інш.

Вядучыя архітэктары рэспублікі распрацавалі праект рэканструкцыі горада. На ажыццяўленне гэтага праекта было выдзелена 42,3 млн руб. За кароткія тэрміны ў цэнтры горада былі ўзведзены Дом Саветаў, 66-кватэрны жылы дом, будынак НКУС, гасцініца “Дняпро”, завершана будаўніцтва кінатэатра “Радзіма”.

Аднак грандыёзны праект не ажыццявіўся. Плануемы пераезд сталіцы зацягнуўся з-за упартага нежадання пераязджаць чыноўнікаў. А затым – “вызвольны паход у Заходнюю Беларусь”. У верасні 1939 г. заходнія беларускія землі былі далучаны да БССР, і дзяржаўная мяжа апынулася далёка на захадзе.

Усе сталі рыхтавацца да вайны, непазбежнасць якой усе адчувалі. Неабходнасць, у першую чаргу ваенна-стратэгічная, у пераносе сталіцы адпала.

У 1930-я гады ў Магілёве было вырашана пытанне водазабеспячэння, па галоўнай магістралі, вуліцы Першамайскай, пайшлі першыя аўтобусы, расшырылася сетка медыцынскіх устаноў. У 1940 г. дзейнічалі - 4 бальніцы на 1345 ложкаў, 9 дзіцячых кансультацый, амбулаторый і паліклінік, Дом дзіцяці, 3 дыспансеры, станцыя хуткай медыцынскай дапамогі, працавала 188 урачоў, 67 фельчараў, 28 акушэрак і 307 медсясцер (у 1924 г. было толькі 11 урачоў і 14 акушэрак на ўвесь Магілёўскі павет). Значнае развіцце атрымаў спорт. У канцы 1930-х гадоў створаны фізкультурна-спартыўныя таварыствы “Дынама”, “Спартак” і ДСТ “Лакаматыў”, дзе займалася больш за 10 тыс. магілёўцаў

На пачатак 1941 г. у Магілёве працавалі 22 сярэднія школы, дзе навучалася каля 15 тыс. дзяцей. Больш за 1000 чалавек займаліся ў 4 сярэдніх спецыяльных навучальных установах – культурна-асветным і музычным вучылішчах, медыцынскім і педагагічным тэхнікумах. У 1930 г. быў адноўлены педагагічны інстытут (раней называўся інстытут народнай адукацыі). У 1937 г. на базе Магілёўскай музычнай школы імя Рымскага-Корсакава было заснавана музычнае вучылішча імя Рымскага-Корсакава. Тут працавалі фартэпіяннае, вакальнае, струннае, духавых інструментаў і інструктарскае аддзяленні, выкладалі высокакваліфікаваныя педагогі Л.Юшкевіч, А.Яўстратаў, І.Каранеўская, А.Боркус Першы выпуск спецыялістаў у 1941 г. не адбыўся – пачалася вайна.

У 1920-30-я гг. у Магілёве працягвалі адукацыю і пачыналі шлях у літаратуру Сяргей Фамін, Кастусь Губарэвіч, Леанід Юркевіч (псеўданім – Юрка Лявонны). Іх творы друкаваліся ў часопісах “Полымя”, “Маладняк”, у газетах “Магілёўскі селянін”, “Соха и молот”, “Камунар Магілёўшчыны”. У 1923 г. маладыя літаратары стварылі акруговае літаб’яднанне – Магілёўскую філію “Маладняка”. У філію ўваходзілі 24 паэты і празаікі. У лістападзе 1928 г. у сувязі з рэарганізацыяй “Маладняка” яна была пераўтворана ў філію Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, якая ўжо праз год выдала альманах “Ранне”. У 1939 г. узнікла літаб’яднанне “Прыдняпроўе”. Літаратары праводзілі значную культурна-асветную работу, арганізоўвалі літаратурна-музычныя вечары, сустрэчы з чытачамі, вучобу творчай моладзі.

Пастаяннай тэатральнай трупы ў Магілёве не было, але горад наведвалі з гастролямі тэатры рэспублікі. Працавала з перапынкамі Руская перасоўная трупа, на базе якой у 1932 г. быў створаны Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР. У 1935–41 гг. ён працаваў у Магілёве. Былі створаны і паспяхова дзейнічалі народныя тэатры палацаў культуры аўтарамонтнага завода і чыгуначнікаў. У перадваенныя гады ў горадзе дзейнічала 12 клубаў, 2 кінатэатры, 13 бібліятэк, краязнаўчы музей і яго філіялы – музей гісторыі і атэізму, мемарыяльны музей Р.Арджанікідзе.

У 1930-я гады Савецкі Саюз рабіў першыя крокі ў асваенні Паўночнага марскога шляху. Магілёўцы ганарацца, што сярод першаадкрывальнікаў Поўначы ёсць і іх землякі – сусветна вядомы вучоны О.Шмідт і ўдзельнік дрэйфу на караблі «Георгій Сядоў» М.Нядзвецкі.

У канцы 1930-х гадоў абвастрылася міжнародная абстаноўка. Кіраўніцтва краіны прымала меры па павышэнні мабілізацыйнай гатоўнасці краіны, узмацненні дысцыпліны і парадку. На прадпрыемствах устанаўліваліся абавязковыя нормы выпрацоўкі, ужываліся рэпрэсіўныя меры за разгільдзяйства, прагулы, спазненне. Многія прамысловыя прадпрыемствы перайшлі на выпуск прадукцыі ваеннага прызначэння. Так аўтарамонтны завод стаў авіярамонтным, металаапрацоўчы – авіяцыйным. Ваенныя заказы выконвалі і іншыя прадпрыемствы.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці даваеннага часу, магілёўцы паспелі зрабіць многае. 15.01.1938 г. Магілёў набыў новы статус – стаў цэнтрам вобласці.

Хваляванні і трывогі ў паўсядзенныя клопаты магілёўцаў унеслі савецка-фінляндская вайна, ваенныя канфлікты на возеры Хасан і рацэ Халхін-Гол. У гэтых баях загінула больш за 20 магілёўцаў. Ля заходніх межаў рэспублікі разгараўся пажар 2-й сусветнай вайны. Не хацелася ў гэта верыць, але гараджанам было зразумела, на думку А.Косцерава, што вайны не пазбегнуць.

Такім чынам, у Магілёве, падчас НЭПа і правядзення палітыкі беларусізацыі, былі адкрыты і працавалі польская школа-сямігодка, тры яўрэйскія школы, дзевяць рускіх школ (з 1926 года толькі адна), у астатніх дзяцей абучалі на іх роднай мове – беларускай. У горадзе працавалі клубы, бібліятэкі, дзіцячыя сады, кінатэатры (“Чырвоная зорка” з 1930 г., “Радзіма” з 1938 г.), тэатр, цырк, музыкальныя школы, педагагічны інстытут, музеі і г.д. У гэты час былі зроблены спробы перайменаваць наш горад. Неабходна ведаць, што ў Магілёве, як і па ўсёй краіне, побач з стваральнай працай назіраліся працэсы разбурэнняў. Знішчаліся нацыянальныя ўклады, духоўныя каштоўнасці, бурыліся помнікі гісторыі і культуры. У канцы 20-х – пачатку 30-х гадоў адбылося гвалтоўнае закрыццё храмаў і ліквідацыя абшчын вернікаў. Найбольшая колькасць храмаў былі канфіскаваны ў вернікаў у 1929-30 гг., большая часць з іх пазней была знішчана (з 73 культавых будынкаў, якія існавалі да 1917 года, да сённяшніх дзён ацалела меней 15). 3.01.1930 г. з усіх цэркваў знялі званы. Напаткалі магілёўцаў і сталінскія рэпрэсіі. Іх зведалі болей за тысячу чалавек у нашым горадзе. Незайздросным быў і лёс іх сваякоў.

У сувязі з правядзеннем у краіне індустрыялізацыі ў Магілёве былі пабудаваны буйныя прамысловыя прадпрыемствы: у 1929 г. пачала працу швейная фабрыка імя В. Валадарскага, у 1930 г. – буйнейшая ў рэспубліцы фабрыка штучнага шоўку (ЗШВ імя Куйбышава), у тым жа годзе гарбарны завод, у 1932 г. – трубаліцейны завод імя А. Мяснікова, у 1935 годзе аўтарамонтны завод імя С. Кірава і г.д.

Канец 30-х гадоў знамянальны ў магілёўскай гісторыі тым, што горад мог стаць сталіцай БССР. Але падзеі верасня 1939 года - уз΄яднанне Заходняй Беларусі з БССР перакрэслілі надзеі магілёўцаў на сталічны статус горада.

## Лекцыя 9. Падзеі вайны 1941 – 1945 гг. і Магілёў. Абарона, акупацыя і вызваленне горада

1. Пачатак вайны і гераічная абарона Магілёва.
2. Акупацыя горада: палітыка генацыду і антыгітлераўскі супраціў.
3. Эканамічнае і сацыяльна-культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі.
4. Вызваленне Магілёва. Страты горада ў вайне.

### 1. Пачатак вайны і гераічная абарона Магілёва

Нямецкі напад на СССР 22 чэрвеня 1941 года быў хаця і прагназіруемым, але неспадзяваным для большай часткі грамадзян і мясцовых кіраўнікоў, якія былі дэзарганізаваны вышэйшым кіраўніцтвам краіны.

З першых дзён вайны на Магілёўшчыне ўся работа дзяржаўных і грамадскіх органаў перабудоўвалася ў адпаведнасці з задачамі ваеннага часу і патрэбнасцямі фронту. З 25 чэрвеня па 3 ліпеня 1941 г. у Магілёве знаходзіліся ЦК Камуністычнай партыі Беларусі і Савет народных камісараў БССР. У раёне чыгуначнай станцыі Лупалава дзейнічала Цэнтральная эвакуацыйная камісія БССР.

Менш чым за тры тыдні было эвакуіравана 14 прадпрыемстваў, у т.л. Магілёўскія заводы авіяцыйнага маторабудавання і гарбарны, фабрыкі штучнага валакна і швейная, Крычаўскі цэментны завод, 2065 трактароў, больш 100 тыс. галоў жывёлы, 7100 т збожжа. Аналагаў такой маштабнай эвакуацыі ў вобласці не было ніколі.

Значная частка магілёўцаў прыняла ўдзел у пабудове абарончых збудаванняў (супрацьтанкавых ірвоў) вакол горада, прынялі ўдзел у абароне горада. Было створана гарадское апалчэнне – гэта дае падставу казаць, што Магілёў разам з салдатамі баранілі самі гараджане.

1 ліпеня 1941 г. у штабе Заходняга фронту, непадалёк ад Магілёва, адбылася нарада прадстаўнікоў Стаўкі Вярхоўнага камандавання з удзелам маршалаў Савецкага Саюза К.Варашылава і Б.Шапашнікава, 1-га сакратара ЦК КП(б)Б П.Панамарэнкі і мясцовых улад. Тут былі разгледжаны задачы па разгортванню партызанскай барацьбы ў тыле ворага і зацверджаны план абароны Магілёва як найбольш важнага апорнага пункта на Дняпроўскім рубяжы. Некалькі пазней былі створаны абласны і гарадскі штабы народнага апалчэння, якое па вобласці налічвала каля 12 тыс. чалавек.

Згодна даследаванняў М.Барысенка, напрыканцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1941 г. на тэрыторыі вобласці пачаліся напружаныя баі. 24-ы і 46-ы танкавыя карпусы 2-й танкавай групы (генерал Х.Гудэрыян), 4-й танковай арміі (фельдмаршал Г. фон Клюге) дасягнулі р. Бярэзіны і зрабілі спробу фарсіраваць яе, каб выйсці да Дняпра. У баях каля Бабруйска з 28 чэрвеня зводны атрад (часці 121-й дывізіі, воіны авіяцыйных падраздзяленняў, курсанты Бабруйскага аўта-трактарнага вучылішча і інш.) пад камандаваннем камандзіра 47-га стралковага корпуса генерала С.Паветкіна на тры дні затрымаў праціўніка на р. Бярэзіне. Пасля цяжкіх баёў нямецкія войскі фарсіравалі Бярэзіну на фронце ў 80 км паміж

г.п. Беразіно і Бабруйскам. Сустрэчнымі агнявымі баямі савецкія войскі затрымалі іх ў міжрэччы Дняпра і Бярэзіны больш чым на тыдзень. Кровапралітныя баі на Дняпроўскім рубяжы на лініі Шклоў-Магілёў-Быхаў вялі войскі 13-й арміі ў складзе 61-га, 45-га стралковых і 20-га механізаванага карпусоў.

Вельмі напружаныя і жорсткія баі разгарнуліся непасрэдна ў раёне Магілёва, дзе абарону трымалі злучэнні 61-га стралковага корпуса генерала Ф.Бакуніна. Горад абараняла ўваходзіўшая ў склад корпуса 172-я стралковая дывізія (генерал М.Ц.Раманаў) з прыданымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі (каля 20 тыс. чалавек). З 3 па 9 ліпеня часці дывізіі вялі баі з ворагам на рубяжы р.Друць у раёне в.Чачэвічы і г.п. Бялынічы. Тут асабліва вызначыўся адступаючы дывізіён капітана Б.Хігрына (462-гі артылерыйскі полк), які геройскі стрымліваў танкі праціўніка. 5 ліпеня батарэя 122-мм гаўбіц на р.Восліўцы па Мінскай шашы падбіла 8 варожых танкаў, з іх чатыры былі падбіты асабіста Б.Хігрыным, які першым на Магілёўшчыне ў 1941 годзе атрымаў званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна).

Асабліва вызначаліся байцы 388-га палка пад камандаваннем С.Куцепава на Буйніцкім полі, дзе 12-13 ліпеня былі знішчаны 39 гітлераўскіх танкаў. Гэты подзвіг апісаў знакаміты пісьменнік К.Сіманаў. Незабыўным застанецца подзвіг батальёна міліцыі каля вёскі Гаі пад камандаваннем капітана К.Уладзімірава і інш.

Неабходна ведаць, што абарона Магілёва падзяляецца на 3 перыяды:

1. 3-9 ліпеня 1941 г. – баі на далёкіх падыходах да горада;
2. 9-16 ліпеня 1941 г. – змаганне на ўскрайках Магілёва;
3. 17-27 ліпеня 1941 г. – баі ў поўным акружэнні.

Як адзначае М.Барысенка, не маючы магчымасці ўзяць Магілёў лабавым ударам з захаду, немцы распачалі ўзмоцненыя атакі на стыках абароны палкоў 53-й, 110-й і 187-й стралковых дывізій, фарсіравалі Дняпро ў раёне Шклова-Быхава і рушылі на Смаленск, Рослаў. 15 ліпеня 1941 года, злучыўшыся ў Чавусах, яны акружылі Магілёўскі абарончы раён. Амаль дзесяць дзён мужна змагаліся абаронцы горада ў поўным акружэнні, адцягваючы на сябе значныя сілы праціўніка. У ноч з 25 на 26 ліпеня на апошнім пасяджанні кіраўнікоў абароны генерал М.Ц.Раманаў аддаў загад на прарыў з асаджанага горада. У час прарыву ён быў цяжка паранены, загінулі палкоўнікі С.Ф.Куцепаў, І.С.Мазалаў і інш.

У гэты ж час на левым беразе Дняпра выходзілі з акружэння іншыя падраздзяленні 61-га стралковага корпуса на чале з генералам Бакуніным Ф.А., якія падчас жорсткіх 2-дзённых баёў у Чавускім раёне страцілі забітымі, параненымі і трапіўшымі ў палон каля 5 тыс. чалавек.

Па апошніх дадзеных з 10-томнай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (1991г.), пад Магілёвам нямецкія войскі страцілі 24 самалёты, каля 200 танкаў, 400 матацыклаў, 500 аўтамашын. Было знішчана 15 тыс. і ўзята ў палон каля 2 тыс. салдат і афіцэраў.

Гераічная 23-дзённая абарона Магілёва адна з яскравых старонак гісторыі Другой Сусветнай вайны.

## 2. Акупацыя горада: палітыка генацыду і антыгітлераўскі супраціў

Акупіраваная ў жніўні 1941 г. Магілёўшчына была залічана да вобласці армейскага тылу групы армій "Цэнтр". Для падтрымання парадку "новыя гаспадары" стварылі тут канцлагеры, гета і турмы, а для савецкіх ваеннапалонных перасыльныя лагеры (дулагі) у Бабруйску, Крычаве, стацыянарны лагер (шталаг) у Магілёве і ў інш. месцах.

Натуральна, што жыхары вобласці ва ўмовах акупацыйнага рэжыму ўступілі ў барацьбу з ворагам. Ужо ў 1941 г. на Магілёўшчыне былі арганізаваны і дзейнічалі да 40 партызанскіх атрадаў і груп.

Асноўнай базай партызанскага руху стаў Клічаўскі раён з яго вялікімі ляснымі масівамі, якія прымыкалі да Быхаўскага, Кіраўскага, Бабруйскага, Асіповіцкага і Бялыніцкага раёнаў. Партызаны кантралявалі большую частку тэрыторыі вобласці амаль на працягу ўсяго перыяду акупацыі. Яны пускалі пад адхон эшалоны, знішчалі танкі, броне- і аўтамашыны, жывую сілу праціўніка, палілі склады і інш. Перад злучэннем з Чырвонай Арміяй (восень 1943 – лета 1944гг.) у вобласці налічвалася больш за 55 тыс. узброеных партызан.

Падпольныя патрыятычныя арганізацыі, якія мелі шчыльную сувязь з партызанамі, дзейнічалі ў Магілёве, Бабруйску, Бялынічах, Горках, Крычаве, Круглым, Клімавічах. Іх члены праводзілі дыверсіі, здабывалі каштоўныя звесткі аб праціўніку для армейскай і франтавой разведак, партызанаў.

11 партызанаў і падпольшчыкаў Магілёўшчыны за подзвігі, здейсненыя ў час вайны, былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх С.Жупін, М.Каралёў, А.Касаеў, В.Лівенцаў і інш.

Адразу пасля акупацыі Магілёва у горадзе пачынаюць дзейнічаць антыгітлераўскія падпольныя групы: настаўнікаў, на хлебазаводзе, некалькі груп на чыгунцы, аўтарэмзаводзе, шоўкавай фабрыцы і г.д. Гітлераўцы разгарнулі жорсткі тэрор. У Магілёве вядомы больш 10 месц масавага знішчэння гаражан і ваеннапалонных. У Лупалаўскім канцлагеры загінулі каля 40 тыс. чалавек, а ўсяго ў горадзе было знішчана каля 100 тыс. чалавек.

## 3. Эканамічнае і сацыяльна-культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі

Гітлераўскія захопнікі канчаткова авалодалі Магілёвам толькі 28 ліпеня 1941 года. Магілёўшчына апынулася і, да моманту вызвалення летам 1944 года, знаходзілася ў тылавой частцы армій групы "Цэнтр". Такім чынам, на падставе аналізу архіўных дакументаў па горадзе Магілёву магчыма разгледзіць палітыку акупацыйных улад на тэрыторыі, якая была падпарадкавана ваенным уладам.

Яўрэйскае насельніцтва павінна было пражываць на тэрыторыі гета. Яны падлягалі поўнаму знішчэнню. Тут і далей па тэксту будзе разглядацца толькі неяўрэйская частка жыхароў Магілёва.

Згодна перапісу неяўрэйскага насельніцтва, у Магілёве на 01.10.1941 года пражывала 47 048 чалавек, з іх 28758 жанчын і 18290 мужчын, 16785 дзяцей да 14 год, 2864 асобы старэйшыя за 60 год, працаздольнага насельніцтва каля 27,5 тысяч (мужчын каля 9000). Па нацыянальнасці: рускіх-28705, беларусаў - 15707, украінцаў - 1085, палякаў - 1063, немцаў - 82, эстонцаў - 13, латышоў - 192,

літоўцаў - 72 і іншых - 129. Па спецыяльнасцям: найбольшая колькасць была рабочых нізкай кваліфікацыі - 7973, хатніх гаспадынь - 7132, вучняў - 2631, слесароў - 1023, настаўнікаў - 817, работнікаў на чыгунцы - 693, медыцынскіх работнікаў - 650, цесляроў - 379, урачоў - 88 (40 мужчын), інжынерна-тэхнічных работнікаў - 405, кавалёў - 132, токараў - 149, шаўцоў - 289, шафёраў - 421 і г.д. Летам 1942 года ў горадзе жыло крыху болей 50000 чалавек.

Усё працаздольнае насельніцтва горада (з 16 год) павінна было працаваць. Пенсіянеры з снежня 1941 года атрымоўвалі штомесяц дапамогу (каля 50 руб. кожны). Для тых, хто не атрымаў працу на прадпрыемствах, штодзень арганізовываліся грамадскія працы. Разлік за выкананую працу з імі рабіўся штодзень.

Падчас акупацыі ў Магілёве была наладжана работа прамысловых прадпрыемстваў: завод газіраванай вады, піваварaны завод (200 чадавек), чыгунка, трубаліцейны завод, завод "Дзімітрава", шоўкавая фабрыка, скураны завод, лесахімзавод, аўтарамонты завод, цагляна-дахоўны завод "Днепр", мэблева-сталярная фабрыка, косцеклеявы завод, пяць цагляных заводаў, мясакамбінат, торфазавод, ТЭЦ (на іх працавала ад 20 да 300 чалавек на кожным), і ўстаноў: гарадская бібліятэка (распачала працу з 1.03.42 г.), восем школ, рамесніцкае і будаўнічае вучылішчы, 7 сталовых, 10 прыватных кавярняў, 11 цырульняў, 3 лазні, гарадскі тэатр, гарадская бальніца, паліклініка з філіяламі, дыспансеры (сухотны і венерычны), санітарна-эпідэмічная станцыя, хлебапякарні, аптэкі і г.д.

У сувязі з тым, што існавала вельмі простая сістэма падаткаабкладання – 10% ад даходу большага за 200 рублёў, шмат хто займаўся прыватным гандлем, рамесніцтвам. Так, толькі ў студзені 1944 года 28 асоб мелі патэнты на гандаль, 27 на занятак рамесніцтвам. З 1942 г. у горадзе дзейнічала 10 прыватных кавярняў, 11 цырульняў, летам было выдадзена 5 патэнтаў на выраб і продаж марожанага.

Нягледзячы на тое, што аплочваемыя штогадовыя адпачынкі не былі прадугледжаны, пэўныя формы сацыяльнай абароны былі. Выплочвалася дапамога ў выпадку хваробы па лістках непрацаздольнасці якія выдавалі ўрачы. У Магілёве з 1943 г. дапамога падчас хваробы выплочвалася толькі са згоды работадаўцы. Рабочы не быў цалкам бяспраўным, яго не магчыма было беспадстаўна звольніць. У Магілёўскім архіве маюцца дакументы юрыдычнага бюро гарадскога ўпраўлення, у якіх разглядаюцца факты аб аднаўленні рабочых на працу, аб спрэчках па зарплаце. Наогул, юрыдычнае бюро са штатам 7 асоб займалася крымінальнымі і грамадзянскімі злачынствамі, якіх было даволі шмат. Маюцца выракі наконт крадзяжоў, хуліганства, спекуляцыі, злачынстваў супраць асобы, прыналежнасці хатней жывёлы, аб правах уласнасці, аб неправільным із'яцці маёмасці, аб выплатах аліментаў на дзяцей і г.д.

З мэтай найлепшага сацыяльнага забеспячэння патрэб работнікаў на цагляным заводзе, ТЭЦ, піўзаводзе, металакамбінаце, торфазаводзе "Грабянёва", аўтарэмзаводзе, шоўкавай фабрыцы, у бальніцы, псіхлячэбніцы існавалі сталовыя. У 1942 г. на трубаліцейным заводзе былі арганізаваны яслі для немаўлятак работніц завода, у 1943 г. падобныя яслі для 30 немаўлятак былі арганізаваны пры Магілёўскай ТЭЦ. На шоўкавай фабрыцы дзейнічаў асобны медыцынскі пункт.

Пры гарадскім упраўленні Магілёва былі ўтвораны некалькі аддзелаў: медыка-санітарны, адукацыі, агульна-тэхнічны і г.д. Пры агульна-тэхнічным аддзеле існавалі восем пададдзелаў з назваў якіх бачна якой справай яны займаліся: будаўнічы, санітарна-тэхнічны, электраэнэргетычны, дарожны, азялянення і добраўпарадкавання, вадаправоду і каналізацыі, грамадскіх работ і інш. Некаторыя з іх прызначаліся для забеспячэння патрэб гітлераўцаў (напрыклад, пра якое электраасвятленне дамоў жыхароў магла ісці размова, калі ў 1942 г. спецыяльным загадам акупацыйныя ўлады адключылі грамадзянскае насельніцтва ад электрасеткі), іншыя дзейнічалі на карысць усіх. Так, пададдзел азялянення і добраўпарадкавання перыядычна высажваў на вуліцах горада дрэвы і кусты, займаўся разбіваннем сквераў і паркаў.

На працягу 1941-43 гадоў у горадзе дзейнічала малочная дзіцячая кухня. Толькі за сем дзён лютага 1943 года яе паслугамі скарысталіся бацькі 103 дзетак, а наогул за гэты тэрмін было выраблена 2618 порцыяў-смесяў. У маі і чэрвені 1942 года кухня забяспечвала неабходным дзіцячым харчаваннем 160 дзетак. У рацыёне прыгатавання смесяў былі (у залежнасці ад узросту): рыс, мучная смесь, грэчка, кісель, малако, цукар, у якасці натуральных вітамінаў пры вырабу смесяў выкарыстоўваліся ягады.

У Магілёве летам 1942 г. у цэнтры горада былі адноўлены 6 вадаправодных магістраляў (3 артэзіянскія свідравіны), у іншых месцах для забеспячэння насельніцтва вадою былі зроблены калодзежы (30 штук).

У Магілёве працавала Метэралагічная станцыя, якая перыядычна паведамляла прагноз надвор’я.

Любая грамадская і культурна-асветная дзейнасць без дазволу акупацыйных уладаў забаранялася. Таму яна была магчыма толькі ў рэчышчы дзеянняў гітлераўцаў. Адной з першых грамадскіх арганізацыяў было “Таварыства Чырвонага Крыжа“, утворанае ў студзені 1942 г. Але вельмі хутка яно змяніла назву на “Таварыства пацярпелых ад вайны“. За 1942 год па Магілёву ў яго шэрагі ўступіла 623 асобы. З красавіка 1943 года яно стала звацца “Таварыства Беларускай народнай самапомачы ў г. Магілёве” і налічвала каля 700 чалавек.

У 1942-1943 гг. у Магілёве ўрачыста святкавалі: 1 Мая – свята Працы, 22 чэрвеня – дзень вызвалення ад бальшавізму, у школах ладзіліся “навагоднія елкі”. Некалькі тысячаў чалавек было на мітынгу і агульнагарадскіх “гуляннях”, якія адбыліся на Тэатральнай плошчы горада 22.06.43 г. Але, нягледзячы на масавасць, значная частка гараджан ухілілася ад удзелу ў мерапрыемствах.

У 1942/43 навучальным годзе ў Магілёве працавала 8 школ (1 чатырох-гадовая, 4 сямігадовых і 3 васьмігадовых з камерцыйным і справаводчым прафухіламі). Сярод іх было 5 беларускіх і 3 рускія. Мелася 114 класаў, у якіх выкладалі 146 настаўнікаў (120 беларусаў, 71 з вышэйшай адукацыяй). У 1942/1943 нав.годзе пачалі вучобу 3963 вучня, завяршылі 2145. У праграмах усіх школ адсутнічаў такі прадмет як гісторыя. Сцвярджалася, што “Берлін сталіца нашай радзімы”. Пры вывучэнні твораў русскай літаратуры з дарэвалюцыйных паэтаў і пісьменнікаў у школьных праграмах шырока прадстаўлены ўсе без выключэння класікі, а з савецкіх дазваляўся толькі “Ціхі Дон” М.Шолахава. Па

беларускай літаратуры ў праграме засталося вывучэнне твораў М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа, Ядзвігіна Ш, Ц.Гартнага, К.Буйло і інш.

У горадзе дзейнічалі рамеснае і будаўнічае вучылішчы, платная музычная школа. 13 мая 1943 года ў Магілёве ў памяшканні былой фельчарскай школы распачаў сваю працу медыцынскі інстытут.

У маі 1942 года прайшла навуковая канферэнцыя ўрачоў у Магілёўскай гарадской бальніцы. У красавіку 1943 года ў горадзе працавалі кароткатэрміновыя курсы каморнікаў, у чэрвені – прапагандыстаў РВА. Ладзіліся рамесна-саматужніцкія выставы, непрацяглы час працавала гарадская бібліятэка з якой былі із'яты кнігі савецкіх аўтараў. Дзейнічалі 7 клубных ўстаноў (памяшканні былых клубаў: прамкааперацыі, гарадскіх прадпрыемстваў, швейнікаў, спартовага, дома Чырвонай Арміі, партыйнага клуба), у якіх ладзіліся "танцы" для моладзі. Кожны дзень дэманстраваліся кінафільмы ў кінатэатрах "Зорька" і "Луч".

У жніўні 1941 года група артыстаў распачынае справу стварэння Магілёўскага драматычнага тэатра. 25.12.41 года адбылося яго ўрачыстае адкрыццё. Тэатральная трупа з 18 артыстаў за 2 гады здзейсніла 15 буйных пастановак. Сярод іх: "Коварство и любовь", "Без вины виноватые", "Хозяйка гостиницы", "Свадьба Кречинского", "Гроза", "Бесприданница" і інш. Тэатр у Магілёве паказаў гледачам 142 спектакля, якія пабачыла 45000 чал. Трупа выязжала на гастролі ў Оршу і Чавусы.

У 1943 г. у горадзе быў створаны дзіцячы тэатр, які паказаў гледачам п'есы "Дорогая гостья", "Жар-птица", музычную пастаноўку "Свята кветак".

Дарэчы білеты на вечаровыя спектаклі з'яўляліся пропускамі пасля каменданцкай гадзіны.

У гады акупацыі ў Магілёве таксама былі створаны і выступалі з канцэртамі: ансамбль народных інструментаў, дзіцячы хор вучняў музыкальнай школы, хоры Мікалаеўскага сабора і Барыса-Глебскай царквы, калектыў гарадской эстрады, духавы аркестар службы парадку. Вельмі часта іх можна было пачуць па магілёўскаму радыё. Магілёўскія паэты друкавалі свае вершы ў мясцовых газетах . Выдаваліся: "Новый путь" і "Последние известия".

Цікавай і разнастайнай была праграма штодзённага мясцовага радыё, якая публікавалася ў мясцовым друку. Вяшчанне вялося праз узмацняльнікі на вуліцах горада з 6.30 да 21 гадзіны. Так, у праграме радыё за 28-30.06.43 года значыліся: тры разы на дзень весткі і навіны, музыка, выступленні магілёўскіх хораў, даклады і паведамленні на эканамічную тэматыку, нарысы аб пісьменніках (аб Ф.Дастаеўскім), канцэрты, антыяўрэйская прапаганда, цыкл перадач пра носьбітаў еўрапейскай культуры (пра Лопе дэ Вега), перадачы для сялян, з вобласці натуразнаўства "У глыбінях мора", дзіцячыя перадачы, аповяд пра мастака Нарбута, сімфанічная музыка, "Тэатр у мікрафона" і г.д.

Пад час акупацыі аднавілі сваю дзейнасць праваслаўныя храмы Магілёва.

Такім чынам гітлераўскія акупацыйныя ўлады знішчаючы яўрэяў, усіх не згодных з іх дзеяннямі, праводзячы палітыку германізацыі, у той жа час стваралі ўмовы для пэўнага эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця неяўрэйскай часткі насельніцтва.

## 4. Вызваленне Магілёва. Страты горада ў вайне

26 верасня 1943 г. войскі Бранскага фронту вызвалілі адным з першых раённых цэнтраў Беларусі Хоцімск, а праз 8 месяцаў (на столькі часу затрымаўся фронт на р.Проня) пачалося вызваленне большай часткі Магілёўшчыны. Гітлераўцы рыхтавалі горад да абароны. Быў утвораны укрэпраён пад назвай “Мядзведзь”. Магілёў планавалі цалкам знішчыць. Горад быў вызвалены 28.06.1944г. у выніку Магілёўскай аперацыі. Больш 21 вайсковай частцы, якія вызначыліся пры вызваленні горада, было прысвоена званне “Магілёўскіх”, а 28 воінам званне Героя Савецкага Саюза.

29 чэрвеня 1944 г. Магілёўская вобласць была поўнасцю вызвалена ад акупантаў. Здзейснілі гэта войскі 1-га і 2-га Беларускіх франтоў (камандуючыя генерал арміі К.Ракасоўскі і генерал-палкоўнік Г.Захараў), прычым у выніку Бабруйскай аперацыі, праведзенай 3-й (генерал-палкоўнік А.Гарбатаў), 28-й (генерал-лейтэнант А.Лучынскі), 48-й (генерал-лейтэнант П.Раманенка), 65-й (генерал-лейтэнант П.Батаў), 16-й паветранай (генерал-палкоўнік авіяцыі С.Рудэнка) арміямі, конна-механізаванай групай (генерал-лейтэнант І.Пліеў) і Дняпроўскай ваеннай флатыліяй (капітан 1 ранга В.Грыгор’еў), быў утвораны бабруйскі «кацёл», у які трапілі 6 дывізій 9-й нямецкай арміі (40 тыс. чал.).

Пад час вайны 19 ураджэнцаў вобласці сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы, 103 Героямі Савецкага Саюза, а тры з іх двойчы Героямі: І.Гусакоўскі, С.Шутаў, І.Якубоўскі (усе камандзіры-танкісты).

Магілёў быў значна пашкоджаны і разбураны пры абароне горада ў 1941 г., вясновай павадкай 1942 г., масавай бамбардзіроўкай савецкай авіяцыі ў 1943 г., падчас акупацыі і вызвалення. З 6653 будынкаў ацалела 3220. Былі разбураны амаль усе прадпрыемствы, акупанты вывезлі абсталяванне педінстытута, спалілі абласную і гарадскую бібліятэкі, архіў і г.д. Матэрыяльныя страты склалі 488 млн руб. (у коштах 1941 г.).

Такім чынам, падзеі вайны 1941-1945 гг. падцвердзілі праўду тых, хто аб´ектыўна і суб´ектыўна бачыў у Магілёве сталіцу. Менавіта наш горад абаранялі так, як бароняць сталіцы. Абарона Магілёва была правобразам абароны Масквы. Баранілі горад байцы 172-й стралковай дывізіі на чале з генералам М.Раманавым, асобныя часткі і народнае апалчэнне, упершыню ў Вялікай Айчыннай вайне створанае менавіта ў нашым горадзе. Асабліва вызначыліся байцы 388-га палка пад камандаваннем С.Куцепава на Буйніцкім полі, дзе 12-13 ліпеня былі знішчаны 39 гітлераўскіх танкаў.

Адразу пасля акупацыі Магілёў не скарыўся – у горадзе пачынаюць дзейнічаць антыгітлераўскія падпольныя групы: настаўнікаў, на хлебазаводзе, некалькі груп на чыгунцы, аўтарэмзаводзе, шоўкавай фабрыцы і г.д. Гітлераўцы разгарнулі жорсткі тэрор. У Магілёве вядомы больш 10 месц масавага знішчэння гаражан і ваеннапалонных. Магілёў значна пацярпеў у гады вайны. Пасля вызвалення ў ім было ўсяго каля 10 тыс. чалавек.

## Лекцыя 10. Магілёў на рубяжы тысячагоддзяў

1. Помнікі горадабудаўніцтва ў сучасным Магілёве.
2. Гісторыя Лупалава-Маскоўскага прадмесця – Кастрычніцкага раёну горада Магілёва.
3. Эканамічнае і культурнае жыццё сучаснага Магілёва.
4. Дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей Беларусі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці.

### 1. Помнікі горадабудаўніцтва ў сучасным Магілёве

Перад магілёўцамі стаіць адна з найбольш важных задач – захаванне культурнай і гістарычнай спадчыны Магілёва і яго жыхароў за тысячагадовы перыяд існавання.

У архітэктурна-планіровачнай структуры горада вылучаецца гістарычны цэнтр – помнік горадабудаўніцтва і архітэктуры. Тут можна вызначыць 4 гістарычныя зоны, у якіх часткова захавалася планіроўка старажытных пасадаў – Нагорскага, Шклоўскага, Пакроўскага і Задубровенскага. Цяпер гэтыя зоны з’яўляюцца помнікамі архітэктуры горадабудаўніцтва.

Нагорскі пасад – найбольш старажытная частка Магілёва, згадваецца ў навуковых дакументах 16–18 стст. Гэта тэрыторыя абмежавана вуліцамі Лазарэнкі (былая Велікакняжацкая, Віленская), Камсамольская (былая Дваранская), Архірэйскі вал Г.Каніскага (былы вал Чырвоная Зорка, Архірэйскі вал) і Левая Дубровенка. Каля 1526 г. на месцы старажытнага замка на высокім плато пры ўпадзенні Дубровенкі ў Дняпро быў пабудаваны новы Магілёўскі замак (цяпер тэрыторыя парку імя Горкага), плошчай больш за 1 га. Да замка далучаўся гандлёва-рамесніцкі Нагорскі (Нагорны) пасад, які пазней атрымаў назву Стары горад. Паміж замкам і пасадам сфарміравалася гандлёвая плошча (у канцы 18 ст. Губернская плошча, цяпер – Савецкая). Гандлёвая плошча ў пачатку 17 ст. займала тэрыторыю больш за 2 га, мела форму няправільнага шматвугольніка. На ёй знаходзіліся 26 драўляных крам. У канцы 18 ст. на плошчы створаны ансамбль мураваных грамадскіх будынкаў. Тэрыторыя Нагорскага гандлёва-рамесніцкага пасада была абнесена земляным абарончым валам, які называўся Кругавым (або Блізкім). За валам ішоў глыбокі роў, ён аддзяляў тэрыторыю Нагорскага пасада (у 1809 г. ён засыпаны, а частка вала на яго працягу скапана).

У той частцы вала, дзе праходзіў роў, былі 2 брамы: Ветраная (драўляная) і Каралеўская (мураваная). Ад кожнай брамы цераз роў перакідваўся драўляны мост. Ад Ветранай брамы пачыналася вул. Ветраная, ад Каралеўскай – вул. Шклоўская, яны вялі да гандлёвай плошчы. Да 17 ст. сфарміравалася двухпрамянёвая сістэма планіроўкі Нагорскага пасада. Яна існуе да нашага часу – ад Савецкай плошчы адыходзяць радыяльныя вуліцы Першамайская (былая Шклоўская, пазней Дняпроўскі праспект, Ульянавай-Крупскай) і вул. Ленінская (былая Ветраная, пазней Вялікая Садовая). На тэрыторыі Нагорскага пасада захаваліся падмуркі гарадской ратушы 17 ст. (Савецкая плошча), рэшткі езуіцкага калегіума 17–18 стст. (вул. Першамайская, 7а), фарны касцёл 17 ст. (часткова), архірэйскі палац 18 ст. (вул. Ленінская, 11 а), будынак гарадской управы 19 ст.

(вул. Ленінская, 1), будынкі акруговага суда 18–19 стст. на Савецкай, абласнога драмтэатра 19 ст. на Тэатральнай плошчах, жылы дом 18 ст. (вул. Ленінская). Акрамя таго, на тэрыторыі Нагорскага пасада знаходзіўся шэраг помнікаў архітэктуры. Сярод іх два буйнейшыя праваслаўныя манастыры 17 ст. – Богаяўленскі і Спаскі, ансамбль Архірэйскага двара і духоўнай семінарыі 18 ст., Станіславаўскі касцёл 17–18 стст., фарны і езуіцкі касцёлы 17 ст., ансамбль грамадскіх будынкаў на Губернатарскай плошчы 18–19 стст. і інш.

Шклоўскі пасад забудаваны да канца 17 ст., займаў тэрыторыю старажытнага Шклоўскага пасада і прылеглыя да яго кварталы, якія разам з Віленскім і Задубровенскім пасадамі называліся Новым горадам. У сучасным Магілёве ён абмежаваны вуліцамі Лазарэнкі, Камсамольскай, Болдзіна (былая Вялікая Гваздоўка, Семінарскі), Цімiразеўскай (былы Варанцоўскі завулак), Дзябранскім Ярам і р. Дубравенка. Новы горад знаходзіўся паміж двума абарончымі валамі: Кругавым (Блізкі) і Палявым (Далёкі). Палявы вал абкружаў Новы горад і пачынаўся ад яра р. Дзебра, перасякаў Дубравенку і падыходзіў да Дняпра. У Палявым вале было восем драўляных брам. Тры з іх – Шклоўская, Віленская і Быхаўская – размяшчаліся на галоўных вуліцах і адкрывалі ўезд у горад адпаведна з поўначы, паўночнага захаду і паўднёвага захаду. У канцы 18 – сярэдзіне 19 стст. частка Новага горада пабудавана за Палявым валам. Планіровачная структура таго часу існуе і цяпер. У 1938 – 40 гг. тут створаны новы ансамбль плошчы. Захаваліся і асноўныя вуліцы Шклоўскага пасада: Першамайская, Ленінская, паралельныя ім Піянерская (былая Малая Садовая) і Карла Маркса (былая Зялёная), папярочныя К.Лібкнехта (былая Паштовая, Пажарная) і Міронава (Афіцэрская). Да нашага часу на тэрыторыі Шклоўскага пасада ёсць нямала помнікаў архітэктуры. Сярод іх Архіепіскапскі палац, жылы корпус Спаскага манастыра, жылы дом (усе 18 ст.), будынкі мужчынскай гімназіі, настаўніцкага інстытута (усе 19 ст.), будынкі банка, крэдытнага таварыства (усе пачатку 20 ст.), размешчаныя на вул. Ленінскай. Акрамя таго, на вул. Камсамольскай захаваўся Станіславаўскі касцёл 18 ст., на вул. Першамайскай – будынак жаночай гімназіі 19 ст., будынак Дваранскага сходу 19 ст. і царква Трох Святціцеляў пач. 20 ст., на вул. Міронава – будынак пазямельнага банку пач. 20 ст., на вул. Піянерскай – будынак рэальнага вучылішча 19 ст.

Пакроўскі пасад забудаваны ў 16 – пачатку 18 стст. ўноймавай частцы Дняпра і нізіннага плато за Архірэйскім валам Г.Каніскага. З поўдня Пакроўскі пасад быў абмежаваны Дняпром, з усходу – ярам і р. Дзебра, з поўначы – Нагорным і Шклоўскім пасадамі. Гэта частка горада не мела абарончых збудаванняў з-за натуральных перашкод, якімі з’яўляліся Дняпро, яр Дубравенка і высокі Архірэйскі вал. Планіроўка Пакроўскага пасада нерэгулярная. Жылыя кварталы драўляных дамоў выцягнуты ўздоўж лініі Дняпра ў форме няправільных чатырох- і шматвугольнікаў. Захаваліся асноўныя вуліцы пасада: сучасныя Вялікая Грамадзянская (былая Вялікая Мяшчанская), паралельна якой праходзяць кароткія вул. Т.Сурты (былая Пакроўская, 1-я Мікалаеўская, Волі 1-я), Трубніцкіх (былая 2-я Мікалаеўская, Волі 2-я). У паўднёвай частцы пасада размешчаны прыдняпроўскі парк (меў ці мае назву імя 30-годдзя БССР). У гэтай частцы горада выдатны помнік беларускага барока – Мікалаеўская царква 17 ст., якая

знаходзіцца ў комплексе з Ануфрыеўскай царквой 18 ст., шпіталем, званіцай, агароджай з брамай. Сярод сучаснай жылой забудовы вылучаюцца рэшткі яўрэйскай школы, а таксама драўляныя жылыя дамы 19 – пачатку 20 стст. На жаль, не захаваліся касцёл і кляштар Бернардзінцаў 17 ст., Пакроўская царква 18 ст., якія існавалі да сярэдзіны 20 ст.

Задубровенскі пасад у сучасным Магілёве займае тэрыторыю на захад ад Дубравенкі і ўздоўж правага берага Дняпра. Абмежаваны сучаснымі вуліцамі Завадской (былая Папінская), Чалюскінцаў (былая Быхаўская шаша), Мянжынскага (былая Малое Завалле), Лазарэнкі і Садовай (былыя завулкі Садоўскі, Пушкаровічаў). У пісьмовых крыніцах упамінаецца ў 16–18 стст., калі тэрыторыя пасада была ўмацавана часткай Палявога (Далёкага) вала з 5 драўлянымі брамамі: Віленскай, Уструшненскай, Трысненскай, Быхаўскай, Папінскай, ад якіх пачыналіся гарадскія вуліцы. З канца 17 – пачатку 18 стст. на гэтай тэрыторыі сфарміраваліся 3 пасады: на поўначы Віленскі, у цэнтры Задубровенскі, на поўдні Папінскі. Сучасныя вуліцы Лазарэнкі і Чалюскінцаў – галоўныя вуліцы Задубровенскага пасада. Яны злучаны папярочнымі больш кароткімі вуліцамі Мянжынскага, Вароўскага (былыя Быхаўская, Салтанаўская, Белаградская) і інш. На сучаснай тэрыторыі Задубровенскага пасада захаваліся 2 мураваныя Барысаглебскія царквы (зав. Брусава, 2), будынак жаночага епархіяльнага вучылішча (вул. Вароўскага, усе 19 ст.), а на старажытных каталіцкіх могілках (вул. Лазарэнкі) – 2 мураваныя капліцы.

У 2-й палавіне 19 ст. пачала забудоўвацца паўночная частка горада – Карабанаўскае прадмесце, абмежаванае цяпер вуліцамі Першамайскай, Віцебскі тупік, Карабанаўскай і Сурганава (былая Нагорная шаша). Архітэктурна-планіровачная структура прадмесця сфарміравалася ў 20 ст., калі ў 1902 г. была пракладзена чыгунка. Утварылася Прывакзальная плошча з мураваным будынкам чыгуначнага вакзала. Ад Прывакзальнай плошчы забудоўваўся Кацярынінскі тракт, які звязаў вакзал з цэнтрам горада. На былой тэрыторыі Карабанаўскага прадмесця захаваліся помнікі архітэктуры пачатку 20 ст.: комплекс будынкаў чыгуначнага вакзала, былы ваенны шпіталь на вул. Сурганава, артылерыйскія казармы на вул. Крупскай, а таксама жылыя драўляныя дамы 19 – пачатку 20 стст.

На сёння ў Магілёве маюцца 25 скульптурна-манументальных помнікаў, 34 абеліскі і стэлы, больш за 70 мемарыяльных дошак, каля 209 помнікаў архітэктуры і градабудаўніцтва (І-ІІІ катэгорыяў). Сярод памятных дошак і помнікаў асобам чый лёс непарыўна злучаны з гісторыяй Магілёва (якія з’явіліся ў апошнія дзесяць-дванаццаць год) варта адзначыць наступныя: помнікі В.Бялыніцкаму-Бірулі, П.Масленікаву, Т.Шаўчэнка, мемарыяльны комплекс “Буйніцкае поле”, дошкі ў гонар Г.Каніскага, С.Собаля, генерала М.Раманава, В.Турава, І.Чыгрынава, А.Куляшову. Грамадскай ініцыятывай ушанаваны ў горадзе – месца ахвярам сталінскіх рэпрэсій, месца пахавання першага кіраўніка ўрада Беларусі Ц.Гартнага (усталяваны памятныя крыжы).

## 2. Гісторыя Лупалава – Маскоўскага прадмесця – Кастрычніцкага раёну горада Магілёва

Кастрычніцкі раён г. Магілёва размешчаны пераважна ў паўднёвай і паўднёва-ўсходняй частцы горада, на левым беразе ракі Дняпро, што і прадвызначыла яго гістрычнае, культурнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё. Кастрычніцкі раён – гэта паўднёвыя і ўсходнія вароты горада.

Своеасаблівасць раёна падкрэслівае даліна Дняпра: часткова высокае правабярэжжа крута апускаецца да ракі і плоская шырокая пойма левабярэжжа, дзе сустракаюцца шматлікія вазёры-старыцы. На тэрыторыі раёна знаходзіцца унікальнае Святое возера, якое прываблівае гараджан сваёй чысцінёю. Уздоўж левага берага Дняпра размешчаны найбольш буйныя лясныя масівы, дубравы, якія з'яўляюцца месцамі масавага адпачынку. Раён таксама вядомы сваім Любужскім лесапаркам, працягваецца добраўладкаванне Дзіцячага парка, сквера імя 700-годдзя Магілёва (закладзены ў 1967 годзе), парка ў раёне праспекта імя О.Шмідта і Святога возера.

Найбольш старажытнае паселішча людзей на тэрыторыі раёна, на левабярэжжы, адносіцца да каменнага веку. У 3,5 км на ўсход знаходзіцца археалагічная стаянка Хвойна, якая датуецца перыядам 10-12 тысяч гадоў таму. Да эпохі неаліта адносіцца і стаянка ў Любужы.

З 15 ст. ў гістарычных дакументах узгадваецца Задняпроўскі пасад г.Магілёва. Менавіта ён з'яўляецца асноваю Кастрычніцкага раёна. На тэрыторыі Заднепроўскага пасада размяшчаліся Лупалаўская і Троіцкая сотні. Напрыканцы 19 стагоддзя за гэтай часткай Магілёва замацавалася назва – Маскоўскае прадмесце. Але па сённяшні час найбольш шырока ўжываецца назва – Лупалава.

Менавіта праз гэтую частку горада праходзілі галоўныя гандлёвыя шляхі на поўдзень і ўсход. Скуры і скураныя вырабы, якімі на працягу стагоддзяў славіліся Лупалаўскія майстры, вывозілася ў Польшчу, Прыбалтыку. Трывалы гандль вёўся з гарадамі Левабярэжнай Украіны. Акрамя рамесніцтва і гандлю, жыхары Задняпроўя займаліся земляробствам, агародніцтвам, садаводствам (у прыватнасці вырошчвалі кавуны, абрыкосы) і жывёлагадоўляй.

Сведчаннем развіцця рамесніцтва і гандлю з'яўляюцца назвы вуліц, якія размешчаны ў Кастрычніцкім раёне. З 17 стагоддзя вядомы вуліцы: Мсціслаўская, Чавуская, Чарнігаўская, Альхоўская, Лупалаўская, Ганчарная, Алейная (жылі майстры-вытворцы алея) і інш. У 1604 годзе на тэрыторыі Лупалава было 204 домаўладальніка, якія мелі 214 гектараў сядзібаў і агароднай зямлі. На левым беразе Дняпра знаходзілася значная частка гарадскіх сенажацяў і 2000 гектараў баравога каралеўскага лесу, які належыў гораду. У раёне Любужа быў размешчаны гарадскі млын.

Назва пасада (прадмесця) Лупалава вельмі старажытная. З аднаго боку, яно ўзнікла непадалёку ад урочышча Грабёж і назва тлумачыцца ад словазлучэння "лупу браць" – збіраць даніну з праязджаючых купцоў. З другога боку ў гэтым месцы жылі пераважна гарбары, якія "лупілі скуры жывёл" і таму, верагодна, пазней месца іх пражывання трансфарміравалася ў назву Лупалава. Напрыканцы 19 – пачатку 20 стагоддзяў на тэрыторыі Маскоўскага прадмесця знаходзілася болей за 30 гарбарных заводаў. У 1909 – 1910 гг. у гарбарных майстэрнях

Магілёва працаваў Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч), які пазней стаў вядомым і знакамітым беларускім паэтам, акадэмікам, першым кіраўніком ураду БССР (загінуў у Магілёве, месца пахавання адзначана памятным знакам на ўскрайку Пячэрскага лесапарку, знак усталяваны ў 1989 годзе грамадскасцю горада).

У Задняпроўі былі размешчаны дзве праваслаўныя царквы, касцёл мар'явітак, некалькі сінагог. Царквы: Траецкая (ад яе пайшла назва сотні) і Петрапаўлаўская. На тэрыторыі сучаснага раёна знаходзілася і Успенская царква. Яна была пабудавана мураваная ў 1670-1680-х гадах у комплексе з невялічкай "цёплай" (зімовай) царквою і званіцай. З'яўлялася помнікам Магілёўскай школы дойлідства. Царква вядомая і тым, што ў ёй калісьці знаходзіўся абраз "Нараджэнне Маці Божай" Пятра Яўлевіча з Галынца – найвыдатнейшы помнік мастацтва (цяпер захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі ў Мінску). Усе цэрквы былі гвалтоўна зачынены савецкай уладаю ў 1929-1930 гадах. Часткова пашкоджаны ў гады вайны 1941-45 гадоў і цалкам разбураны ў 1950-я гады (Успенскую ўзарвалі ў адну з начэй лета 1957 года, адначасова з ратушай).

На працягу войн 16-18 стст. прадмесце і яго жыхары зведалі шмат пакутаў. Неаднаразова знішчаліся пабудовы і рабавалася маёмасць месцічаў. З-за раўніннай мясцовасці на тэрыторыі раёна размяшчаліся на пастой войскі, праводзіліся ваенныя манёўры, а ў 19 стагоддзі знаходзіўся лагер для размяшчэння чатырох палкоў: Уладзімірскага, Казанскага, Угліцкага і Суздальскага.

Менавіта тут, на левым беразе Дняпра, стаяў разам са сваёю ватагаю казакаў і ратных людзей у 1581 годзе, рыхтуючыся да штурму Магілёўскага замка, будучы заваёўнік Сібіры Ермак Цімафеевіч. У 1706 годзе цар Пётр І, які прыбыў у Магілёў разам з Мартай Скаўронскай (у будучым жонка імператара і імператрыца Кацярына І), на Лупалава аглядаў свае войскі. Каля Лупалаўскіх слупоў рускае войска варажыла напярэдадні Галоўчынскай бітвы. Прадказанне для іх было несуцяшальным і шведы перамаглі, у хуткім часе захапіўшы Магілёў. На тэрыторыі Кастрычнікацкага раёна знаходзіцца месца, якое па сённяшні час мае назву "Карлава даліна (луг)". Менавіта на ім у 1708 годзе размясціўся са сваім войскам шведскі імператар Карл ХІІ. Падчас знішчэння горада маскоўскім войскам 8 верасня 1708 года ацалелі толькі Лупалаўскае і Мікольскае прадмесці, чаго нельга сказаць пра падзеі чэрвеня 1944 года. Найбольш пацярпелі ад дзеянняў гітлераўскіх акупантаў (былі практычна цалкам спалены) менавіта гэтыя часткі горада.

У маі 1780 года ў Магілёў прыбыла расійская імператрыца Кацярына ІІ для сустрэчы з аўстрыйскім імператарам Іосіфам ІІ. Спецыяльна для гэтых венцаносных асоб у Заднепроўі былі наладжаны грандыёзныя вайсковыя манёўры. Але іх немагчыма ніякім чынам параўнаць з вайсковым аглядам, які быў арганізаваны ў 1802 годзе для імператара Аляксандра І, які выказаў пажаданні пабачыць, як дзейнічаюць войскі ва ўмовах максімальна набліжаных да баявых. У выніку загінулі дзесяткі жаўнераў і мясцовых жыхароў, якія прыйшлі паглядзець на відовішча.

У ліпені 1812 года, падчас знаходжання ў Магілёве напалеонаўскіх войскаў, імі было ўмацавана акопамі і траншэямі левабярэжжа Дняпра каля Лупалава, а ў Троіцкай царквы ўсталяваны гарматы. Ў дамах жыхароў размяшчаліся французкія жаўнеры.

На ўскраінах Лупалава, дзе сення перакрыжоўваюцца вуліца Астроўскага і Пушкінскі праспект, калісьці знаходзілася Чарнігаўская брама – усходнія вароты Магілёва. Ўсе хто ехаў з поўдня на поўнач ці наадварот не абміналі гэтае месца. Ў 1820 і 1824 гг. рускі паэт А.С.Пушкін, ў 1828 г. М.В.Гогаль, ў 1843 і 1847гг. Т.Р.Шаўчэнка, везлі праз браму арыштаваных дзекабрыстаў, а ў 1832 годзе праехаў са світаю імператар Нікалай I (для перавозкі світы жыхары Лупалава давалі каней). Праз Маскоўскае прадмесце праязжаў , насьцяком разам з сынам, на аўтамабіле апошні расійскі імператар Мікалай II. Падчас знаходжання ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання (1915 – 1917 гг.) яму падабалася здзяйсняць аўтамабільныя вандроўкі па Аршанскай шашы.

Ў другой палове 19 ст. Лупалава славілася сваімі піваварамі. "Лупалаўскае" піва была шырока вядома нават за межамі Расіі. Ў 1862 годзе быў утвораны піваварны завод Ф.Лекерта, а ў 1870 годзе піваварны завод , які належыў Э.Яннік.

У 1841 – 49 гадах праз Лупалава быў пракладзены шашэйны шлях Орша – Доўск, як частка тракту Пецярбург – Кіеў. У 1860 г. быў здадзены ў эксплуатацыю мост на свайных апорах праз Дняпро. I шлях і мост на той час адпавядалі самым высокім тэхнічным патрабаванням да падобных збудаванняў. Да праектыроўкі і стварэння шляху і маста меў непасрэдныя адносіны інжынер, палкоўнік, аўтар першага ў Расіі падручніка па механіке – Мікалай Ястрэбскі. У вольны час, у Магілёве, ён напісаў працяг «Мёртвых душ» М.В.Гогаля. Апублікаваныя ў Маскве, яны былі ўспрыняты чытачамі як арыгінальны, цудам уратаваны, твор вялікага пісьменніка. З цяжкасцю М.Ястрэбскі здолеў пераканаць літаратуразнаўцаў, што гэта "містыфікацыя" і аўтар працягу менавіта ён, а не М.Гогаль. Мост праз Дняпро быў знішчаны ў гады вайны 1941-44 гг.

Лупалава мае непасрэднае дачыненне да грамадска- палітычнага руху, які ахапіў усю Расію ў канцы 19 – пачатку 20 стст. У 1898 г. сярод Лупалаўскіх гарабараў была створана адна з першых прафсаюзных арганізацый у Беларусі (невядома чаму датай заснавання прафсаюзнага руху ў Беларусі лічыцца 1904 год). У 1904 годзе на Лупалава была арганізавана першая арганізацыя РСДРП, якая ўваходзіла ў Палескі камітэт РСДРП. Рабочыя прадпрыемстваў Лупалава прынімалі актыўны ўдзел у падзеях рэвалюцыі 1905 - 1907 гадоў.

У хуткім часе пасля кастрычніцкіх падзей 1917 года ў Петраградзе, у Магілёве была ліквідавана Стаўка, горад быў акупіраваны спачатку войскамі пад камандаваннем генерала Ю.Доўбар-Мусніцкга, а затым германскімі. Менавіта па Дняпру праходзіла мяжа паміж кайзераўскай Германіяй і савецкай Расіяй. 23 мая 1918 года чырвонаармейскія вайсковыя часткі выціснулі катнрэвалюцыйныя атрады з Лупалава на правы бераг Дняпра. У баі за вызваленне Лупалава загінулі чырвонаармейцы І.Кірыенка і Я.Іваноў. На Лупалава замацавалася савецкая ўлада. Прадмесце стала памежным горадам. На мосце праз Дняпро з абодвух бакоў (савецкага і германскага) былі пастаўлены увартавыя, аднак гэта не

перашкаджала мясцоваму насельніцтву пераходзіць з боку для ўзаемнага тавараабмену.

31 мая 1918 года на сходзе прадстаўнікоў ад мясцовага насельніцтва, які адбыўся на Лупалава, быў выбраны Лупалаўскі павятовы выканаўчы камітэт. Першым старшынёю выканкама стаў камуніст Гаўрыленка. Менавіта з гэтага моманту пачынаецца гісторыя Лупалава і Лупалаўскага раёна – адміністратыўных адзінак, якія мелі асобны ад горада Магілёва статус.

10 чэрвеня 1918 года сход грамадзян прадмесця Лупалава заявіў аб сваім жаданні заставацца ў складзе РСФСР. З 1919 па 1924 гады Лупалаўскі раён увахолзіў у скалд савецкай Расіі. З 3 сакавіка 1924 года ў скалдзе БССР. Крыху раней, у студзені 1924 года, па ініцыятыве дэпутатаў гарсавета Магілёва была ўнесена прапанова перайменаваць горад у Уладзімір – Ільіч, а Лупалава – у Ленін. Гэты праект не быў рэалізаваны. У 1926 годзе Лупалава зноўку стала неад’ёмнай часткай горада Магілёва. Лупалаўскі вясковы раён, у склад яго ўваходзіла 19 сельсаветаў, праіснаваў да сакавіка 1931 года.

Задняпроўская частка горада і тэрыторыя цяперашняга Кастрычніцкага раёну ўвайшлі ў гісторыю індустрыялізацыі СССР і БССР. Тут былі пабудаваны буйныя прамысловыя прадпрыемствы, першынцы першых пяцігодак – фабрыка штучнага валакна (1930 год), аўтарамонтны завод (1935 г.) і інш.; чыгуначная станцыя “Лупалава”. На тэрыторыі, дзе раней размяшчаліся вайсковыя часткі, у 1930-я гады ствараецца аэрадром (тэрыторыя паміж сучаснымі бульварамі Непакораных і праспектам імя О.Шмідта). Пасля вайны там да 1972 года знаходзіўся Магілёўскі аэрапорт. У 1935 годзе на аэрадроме быў створаны першы авіяцыйна-тэхнічны клуб. Напрыканцы 1930-х гадоў у аэраклубе займаўся ўраджэнец Магілёва Міхаіл Лусто, які ў гады вайны 1941-45 гг. быў лётчыкам-знішчальнікам. Знішчыў 20 варожых самалётаў і быў уганараваны званнем – Герой Савецкага Саюза.

Непарыўна злучана гісторыя Кастрычніцкага раёну з перыядам сталінскіх рэпрэсій. Пачынаючы з 1918 па канец 1930-х гадоў на ўскрайку горада, дзе сёння скрыжоўваюцца Пушкінскі праспект, Гомельская шаша і праспект Дзімітрава, у мясцовым урочышчы, недалёка ад мясакамбіната адбываліся растрэлы безпадстаўна рэпрасаваных савецкай уладай. На гэтым месцы сёння грамадскасцю ўсталяваны памятны крыж.

З далёкіх часоў на тэрыторыі Лупалава пражывалі і працавалі людзі розных нацыянальнасцей і веравызнання: праваслаўныя, іудзеі, католікі (Любуж, Грабянёва і інш.); беларусы, рускія, яўрэі, палякі, латышы, цыганы (абшчына сфарміравалася ў асноўным пасля вайны 1941-45 гг.). На тэрыторыі Лупалава і Лупалаўскага раёна ў 1920-я гады дзейнічалі беларускія, яўрэйскія, дзве польскія і латышскія школы.

У 1941 годзе гітлераўская Германія напала на СССР. З першых дзён вайны жыхары Кастрычніцкага раёна мацавалі абарону сваёй рэспублікі. Аднымі з першых у краіне былі сфарміраваны атрады народнага апалчэння на фабрыцы штучнага валакна, на аўтарамонтным заводзе. Яны адыгралі значную ролю ў 23 дзённай гераічнай абароне горада Магілёва.

З першых дзён вайны тэрыторыя сучаснага Кастрычніцкага раёна была адным з эпіцэнтраў падзей пачатковага этапа вайны. Аб гэтым выдатна сведчаць некалькі эпізодаў, якія знайшлі сваё ўвасабленне ў мемарыяльных знаках і абеліcках. У першы тыдзень вайны на Лупалаўскім аэрадроме размяшчаўся 313-ы асобны выведна-бамбардыровачны полк. 25 чэрвеня 1941 года самалёты палка з аэрадрома падняліся ў паветра і ўдзельнічалі ў масіраваным бомбавым удары па буйнаму прамысловаму цэнтру Германіі – Гамбургу. Гэта была адна з першых бамбардзіровак савецкай авіяцыі па аб’ектах гітлераўскай Германіі. Дзеля выканання гэтага задання быў створаны зводны атрад – 100 лепшых экіпажаў бамбардыроўшчыкаў на чале з камандзірам 1-й эскадрыллі маёрам Цітовым. Гэты налёт на Гамбург 25 чэрвеня 1941 года прывёў у шокавае становішча гітлераўскае вярхоўнае камандаванне сваёй нечаканасцю. Бамбардзіроўка адбылася ноччу з даволі трапным пападаннем у прамысловыя аб’екты, у сувязі з чым германскі друк доўга каменціраваў “двухтысячны налёт рускіх на Гамбург”.

8 ліпеня 1941 года ў небе над Магілёвам вызначыўся камандзір авіяцыйнага звяна старшы лейтэнант М.Цярохін. У адным баю, вычарпаўшы баявы запас, ён таранам збіў тры варожых бамбардзіроўшчыка. За гэты подзвіг у небе над нашым горадам М.Цярохін быў узнагароджаны ордэнам Леніна, а восенню 1941 года на ўсіх франтах стаў вядомы верш К.Сіманава «Сакрэт перамогі», які быў прысвечаны адважнаму лётчыку.

На ўсходнім ускрайку раёна, на Чавускай шашы, знаходзіцца мемарыяльны знак “Зямлянка”. Менавіта тут напрыканцы чэрвеня 1941 года знаходзіўся штаб Заходняга фронту. 1 ліпеня ў адной з зямлянак штаба адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў стаўкі маршалаў К.Варашылава, Б.Шапашнікава, камандуючага фронта А.Яроменка, сакратара ЦК КП(б)БП П. Панамарэнка і інш. На нарадзе вырашаліся пытанні арганізацыі супраціву ворагу на Дняпроўскім рубяжы, абароны г. Магілёва, арганізацыі барацьбы ў тыле ворага. Менавіта тут была зроблена спроба даць арганізаваны адпор гітлераўскім захопнікам.

У гісторыю вайны 1941-45 гг. увайшла гераічная абарона Магілёва. Асабліва вызначыліся сваім гераізмам байцы 388 стралковага палка пад камандаваннем палкоўніка С.Ф.Куцепава ў баях на Буйніцкім полі, дзе ўпершыню быў развенчаны міф аб неператможнасці гітлераўскіх танкавых армад.

На левым беразе Дняпра гераічна стрымлівалі ворага на рубяжы абароны Любуж – Грабянёва з 10 да 25 ліпеня 1941 года байцы 747-га стралковага палка пад камандаваннем А.Шчаглова. Асабліва ўпартыя баі вяліся ў раёне аэрадрома і чыгуначнай станцыі «Лупалава», якая некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі абаронцаў і захопнікаў. Пры гэтым вызначыліся мужнасцю і гераізмам воіны 20-га механізаванага корпуса. Часткі корпуса з баямі адышлі ад Мінска, страцілі тэхніку і змагаліся за станцыю Лупалава як пяхота. У іх складзе быў 51-ы танкавы полк, якім камандаваў ураджэнец Магілёўшчыны, падпалкоўнік І.Якубоўскі (у будучым двойчы Герой Савецкага Саюза, маршал Савецкага Саюза, намеснік міністра абароны СССР). Воіны палка захапілі пантонны мост, які быў прызначаны гітлераўцамі для фарсіравання Дняпра, вялікую колькасць вайсковай маёмасці і іншае, што адразу знішчылі.

Прыкладаў гераізму было шмат. Але нягледзячы на гэта, перазыходзячы абаронцаў колькасцю і ўзбраеннем вораг захапіў Магілёў. З 27 ліпеня 1941 года да 28 чэрвеня 1944 года працягвалася гітлераўская акупацыя горада. Але насельніцтва не скарылася. Практычна з першых дзён акупацыі ўзніклі і дзейнічалі падпольныя групы супраціву на аўтарамонтным заводзе, на фабрыцы штучнага шоўку і інш.

Гітлераўцы ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. На тэрыторыі Магілёва былі створаны 5 лагераў смерці, у тым ліку на тэрыторыі Задняпроўя Грабянёўскі і Лупалаўскі лагеры смерці. Апошні быў створаны на месцы былога аэрадрома і быў прызначаны для ваеннапалонных і часткова для мясцовых жыхароў. З восені 1941 года да вясны 1943 года ў лагеры ад хвароб, голаду, растрэлаў было знішчана, па розных звестках, ад 40 да 80 тыс. чалавек. Сёння на месцы канцлагера мемарыяльны комплекс (насупраць універсітэта харчавання). Даволі шмат вязняў лагера былі выратаваны ад голада і смерці жыхарамі Магілёва. З удзячнасцю захоўваецца ўспамін аб дзіўнай і самаахвярнай жанчыне Праскоўі Дзерыба, якая не дала памерці ад голада і хвароб сотням, калі не тысячам, вязняў лагера смерці на Лупалава. У савецкі час афіцыйныя ўлады ніяк не адзначылі яе подзвіг.

Магілёў быў вызвалены ад гітлераўскіх захопнікаў 28 чэрвеня 1944 года ў выніку Магілёўскай наступальнай аперацыі савецкай арміі. Рыхтуючыся да абароны горада ўздоўж высокага правага берагу Дняпра, акупанты практычна цалкам разбурылі задняпроўскую частку горада і Падніколле.

Задняпроўе (Лупалава) было вызвалена 26-27 чэрвеня. Менавіта адсюль ноччу 27 чэрвеня 1944 года праз Дняпро пераправілася падраздзяленне капітана В.В.Фаціна. Дзякуючы яго адважным дзеянням гітлераўцы не паспелі цалкам зруйнаваць цэнтральную частку горада. Капітан В. Фацін са сваімі байцамі захапіў у палон каменданта горада, штаб дывізіі. Усяго: 2 генералаў, 35 афіцэраў, больш за 500 салдат, 16 гармат, 200 аўтамашын і іншую вайсковую тэхніку. Сёння ў яго гонар названа адна з вуліц у Кастрычніцкім раёне.

На тэрыторыі раёна ўсталяваны помнікі і абеліскі ў гонар вызваліцелей: на брацкіх пахаваннях на праспекту Шмідта, савецкіх воінаў на вуліцы Аўтазаводскай, на месцы знаходжання каманднага пункта 121-га стралковага корпуса, адкуль у чэрвені 1944 года адбывалася кіраўніцтва фарсіраваннем Дняпра і штурмам Магілёва (праспект Дзімітрава).

Нягледзячы на шматлікія разбурэнні і чалавечыя ахвяры, насельніцтва раёна хутка аднавіла прадпрыемствы, жылы фонд, аб’екты культуры і вольнага часа. Пэўную дапамогу ім у гэтым аказвалі ваеннапалонныя з гітлераўскай арміі. Іх лагер знаходзіўся пасля вайны ў раёне аўтамабільнага завода імя С.Кірава (на ўскрайку лема ў Любужы маецца аб гэтым памятны знак).

Асабліва хутка стала развівацца Задняпроўе ў 1960-я гады, у сувязі з будаўніцтвам на тэрыторыі раёна шэрагу буйных прамысловых прадпрыемстваў. Дарэчы, да сярэдзіны 1960-х гадоў, у раёне сённяшняга Кастрычніцкага райвыканкама і гасцініцы “Турыст” знаходзілася выстава дасягненняў народнай гаспадаркі Магілёўскай вобласці.

25 студзеня 1962 года згодна указу Прэзыдыума Вярхоўнага савета БССР у Магілёве быў утвораны Кастрычніцкі адміністратыўна-тэрытарыяльны раён.

У 1965 годзе ў скверы, недалёка ад былога месцазнаходжання Чарнігаўскай брасмы, быў устаноўлены помнік А.С.Пушкіну. У тым жа годзе на Грабянёўскім полі па англійскаму праекту пачалося будаўніцтва буйнейшага ў Еўропе камбіната сінтэтычнага валакна. Першапачаткова камбінат планавалі пабудаваць у Краснаярску і нават засвоілі 1,5 млн руб. БССР дамагалася дазволу ўзвесці гігант хіміі ў Магілёве. Будоўлю аб’явілі Усесаюзнай ударнай камсамольскай. 5.11.1968 года быў атрыманы першы беларускі лаўсан. У 1975 годзе камбінат увайшоў у склад ВА “Хімвалакно”. Будаўніцтва стымуліравала сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна. З 1969 года пачалася комплексаная шматпавярхоўная забудова Задняпроўя, з 1976 года мікрараёнаў па пр-ту Дзімітрава. Акрамя жылых забудоў узводзіліся аб’екты адукацыі і культуры.

У 1973 годзе на тэрыторыі раёна з’явілася вышэйшая навучальная ўстанова – тэхналагічны інстытут, з 2002 года Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання. У 1977 годзе быў адкрыты Палац культуры і тэхнікі ВА “Хімвалакно”, у якім адбываюцца святкаванні і ўсталяванні найбольш значных падзей з жыцця горада, вобласці і краіны. На тэрыторыі раёна ў 1980–90-я гады былі пабудаваны сучасныя будынкі навучальных устаноў, бібліятэк, устаноў аховы здароўя, кінатэатры “Космас” і “Ветразь”, спартыўныя комплексы “Хімік” і “Тарпеда”, будынак вяслярнай базы, аб’екты гандлю. У апошнія гады на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна ўзведзены помнік воінам-інтэрнацыяналістам, палац спорта “Магілёў” (Лядовы палац), адкрыты памятная дошка ў гонар народнага пісьменніка І.Чыгрынава, у 2005 годзе помнік паэту Т.Шаўчэнка.

## 3. Эканамічнае і культурнае жыццё сучаснага Магілёва

Пасля вызвалення Магілёва ад гітлераўскіх захопнікаў пачалось адраджэнне яго гаспадаркі. Трэба адзначыць, што вельмі шмат для аднаўлення роднага горада зрабілі самі магілёўцы. Практыкавалася правядзенне масавых грамацкіх прац жыхароў па добраўладкаванню горада. У першы дзень такіх прац удзельнічала 5530 жыхароў. За адзін год магілёўцы адпрацавалі 74 тыс.чалавека-дзён. Дапамагалі аднаўляць горад жыхары іншых гарадоў і рэспублік былога СССР, а таксама нямецкія ваеннапалонныя.

Згодна перапісу 1959 г. у Магілёве жыло 121712 жыхароў. У пачатку 1960-х гадоў у горадзе было больш за 20 буйных прамысловых прадпрыемстваў. За 1960-1990 гг. у Магілёве з΄явілася больш як 40 прамысловых прадпрыемстваў.

Асабліва хуткімі тэмпамі стаў развівацца горад пасля будаўніцтва ў ім камбінату сінтэтычнага валакна ў 1971 г. (сёння ААТ “Магілёўхімвалакно”). У 1967-69 гг. быў пабудаваны ліфтабудаўнічы завод, у 1968г. – камбінат сілікатных вырабаў, у 1973 г. – КШТ, у 1974 г. – завод “Тэхнапрыбор”. Прамысловае развіццё горада адмоўна паўплывала на экалагічны стан Магілёва.

На пачатку трэцццяга тысячагоддзя Магілёў - адміністрацыйны цэнтр Магілёўскай вобласці. Прамыя аўтадарогі злучаюць яго з Масквой, Санкт-Пецярбургам, Кіевам, Адэсай, Мінскам. Ён мае добрыя транспартныя шляхі і камунікацыі з усімі беларускімі гарадамі. Мае гарады-пабрацімы: Айзенах

(Германія), Віллербанн (Францыя), Влацлавек (Польшча), Клайпеда (Літва), Бардэйоў (Славакія), Керч (Украіна), Тула (Расія), Крагулявец (Сербія), Габрава (Балгарыя).

У Магілёве працуюць абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты і адпаведныя саветы дэпутатаў, іншыя дзяржаўныя ўстановы горада і вобласці. Дзейнічаюць шэраг грамадскіх партый і аб’яднанняў. У горадзе выходзяць 12 газет (рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх), часопісы, маюцца абласны і гарадскі тэлеканалы.

Магілёў – горад абласнога падпарадкавання, падзелены на два адмінстрацыйных раёны. З’яўляецца развітым прамысловым і культурным цэнтрам з добрай сеткай тэлекамунікацый. Плошча горада 10287,3 га, падзяляецца на дзве часткі ракой Дняпро, сярэднегадавая тэмпература +5,4°С.

Магілёў адзін з буйнейшых гарадоў Беларусі. У ім жыве (1999 г.) каля 360 тыс. чалавек, з іх беларусаў 85,9%, рускіх 10,8%, украінцаў – 1,7%, палякаў – 0,2%, яўрэяў – 0,5%, іншых нацыянальнасцяў – 0,9%.

З агульнага ліку насельніцтва (1.11.1997 г.) моладзі было 88100 чал., у тым ліку студэнтаў ВНУ – 12669, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў – 8327, навучэнцаў прафтэхвучылішчаў - 7926, вучняў школ – 52100. Згодна перапісу 1999 года ў Магілёве жыло каля 360 тысячаў чалавек.

Магілёў – універсітэцкі горад. З 1973 г. дзейнічаў тэхналагічны інстытут, цяпер Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання. У горадзе дзейнічаюць Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.Куляшова, Беларуска-Расійскі універсітэт, адна недзяржаўная ВНУ, педагагічны факультэт Беларускай акадэміі музыкі, 3 каледжы, 4 ліцэі, музычнае вучылішча, вучылішча культуры і шэраг іншых сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 42 агульнаадукацыйныя школы, з іх 3 гімназіі, 2 школы-гімназіі, 1 школа-сад. На тэрыторыі горада дзейнічаюць 2 тэатры (абласны драматычны і тэатр лялек), абласная філармонія, 19 палацаў, дамоў культуры і клубаў, 40 бібліятэк, 7 гарадскіх дзіцячых школ мастацтваў, 4 кінатэатры, Абласны краязнаўчы музей з філіялам «Музей этнаграфіі», Абласны мастацкі музей імя П.Масленікава, Музей гісторыі Магілёва, філіял Нацыянальнага мастацкага музея - музей В.К.Бялыніцкага-Бірулі.

Штогод у горадзе адбываюцца Міжнародны пленэр мастакоў імя В.Бялыніцкага-Бірулі, Міжнародны фестываль хрысціянскай духоўнай музыкі «Магутны Божа», Міжнародны фестываль музыкі «Залаты шлягер» (праз год); праводзяцца калядныя, вялікодныя (пасхальныя), восеньскія кірмашы з гандлем і святочнымі музычнымі прадстаўленнямі, народныя святы («Купалле», «Каляды») і іншыя культурныя мерапрыемствы.

Праз год адбываецца Міжнародная навуковая канферэнцыя “Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць”, у 2005 годзе была ўжо пятая, дзве апошніх арганізоўваліся навукоўцамі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта харчавання пры ўдзеле гарвыканкама і музея гісторыі Магілёва. У 2004-2005 гг. праводзіліся Раманаўскія чытанні намаганнямі МДУ імя А.Куляшова. Восенню 2005 года на будынку абласнога краязнаўчага музея была адчынена памятная дошка ў гонар Е.Раманава, крыху раней музею было прысвоена ганаровае званне імя

Е.Р.Раманава – вядомага даследчыка Магілёўшчыны. Ва ўсіх навучальных установах горада выкладаецца вучэбны курс "Магілёвазнаўства" (аўтары праграмы В.Валадзькова, І.Пушкін), ва універсітэце харчавання пад назвай "Гістарычная і культурная спадчына г. Магілёва".

Магілёў мае 6 стадыёнаў, 123 спартыўныя залы, 7 басейнаў, 48 стралковых цiраў, 292 розныя спартыўныя пляцоўкі, 16 тэнісных кортаў, 2 пляцоўкі для гульні ў хакей на лёдзе, 10 спартыўных школ. У 2006 годзе завяршылася будаўніцтва спартыўнага комплексу "Алімпіец". Спартсмены Магілёва паспяхова ўдзельнічаюць у міжнародных спаборніцтвах па наступных відах спорту: акадэмічнае веславанне, пяцібор'е, стральба з лука, лёгкая атлетыка, лыжны спорт, барацьба самба і дзюдо, скачкі на батуце, мастацкая гімнастыка, радыёспорт. Сярод магілёўцаў маюцца алімпійскія чэмпіёны і прызёры алімпійскіх гульняў: С.Баітава, Р.Макараў, А.Масяйкоў і інш.

У Магілёве дзейнічаюць шэраг палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. У тым ліку і грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей Беларусі. Таварыствы праводзяць значную грамадскую і культурна-асветную працу.

Горад мае моцны вытворча-тэхнічны патэнцыял. Найбольш развітыя прамысловыя галіны: хімічная, машынабудаўнічая, лёгкая і харчовая. На Магілёў прыпадае больш за 38,9% прадукцыі, выпускаемай прамысловасцю вобласці. У горадзе дзейнічаюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія робяць хімічныя валокны тэкстыльнага і тэхнічнага прызначэння, аўтамабільныя краны, пасажырскія ліфты, самаходныя скрэперы, электрарухавікі, тканіну, абутак і інш. 38 прамысловых прадпрыемстваў ажыццяўляюць знешнеэканамічную дзейнасць.

## 4. Дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей Беларусі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці

У Рэспубліке Беларусь дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў, інтарэсаў. Дзяржава нясе адказнасць за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія жывуць у краіне. Усе роўныя перад законам і маюць правы без усялякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону. Кожны мае права на свабоду аб'яднанняў, захоўванне сваёй нацыянальнай прыналежнасці, таксама ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання нацыянальнасці. Знявага нацыянальнай годнасці караецца па закону. Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін, выхавання і навучання.

З моманту атрымання Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці побач з адраджэннем культуры і нацыянальнага жыцця беларускага этнаса пачаўся і аналагічны працэс у большасці нацыянальных супольнасцей, якія жывуць на тэрыторыі нашай краіны. Згодна дадзеных на 01.11.2004 г. у Беларусі функцыяніруюць 122 грамадскія арганізацыі 24 нацыянальных супольнасцей, з іх 38 арганізацый маюць статус міжнародных і рэспубліканскіх.

Дадзеныя арганізацыі рэалізуюць культурна-асветніцкія, інфармацыйныя, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы, у тым ліку і пры падтрымцы рэспубліканскіх, абласных, раённых і гарадскіх уладаў. Дзейнасць усіх нацыянальных фарміраванняў накіравана на вывучэнне гісторыі, культуры, мастацтва сваіх народаў, правядзенне сустрэч, семінараў, свят, фестывалей, выстаў, канферэнцый, наладжванне творчых сувязей з краінамі іх паходжання. Ствараюцца культурна-асветніцкія цэнтры, калектывы самадзейнай народнай творчасці.

На правядзенне культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў нацыянальных аб'яднанняў мэтавым парадкам на конкурснай аснове выдаткоўваюцца сродкі з агульнадзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў. З мясцовых бюджэтаў фінансуецца развіццё самадзейнага мастацтва, дацыруецца дзейнасць устаноў культуры, якія створаны нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі.

Нацыянальны склад Магілёўскай вобласці і г. Магілёва (у %):

| Нацыя-нальнасць | 1959г. | | 1970г. | | 1979г. | | 1989г. | | 1999г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вобл. | горад | вобл. | горад | вобл | горад | вобл. | горад | вобл. | горад |
| Беларусы | 87,9 | 74,7 | 85,6 | 76,8 | 84,3 | 78,8 | 82,2 | 78,2 | 86,1 | 85,9 |
| Рускія | 7,7 | 15,3 | 9,8 | 15,5 | 11,1 | 15,0 | 13,0 | 15,7 | 10,9 | 10,8 |
| Украінцы | 1,4 | 2,6 | 1,8 | 2,6 | 1,9 | 2,4 | 2,3 | 2,9 | 1,7 | 1,7 |
| Палякі | 0,3 | 0,5 | 0,3 | 0,4 | 0,3 | 0,3 | 0,3 | 0,3 | 0,2 | 0,2 |
| Яўрэі | 2,4 | 6,3 | 2,1 | 4,0 | 1,9 | 2,7 | 1,4 | 1,9 | 0,3 | 0,5 |
| Іншыя | 0,3 | 0,6 | 0,4 | 0,7 | 0,5 | 0,8 | 0,8 | 1,0 | 0,7 | 0,6 |

Пазнаёмімся з дзейнасцю нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці, у якасці прыкладу за 2003-2004 гг.

Згодна афіцыйнай штогадовай «Справаздачы аб выніках забеспячэння выканання заканадаўства аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях, нацыянальных меншасцях за 2003 год» савета па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага аблвыканкама (далей – савет): «Грамадзяне розных нацыянальнасцей, якія жывуць на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, маюць ў поўнай меры магчымасць рэалізаваць забяспечанныя беларускім заканадаўствам правы па вывучэнню гісторыі, культуры, роднай мовы, ствараюць свае грамадскія нацыянальна-культурныя аб'яднанні, па меры магчымасці актыўна ўзаемадзейнічаюць з этнічнымі дзяржавамі».

На пачатак 2004 года на тэрыторыі Магілёўскай вобласці былі зарэгістраваны і працавалі 16 грамадскіх арганізацый, якія былі ўтвораны прадстаўнікамі 8 нацыянальнасцей. Менавіта: Магілёўскае грамадскае таварыства (ГТ) азербайджанцаў «Хазар» (ліквідавана ў верасні 2005 года), Азербайджанскае таварыства гісторыі і культуры ў г. Бабруйске, ГТ армян «Масіс» (Магілёў), Міжнароднае ГТ армян «Урарту», ГТ «Магілёўская яўрэйская абшчына», Магілёўская гарадская яўрэйская нядзельная школа, Магілёўскі гарадскі дабрачынны цэнтр «Хэсэд Барух», ГТ «Бабруйская гарадская яўрэйская абшчына», Гарадское яўрэйскае таварыства «Рахамім», ГТ яўрэйскай культуры

«Тхія», Нямецкая абшчына «Цэнтар нямецкай культуры» (Бабруйск), Магілёўскае аддзяленне ГТ «Саюз палякаў на Беларусі», Бабруйскае аддзяленне ГТ «Саюз палякаў на Беларусі», Магілёўскае гарадское аддзяленне РГТ «Рускае таварыства», Бабруйскае таварыства рускай культуры «Русь», культурна-асветніцкае ГТ украінцаў «Дніпро», Магілёўскае гарадское грамадскае аб'яднанне "Грузінская абшчына Іберыя".

Сярод нацыянальных аб'яднанняў вобласці традыцыйна найбольш шматлюдным (каля 8 тыс. чалавек) і разгалінаваным з'яўляюцца яўрэйскія.

Так, у г. Бабруйске працуюць 3 яўрэйскія нядзельныя школы (каля 300 дзяцей) па вывучэнню нацыянальных традыцый, мовы «Іўрыт», англійскай мовы, паляпшэнню фізічнага выхавання. Пры гарадской абшчыне працуе лялечны тэатр, з дванаццацю дзяцьмі-інвалідамі заняткі праводзяцца «на даму». Пры культурным цэнтры «Тхія» дзейнічае універсітэт культуры, жаночы, сямейны, маладзёжны і дзіцячыя клубы, бібліятэка, выдаецца газета «Гешэр», у якой размешчана ўсебаковая інфармацыя аб дзейнасці нацыянальна-культурнай супольнасці. Пры дабрачынным таварыстве «Рахамім» дзейнічае шахматна-шашачны клуб, клуб аздараўлення для састарэлых, жаночы клуб, выдаецца газета «Мішпоха».

Пры Магілёўскай яўрэйскай абшчыне працуе добрачынны цэнтр «Хэсэд Барух», дзейнічаюць сямейны і маладзёжны клубы, хор ветэранаў «Мішпоха», вакальны ансамбль моладзі «Тайбелех», два ансамбля танца (дзіцячы «Отазей» і сумесны для дзяцей і іх бацькоў «Сімха»), тэатр «Шалом».

Усе гэтыя калектывы былі сталымі ўдзельнікамі і лаурэатамі рэспубліканскіх і абласных фестываляў нацыянальных культур, аглядаў мастацкай і нацыянальнай творчасці. Так, 7 снежня 2003 года ў тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча адбыўся 7-ы фестываль яўрэйскай кнігі. Спецыяльна да фестывалю абшчынай быў выдадзены буклет «Бабруйскі след…» з біяграфіямі і фрагментамі твораў гасцей свята. Акрамя таго, яўрэйская абшчына выступіла ініцыятарам стварэння так званай «Алеі праведнікаў» у гарадскім парку – у гонар асоб, якія ратавалі яўрэяў ад гітлераўцаў. Ініцыятыва падтрымана гарвыканкамам і была рэалізавана на прынцыпах частковага фінансавання ў межах падрыхтоўкі да святкавання 60-годдзя вызвалення Бабруйска ад гітлераўскіх захопнікаў.

Больш за чатыры гады ў Магілёве дзейнічала грамадскае аб'яднанне азербайджанцаў «Хазар», мэтай якога з'яўлялася прапаганда нацыянальных традыцый, рэалізацыя грамадзянскіх, сацыяльных і культурных правоў і свабод азербайджанцаў у дзяржаўных і іншых установах, дабрачынная дзейнасць. У 2003 годзе пры ГТ «Хазар» была створана нядзельная школа. Была заключана дамова на арэнду памяшкання для заняткаў у школе з упраўленнем уласнасці гарвыканкама. Заняткі праводзіліся ў памяшканні дзіцячай музычнай школы № 4. Таварыства запрасіла два выкладчыка з Рэспублікі Азербайджан з мэтай выкладання азербайджанскай мовы, гісторыі, традыцый і культуры азербайджанскага народа для дзяцей і падлеткаў, увесь час пражываючых на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Кіраўніцтва Кангрэса Азербайджанскіх абшчын, пры актыўным удзеле таварыства «Хазар», вылучыла прапановы аб усталяванні пабрацімскіх сувязяў паміж гарадамі Магілёў і Сумгаіт. Аб гэтам ішла размова

02.10.2003 г. падчас сустрэчы намесніка старшыні Магілёўскага гарвыканкама з намеснікам Дзяржаўнага камітэта Азербайджанскай Рэспублікі па працы з азербайджанцамі, якія жывуць за мяжою. У 2004 годзе, дзякуючы намаганням ГТ «Хазар», у Магілёве была ўсталявана памятная дошка ў гонар Везірава А.Ф., які з'яўляўся Ганаровым грамадзянінам Магілева і быў азербайджанцам па нацыянальнасці.

У верасні 2005 года, па рашэнню Магілёўскага абласнога суда, Магілёўскае грамадскае аб'яднанне азербайджанцаў "Хазар" было ліквідавана за правядзенне дзейнасці з парушэннямі заканадаўства.

Прадстаўнікі грузінскай нацыянальнасці ў г. Магілёве актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіліся ў вобласці і рэспубліцы. Таварыства "Іберыя" было зарэгістравана ў лістападзе 2004 года.

Шматвобразнай культурнай і дабрачыннай дзейнасцю займаецца Бабруйская нямецкая абшчына «Цэнтр нямецкай культуры». Абшчына падтрымлівае шчыльныя сувязі з шэрагам дабрачынных устаноў Германіі, што дазваляе ей аказваць значную дапамогу медыцынскім і адукацыйным установам горада, а таксама маламаёмасным катэгорыям насельніцтва. У 2003 годзе цэнтр нямецкай культуры нават аказаў спонсарскую дапамогу савету па справах рэлігій і нацыянальнасцей аблвыканкама ў выглядзе бясплатнага выдаткавання для патрэб савета кампутара і прынтара. У чэрвені 2003 года члены абшчыны прынялі ўдзел у Міжнародным фестывалі фальклора «Венок дружбы». Працаваў «нямецкі дворык», у праграме якога была выстава кулінарных, кандытарскіх вырабаў і канцэртная праграма ансамбля «Лэрхен». 24 жніўня 2003 года пры садзейнічанні Бабруйскага гарвыканкама абшчына правяла мерапрыемствы, якія былі прысвечаны 62-й гадавіне дэпартацыі немцаў Паволжа. Рашэннем гарвыканкама Бабруйска ад 28.10.2003 г. № 21-33 Цэнтру нямецкай культуры для арганізацыі статутнай дзейнасці прадастаўлена памяшканне на правах арэнды. Пры цэнтры працуе нядзельная школа з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы.

Актыўна дзейнічаюць аб'яднанні палякаў. Польская мова вывучаецца ў гуртках пры Магілёўскім «Доме польскім», гуманітарным ліцэі МДУ імя Куляшова. Як прадмет польская мова вывучаецца з першага класа ў СШ № 2 г.Магілёва, у дзіцячых садках №№ 34, 81 (сфарміраваны па адной групе). У МДУ імя Куляшова выкладаецца спецкурс польскай мовы. Пры «Доме польскім» дзейнічае «Тэатр моды, пластыкі і грацыі», два харавых калектыва, бібліятэка. У снежні 2004 года ў Доме польскім г. Магілёва была арганізавана выстава аб гісторыі і культуры палякаў на Магілёўшчыне.

Утворанае ў 2003 годзе культурна-асветніцкае аб'яднанне ўкраінцаў «Дніпро» налічвае каля 50 украінцаў, якія жывуць у г. Магілёве. Гэта прадстаўнікі розных прафесій і ўзростаў. Асноўнай мэтай дзейнасці аб'яднання «Дніпро» з'яўляецца садзейнічанне нацыянальна-культурнаму адраджэнню ўкраінцаў, захаванню і развіццю ўкраінскай мовы, культуры, народных традыцый. Украінцамі Магілёва арганізоўваліся святочныя сустрэчы. На іх знаходзілі адзін аднаго землякі з розных куточкаў Украіны, абменьваліся ўспамінамі, спявалі любімыя спевы, частаваліся традыцыйнымі нацыянальнымі стравамі. У жніўні

2005 года па ініцыятыве аб’яднання ў горадзе, на левым беразе Дняпра, быў усталяваны помнік Т.Р.Шаўчэнкі.

Шматвобразна грамадска-культурная дзейнасць нацыянальных аб’яднанняў рускіх, армян, цыганоў. Асабліва яскрава гэта бачна падчас розных фестываляў і святаў з удзелам этнічных супольнасцей. Так, пры правядзенні Міжнароднага фестывалю «Вянок дружбы» у Бабруйску армянская абшчына падрыхтавала двухгадзінную праграму каля будынка тэатра драмы і камеды імя В.Дуніна-Марцінкевіча. Цыганскі ансамбль г. Магілёва з’яўляецца сталым удзельнікам усіх масавых святаў і гулянняў. У 2003 годзе падчас святкавання Дня горада Магілёва цыганам была выдзелена пляцоўка ў кінатэатра «Радзіма» (цэнтр горада і свята), на якой яны арганізавалі забаўляльную праграму з спевамі, танцамі, гульнямі. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці таварыства рускай культуры «Русь» г.Бабруйска з’яўляюцца шматразовымі дыпламантамі і лаурэатамі гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў і фестываляў. Магілёўскае ГТ «Рускае таварыства» правяла шэраг творчых акцый сумесна з іншымі нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі: конкурс сачыненняў на тэму «Мая Радзіма», спаборніцтва па ўсходнім нардам, экскурсійныя вандроўкі ў Расію і г.д.

Усе без выключэння нацыянальна-культурныя аб’яднанні прымаюць удзел у абласным і рэспубліканскім турах фестывалю нацыянальных культур. Вынікам абласнога тура быў святочны трохгадзінны гала-канцерт, выстава-дэгустацыя нацыянальных блюд і напояў, выстава вырабаў народнай творчасці. У 2003 годзе пры падсумаванні вынікаў абласнога тура савет традыцыйна заснаваў і ўручыў два каштоўных прызы: «Самаму юнаму ўдзельніку фестываля» і «За вернасць традыцыям у нацыянальным мастацтве».

Неабходна адзначыць, што ўсе больш-менш значныя мерапрыемствы, якія арганізавалі і праводзілі нацыянальныя аб’яднанні, асабліва дабрачыннага характару, усебакова асвятляліся ў сродках масавай інфармацыі. Іх пазітыўная адзнака садзейнічае ўмацаванню сяброўства і ўзаемаразумення жыхароў вобласці розных нацыянальнасцей.

Характарызуючы сітуацыю ў сферы міжнацыянальных адносін савет па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Магілёўскім аблвыканкаме палічыў «неабходным адзначыць станоўчую практыку работы ў дадзенай сферы кіраўніцтва Магілёўскага гарвыканкама». Сапраўды, па выніках сустрычы 7.02.2003 года старшыні гарвыканкама Шорыкава В.І. з кіраўнікамі нацыянальных аб’яднанняў, у праграму штогадовых мерапрыемстваў свята горада ўключаюцца Дні культур нацыянальных супольнасцей Магілёва. Гарвыканкамам разгледжана пытанне аб падборы памяшканняў пад офісы для нацыянальных аб’яднанняў, усім ім прапанаваны памяшканні ў будынку былога гатэлю «Дняпро» у цэнтры горада. На думку савета: «Правадзімая саветам і гаррайвыканкамамі работа па рэалізацыі правоў нацыянальных супольнасцей у сферы культуры, адукацыі, інфармацыі садзейнічае ўмацаванню палітычнай і сацыяльнай стабільнасці ў рэгіёне, захаванню спакойнага міжнацыянальнага ўзаемадзеяння».

Эканамічны і культурны патэнцыял горада дазваляе магілёўцам з аптымізмам глядзець у будучыню.

# Літаратура

## Крыніцы


1. Весь Могилев на Днепре. – Могилев, 1912.
2. Записки игумена Ореста // Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси. – Вильна, 1867. – Т.2; 1871. – Т. 5.
3. Магілёўскя хроніка Трафіма Сурты і Юрыя Трубніцкага // Беларускія летапісы і хронікі / Уклад. У. Арлова, прадм. В.Чамярыцкага. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 281 – 390.
4. Могилёвская старина. – Могилёв, 1900 – 1903. – Вып. I-III.
5. Опыт описания Могилевской Губернии / Под. ред. А. Дембовецкого. – Могилев: Типография губернского правления, 1882. – Т. 1. – 782 с.
6. Опыт описания Могилевской губернии / Под ред. А. Дембовецкого. – Могилев: Типография губернского правления, 1884. – Т. 2. – 986 с.
7. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. Т. XXIII. Могилевская губерния. Издание центрального Статистического комитета. – 1903.
8. Хроника белорусского города Могилева. Переведена с польского с подлинника статским советником Николаем Гортынским. – М.: Унив. типография Коткова, 1887. – 142 с.
9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.5. / Беларус. Энцыкл., Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн., 1999. – 592 с.


## Асноўная літаратура


1. Агеев А., Климуть Я., Пушкин И. Перекрёстки Могилёвской истории. - Минск: ООО”Туринфо”, 2004. – 216 с.
2. Агееў А.Р., Марзалюк І.А., Пушкін І.А. Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах. – 2-е выд. – Магілёў: Абласная друкарня, 1999. – 204 с.
3. Агееў А.Р., Пушкін І.А. Магілёў на скрыжаванні. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Магілёў: Абласная друкарня, 2000. – 96 с.
4. Курков И., Пушкин И. Могилёвщина. Легенды, события, люди. – Минск: Медиафакт, 2004. – 304 с.
5. Марзалюк І.А. Магілёў ў XII – XVIII стст. Людзі і рэчы / Навук. рэд. Я.Р.Рыер. – Магілёў – Мінск: Веды, 1998. – 260 с.
6. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва / Беларус. Энцыкл.; Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1998. – 496 с.
7. Філіповіч І.І. Міфы і праўда аб Магілёве. – Магілёў, 1993. – 142 с.

## Дадатковая літаратура


### Да тэмы 1

1. Барысенка М.С. Магілёўшчына – мой любы Прыдняпроўскі край. Зборнік экскурсій у 2-х частках. Ч. 1. – Магілёў: УПКП "Магілёўская аблдрукарня імя С.Собаля", 2004. – 192 с.
2. Сидоренко Б.И. Древний Могилёв: Очерки истории города в XIV-XVIIвв. – Минск, 1997. – 150 с.
3. Ткачоў М.А. Замкі і людзі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.

### Да тэмы 2

1. Барысенка М.С. Магілёўшчына – мой любы Прыдняпроўскі край. Зборнік экскурсій у 2-х частках. Ч. 1. – Магілёў: УПКП "Магілёўская аблдрукарня імя С.Собаля", 2004. – 192 с.
2. Грыцкевіч А. Магілёў як рэлігійны цэнтр у XVII – XVIII стагоддзях // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац. У 2 ч. Ч. I. / Уклад. І.Пушкін, В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 51 – 57.
3. Кузьменка М. Магілёўская епархія ад часоў далучэння да Расеіі і да 1918 года // Магілёўская даўніна. – Магілёў, 1995. – С. 73 – 91; 1997. – С. 54 – 60; 1998. – С. 63 – 68; 1999. – С. 51 – 57.
4. Мелешко В.И. Могилев в XVI – середине XVII вв. – Минск: Наука и техника, 1988. – 264 с.
5. Пушкін І. Дзейнасць таварыства Ісуса на абшарах Магілёўшчыны // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 1 / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 145-160.

### Да тэмы 3

1. Барысенка М.С. Магілёўшчына – мой любы Прыдняпроўскі край. Зборнік экскурсій у 2-х частках. Ч. 1. – Магілёў: УПКП "Магілёўская аблдрукарня імя С.Собаля", 2004. – 192 с.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобласць. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1986. – 408 с.
3. Марзалюк І. Магілёўская штодзённасць // Магілёўская даўніна, 1996. – С.5-13.
4. Слюнькова И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
5. Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. – Минск: Вышэйшая школа, 1985. – Т.1. – 296 с.
6. Чарняўская Т.І. Архітэктура Магілёва. – Мінск: Навука і тэхніка,1973. - 96с.

### Да тэмы 4

1. Клімуць Ж.Я.Фарміраванне беларускай нацыянальнай кухні ў XVIII-XX ст. // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін.- Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С. 50-54.

2. Літоўская гаспадыня, ці Навука аб утрыманні ў добрым стане хаты. – Мінск: Полымя, 1993. – 366 с.
3. Спадчына, 2003. - № 2-3. [нумар прысвечаны спажывецкай культуры Беларусі].
4. Чапялінская Ж.І. Гісторыя і традыцыі харчавання // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін.- Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С.46-50.


**Да тэмы 5**


1. Агееў А. Магілёўшчына пад час вайны 1812 года // Магілёўская даўніна, 1995. – С. 51-60.
2. Бектинеев Ш.И. Могилёвский пехотный полк // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац. У 2 ч. Ч. І. / Уклад. І.Пушкін, В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С.150 - 159.
3. Котлярчук А. Карл XII у гісторыі і паданнях Магілёва // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / Уклад. І.Пушкін.– Магілёў: УПКП "Магілёўская абласная ўзбуйненная друкарня", 2001. – С. 95 – 99.
4. Пушкін Ігар "...Праз агонь у попел і тло" // Беларуская мінуўшчына, 1994.– № 3. – С. 23 – 24.
5. Сагановіч Г.М. Невядомая вайна (1654-1667). – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 146 с.


**Да тэмы 6**


1. Агеев А.Г., Пушкин И.А. История профсоюзного движения Могилёвщины.- Могилёв: УПКП "Могилёвская обласная укрупнённая типография имени Спиридона Соболя", 2005. - 216 с.
2. История Могилевского еврейства: Документы и люди: науч. популяр. очерки и жизнеописания. В 2-х кн. Кн. 1 / Сост. А. Литин. – Минск: Юнипак, 2002. – 256 с.
3. Пушкін Ігар Па дарозе ў ссылку // Пушкін – беларуская культура – сучаснасць: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 1999. – С. 46 – 50.
4. Пушкін Ігар. Пушкіны. Адкуль яны? // А.С.Пушкін і Беларусь - А.С.Пушкин и Беларусь // Уклад. Т.Махнач, галоўн. рэд. А.Мальдзіс. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – С. 85 – 86.
5. Шимукенус М.В. Могилёвские губернаторы 1772-1917 // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 1 / Уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 138-141.


**Да тэмы 7**


1. Агеев А.Г., Пушкин И.А. История профсоюзного движения Могилёвщины.- Могилёв: УПКП "Могилёвская обласная укрупнённая типография имени Спиридона Соболя", 2005. - 216 с.
2. Бяспанскі С.І. Магілёў сустракае каранаваных асоб // Магілёўшчына. III вып. – Магілёў, 1992. – С. 52-55.

3. Позняк С.В. Николай II в Ставке Верховного главнокомандования в Могилеве // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 1 / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 226 – 274.
4. Пушкін І.А. Магілёў і Магілёўшчына ў святле апублікаваных архіваў Беларускай Народнай Рэспублікі // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С. 260 – 270.
5. Филиппович И.И. Могилев: Хроника событий 1917-1918 гг. – Могилев, 1995. – 125 с.

**Да тэмы 8**

1. Васілеўскі Ю. Да гісторыі Магілёўскага гуртка беларускай моладзі “Асвета” (1918-1923 гг.) // Магілёўская даўніна, 1994. – С. 25-33; 1996. – С. 29-40.
2. Кандратьева Л. Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 3. – С. 44 – 46.
3. Навіцкі У.І. Магілёў – цэнтр абнаўленчага руху РПЦ у Беларусі (20 – 30-я гг. XX ст.) // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 2 / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 3 – 7.
4. Пушкін І.А. Удзел латышоў у грамадска-палітычным і культуным жыцці Магілёўшчыны (20-я гады) // Гісторыя Беларускага Падняпроўя. – Магілёў: Абласная друкарня, 1999. – С. 135 – 145.
5. Пушкін І.А. Удзел палякаў Магілёўшчыны у грамадска-палітычным жыцці БССР і адносіны да іх дзяржаўнага кіраўніцтва. 20-я гады XX ст. // Проблемы славяноведения: Сборник научных статей и материалов. Вып. 3. – Брянск: Изд-во БГУ, 2001. – С. 252 – 261.
6. Пушкін І.А. Удзел яўрэяў г. Магілёва ў грамадска-палітычным і культурным жыцці (1917 – канец 30-х гадоў XX ст.) // Этнаграфія Беларускага Падняпроўя: Матэрыялы навуковай канферэнцыі. – Магілёў: Выд-ва МДУ імя А. Куляшова, 1999. – С. 30 – 40.
7. Пушкін І.А. Як зачыняліся цэрквы ў Магілёве // Магілёўская даўніна. – 1996. – С. 87 – 90.
8. Селеменёв В. Как белорусскую столицу переводили в г. Могилев // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / Уклад. І.Пушкін. – Магілёў: УПКП «Магілёўская абласная ўзбуйненная друкарня», 2001. – С. 248 – 251.

**Да тэмы 9**

1. Барановский Е. Отражение истории обороны Могилева в июле 1941 г. в документах Национального архива Республики Беларусь, отечественой и немецкой литературе // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / Уклад. І.Пушкін.– Магілёў: УПКП “Магілёўская абласная ўзбуйненная друкарня”, 2001. – С. 297 – 300.

2. Борисенко Н. Днепровский рубеж: героическое лето 1941-го. – Могилёв: УПКП «Могилёвская укрупнённая областная типография имени Спиридона Соболя», 2004. – 368 с.
3. Коваленчиков Н.Н. Подпольные патриотические организации Могилёва в годы Великой Отечественной войны // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 2 / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 101-107.
4. Костеров А.П. Бессмертный подвиг защитников Могилёва летом 1941 г. – Могилёв: УПКП «Могилёвская укрупнённая областная типография имени Спиридона Соболя», 2004. – 216 с.
5. Костеров А. Роль и значение оборонительных сражений на могилевском направлении летом 1941 года // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац / Уклад. І.Пушкін.– Магілёў: УПКП "Магілёўская абласная ўзбуйненная друкарня", 2001. – С. 258 – 262.
6. Свинтицкий Ф.А. Боевые действия войск 2-го Белорусского фронта по освобождению Могилёва // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін.- Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С. 361 - 366.

**Да тэмы 10**

1. Борисенко Н.С. Проблемы охраны историко-культурного наследия г. Могилёва // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. - Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С. 448 - 453.
2. Бяспанскі С.І. Да пытання аховы помнікаў гістарычнага цэнтра Магілёва // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. - Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С. 444 - 448.
3. Волчок Г.И. Внешнеполитические связи Могилёва с регионами Российской Федерации // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 2 / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Магілёў, 2003. – С. 179-187.
4. Магілёў: ілюстраваны альбом / Уклад. Г.Карчэўскі; аўтары тэксту І.Пушкін, У.Цярэшчанка. – Мінск: НВТАА "Икселент", 2003. – 95 с.
5. Морозова Н.Н. Экономическая оценка промышленного потенциала Могилёва // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. 2 / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. – Магілёў,2003.– С.187-193.
6. Шымукенус. М. З гісторыі Магілёўскага Задняпроўя // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А.Пушкін, В.В.Юдзін. - Могилёв: УПКП «Могилёвская обл.типография им. С.Соболя», 2005. – С. 69-74.

Вучэбнае выданне

# ГІСТАРЫЧНАЯ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ГОРАДА МАГІЛЁВА

Курс лекцый

Складальнік **Пушкін** Ігар Аляксандравіч

Рэдактар Т. Л. Бажанава
Тэхнічны рэдактар А. А. Шчарбакова

Падпісана да друку 4.07.2006 г. Фармат 60х84 1/6
Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Друк трафарэтны.
Умоўн. друк. л. 8,7. Ул.-выд. л. 9,4
Тыраж 60 асоб. Заказ 102

Установа адукацыі
"Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання"
212027, Магілёў, пр-т Шмідта, 3.
ЛП № 226 ад 12.02.2003г.

Надрукавана на рызографе рэдакцыйна-выдавецкага аддзела
установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання"
212027, Магілёў, пр-кт Шмідта, 3.
ЛВ № 604 от 03.06.2003г.